# ЯЎГЕН
# ВАСІЛЁНАК

ЯЎГЕН
ВАСІЛЁНАК

# ВЫБРАНЫЯ
# ТВОРЫ

# ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ Ў ДВУХ ТАМАХ

ТОМ 2

# Яўген Васілёнак

## АПОВЕСЦІ
## АПАВЯДАННІ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1977

Бел 2
В 19

В $\frac{70303\text{-}064}{М\ 302(05)\text{-}77}$ 94-77

# ЗАМЕЦЬ

Як стала цямнець, усхадзіўся вецер. Па рэйках пабегла пухкая замець, забіваючы стрэлкі снегам. Аляксей Нямнога высунуўся з акна паравознай будкі, акінуў позіркам станцыйныя пуці. Іхні веер, вузеючы на выхад да стрэлачнай гарлавіны, патанаў у дрыготкай шэрані. Падумаўшы, што цяпер рабіць манеўры будзе цяжэй, Аляксей прывычным рухам перавёў рэверс, пасунуў рэгулятар. Колы спачатку прабуксавалі разоў колькі, потым даволі лёгка скранулі паравоз з месца.

— Не пашэнціла нам з надвор'ем,— сказаў памочнік машыніста Сяргей Бабук.— Пакуль змена, вочы на лоб вылезуць.

— Але, не пашэнціла...— паморшчыўся Аляксей Нямнога: снежныя калючкі сцёбнулі яму ў твар.

— Паязным брыгадам зараз яшчэ цяжэй,— прамовіў качагар Валодзя Кірылюк.— Праехаць чырвоны сігнал — што плюнуць!..

— Не каркай! — цыкнуў на яго Сяргей.— Бяры шуфель, вугаль вунь пачынае змярзацца.

З першага пуці толькі што адправіўся пасажырскі поезд на Мінск. Магутны магістральны цеплавоз амаль нячутна ўзяў яго з месца і адразу пачаў імкліва набіраць хуткасць. Цяпер ужо і хваставога агеньчыка не было відаць, поезд выйшаў на перагон.

Да канца змены было яшчэ багата часу. «Яшчэ маршруты два, а то нават і тры ўправімся расфарміраваць»,— надумаў Аляксей.

На падножку ўскочыў на хаду саставіцель, сярэдніх год мужчына ў расхрыстанай ватоўцы, са ссунутай на патыліцу шапкай, з-пад якой выбіваліся кучары чорных, прыця-

рушаных снегам валасоў. «Фарсун!» — зазначыў у думках Аляксей Нямнога.

— Механік, будзем расфарміроўваць зборны,— сказаў саставіцель.

— З шостага пуці?

— З шостага.

— Дарэчы, як тваё прозвішча?

— Шацкі я. А завуць Паўлам. А цябе?

Аляксей назваў сябе. Ён чамусьці вельмі не любіў гэтага фамільярнага слова «механік», якім з даўён-даўна чамусьці называюць на транспарце машыністаў.

— Цікавае ў цябе прозвішча! — зарагатаў Шацкі і ўзлез па прыступках у будку.— Нямнога!.. Першы раз чую такое! Гы, Нямнога!

— Залішне балбочаш,— сказаў Аляксей.— Лепей давай план расфарміроўкі.

— От зараз дзяжурная скажа. Міравецкая, між іншым, бабенцыя. Пальчыкі абліжаш. Цікава — замужняя яна альбо яшчэ не?.. Давай, тармазі нямнога, таварыш Нямнога!

— І скуль гэта ты ўзяўся, такі балбатун? — прытармажваючы паравоз, нездаволена прамовіў Аляксей.— Штосьці я цябе раней не бачыў у нас. Мабыць, паступіў нядаўна?

— З Мінска прымчаў, са сталіцы. У вас тут саставіцельскіх брыгад не хапае, от мяне з памочнікам Сашкам Максімавым і камандзіравалі сюды. Аж на цэлы месяц. Любата! І зарплата ідзе, і камандзіровачныя бягуць... А вунь дзяжурная ўласнай персонай шыбуе. Ну і бабенцыя, от жа ж бабенцыя!..

З вакзала і папраўдзе выйшла на перон дзяжурная па станцыі Ніна Дарафеева — смуглатварая, падобная на цыганку, дзяўчына. Яна была ў цёмна-сінім форменным паліто і ў чырвонай фуражцы, на нагах — высокія элегантныя боцікі, і ўсё гэта вельмі пасавала ёй. Калі паравоз прыпыніўся, Павел Шацкі саскочыў долу і, прыстукнуўшы абцасамі заледзянелых валёнак, зухавата казырнуў дзяжурнай.

— Я вас слухаю, таварыш начальнік! Гатовы выканаць любое ваша заданне, таварыш начальнік!

— Хлопчыкі,— сказала Ніна,— той зборны няхай пакуль што пачакае. Прыйдзецца ўзяцца за тысяча дванаццаць чацвёрты. Яго трэба ў першую чаргу пераўфарміраваць.

— Есць, таварыш начальнік! — зноў казырнуў Шацкі.— Будзе зроблена, таварыш начальнік!

Яны падаліся ў дзяжурку ўдакладняць план манеўраў. Шацкі паслужліва свяціў ёй пад ногі ліхтаром.

Ужо зусім сцямнела. Змагаючыся з цемраю, пражэктары кідалі з мачтаў на пуці промні святла, але гэта намагала мала — прабіцца скрозь узвіхуранае шаленства снежнага пылу ім было цяжка.

— Як ён сказаў? — пачуў Аляксей Валодзеў голас.— Бабенцыя?.. Няхай дзякуе, што не чуе гэтага Ягор Талейка. Ён бы яму, гэтаму хлюсту, паказаў бабенцыю! Ён бы яму паказаў, дзе ракі зімуюць!

— А мне ён падабаецца,— сказаў Сяргей Бабук.— Вясёлы хлопец, зухаваты. З такім нідзе не засумуеш. І работа ў яго аж гарыць. Без году тыдзень працуе ў нас на станцыі, а ўжо і пуці ўсе ведае, і стрэлкі, і маршруты. Не, вы сабе як хочаце, а мне ён падабаецца, праўду кажу.

«Але, але, Ягор Талейка паказаў бы яму, дзе ракі зімуюць,— думаў Аляксей.— Ніну ён не дасць у крыўду, гэта ўжо будзьце ўпэўнены».

І штосьці падобнае на зайздрасць варухнулася ў Аляксеевым сэрцы. На зайздрасць... або на рэўнасць?

Ат, няма чаго пра гэта думаць, няма чаго тлуміць сабе галаву рознай непатрэбшчынай. Што было, тое сплыло. Ну, не атрымалася ў іх з Нінай каханне, то што ж тут паробіш!.. Ну, аддала яна перавагу Ягору Талейку, то хіба ж тут што-небудзь перайначыш!

Нічога ўжо не паробіш і нічога не перайначыш. Ані нічога.

Адчуўшы, што ўвесь час глядзіць на ярка асветленае акно дзяжуркі, Аляксей хутка павярнуў галаву налева, пачаў узірацца ўздоўж пуцей. Наперадзе стужкі рэек нібы правальваліся ў нейкую бездань.

Бездань — не бездань, а пуці там і сапраўды маюць пакат. Гэты пакат пачынаецца адразу ад станцыі — спачатку невялікі, ледзь прыкметны на вока. Затым ён большае, і гэтак аж да наступнай станцыі, да Заранска. І калі поезд ідзе ў той бок, дык вагоны самі падштурхоўваюць цеплавоз, і машыністу ўвесь час даводзіцца прыцішваць, прытармажваць іхні бег.

А вецер усё мацнеў. І ўсё прыспешваўся шалёны танец сняжынак, перамешаных з прамёрзлым пяском.

Аляксей не заўважыў, калі з дзяжуркі выйшаў Шацкі, і таму нават здрыгануўся, як пачуў ягоны голас зусім побач:

— Паехалі нямнога, таварыш Нямнога!

— Куды? — замест Аляксея запытаўся Сяргей Бабук.

— На восьмы пуць, у хвост тысяча дваццаць чацвёртаму. Работа невялікая, але тэрміновая. Трэба выкінуць з сярэдзіны шэсць вагонаў. Ніна Сямёнаўна прасіла зрабіць як найхутчэй, ёй трэба адпраўляць састаў далей. Не падвядзём Ніну Сямёнаўну, га? Памочніка я ўжо выправіў да саставу, хай рыхтуе адчэпку. Паехалі, браткі! Варушыся нямнога, таварыш Нямнога!

Аляксей перавёў рэверс на задні ход, штурхнуў рэгулятар. Са свістам вырвалася пара з цыліндраў, ахутаўшы паравоз белым воблакам. Колы рыўком скранулі паравоз, і ён жвава пабег па рэйках тэндэрам уперад.

— Ну і бабенцыя, от жа ж бабенцыя!..— не сунімаўся Шацкі.— За такою можна і ў агонь, і ў ваду. Але ж ты мне, механік, так і не сказаў, замужам яна ці яшчэ не.

— А ты ў яе сам спытай.

— Ды я і пытаўся, але яна адно рагоча.

— Паслязаўтра, у нядзелю, наша дзяжурная будзе гуляць вяселле,— не паварочваючыся, сказаў Сяргей Бабук.

— Што ты кажаш!..— пстрыкнуў пальцамі Шацкі.— Няўжо праўда?..

— Спазніўся ты, браце, узяць сваю камандзіроўку,— зарагатаў Сяргей Бабук. З тэндэра грымнуў таксама Валодзеў рогат.

— То за каго ж яна замуж ідзе? — ані не бянтэжачыся, спытаў Шацкі і чамусьці зірнуў на Аляксея.

— Ёсць адзін такі машыніст — Ягор Талейка! — паказваючыся ў праёме дзвярэй з тэндэра, паспяшаўся сказаць Валодзя Кірылюк.

— А-а, ведаю. Ён пасажырскія водзіць.

— Лічы — прапашчае твае дзела,— зноў зарагатаў Бабук.

— Не кажы...

Яны выехалі за стрэлку, прыпыніліся. Пачалі чакаць, пакуль перавядзецца стрэлка. Але тая чамусьці не краталася.

— Забылася на нас нявеста, ці што? — прабурчаў Шацкі.

Нарэшце на стрэлцы пачулася надрыўнае, перарывістае гудзенне. Аднак стрэлка і цяпер не пераводзілася.

— Ясна,— сказаў Шацкі,— снегу набілася.

Матор на стрэлцы памаўчаў крыху і зноў загудзеў. Вастракі трошачкі ссунуліся, але далей не ішлі.

— Дзе ж тая чысцільшчыца, ліха яе матары! — са злосцю сказаў Шацкі.— Мусіць, недзе ў цяпло зашылася і не шманае.

— Хіба ў яе адна гэтая стрэлка,— працадзіў праз зубы Аляксей.

— Але ж нам трэба...

— А калі трэба, дык узяў бы і сам пачысціў. Не зломак жа.

Шум матора на стрэлцы заціх. Шацкі паглядзеў у той бок, тады перавёў позірк на Аляксея.

— А што ты думаеш! Зробім падаруначак нявесце! Далібог, зробім!

Ён схапіў шуфель, жмут абціравачных канцоў і саскочыў долу.

— Баявы хлопец! — зазначыў Бабук.— Люблю такіх!

Хвілін праз пяць зноў загудзеў матор — цяпер ужо роўна, спакойна. Стрэлка перавялася.

Да паравоза падбег Шацкі — узбуджаны, з узмакрэлым ілбом.

— А я што казаў! Зробім, казаў, падарунaчак нявесце — і зрабілі! Завадзі свой самавар, механік!

«Сам ты самавар! — адкрываючы рэгулятар, агрызнуўся ў думках на Шацкага Аляксей.— Не ўсім жа ездзіць на цеплавозах ды на электравозах, некаму ж трэба і на манеўрушцы коўзацца па станцыі, бо і гэта патрэбна, і без гэтага не абысціся. А машына ў мяне яшчэ добрая, паслухмяная».

Астатнія стрэлкі пераводзіліся спраўна: мусіць, каля іх нядаўна пабывала чысцільшчыца.

Нарэшце яны апынуліся на восьмым пуці, у хвасце доўгага таварнага саставу — тут былі і вагоны, і платформы, і цыстэрны. Ляснула аўтасчэпка. Паравоз і састаў сталі цяпер адно цэлае.

Недзе ў сярэдзіне саставу счэпшчык Максімаў прасігналіў: маўляў, састаў расчэплены ў патрэбным месцы. Шацкі наказаў Аляксею:

— Кратай!

І зноў колы пабуксавалі крыху, пакуль скранулі састаў.

— Выедзем з гэтымі вагонамі за стрэлку, тады заедзем на сёмы пуць, пакінем іх там, а самі вернемся на восьмы,— гаварыў тым часам Шацкі.— Возьмем тыя шэсць вагонаў, што трэба выкінуць з саставу, і адтарабанім іх часова на трэці пуць. Потым вернемся па гэтыя вагоны, зноў выедзем на восьмы пуць, далучым іх да астатніх вагонаў, і — маршрут гатовы, шаноўная Ніна Сямёнаўна, можаце адпраўляць яго, куды вам трэба. Ясна? А мы тады робім яшчэ адзін рэйсік, выязджаем на трэці пуць, бяром тыя нашы шэсць вагончыкаў і шыбуем з імі па ветку цагельнага завода. Пакідаем іх там пад пагрузку, а самі прастуем на шосты пуць, пачынаем работу з тым зборным. З ім марокі будзе паболей, але нічога, да канца змены ўправімся. Адсалютуем Ніне Сямёнаўне, і — урассыпную. Ясна? Дарэчы, ты жанаціk, га, механік?

— Ён у нас будзе вечны халасцяк, абяцанне такое даў,— замест Аляксея адказаў Бабук.

— А я, браткі, ужо двух пацаноў маю. Што — не верыце? Аднаму паўтара годзіка, другі толькі месяц як нарадзіўся. Не верыце?

— Чаму ж, верым,— сказаў Бабук.— Толькі ж нешта дужа высокі тэмп ты ўзяў у гэтай справе.

— А мы так з Валюхай рашылі: народзім аднаго за адным трох і паставім кропку. Цяпер трэба пастарацца на дачку.

— А калі зноў сын будзе?

— Ціпун табе на язык.

Яны пакінулі адчэпленую палавіну саставу на сёмым пуці і вярнуліся на восьмы. Зноў ляснула аўтасчэпка. Максімаў, які чакаў іх каля саставу, адчапіў патрэбныя шэсць вагонаў.

Выехалі з імі за стрэлку, прыпыніліся.

— А дзяжурнай нашай пашанцавала,— задумёна сказаў раптам Шацкі.— Ягора Талейку я ведаю. Удачлівы хлопец.

«Так, так, ён дужа ўдачлівы, гэта праўда,— адразу пагадзіўся ў думках з Шацкім Аляксей.— Мы ж з ім аднагодкі, а розніца паміж намі вунь якая!.. Я от спяўдаюся па станцыі па гэтай паршывай маневўрушцы, якую ў нашы дні і за лакаматыў лічыць сорамна, яе не сёння-заўтра ў металалом спішуць, на пераплаўку адправяць, а ён на найноўшым цеплавозе лётае, пасажырскія паязды водзіць. І Ніна, вядома ж, не магла не аддаць перавагі іменна яму...»

Нейкі тупы боль працяў раптам усяго Аляксея, і ён аж зубамі скрыгатнуў.

— Ты чаго гэта, механік? — здзівіўся Шацкі.

— Стрэлка пераведзена? — толькі праз хвіліну, узяўшы сябе ў рукі, спытаў Аляксей.

— Пераведзена, ага.

— Паехалі?

— Давай!

Паравоз штурхнуў вагоны і пакаціў іх перад сабою.

«Ён цяпер таксама на рабоце, мы ў адзін час заступалі,— з нейкай шчымлівай тугою думаў Аляксей.— Цяпер ён, напэўна, у Заранску, прыбыў туды па цеплавозе з пасажырскім...— Аляксей зірнуў на гадзіннік.— Не, ён яшчэ не даехаў да Заранска, ён прыедзе туды праз восем мінут. Пастаіць у Заранску адмераныя графікам пятнаццаць мінут і памчыць далей. Сюды, да нас. І яго выйдзе страчаць яна, Ніна, дзяжурная па станцыі і ягоная нявеста. Цяпер яна, вядома, толькі пра гэта і думае — пра тое, як будзе страчаць яго. Яна будзе стаяць на пероне ў сваім форменным, старанна прыгнаным па фігуры паліто, у чырвонай фуражцы, у элегантных імпартных боціках — строгая і афіцыйная, і ў той жа час узрушана-млеючая, з расчырванелымі шчокамі, з поўнымі радаснага бляску вачыма... А паслязаўтра будзе вяселле. На тое вяселле запрошаны і я. Ды мяне па ім не будзе. Я не пайду на тое вяселле. Не, не пайду!..»

— Стоп! — зняпацку раўнуў Шацкі.— Тут мы нашы вагончыкі пакуль што і пакінем. Усё ідзе як след, дарагі ты мой Нямпога! От зараз адчэпім — і назад, будзем злучаць тыя дзве палавіны саставу. А як злучым, прыедзем па гэтыя. І ўсё будзе чын чынам, усё будзе ў найлепшым ажуры. А таму — няхай жыве дзяжурная па станцыі Ніна Сямёнаўна Талейка!

Шацкі саскочыў з паравоза і падаўся выключаць аўтасчэпку. Але там ужо быў Максімаў.

«Так, так, паслязаўтра яна будзе ўжо не Дарафеева, а Талейка. Ніна Сямёнаўна Талейка. І будзе вяселле, прыйдуць усе запрошаныя. Можа, на́ват і гэты балбатун Шацкі прыпрэцца. Толькі аднаго мяне не будзе. Я не прыйду. Не, не прыйду!..»

— Алюр галопам тры крыжы — марш! — зноў апынуўшыся ў будцы, яшчэ больш аглушальна раўнуў Шацкі.— Карацей кажучы, паехалі!

Манеўруючы, яны выбраліся на сёмы пуць, узялі пакінутую там палавіну саставу, выцягнулі яе за стрэлку, тады выехалі на восьмы пуць. Разрозненыя часткі саставу цяпер зноў зрабіліся адным цэлым. У галаве саставу ўжо стаяў паравоз. Значыць, маршрут будзе скора адпраўлены.

А Аляксей тым часам павёў свой паравоз на трэці пуць. Каб трапіць туды, зноў давялося паспоўдацца ўзад-уперад па іншых пуцях, мінуць і адну, і другую, і трэцюю стрэлкі.

— Хутчэй, хутчэй,— падганяў Шацкі Аляксея.

— Паспех — людзям на смех,— пільна ўзіраючыся ў шэрасць наперадзе, толькі і зазначыў Аляксей.

Яны праехалі міма вакзала, міма таварнай канторы, мінулі гідраўлічную калонку... І раптам немы крык рэзнуў Аляксеевы вушы:

— Стойце! Стойце! Стойце-е-е!

Аляксей ірвануў тармазны кран. Паравоз прасунуўся па інерцыі яшчэ метраў колькі і замёр.

— Што... што здарылася?.. — спалохана спытаў Шацкі.

Да паравоза падбег Максімаў.

— Вагонаў... няма... Няма вагонаў!..— як звар'яцелы закрычаў ён.

— Як гэта няма? Што ты вярзеш?! — не разумеючы яшчэ, што здарылася, у сваю чаргу закрычаў Шацкі і кінуўся да Максімава.

— Сам паглядзі... не бачыш хіба?.. На пуці вунь ані нічога!..

З паравоза кулём зляцеў Валодзя Кірылюк. За ім скочыў Бабук. Увесь калоцячыся нервовымі дрыжыкамі, злез на дол і Аляксей.

— А і праўда...— разгублена сказаў Валодзя.— Няма...

Ён намкнуўся быў бегчы ўперад, але, махнуўшы рукою, застаўся на месцы, толькі адно пераступаў з нагі на нагу.

Вагоны зніклі... Гэта было непраўдападобна, неверагодна, але ж усе бачылі — іх няма.

— Башмакі! — раптам зароў Аляксей; сціснуўшы кулакі, ён ушчыльную падышоў да Шацкага.— Вы... вы паклалі тармазныя башмакі пад колы?..

— Я... я н-не ведаў...— заікаючыся, сказаў Максімаў.— Н-не ведаў, што т-трэба класці б-башмакі...

Ад Шацкага, які і слова не мог вымавіць, Аляксей кінуўся да Максімава і шалёна затрос кулакамі перад самым ягоным тварам.

— Разгільдзяі!.. Сволачы!.. Бабнікі праклятыя!.. Вы ведаеце, што вы нарабілі?!

— Я н-не б-бабнік...— недарэчна сказаў Максімаў.

Было ясней за яснае: вагоны, пакінутыя на ўхіле незатармажанымі, скрануліся з месца і пакаціліся самі па сабе... Дзе яны цяпер? Сказаць пэўна было цяжка. Усё залежыць ад таго, якія стрэлкі і ў якім становішчы трапяць на іхнім шляху. Адно было бясспрэчна: яны будуць усё прыскорваць ды прыскорваць свой бег, пакуль не наляцяць на якую перашкоду...

Раптам абмяклы, Аляксей адвярнуўся ад Максімава і нібы толькі сабе ціха сказаў:

— Зрабілі падаруначак нявесце...

— Але ж мы не ведалі, што тут гэткі пакат...— пачаў апраўдвацца Шацкі.

— Скажы лепш — забыліся.

— І дзяжурная нас не папярэдзіла. А яна абавязана была папярэдзіць... абавязана была... абавязана!..

— Каб жа гэта ведаць, што такое можа здзеецца!..— сказаў Максімаў.

Бабук, які дагэтуль маўчаў, раптам узрушана загаварыў:

— Трэба штосьці рабіць! Не стаяць жа вось гэтак і чакаць бяды!.. Давайце штосьці будзем рабіць! Ну, давайце!

Толькі цяпер, на доле, Аляксей па-сапраўднаму адчуў, як шалее непагадзь. Узвіхураны ветрам снежны пыл працінаў як не наскрозь, сляпіў вочы, а твар нібы пакрываўся ледзяною коркаю.

— Вагоны — не карась, на кручок не зловіш,— панура сказаў Валодзя Кірылюк.

«Што ж рабіць, што рабіць, што?..— ліхаманкава думаў Аляксей.— Ці ведае хаця Ніна пра гэта? Напэўна, ведае, ёй павінны былі пазваніць ужо са стрэлачнага паста...»

І тут якраз з'явілася Ніна — у расхрыстаным паліто, задыханая, яна аж хісталася.

— Акаянныя, што вы нарабілі!..— прастагнала яна.— Што вы нарабілі, праклятыя!

— Дзе цяпер вагоны? — хутка спытаў Аляксей.

— Яны ўзрэзалі выхадную стрэлку і выйшлі на галоўны пуць...

— На цотны?

— Ага...

Валодзя Кірылюк свіснуў.

— На перагон выкаціліся. А там такі пакат!..

Ніна ў знямозе апусцілася на рэйку, абхапіла галаву рукамі.

— З Заранска толькі што да нас адправіўся пасажырскі!..

Вось яно, самае жахлівае!.. Пасажырскі поезд ідзе сюды іменна па цотным пуці. А насустрач яму коцяцца вагоны...

Аляксею аж млосна зрабілася. Ён схапіўся за буфер рукою.

І раптам у галаве пранеслася яшчэ адна думка-здагадка: той пасажырскі поезд вядзе не хто іншы, як Ягор Талейка!

— Хлопчыкі!..— узнімаючыся з рэйкі, умольна прамовіла Ніна.— Хлопчыкі, даражэнькія, ну зрабіце што-небудзь, ну прыдумайце!..

Ніхто не адказаў ёй, ва ўсіх вочы былі апушчаны долу.

Яна працягнула рукі да Аляксея.

— Лёша! Лёшачка! Мілы, дарагі! Ты ж харошы, ты разумны! Заклінаю цябе, малю — ратуй!

Яна паклала яму рукі на плечы, упілася сваімі шырока расплюшчанымі і нібы ашклянелымі вачыма ў ягоныя вочы.

— Лёша!.. Лёшачка!..

Ён адштурхнуў яе і крыкнуў:

— Усе на паравоз!

І сам першы кінуўся ў будку. За ім паўскаквалі Бабук, Кірылюк, Максімаў і Шацкі. Яны не ведалі, што збіраецца рабіць машыніст, але адразу падпарадкаваліся ягонаму загаду: машынальна, не разважаючы, яны выканалі б цяпер абы-які і абы-чый загад.

Аляксей рыўком адкрыў рэгулятар, і паравоз, ірвануўшыся, паляцеў уперад.

На пуцях засталася адна Ніна.

— Лёша, зрабі!.. Зрабі!..— утрапёна закрычала яна ўслед паравозу. А як той быў ужо далекавата, пабегла ў дзяжурку.

Мінуўшы стрэлачны пост, паравоз вылецеў на галоўны цотны пуць. На той самы, па якім недзе наперадзе каціліся нікім не кіруемыя вагоны.

Пакуль што іх не было відаць. Але вось паравозны прамень намацаў штосьці заіндзелае, з няпэўнымі ў дрыготкім святле абрысамі.

— Яны! Вагоны! — выгукнуў Бабук.

Так, гэта былі яны, злашчасныя вагоны-ўцекачы. Вагоны зараз каціліся не вельмі шпарка, яны яшчэ не паспелі набраць вялікай хуткасці. Але з кожнай хвілінай бег іх прыскорваўся.

Ды паравоз дагнаў іх. Калі да вагонаў заставалася якіх метраў два ці тры, Аляксей затармазіў. І кінуў Шацкаму толькі адно слова:

— Башмакі!

Цяпер зразумела было, якую задуму займеў Аляксей: з дапамогаю тармазных башмакоў затрымаць, запыніць вагоны, а тады, прычапіўшы іх да паравоза, адвесці назад, на станцыю.

Усе зноў апынуліся доле. Шацкі і Максімаў кінуліся паўз вагоны,— саставіцель з правага боку, счэпшчык з левага. Яны апярэдзілі вагоны і амаль адначасова паклалі башмакі на рэйкі. Калі пярэднія колы дакрануліся да іх, пачуўся скрогат металу, пасыпаліся іскры, і... башмакі вылецелі з-пад бандажоў. На нейкі момант вагоны нібы прыцішылі свой бег, а пасля пашыбавалі яшчэ шпарчэй.

Зноў і зноў падкладвалі Шацкі і Максімаў башмакі пад колы, і ўсё марна...

Башмакі, якія надзейна трымаюць вагоны, калі тыя стаяць на месцы, цяпер былі бескарысныя. Пакат пуці і набытая вагонамі сіла інерцыі рабілі сваю справу... Башмакі выбіваліся коламі і ляцелі прэч.

Усведамленне ўласнага бяссілля перад немінучай катастрофай канчаткова расслабіла і нібы нават загіпнатызавала людзей, і яны стаялі ўсе хто дзе хмурыя, маўклівыя, не пазіраючы адзін на другога.

А вагоны, аддаляючыся, каціліся сабе і каціліся...

Вакол гула, ракатала, стагнала непагадзь. Вецер так раз'юшана кідаўся калючым, перамешаным з пяском снегам, што аж дых займала.

— Вагоны не карась, на кручок не зловіш...— як праз сцяну данёсся да Аляксея Валодзеў голас.

«На кручок не зловіш...— машынальна паўтарыў сам сабе Аляксей.— На кручок... на кручок... на кручок...»

І раптам ён аж скалануўся. «На кручок?! Іменна на кручок іх і трэба лавіць! На кручок!»

Ён як звар'яцелы пабег назад, да паравоза, які самотна соп парою непадалёк. І адразу ж за ім кінуўся Валодзя

Кірылюк. Астатнія засталіся на насыпе, яны нават і не заўважылі, што машыніст знік.

А Аляксей, ускочыўшы ў будку, адпусціў тармазы і з нейкай злоснай зацятасцю націснуў на рэгулятар. Паравоз, нібы прышпораны конь, ірвануўся наперад. Тады зняча ўку зароў па ўсю моц: усе, хто стаяў на пуці, шарахнуліся пад адхон.

— Куды мы? Навошта? — увесь калоцячыся, спалохана спытаў Валодзя.

— На кручок іх! На кручок! — апантана паўтараў Аляксей.— Трымайся, Валодзя, трымайся, хлопча! Мы іх зараз... мы іх зараз... От мы іх зараз!..

Паравоз зноў ляцеў наўздагон за вагонамі. Тыя ўправіліся адкаціцца ледзь не на кіламетр і, каб дагнаць іх, паравозу спатрэбілася адолець больш за два кіламетры.

Вось ужо і вагоны,— блізенька, перад самым паравозам. А той ляціць проста на іх...

Аляксей не пачуў характэрнага ляску металу, але ўсёй сваёй істотай адчуў, што аўтасчэпка спрацавала. Паравоз і папраўдзе падчапіў вагоны на «кручок».

Зразумеў гэта і Валодзя Кірылюк.

— Ёсць, Аляксей Іванавіч! Злавілі! Злавілі! — ашалела закрычаў ён і ад радасці пачаў малаціць кулакамі сабе па грудзях.

Аляксей уключыў тармазы. Заскрыгаталі, прыціснуўшыся да бандажоў, тармазныя калодкі.

Наперадзе пачаў шарэць край неба. Тады, нібы з-пад зямлі, выкацілася пляма святла. Было такое ўражанне, быццам узыходзіць сонца. Ды Аляксей ведаў — гэта паказаўся пражэктар пасажырскага поезда.

Цяпер задача была адна — уцячы ад поезда. Аляксей перавёў рэверс на задні ход, пасунуў рэгулятар. Колы пачалі ліхаманкава буксаваць, але Аляксей уключыў пясочніцу, і гэта памагло. Паравоз скрануўся з месца і пацягнуў за сабою вагоны.

Узбірацца на пад'ём было цяжка, колы зноў і зноў буксавалі, і Аляксею ўвесь час прыходзілася ўключаць пясочніцу.

Тым часам у паравозную будку паўскаквалі Бабук, Максімаў і Шацкі.

А ззаду пагрозліва набліжалася пляма святла. Пасажырскі поезд, узяўшы добры разгон, лёгка адольваў пад'ём. Ды і магістральны цеплавоз не мог ісці ні ў якое

параўнанне з манеўровым паравозам. І ўсё ж Аляксей ведаў, што самае страшнае ўжо мінула. Яны ўправяцца выскачыць за стрэлку. А тады перавядуць яе, і пасажырскі пойдзе на першы пуць.

«Паслязаўтра на вяселлі я раскажу Ягору, як уцякаў ад яго. Мы разам парагочам. Во смеху будзе!.. А цяпер — выручай, родная манеўрушка! Цябе яшчэ рана спісваць у металалом, ты яшчэ паслужыш, яшчэ пабегаеш па рэйках. Ага, пабегаеш!..»

*1973*

# ЗВЫЧАЙНАЯ НОЧ

Валя перакінула костачкі на лічыльніках і сказала вусатаму дзядзьку:

— З вас сорак восем капеек.

Дзядзька моўчкі адлічыў грошы і паклаў перад Валяй на ружовую талерачку, прышрубаваную да століка. Валя спрытна пералічыла манеты, націснула на клавішы касавага апарата, крутанула ручку, зноў націснула, зноў крутанула. Тады аддала чэкі дзядзьку, і той гэтак жа моўчкі падаўся да раздатачнага акна, каб атрымаць свае катлеты і рысавы малочны суп.

Ён заўсёды браў, прыходзячы ў сталовую, катлеты і рысавы малочны суп. І быў вельмі незадаволены, калі ў меню не аказвалася малочнага супу. У яго, напэўна, было штосьці са страўнікам або ён проста любіў малочную страву, бо як не было супу, ён браў пляшку малака і выпіваў яго з белымі сухарамі, якія прыносіў з сабою. Суп ён таксама еў з сухарамі. Валя ведала гэтага маўклівага вусатага дзядзьку — ён быў выклікальшчыкам лакаматыўных брыгад. Дзяўчына наогул ведала амаль усіх, хто прыходзіў у іхнюю дэпоўскую сталовую — машыністаў, памочнікаў, качагараў. Ведала і людзей з іншых служб чыгуначнага вузла, бо сталовая была адчынена круглыя суткі і ёю карысталіся не адны толькі дэпоўскія, а і аглядчыкі вагонаў, стрэлачнікі, саставіцелі паяздоў, асабліва ў начны час.

Сёння ў Валі якраз і было начное дзяжурства. Пачалося яно гадзіны дзве назад, пачалося звычайна, як і мінулае, як і ўсе астатнія за гэты год, што Валя робіць касіркай у сталовай.

Ёй падабалася быць касіркай. Асабліва тут, у чыгуначнай сталовай. Валя і сама была з сям'і чыгуначнікаў.

Бацька яе ўсё жыццё рабіў за дзяжурнага па станцыі, цяпер ён на пенсіі. Старэйшы брат і сястра служаць у Мінску, ва ўпраўленні чыгункі. Пасля школы Валя нікуды вучыцца далей не пайшла, ёй хацелася як найхутчэй стаць на свой хлеб. Уладкавала яе на працу суседка — яна раней сама тут рабіла, а летась паехала жыць да сына ў Калінінград, дзе той застаўся пасля службы на флоце і дзе ўжо ажаніўся.

А падабалася Валі быць касіркай найбольш таму, што ўвесь час сядзіш сабе на адным месцы, нікуды не трэба хадзіць, не трэба паказваць знаёмым, а тым больш незнаёмым людзям, як ты ходзіш, якія ў цябе ногі і ці ёсць яны наогул.

— Валечка, наша вам аграмаднае цеплавознае шанаванне! — пачула яна раскацісты дзецюковы басок. Перад ёю стаяў і прыязна ўсміхаўся на ўвесь свой круглявы чырвоны твар памочнік машыніста Юрка Сляпук з Мінскага дэпо. Значыць, яны з машыністам Рыгорам Галабародавым толькі што прывялі грузавы поезд. Завіталі вось падсілкавацца, потым адпачнуць у доме лакаматыўных брыгад, а тады зноў паедуць з чарговым поездам назад у Мінск.

— Добры дзень! — і сама міжвольна ўсміхаючыся ў адказ на Юркаву ўсмешку, прамовіла Валя.— Што вам выбіць? Вось меню, выбірайце. Толькі малочнага супу ўжо няма, дзядзька Нічыпар апошні ўзяў, я яму спецыяльна пакідала. Затое боршч — смаката!

— Які там дзень! — на ўсю сталовую грымнуў Юрка.— На дварэ вунека ноч, і ніякая яна не добрая, а нават дужа наадварот. Грымоты такія, што проста жах! А вецер дык так і пнецца скінуць цеплавоз з рэек.

— Мабыць, скора дождж пойдзе.

— Каб ён век не хадзіў. Пяску не набярэшся сыпаць пад колы. Для нас, цеплавознікаў, адно гора гэты дождж.

«А і хвалько ж ты, Юрка,— падумалася Валі.— На кожным кроку падкрэсліваеш, што ты не абы-хто, а цеплавознік. Зрэшты, не адны толькі цеплавознікі не любяць дажджу, паравознікам яшчэ цяжэй, у іх жа машыны не такія магутныя».

— Дык што вам выбіць? Вы сёння цяжкавагавы прывялі?

— А мы толькі цяжкавагавыя і водзім. Сягоннянні аж на восемсот шэсцьдзесят тон перавышае норму.— Юр-

ка з выглядам пераможцы зірнуў на Валю і ў гэтую хвіліну нават усміхацца перастаў.

— Чаго ты там длубаешся? — гукнуў да Юркі з левага ад Валі кутка залы Рыгор Галабародаў — высокі і шыракаплечы мужчына з рыжаватымі валасамі.— Хочаш, каб я тут з голаду дуба даў?

— Ды от Валечка зачаравала мяне, забыўся нават, чаго і прыйшоў,— лагодна зарагатаў Юрка.

— Выбіваю два баршчы,— строжачыся, сказала Валя.— Што яшчэ?

— Два рагу і тры кампоты. Не, наадварот — тры рагу і два кампоты. Майго машыніста адна порцыя рагу не задавальняе, бо і чарвячка яму не заморыць. Ён жа не толькі цяжкавагавыя паязды водзіць, а і сам, бачыце, чалавек не абы-якой вагі. Да таго ж — ганаровы чыгуначнік, а каб падтрымліваць марку, яму трэба...

— Вам што? — перапыняючы Юркаву балбатню, сказала Валя да незнаёмай дзяўчыны, што ўжо колькі хвілін стаяла за Юркавай спіною.

— Адзін вінегрэт і адзін кампот,— ціха і неяк сарамліва прамовіла дзяўчына, не пазіраючы на Валю.

— Дзякую, Валечка,— узяўшы чэкі і рэшту з траячкі, Юрка прыклаў руку да грудзей.— Цалую ручкі, як кажуць ці то венгры, ці то румыны.

«Напэўна, практыкантка,— падумала Валя пра дзяўчыну.— Можа, нават з Гомельскага чыгуначнага інстытута. На каго яна, цікава, вучыцца? Кім будзе пасля інстытута? Канечне, інжынерам. Але дзе, на якой пасадзе рабіць будзе?»

Валі чамусьці захацелася, каб дзяўчына стала дзяжурнай на станцыі. Прымаць і адпраўляць паязды, стоячы на пероне ў строгім форменным касцюме, з чырвонай фуражкай на галаве — гэта ж дужа здорава! І во гэтай дзяўчыне вельмі пасавала б чырвоная фуражка. У яе светлыя валасы, і чырвоны колер да іх ну проста сам просіцца.

Бліснула ў вокны маланка, і адразу ж грымнуў і пакаціўся пошчакам па-над пуцямі гром. Потым бліснула і грымнула яшчэ раз і яшчэ. І з грымотамі на двары перамешваўся басавіты Юркаў рогат у зале.

«А ўвогуле ён неблагі хлопец, гэты Юрка Сляпук,— падумала Валя.— А што хвалько і балбатун, дык гэта ад маладосці. І яшчэ ад усведамлення таго, што ён ездзіць

не на такой састарэлай тэхнікі, як паравоз, а на найноўшым цеплавозе і што за машыніста ў яго ганаровы чыгуначнік Рыгор Галабародаў, чалавек «не абы-якой вагі» і, вядома ж, вялікі знаўца сваёй справы, у якога ёсць чаму павучыцца. Ды ён проста шчаслівы чалавек, гэты Юрка Сляпук».

Вось гэткай жа навальнічнай ноччу, толькі бліжэй да раніцы, месяц назад завітаў быў у сталовую і той малады чалавек — Сяргей. Быў ён нетутэйшы, і наогул невядома было, адкуль ён з'явіўся, дагэтуль яго Валя ніколі не бачыла ні ў сталовай, ні дзе яшчэ. Ён узяў толькі біфштэкс і болей нічога, нават хлеба не ўзяў, гэта Валя добра памятае, і сеў якраз на тое самае месца, дзе цяпер сядзіць Юрка. Елася яму чамусьці дрэнна, ён доўга корпаўся з тым біфштэксам і, не з'еўшы і палавіны, пасля мо паўгадзіны сядзеў яшчэ за сталом, пра нешта засяроджана думаючы. Дождж даўно перастаў, а ён усё сядзеў. Потым, ужо адыходзячы, ён чамусьці пільна паглядзеў на Валю, і яна адчула, што нечага ўся зачырванелася пад гэтым працяглым паглядам. Ён пайшоў да дзвярэй, а Валі нечаведама з чаго раптам захацелася кінуцца следам за ім, спытаць, што з ім такое дзеецца, чаму ён такі сумны і задуманы, і, калі трэба, памагчы яму,— Валя была чамусьці ўпэўнена, што хлопцу патрэбна дапамога і што яна здолее памагчы. А ён, адчыняючы дзверы, зноў азірнуўся на яе і, як падалося Валі, усміхнуўся ёй — можа, адным толькі вачыма.

Яна, вядома, не кінулася за ім, яна і з месца не крапулася.

А Сяргей болей не прыходзіў. Валя ўсё чакала, усё спадзявалася, што ён зноў завітае ў сталовую, зноў зірне на яе, як тады, апошнім разам, а яна, канечне ж, уся зачырванеецца пад ягоным паглядам. І можа стацца, што ён даверыцца ёй... Ды Сяргей так і не з'явіўся болей ніводнага разу.

Зрэшты, можа, ён і не Сяргей, Валя ж не ведала яго імя, гэта яна сама так назвала хлопца. Ёй дужа падабалася гэтае імя — Сяргей, от ёй і захацелася, каб і ён быў Сяргеем.

«А раптам ён прыйдзе сёння? — аж сумелася ад такой думкі Валя і, як і тады, адчула, што пяшчадна чырванее.— Сёння ж таксама навальніца, гэтак жа грукоча, як і ў тое начное дзяжурства, то чаму б яму і не прыйсці?

От возьме і прыйдзе. Няхай толькі дажджу не будзе, няхай дождж пройдзе стараною, а то Сяргей вымакне да ніткі і прастудзіцца, а я не хачу, каб ён прастудзіўся, хопіць і таго, што я сама ўвесь час прастуджваюся».

Яна і напраўдзе закашлялася, ды гэты яе кашаль патануў у новым грукаце грому. Здавалася, ён грымнуў над самай галавою, і Валя адразу з пачырванелай зрабілася белаю і аж дыхаць перастала. Ды тут у сталовую ўваліўся шумлівы гурт замэдзганых пажылых мужчын. «Паравозная брыгада Тараса Маркавіча Катлубоўскага,— адзначыла ў думках Валя.— Прыехалі, канечне, са зборным. І, вядома, вельмі натаміліся пад час паездкі. Усё ж цяжкая ў іх работа, гэта зусім не тое што ў цеплавознікаў. Вунь якімі франтамі выглядаюць Рыгор Галабародаў і Юрка Сляпук. На іх чысцюткія форменныя касцюмы, белыя кашулі ды яшчэ і гальштукі. Нібы і не паязды яны водзяць, а дзесьці ў канторы паперкі напісваюць. А паравознікам не да гальштукаў і не да белых кашуль. Паравознікі маюць справу з вуглем, а той дужа любіць на ўсім чыста пакідаць свой след».

Машыніст Катлубоўскі, яго памочнік Шахновіч і качагар Цапок ішлі да Валі праз усю залу няспешна, з паважнасцю ўпэўненых у сабе людзей. Былі яны амаль аднаго ўзросту, кожнаму з іх пераваліла ўжо за пяцьдзесят, і ездзілі яны адною брыгадаю ўжо дваццаць пяць год. З гэтай нагоды нядаўна ў дарожнай газеце быў пра іх вялікі — на ўсю паласу — нарыс, які называўся «Сярэбраная брыгада». Там, між іншым, пісалася і пра тое, што ўся радня Катлубоўскага, ажно дванаццаць чалавек, працуе па чыгунцы. Ёсць сярод іх акрамя машыніста пяць слесараў, два токары, тры электрыкі і адзін экапаміст. І так ужо атрымалася, што шасцёра Катлубоўскіх — мужчыны, шасцёра — жанчыны. Дапытлівыя газетчыкі падлічылі нават, што агулам Катлубоўскія адрабілі на чыгунцы ажно дзвесце восемдзесят сем гадоў!

Хадзілі чуткі, што брыгадзе Катлубоўскага прапанавалі былі ісці перавучвацца на цеплавознікаў. Але яны ў адзін голас адмовіліся. Маўляў, датуль, пакуль не знімуць усе паравозы з лініі і не заменяць іх цеплавозамі ды электравозамі, яны не расстануцца са сваёй машынай, на якой, аказваецца, ездзяць таксама дваццаць пяць год. Яны самі рамантуюць яе, самі ўдасканальваюць, бо ў кожнага — залатыя рукі і не абы-якая галава.

Пакуль яны ішлі праз залу — Катлубоўскі наперадзе, Шахновіч за ім, а Цапок ззаду,— усе позіркі былі скіраваны на іх. Нават раздатчыца Маша, асоба ўвогуле нецікаўная і нібы абыякавая да ўсяго на свеце, і тая ўтаропілася ў паравознікаў. А балбатун Юрка Сляпук раптам змоўк на паўслове, ды так і сядзеў з разяўленым ротам. Рыгор Галабародаў таксама неўзаметку кідаў позіркі на паравознікаў.

Падышоўшы да Валі, паравознікі стрымана павіталіся з ёю. А качагар Цапок нечакана разгарнуў газету, якую асцярожна трымаў у руках, і працягнуў Валі букет палявых кветак.

— Затрымалі нас былі ў дарозе, перад чырвоным светафорам,— пачаў ён тлумачыць Валі.— Зірнуў я — а вакол такая краса!.. Я не стрымаўся, узяў скочыў з паравоза... І от назбіраў.

— Вой, дзякую, дзядзька Цапок... прабачце, не ведаю вашага імя і па бацьку...

— Пракоп Нестаравіч ён,— паслужліва падказаў Шахновіч.

— Шчыра, шчыра дзякую, Пракоп Нестаравіч! — Валя паднесла кветкі да твару.— От не чакала такога падарунка.

— Ён у нас лірык,— сказаў Катлубоўскі.— І сын у бацьку ўдаўся, вершы пачаў складаць.

— Ага, гэта мой меншы, чарцяка,— аж засвяціўся Цапок.— Адзін верш нават надрукавалі ў «Чырвонай змене». Можа, чыталі? Называецца «Пралескі».

— Не, не чытала, на жаль,— прызналася Валя і сапраўды вельмі пашкадавала, што не трапіла ёй на вочы газета з тым вершам.— А калі ён быў надрукаваны?

— Дзевятнаццатага красавіка. Калі што якое, то пачытайце.

— Абавязкова пачытаю. Схаджу ў бібліятэку і пашукаю ў падшыўцы. Ведаеце, нават заўтра схаджу.

— Петрык паслаў ім яшчэ цэлы сшытак вершаў. Можа, што і надрукуюць зноў.

— Павінны надрукаваць. У яго ж талент.

— Каб жа ведаць. Праўда, вершамі ён проста трызніць. Нават у сне складна мармыча. «Я да цябе завітаю на самым пачатку мая». Гэта я ўчора ноччу падслухаў. Прачнуўся раптам — і чую Петрыкаў голас: «Я да цябе... да цябе завітаю... на самым пачатку... пачатку мая...» Гэ-

та ж думаць! — Цапок да таго расчуліўся, што часта-часта заморгаў вейкамі.

— У яго талент! У яго, канечне ж, талент!

— Каб жа ведаць...

Тым часам Катлубоўскі схадзіў да раздатчыцы, выпрасіў у яе слоік з вадою і паставіў яго каля касавага апарата. Валя ўсунула кветкі ў слоік, папраўіла іх, каб букет выглядаў як найлепей.

— Яшчэ раз дзякую, Пракоп Нестаравіч! От не чакала!

— Няма за што. Спыніліся, кажу, мы ў дарозе, ну я і назбіраў. Валечцы, думаю, павінны спадабацца.

— Вой, дужа падабаюцца!

Паравознікі пачалі вывучаць меню. Кожны браў ежу на свой густ, а густы ў іх былі вельмі розныя. Затое апетыт ва ўсіх трох аказаўся аднолькава добрым. З падносамі, спрэс застаўленымі талеркамі, яны пакіраваліся да свайго, даўно аблюбаванага стала ў правым кутку, які цяпер якраз быў не заняты.

Навальніца грымнула яшчэ разы тры, з кожным разам аддаляючыся і цішэючы. І нарэшце зусім аціхла. Дождж, нібы паслухаўшыся Валі, так і не пайшоў. Улёгся і вецер. У цішыні, што запанавала наўкола, выразна сталі чутны гудкі паравозаў, тыфоны цеплавозаў, свісткі саставіцеляў.

«Няўжо ён і сёння не прыйдзе? — з тугою думала Валя, пільна ўзіраючыся ў кожнага новага наведвальніка.— А мне чамусьці здавалася, што сёння ён павінен абавязкова прыйсці. І дажджу вунь няма. Ён якраз такой во парою прыйшоў быў мінулым разам. То, можа, яшчэ і завітае?.. Калі ён падыдзе выбіваць чэкі, я дам яму вось гэтую рамонку, самую вялікую і прыгожую. І ён засуне яе спяблінкай у нагрудную кішэньку, так, што звонку будуць адны пялёсткі... А можа, мне ўзяць ды самой засунуць рамонку яму ў кішэньку? А што — вазьму і засуну!.. Цікава, а колькі ў яе пялёсткаў? Не, я не буду лічыць, хай ён сам пасля палічыць...»

У зале не было ўжо ні цеплавознікаў, ні паравознікаў. На іх месцах, ды і на іншых, сядзелі ўжо і падсілкоўваліся новыя людзі. Некаторыя прыходзілі са сваёю ежаю — з бутэрбродамі або з ладнымі кавалкамі курыцы ці сала — і бралі ў такіх выпадках шклянкі па дзве, а то і па тры чаю. Праўда, саставіцель паяздоў Іван Кароль браў адну

шклянку, затое па працягу почы забягаў у сталовую аж чатыры разы. Вядома, ён вельмі заняты, увесь час спяшаецца, яму няма калі пасядзець за сталом па-людску. Ні яму, ні яго памочніку Васілю Чамадуру — той таксама сілкуецца прыхваткамі.

Пачало днець.

Неўзабаве за вокнамі і зусім стала відно.

А потым Валя ўбачыла ў акне дзівоснае відовішча: на пуцях воддаль стаяў паравоз з незвычайнай трубою — яна была нібыта адлітая з золата. Спярша залатою была толькі самая макаўка, пасля зіхацець стала і ўся труба.

— Паглядзі, Маша, паглядзі! — гукнула Валя да раздатчыцы.— Залатая труба! Залатая!

Але пакуль Маша расшаломала, па што ёй трэба глядзець, з трубы нібы хто злізнуў позалаць, і дзіва знікла, прапала; гэта, канечне ж, нейкая дурная хмурынка — рэшта начных аблокаў — затуліла сонца, і ўсё стала звыклым, будзённым.

— Гэткую красу празявала! — аж злосна сказала Валя да Машы.— І чаго ты такая... такая... з такою тоўстаю скураю!

— Ат! — махнула Маша рукою.— Выдумляеш...

Да канца Валінай змены ў сталовай перабывала яшчэ багата людзей,— найбольш вадзіцеляў цеплавозаў. Былі і знаёмыя, былі і такія, якіх Валя бачыла ўпершыню. Гучалі за столікамі незразумелыя, таямнічыя словы — рэкуперацыя, анкероўка, вагона-гадзіна, тона-кіламетр, кантактар, пантограф...

І часам пачынала мроіцца Валі, што яна сядзіць не ля касы, а ў кабіне цеплавоза або нават электравоза, што яна сама, сваім розумам вядзе грузавы — не, пасажырскі! — поезд, і той ляціць усё далей і далей, без прыпынкаў і па самай вялікай хуткасці; а куды ляціць, пра тое ніхто нічога не ведае...

— Боршч і катлеты, быстра-а! Бо я галодны, як гайня зімніх ваўкоў!

І гэтага хлопца, што нібы натапырапы стаіць перад касай, Валя ведае. Ён — электрамеханік. І імя ў яго адпаведнае — Электрон. Прыдумалі ж бацькі, ну што ты скажаш! Як у ваду глядзелі. От толькі не дапялі, што з прозвішчам ягоным імя такое ніяк не стасуецца. Бо прозвішча — Салома. Ха, Электрон Салома!

— На аварыю выклікалі?

— Не, якраз з аварыі вярнуўся. Усю ноч, каб яму спрахнуць, праваландзіўся. Рэле згарэла, ледзь знайшоў.

Валя не стала распытваць, дзе было тое цяпер рэле і чаго яно згарэла. Вядома, калі чалавек галодны, яму не да гаворкі.

Людзі прыходзілі і адыходзілі. Прыходзілі з адным настроем, адыходзілі з другім. От і Электрон пайшоў, насвістваючы якісьці вельмі вясёлы матыўчык. А быў жа такі злосны. Можа, і не як гайня зімніх ваўкоў, а ўсё ж — злосны.

Перад самым тым, як Валі трэба ўжо было здаваць змену сваёй напарніцы Каці Стральцовай, у сталовую пячакана завітала цётка Сцепаніда. Зрэшты, яна заўсёды з'ўлялася печакана.

Яшчэ ад дзвярэй цётка Сцепаніда пачала ўсміхацца Валі. Усмешка была адкрытая, радасная, якая бывае ў маці, што пасля доўгай разлукі страчае любімае сваё дзіця. І ў той жа час ва ўсмешцы было нібы штосьці вінаватае, такое, чаго цётка Сцепаніда не хацела паказаць, а яно само выбівалася вонкі. Левай рукою яна прыціскала да грудзей невялічкі пакуначак, загорнуты ў клятчастую хустачку.

Жанчына яшчэ не старога веку — ёй было сорак чатыры гады — цётка Сцепаніда тым не менш была зусім сівая. Сівізна гэтая — знак мінулай вайны. А яшчэ ад таго ліхалецця застаўся ў яе і больш жудасны знак. За сувязь з партызанамі яе — тады шаснаццацігадовую дзяўчыну — так каталі гітлераўцы, што яна аглохла і страціла мову. З таго часу яна і не чуе нічога, і сказаць не можа ні слова. І дактары пасля як ні стараліся, не здолелі даць ёй рады.

Цётка Сцепаніда падышла да Валі збоку, моцна абняла і пацалавала ў лоб. І Валя прытулілася да цёткі Сцепаніды і таксама абняла яе правай рукою. І адчула, як гулкімі штуршкамі калоціцца цётчына сэрца. І ледзь стрымала слёзы, што вось-вось гатовы былі пырснуць з вачэй.

— Вы сядайце, цётачка, сядайце, калі ласка,— гаварыла Валя, ведаючы, што тая хоць і не чуе яе, але ўсё роўна разумее. За гэтыя паўтара года, што мінуліся з часу іхняга няшчаснага знаёмства, цётка Сцепаніда навучылася добра разумець Валю, і Валя таксама разумела яе мігі і знакі.— Вунь тое крэсла вазьміце і прысуньце сюды, а то што ж вам стаяць.

«Не трэба мне тое крэсла,— махнуўшы рукою, нібы сказала цётка Сцепаніда.— Я во лепей пастаю каля цябе, пагляджу ў твае вочачкі, абмацаю позіркам кожную рысачку твайго тварыку. Не турбуйся, Валечка, мне гэтак добра стаяць поруч з табою».

Яны памаўчалі.

Людзей цяпер у сталовай было зусім мала, але і тыя, што былі, не звярталі на іх ніякай увагі. А мо толькі рабілі такі выгляд.

Тады цётка Сцепаніда, нібы спахапіўшыся, паспешліва развінула хустачку і дастала цёплыя вязаныя рукавічкі, аздобленыя адмысловым каляровым узорам. «Гэта табе, Валечка,— паказала яна на мігі.— Каб тваім ручачкам зімою цёпленька было, каб не мерзлі твае тоненькія пальчыкі. Я іх сама звязала. Не верыш? Далібог, сама».

Яна ніколі не прыходзіла з пустымі рукамі, абавязкова што-небудзь прыносіла. Валі і браць было няёмка, і адмовіць няшчаснай жанчыне не выпадала. А тая прыходзіла не толькі на работу, а і дома ў Валі бывала. У Валіным пакоі на самым прыкметным месцы — на тэлевізары — стаіць не то балерына, не то гімнастка.

Спачатку гэта быў звычайны сук, які цётка Сцепаніда неяк угледзела ў лесе. Калі яна адрэзала лішнія сучкі і галінкі і зрабіла падстаўку, якраз і атрымалася гэтая незвычайная статуэтка. Было ў Валі і яшчэ шмат розных цётчыных падарункаў, і ўсе іх тая рабіла сама, сваімі цудоўнымі рукамі.

А цяпер вось рукавічкі... Нават і адзяваць іх боязна, такія яны хвацкія. Хоць бяры і пасылай іх на выстаўку.

«Ты прымер, Валечка, прымер,— паказала цётка Сцепаніда.— Ці падыдуць хаця яны табе».

— Авой, якія рукавічкі! Зроду не бачыла такіх! Не ведаю, як і аддзячыць вам, мілая вы мая, харошая!

Усцешаная тым, што рукавічкі вельмі спадабаліся Валі і што яны былі якраз, цётка Сцепаніда развіталася, яшчэ раз абняўшы і пацалаваўшы Валю, і пайшла. І здавалася, што няма ў гэтую хвіліну больш шчаслівага чалавека, як яна.

Валя не магла бачыць і ведаць, што як толькі цётка Сцепаніда выйшла са сталовай і завярнула за рог, з яе вачэй ручаямі паліліся слёзы. Жанчына плакала горка, няўцешна і слёз сваіх ні ад каго не хавала. Стрэчныя людзі, размінуўшыся, паварочваліся і журботна глядзелі ёй

услед. Людзі ведалі, што яна не плакала нават тады, калі яе катавалі немцы.

А сама Валя праз паўгадзіны здала ўтаргоўку, тады здала змену і пачала збірацца дамоў. Для гэтага ёй перш за ўсё спатрэбілася працягнуць руку назад, дзе ў кутку стаялі мыліцы. Яна ўзяла адну мыліцу, потым другую і, абапіраючыся на іх, паклыпала да выхада на адзінай сваёй назе.

Другую нагу яна страціла паўтара года таму назад. Тады яна якраз прыйшла з мамай на вакзал сустракаць бацьку, які вяртаўся з санаторыя. Поезд павінен быў вось-вось прыйсці, і яны выйшлі на перон. Валя ведала, што пасажырскія паязды прымаюцца на першы пуць. Яна стала нецярпліва ўзірацца ў той бок, адкуль павінен быў прыбыць бацькаў поезд. Ды таго ўсё не было. Ды раптам Валя пачула пранізлівы паравозны гудок з другога боку. Гэта адтуль па трэці пуць ішоў грузавы састаў. А яшчэ Валя ўбачыла, што проста перад ёю па гэтым самым трэцім пуці спакойненька тэпае нейкая жанчына. Паравоз, даганяючы яе, раве на ўсю моц, а жанчына тэпае і тэпае. Тады Валя яшчэ не ведала, што жанчына проста не чуе таго гудка, што яна наогул нічога не чуе, бо зусім глухая і да таго ж нямая.

Разумела Валя другое — трэба адвесці ад жанчыны бяду! І яна ў тое ж імгненне кінулася да яе і з разгону штурханула тую на суседні пуць і сама паляцела за ёю. Ды нечакана зачапілася нагою за рэйкі... І ў той жа момант адчула дотык паравознага бегунка...

Так пазнаёмілася Валя з цёткай Сцепанідай. Праўдзівей кажучы, пазнаёмілася крыху пазней, калі тая стала наведваць Валю ў бальніцы... Першы раз цётка Сцепаніда прыйшла са сваім братам, які працаваў аглядчыкам вагонаў і якому яна ў той няшчасны дзень, аказваецца, несла абед...

Сонца было ўжо высока, і ўсё наўкол зіхацела пад яго промнямі. «А гэта і добра, што Сяргей не прыйшоў і сёння,— думала Валя.— От я скора навучуся хадзіць па пратэзе, мне зрабілі дужа добры пратэз, і я ўжо даўно трэніруюся хадзіць на ім. Скора так налаўчуся, што выкіну к чорту гэтыя мыліцы і буду хадзіць роўненька-спрытненька, ніхто і не пазнае... Няхай тады і прыходзіць Сяргей, можа, я і здолею памагчы яму, у яго ж нейкае вялікае гора...»

Валя ішла сваёю звычайнаю дарогай, і кожны, хто трапляўся ёй насустрач, вітаўся з ёю,— дзяўчыну ведалі ўсе жыхары чыгуначнага пасёлка, і сама яна ведала амаль усіх. Не ведала яна ў твар толькі тых, хто даў ёй сваю кроў, калі дзяўчыне рабілі аж тры аперацыі, калі дактары самаахвярна змагаліся за яе жыццё,— зрэшты, Валя лічыла, што ўвесь чыгуначны пасёлак прыйшоў тады ёй на дапамогу.

Мажліва, так яно і было.

*1973*

# НА ПЕРАГОНЕ

Максім Зубец зірнуў на стрэлку скорасцемера, потым на гадзіннік. Усё ішло добра, цеплавоз паслухмяна падпарадкоўваўся яму, машыністу, і спраўна цягнуў даўжэзны састаў таварных вагонаў. Мабыць, пра тое самае падумаў і памочнік машыніста Васіль Хлябцэвіч, бо раптам сказаў з відавочным захапленнем:

— Любата, Максім, га? Звер, а не машына!

— Зялёны! — сказаў Максім.

— Зялёны! — пацвердзіў Васіль.— Дыспетчар трымае слова, малайчына. Ды хіба такой машыне не дасі «зялёнай вуліцы»!

Цеплавоз і папраўдзе быў выдатны. Ён нядаўна прыбыў у дэпо з завода — усё на ім было новенькае, акуратненькае, аж зіхацела. Максім з Васілём рабілі на ім першы самастойны рэйс — перад тым з'ездзілі некалькі разоў з машыністам-інструктарам, паездкі прайшлі ўдала, былі сярод іх і з цяжкавагавымі саставамі. Цяпер яны самі ўзялі цяжкавагавы, перагаварылі з дыспетчарам, і той паабяцаў прапусціць па ўсім участку без прыпынкаў. Ім трэба было вытрымаць толькі адну ўмову — самім нідзе не затрымлівацца, ісці дакладна па графіку, які вызначыў ім дыспетчар. Папярэднюю станцыю яны мінулі мінута ў мінуту па гэтым графіку і цяпер ідуць таксама добра. Цеплавоз бярэ добры разгон, лёгка адольвае пад'ёмы,— настолькі лёгка, што Максім прыходзіць да думкі: такой машынай можна вадзіць яшчэ і цяжэйшыя саставы.

— Хвацкая, кажу, машына,— зноў пачаў Васіль.— Амаль пяцьсот тон лішніх вязём, а ёй хоць бы што. Возьме, канечне, і больш. Значна больш.

«Гэта проста дзіўна,— зазначае сам сабе Максім.— Васіль думае пра тое самае, пра што і я. І гэтак амаль заўсёды. Нібыта ён адгадвае мае думкі. Або, наадварот, я адгадваю ягоныя».

Зрэшты, нічога дзіўнага тут няма. Пра што яшчэ, акрамя работы, могуць думаць два закаханыя ў сваю прафесію чалавекі, якія складаюць пад час паездкі адну брыгаду і, значыцца, з'яўляюцца адным цэлым? Ды і ездзяць разам яны ўжо багата гадоў — раней на паравозе, а цяпер вось на самым найноўшым магістральным цеплавозе. І ўчастак знаёмы ім так, што, здаецца, і з завязанымі вачыма правядуць па ім поезд.

Наперадзе станцыя Цалік. Максім ведаў — там будзе затрыманы зборны поезд, што ідзе наперадзе, каб прапусціць ягоны, Максімаў, поезд без прыпынку. Гэта, вядома, калі Максім не парушыць свайго графіка, бо калі затрымаецца па якой-небудзь прычыне на перагоне і падыдзе да Цаліка са спазненнем, зборны адправяць раней, і Максім вымушаны будзе прыпыніцца на станцыі. Больш таго, ён будзе пастаўлены на бакавы пуць, пад абгон,— ззаду ідзе пасажырскі поезд, які ў Цаліку не мае па раскладу прыпынку.

Максім зноў зірнуў на скарасцемер, на гадзіннік.

— Нармальна,— сказаў Васіль.— Неўзабаве павінен паказацца ўваходны сігнал Цаліка.

«Але, але, праз паўтары-дзве мінуты, пасля закруглення, пакажацца ўваходны светафор Цаліка. Але якое на ім будзе гарэць святло — зялёнае або жоўтае?.. Якое?..»

Прайшла мінута. Яшчэ трыццаць секунд. Дваццаць. Дзесяць...

— Уваходны зялёны! — выгукнуў Васіль і ўвесь падаўся ўперад.

— Зялёны, Васёк, зялёны! — стрымліваючы радасць, як мага больш спакойна сказаў Максім.— На праход ідзём!

Імкліва набліжалася станцыя. На бакавым пуці відзён быў хваставы сігнал зборнага поезда. Максімаў цеплавоз прастукаў коламі па ўваходных стрэлках, памчаў да будынка станцыі. На пероне сустракаў поезд дзяжурны па станцыі, даўні Максімаў знаёмы Пятро Іванавіч Быхавец. Максім націснуў на клапан тыфона. Нізкі аксамістыя гук тыфона ўладна ўскалыхнуў застыглую ў дрымоце цішыню начной станцыі. Вось ужо і выхадныя стрэлкі засталіся ззаду, а наперадзе зноў клікала ў дарогу вабнае

зялёнае вока светафора. Поезд вылецеў на наступны перагон.

— От я думаю,— сказаў Васіль,— чаму б нам не ўзяцца вадзіць адны толькі цяжкавагавыя саставы? Паставіць перад начальствам такую прапазіцыю: маўляў, давайце нам саставы толькі павышанай вагі, звычайныя мы браць не будзем. Гэта ж колькі мы перавезлі б за пяцігодкі дадатковага грузу!

— Сотні тысяч тон, во колькі мы перавезлі б! Дзесяткі звышпланавых саставаў! І калі хочаш ведаць — я ўжо гаварыў пра гэта з Валатковічам.

— З Сяргеем Раманавічам?

— Але, з нашым парторгам.

— Вялікай мудрасці чалавек, гэты Сяргей Раманавіч. Ён мне ўяўляецца ўзорам партыйнага дзеяча. Прынцыповы, аб'ектыўны, чулы, справядлівы, і ў дадатак яшчэ нейкі... як бы гэта сказаць... надзвычай далікатны, ці што.

— У яго за плячыма вялікая школа падпольнай барацьбы па акупіраванай немцамі тэрыторыі.

— Кажуць, ён некалькі разоў быў на валаску ад смерці. І наогул пра яго расказваюць легенды.

Далёка наперадзе паказаўся пражэктар сустрэчнага поезда — гэта ішоў скоры маскоўскі. Ён імкліва набліжаўся, а насустрач яму, толькі па другой каляі, гэтак жа імкліва шыбаваў Максімаў састаў. Яшчэ некалькі секунд — і вось ужо скоры як віхор праляцеў міма.

Не першы год водзіць паязды Максім, здаецца, мог бы і прывыкнуць да бясконцых сустрэч з другімі паяздамі пад час рэйсаў, і ўсё ж кожны раз, як пралятае міма састаў, Максім трошачкі ўздрыгвае — недзе ў самай сярэдзіне, нейкай маленечкай часцінаачкай душы ці чаго там яшчэ. «Цікава, а ці ўздрыгвае ў гэты час Васіль? — падумаў Максім.— Мабыць, таксама ўздрыгвае, бо прывыкнуць да гэтага, відаць, немагчыма».

— Ну і што ж табе сказаў Сяргей Раманавіч? — спытаў Васіль.

— Сказаў, што з яго боку падтрымка будзе забяспечана.

— Галоўнае — дамовіцца з дыспетчарамі, каб яны не падсоўвалі любы састаў, абы з рук збыць.

— А яшчэ ведаеш, што сказаў Сяргей Раманавіч? Паездзіш, кажа, сам з цяжкавагавымі, набярэшся вопыту, а тады бяры і пішы артыкул у дарожную газету. Выступі з

заклікам да ўсіх машыністаў дэпо. А мо нават і да машыністаў усёй чыгункі. Каб яны таксама вадзілі саставы толькі павышанай вагі.

— Уга, куды хапянуў! То ён жа цяпер ні на дзень не выпусціць нас з-пад увагі. За кожным рэйсам сачыць будзе, правяраць, як мы водзім паязды.

Максім міжвольна зірнуў на скорасцемер, на другія прыборы. Пачынаўся невялікі пад'ём, і скорасць стала трошкі зніжацца. Максім перавёў кантролер у наступную пазіцыю. Цеплавоз лёгка перайшоў на новы рэжым, скорасць зноў стала ранейшай.

— Зялёны! — сказаў Васіль.

— Бачу, зялёны! — адказаў Максім.

Насустрач і папраўдзе ляцеў вабны зялёны агеньчык чарговага блок-участка. Імгненне — і ён праскочыў міма.

«Нармальна»,— сам сабе сказаў Максім, зірнуўшы на гадзіннік. Гэты блок-участак яны павінны былі мінуць менавіта ў дзве гадзіны і восем мінут.

Поезд імчаў і імчаў, паглынаючы калёсамі ўсё новыя кіламетры шляху.

— Чырвоны! — раптам усклікнуў Васіль.— Максім, чырвоны!

— Бачу, чырвоны! — выгукнуў Максім. А ягоныя рукі тым часам самі, амаль аўтаматычна, выключылі кантролер, прывялі ў дзеянне тармазы, уключылі пясочніцу. Усё гэта было зроблена яшчэ да таго, як у мозгу ўзнікла пытанне: а чаму, з якое прычыны з'явіўся наперадзе чырвоны сігнал?.. І чаму ён з'явіўся там, дзе наогул ніякага сігналу не павінна было быць — ні зялёнага, ні жоўтага, ні тым больш чырвонага?

— Пуцявы абходчык круціць чырвоным ліхтаром,— з трывогай у голасе сказаў Васіль.— Што там такое здарылася?.. Можа, з рэйкамі што?..

Але Максім таксама зразумеў, што сігнал падае пуцявы абходчык Мікіта Пацук. Значыць, выявіў нейкую няспраўнасць, магчыма, нават і папраўдзе трэснутую рэйку, і патрабуе неадкладна спыніць поезд. Цяпер усё залежыць ад таго, ці здолее поезд прыпыніцца раней, чым наедзе на небяспечнае месца. Бо хоць і затармажаны, ён усё ж прадаўжае ляцець наперад — яго супе магутная сіла інерцыі, якую набылі перад гэтым усе тыя тысячы тон, што знаходзяцца ў даўжэзнай чарадзе вагонаў.

Напэўна, пуцявы абходчык зразумеў, што ягоны сігнал

убачылі, і перастаў круціць ліхтаром — чырвоны агонь гарэў цяпер на адным месцы. А поезд усё сунуўся і сунуўся наперад,— праўда, з кожнай секундай трацячы сваю скорасць, збаўляючы шалёны бег.

Вішчалі тармазы, нібы ў ліхаманцы калаціўся цеплавоз. Максім высунуўся ў бакавыя дзверы, зірнуў уздоўж саставу. Той знізу ўвесь быў расквечаны нібы якойсьці фантастычнай ілюмінацыяй,— гэта ад бандажоў і тармазных калодак феерверкамі ляцелі іскры.

— Чорт, што ж там такое?! — пачуў Максім Васілёў голас над вухам.— Няўжо наедзем?..

Максім нічога не адказаў, вярнуўся на сваё месца. Больш зрабіць ён нічога не мог, бо зрабіў усё, што трэба было. Заставалася адно — чакаць. Набрацца цярплівасці і чакаць. Хоць гэта і самае найгоршае, што можа быць на свеце — трывожнае чаканне невядомасці.

Галава была на дзіва яснай, светлай, увага гранічна сканцэнтраванай. Ад пачатку тармажэння састаў прасунуўся ўжо метраў чатырыста, Максім ведаў гэта пэўна. Мабыць, прасунецца і яшчэ метраў сто пяцьдзесят, а мо і сто семдзесят. А колькі метраў да пуцявога абходчыка?.. Няўжо меней? І яшчэ адно няяснае пытанне — дзе ён стаіць, Мікіта Пацук: там, дзе небяспека, або адышоўшыся ад яе?

Скорасць была трыццаць кіламетраў, потым стала дваццаць, пятнаццаць. Цяпер у святле пражэктара добра была відаць постаць пуцявога абходчыка — той стаяў на тым самым пуці, па якім ішоў састаў. А побач...— дзіўная рэч! — побач, на броўцы, былі відаць яшчэ дзве постаці, і, мяркуючы па ўсім, жаночыя.

— Ён не адзін! — здзіўлена сказаў Васіль.— Там яшчэ людзі!

Максім зноў прамаўчаў, хоць здзіўлены быў не менш за Васіля.

Поезд ужо ледзь сунуўся. Пуцявы абходчык сышоў з каляі, далучыўся да жанчын, і ўсе яны адышліся яшчэ трошкі ўбок.

Не дайшоўшы якіх пяць-шэсць метраў да іх, цеплавоз спыніўся.

Максім ірвануў дзверы і скочыў долу. Следам за ім скочыў і Васіль.

— Што, што здарылася? — кінуўшыся да Пацука, нецярпліва спытаў Максім.

— Ды такое, браток, дзела...— неяк вінавата пачаў пуцявы абходчык. Ён паказаў вачыма на маладзейшую жанчыну.— У бальніцу ёй трэба. А сам жа ведаеш, колькі кіламетраў да Махавікоў. Ніяк не дайсці ёй...

Максім не ведаў — радавацца яму або бедаваць. Добра, што пуць усё ж спраўны, што ніякага няшчасця не здарылася. І ўсё ж... поезд затрыманы ў дарозе, графік парушаны.

— Чорт ведае што! — ускіпеў Васіль.— Я думаў — што-небудзь сур'ёзнае, а тут... тфу! — Ён ушчыльную падышоў да Мікіты Пацука, які аказаўся высокім сутулаватым мужчынам гадоў на трыццаць, і, здаецца, гатовы быў з кулакамі накінуцца на яго.— Ты не меў ніякага права спыняць нас! Мы з цяжкавагавым ідзём, ясна? У нас імянны графік, дыспетчар нам даў зялёную вуліцу, а што ж цяпер атрымаецца? Ганьба на нашы галовы, вось што атрымаецца, ясна?

— Нявыкрутка ў нас, зразумейце ж вы!..— з плачам у голасе сказала старэйшая жанчына.— Пільна трэба ў бальніцу...

— А ў нас што — карэта «хуткай дапамогі»?! — кіпеў Васіль.

Мікіта Пацук пераступіў з нагі на нагу.

— Яна... Маша... павінна радзіць...— ціха сказаў ён.

— Ну і няхай сабе раджае на здароўе. Мы лакаматыўная брыгада, а не бабкі-павітухі, ясна? У нас цеплавоз, а не радзільны дом, ясна?

— Пачакай, Вася, не гарачыся,— сказаў Максім. І з дакорам дадаў, звяртаючыся ўжо да Пацука і да старэйшай жанчыны: — То дзе ж вы раней былі, чаму не паклапаціліся загадзя паехаць у бальніцу?.. — Ён гаварыў гэта, хоць разумеў, што кажа зусім не тое. Але ж яму трэба прыняць нейкае рашэнне, ад якога, магчыма, будзе залежыць многае.

— Думалі, не пара ёй яшчэ,— сказала кабета.— Думалі, заўтра возьмем у лесніка каня, адвязём у бальніцу. Ажно во яе ўзяло і схапіла. Памажыце, людцы!

Падышоў галоўны кандуктар Слічонак.

— Можа, на тармазную пляцоўку да мяне возьмем яе, калі ўжо так трэба...— нерашуча прапанаваў ён.

— Ніякай тармазной пляцоўкі! — сказаў Максім.— Яна там адубее. Вася, памажы Машы ўзлезці на цеплавоз. Адвядзі яе ў дызельнае памяшканне.

— І я паеду, бо няможна ёй адной,— умольна сказала старэйшая.

— Добра, давайце і вы. Толькі хутчэй.

— Мы зараз, зараз...

— Чорт ведае што... — прабурчаў Васіль, аднак узяўся памагаць жанчынам.

Парадзіха застагнала.

— Асцярожней, асцярожней! — сказаў Максім.

Яны ўсе разам памаглі парадзісе ўзабрацца на цеплавоз. Потым Васіль адвёў жанчын у дызельнае памяшканне і вярнуўся назад.

Максім заняў сваё месца.

— Дзякую, браток! — данёсся да яго голас Пацука.

Кіўнуўшы галавой,— маўляў, усё будзе добра! — Максім націснуў на клапан тыфона, адпусціў тармазы, уключыў кантролер. Зараўлі рухавікі. Цеплавоз, нібы застаялы конь, адразу скрануў з месца састаў і пачаў набіраць хуткасць.

— Цяпер нам вунь колькі наганяць трэба...— прамовіў Васіль.— А ці здолеем...

— Паспрабуем! — сказаў Максім і перавёў кантролер яшчэ на адну пазіцыю.— Бачу зялёны!

— Зялёны! — пацвердзіў Васіль. І дадаў: — Мабыць, мы ўсё ж крыху затрымалі пасажырскі, што ідзе ззаду.

— Калі дыспетчар не выклікаў нас, значыць, не затрымалі.

— І то праўда. Мы ж вырваліся былі далёка наперад. Але ён недзе на хвасце ў нас.

Максім перавёў кантролер на апошнюю пазіцыю. Цяпер поезд ляцеў хутчэй за самы хуткі вецер. Максім выклікаў па рацыі дзяжурнага па станцыі Махавікі. Назваў сябе і нумар поезда, тады сказаў:

— Прашу, таварыш дзяжурны, звязацца з бальніцай, няхай прышлюць к нашаму прыходу «хуткую дапамогу».

— Захварэў хто з вас? — занепакоіўся дзяжурны па станцыі.

— Ды не, тут у нас... парадзіха, адным словам.

— Парадзіха?..— здзіўлена перапытаў дзяжурны.— Адкуль яна ў вас узялася?

— Пасля растлумачу. Званіце ў бальніцу.

— Добра, пазваню. Ідзяце па графіку?

Павагаўшыся якую долю секунды, Максім цвёрда сказаў:

— У Махавікі прыбудзем без спазнення!

Зноў праляцеў сустрэчны поезд.

— Штосьці раптам ёкнула недзе ўсярэдзіне,— сказаў Васіль.— Ці, можа, яно там заўсёды ёкае, калі пралятае сустрэчны, а я не заўважаў?..

«Заўсёды ёкае, Васёк, заўсёды,— радасна сказаў сам сабе Максім.— І будзе ёкаць, і няхай сабе, даражэнькае, ёкае!..»

Максім зірнуў на гадзіннік. Вось-вось павінен паказацца папераджальны светафор Махавікоў. Мабыць, поезд усё ж трошачкі позніцца...

— Бачу жоўты! — выгукнуў Васіль.

— Правільна, жоўты! — пацвердзіў Максім і шумна ўздыхнуў.

Махавікі — іхні пункт абароту. Адтуль яны, адпачыўшы, паедуць назад у сваё дэпо.

— Можа, толькі на якую хвіліну ўсяго і спознімся,— нібы здзіўлена прамовіў Васіль.

— Ці скора ўжо, га? — пачуўся раптам у кабіне жаночы голас.

Не паварочваючыся, Максім сказаў старой жанчыне:

— Вунь ужо станцыя відаць. Як там Маша?

— Малое ў нас! — захліпаючыся радасцю, сказала жанчына.

— Ну?..— зароў Васіль.— Дзялы!..

— Хлопчык? — спытаў Максім.

— Хлопчык! — адказала жанчына і падалася з кабіны.

— А я думаў, што будзе дзяўчынка...— як не расчаравана сказаў Васіль.— У такой незвычайнай абстаноўцы магла нарадзіцца хіба толькі жанчына, далібог...

— Дзіўна, чаму ты мог так падумаць,— сказаў Максім.— На цеплавозе мог нарадзіцца толькі будучы цеплавознік. Мужчына, адным словам.

Заскрыгаталі тармазы, зароў тыфон.

Павольна набліжалася станцыя. На пероне відзён быў дзяжурны па станцыі, а далей, там, дзе меўся прыпыніцца цеплавоз, стаялі людзі ў белых халатах з насілкамі.

*1973*

# ХАВАЙ, ЯК Я ХАВАЮ

Распісаўшыся ў плацёжнай ведамасці, Іван Пераход узяў пададзеныя яму праз акенца грошы і, падпарадкоўваючыся загаду на шыльдачцы, што патрабаваў правяраць грошы, не адыходзячыся ад касы, хуценька палічыў дзесяткі, пяцёркі, траячкі, рублі. Усё было правільна, касір даў якраз столькі, колькі і належала атрымаць Івану. Ён паклаў грошы ў кішэню пінжака і падаўся да выхада з канторы. Змену сваю Іван ужо адрабіў, можна было і дадому шыбаваць.

На заводскім двары Івана дагналі ягоныя даўнія знаёмыя Захар Пратасеня з кавальска-прэсавага цэха і Барыс Сівец з аддзела забеспячэння.

— Майстру такарнай справы — наша шанаванне! — сказаў Захар Пратасеня і ляпнуў Івана па плячы.

Барыс Сівец штурхануў Івана з другога боку, ахрыплым голасам прасіпеў:

— Штосьці даўнавата не бачыліся. Дзе прападаеш, айцец?

— Ды як вам сказаць...

— А і праўда, што гэта цябе нідзе не відаць? — падзівіўся і Пратасеня.— Робім на адным заводзе, а бачымся апошнім часам гады ў рады. Пасля работы ты знікаеш нібы тая ракета. Ёсць — і няма!

— Нядобра, айцец, нядобра адрывацца ад мас,— заявіў Барыс Сівец.— Няўжо гэтак моцна закілзала жонка?

— Ды як вам сказаць...

— Самі пад жонкамі ходзім, але ж во неяк вылузваемся. Нядобра, айцец, нядобра...

Яны ўтрох былі амаль аднаго веку. Старэйшы з іх, Барыс Сівец, меў трыццаць два гады. І выглядаў ён ста-

рэйшым, бо даўно ўжо адпусціў сабе бараду і вусы. Тым не менш ён да кожнага, нават маладзейшага за сябе, гаварыў «айцец».

— Нядобра, айцец, нядобра. Ты гэтак зусім адцураешся людзей. А тады ж здзічэеш, ну проста здзічэеш, чыстую праўду табе кажу. Палучка сёння ў вас у механічным была?

— Хіба не ведаеш. Сам жа, нябось, таксама атрымаў.

— І сам атрымаў, і ў Захаркі вунь, паглядзі, кішэня адтапырылася. А што добрыя людзі робяць, калі ў іх капейчына завялася? Куды яны цвёрдым крокам трымаюць кірунак? Адкажы мне на гэтае пытанне, айцец!

— Карацей кажучы — уздрыгнём, га? — падхапіў Барысавы словы Захар Пратасеня.— Сабразім на трох, га?

— Ды як вам сказаць...

Яны мінулі прахадную і апынуліся на люднай гарадской вуліцы. Прыпыніліся, азірнуліся наўкола, нібы рашаючы, куды пайсці,— направа або налева.

А надвор'е было — лепшага, здаецца, і не трэба. Чысцюткае блакітнае неба, зыркае сонца, ціхенечкі ветрык, духмянае пасля нядаўняй кароткай і цёплай залевы паветра,— усё зусім як улетку, і нават не верылася, што па календары ўжо восень і што цяпер павінна быць самая пара пранізлівых сівераў, заложных дажджоў, беспрасветнай шэрасці. Ды от жа штосьці пераблыталася, перакруцілася ў прыродзе, і ў кастрычніку зноў вярнулася да людзей лета.

— Прапазіцыя такая,— сказаў Барыс Сівец.— Паварочваем направа, тады праз два кварталы зноў направа. Там на рагу ёсць гастраном, а пры ім кафэтэрый. Возьмем, што трэба, у гастраноме, і — шмыг у кафэтэрый. Захару звесці з прылаўка шклянку — што плюнуць. І разалье пляшку — кропля ў кроплю, як у аптэцы. Будзе кожнаму роўненька па сто шэсцьдзесят шэсць цэлых і шэсцьдзесят шэсць сотых грама. Няма пярэчанняў, айцец?

— Ды як вам сказаць...

— Пачакайце, от толькі запачу на чорны дзень пару капеек, каб пасля не забыцца,— сказаў Захар Пратасеня. Ён выняў з кішэні пачак грошай, адлічыў некалькі паперак і, зняўшы кепку, засунуў іх усярэдзіну, па-над казырком. Астатняе паклаў назад у кішэню.— Гэта ж узяла жонка моду: як лягу спаць, перамацае ўсе кішэні, выграбе ўсе чыста, да капеечкі. От я і прыдумаў схованку.

Ці мала па што мужыку жывая капейчына патрэбна, самі ведаеце. А хіба жонка разумее гэта? Ёй абы сесці на тыя грошы, як квактуха на яйкі.

— Думаеш, толькі твая такая? — заўважыў Барыс Сівец.— Усе яны, айцец, на адзін капыл.

— От і даводзіцца мазгаваць з палучкі, куды б гэта заначыць якую пяцёрку, дзе б знайсці такое месцейка, пра якое б яна нізавошта не здагадалася. От было ў мяне аднаго разу, паслухайце. Нават і цяпер, як успомню... І смех і грэх... Атрымаў я во гэтаксама, як сёння, зарплату, а зарабіў якраз добра, даў паўтары нормы. Ну і варушу, значыцца, мазгамі: куды засунуць рублёў колькі? Пра «пістончык» у штанах жонка ведае, пра патайную кішэньку ў пінжаку таксама ведае, не кажучы ўжо пра вокладку для прафсаюзнага білета, якую я неяк спецыяльна прыдбаў быў для гэтай мэты і якою мо з паўгода карыстаўся, пакуль не надыбала жонка... І тут мне раптам цюкнула. Дай, думаю, засуну пакуль што за халяву ў бот, а ўжо як буду дома і жонка сцішыцца, перахаваю кудынебудзь. Узяў я, значыцца, шэсць рублёў, а далі тады ў касе якраз аднымі рублямі, ды новенькімі, ажно хрустаюць... узяў, значыцца, шэсць паперак і шась іх за халяву. Дамоў, вядома, адразу не пайшоў, а заскочыў з адным чалавекам у адно цёпленькае месца.

— І не з адным нейкім там чалавекам, а са мною,— удакладніў Барыс Сівец.— І не ў адно нейкае там месца, а ў павільён «Марожанае», захапіўшы папярэдне пляшку ў магазіне на Камсамольскай.

— Няўжо гэта ты тады быў? А я і забыўся ўжо. Ну то слухайце, як яно далей было, я ж табе, мабыць, не расказваў.

— Расказваў, айцец, расказваў.

— Ну то Іван во не чуў. Не чуў жа, га?

— Ды як табе сказаць... Здаецца, не чуў.

— Карацей кажучы, прыйшоў я дамоў у самым найлепшым настроі. Аддаў жонцы грошы. «Усе тут?» — пытаецца. «Усе,— кажу,— да капеечкі. Можаш праверыць». І сам выварочваю кішэні — глядзі, маўляў, нічога не заначыў. «Ды я табе і так веру»,— кажа жонка і ўсміхаецца. «Трасцу ты мне верыш,— думаю я сам сабе.— Але на гэты раз я цябе перахітру, нічога ў цябе не выйдзе. Дзе сядзеш, там і злезеш». Павячэралі мы, пагаманілі, трэба і спаць класціся. Пачаў я раздзявацца. Падышла чарга

да ботаў. І тут паўстала перада мной найскладанейшая задача: як зняць правы бот, каб жонка нічога не заўважыла? А яна, як на тое, круціцца побач і то флакончыкі ды слоічкі свае на трумо пачне парадкаваць, то рамкі з фатаграфіямі на сцяне паправіць. «Сходзі,— кажу да яе,— зірні на Волечку, ці спіць яна хаця, ці не скінулася з яе часам коўдрачка». «Не,— адказвае жонка,— не скінулася, я нядаўна глядзела». «Калі тое было,— зноў кажу сваё,— сходзі яшчэ, ці мала што». «Адчапіся! — ужо злосна кажа тады яна.— Сама ведаю, што рабіць!.. А ты вунь, бачу, так назюзюкаўся, што і ботаў скінуць не можаш. Аж глядзець брыдка. Давай ужо сцягну, а то так і заснеш абуты...» «Не руш! Я сам!..» — толькі і паспеў крыкнуць я, а яна — хоп за бот, ды як тузане!.. Тут з халявы і пырхнулі яны, мае родненькія рубельчыкі... «А божа! — вырачыла вочы жонка.— Хто б мог падумаць, што ты гэткую плату за такую дробязную работу назначыш! Ды я за такія грошы буду хоць па дзесяць разоў на дзень сцягваць з цябе боты. Давай во і другі сцягну, можа, з яго не рублі, а пяцёркі або дзясяткі пасыплюцца, га?»

— От гэта ўліп! — зарагатаў Барыс Сівец.— Уяўляю, які выгляд ты меў на тую хвіліну, айцец!

— І не кажы!..— зарагатаў і сам Захар Пратасеня.— Хоць ты скрозь зямлю праваліся... Затое цяпер у мяне надзейная схованка. Кладу во сюды ў кепачку. А як прыходжу дамоў, адразу вешаю яе на самым відавоку. Жонцы і не ў галаве зазірнуць у маю кепачку, га-га-га...

— Не, айцец, і гэтая твая схованка не такая ўжо надзейная, як табе здаецца,— сказаў Барыс Сівец.— Кажу гэтак, бо маю вопыт. І магу расказаць адну гісторыйку. Калі, вядома, ёсць ахвота слухаць.

— Давай, давай! — загарэўся Пратасеня.— Дзяліся вопытам, гэта ж пальзіцельна! Праўда, Іван?

— Ды як вам сказаць...

Яны адышліся трохі ўбок, каб не замінаць людзям, што ішлі цераз прахадную — і з завода, і на завод.

— Гісторыя кароткая, я хуценька раскажу. А тады ўжо і рушым.— Барыс зірнуў на гадзіннік.— Да сямі яшчэ далёка, паспеем. Ну дык вось... Не думай, айцец, што толькі ў аднаго ў цябе такая разумная галава, змікіціў быў і я пра кепачку. І ўсё было добра, пакуль не адзін выпадак. Дзела было не так і даўно, тыдняў тры таму. Не, якраз месяц назад, таксама ў палучку. Іду гэта я сабе да-

моў, вядома, пад градусам, давялося ўзяць у адной кампаніі грамаў дзвесце сорак.

— Без мяне? — здзівіўся Захар Пратасеня.

— Ты тады ў другую змену рабіў, айцец.

— А-а... то-та ж!

— Іду гэта, спяваю паціхеньку сабе пад нос «Ад панядзелка да панядзелка добра п'ецца нам гарэлка», я ж не люблю гарлапаніць на ўсю вуліцу, самі ведаеце, бо міліцыю трэба шанаваць. І раптам адкуль ні вазьміся — вецер, ды такі, што... вой! Можа, ён, халера, і перад тым быў, ды я яго не заўважаў, а тут раптам чую — падхапіла нячыстая сіла маю кепачку і па-анесла!.. Я — наўздагон! А кепачка коціцца сабе і коціцца па тратуары, і ніяк я не магу дагнаць яе. То во спынецца, а як толькі падбягу — яна ізноў пакацілася. Дзякаваць богу, прыціснула нагою нейкая стрэчная жанчына, тады я і ўхапіў сваю кепачку. Абтрос аб штаны, зноў насунуў на галаву, цяпер ужо да самых вушэй. Тады крокаў праз колькі сэрца ёк! Я шась кепачку з галавы, зірк усярэдзіну... Пуста! Туды-сюды рукою, нават падкладку вывернуў... Дзе там! І знаку няма!

— А многа заначыў быў? — давячыся смехам, спытаў Пратасеня.

— Чырвоненькую, айцец.

— Ажно дзесятку?..

— Цалюткую.

— Во, нябось, шкада было, га?

— Проста хоць плач!.. Пайшоў назад, зіркаю вачыма і туды, і сюды — падзе нічога. Тады здуру пытаюся ў аднаго мужчыны, ці не бачыў ён маёй чырвоненькай? Той паглядзеў на мяне, як на вар'ята, і — ходу!..

Захар Пратасеня аж за жывот схапіўся, гэткі яго ўзяў смех. Дробненька хіхікаў, выціраючы слёзы, і Іван Пераход.

— А ты кажаш — надзейная схованка. Нічога надзейнага на свеце няма, айцец.

Нарагатаўшыся ўволю, Пратасеня спытаў у Перахода:

— А ты, Іване, робіш заначкі? Прызнавайся, як на духу.

— Ды як вам сказаць...

— Не можа быць, каб не рабіў. То падзяліся вопытам, магчыма, ён і нам прыгадзіцца.

— Ды было і ў мяне...

— Ты ж у нас інтэлектуал. Нябось, такое ўдумаў, што сам чорт галаву зломіць, пакуль расшалопае, дзе яно і як яно ляжыць.

— Само неяк удумалася... А пачалося ўсё з бібліятэчкі, якою мяне прэміраваў заўком. Было гэта пазалетась. Далі мне тады як не два дзесяткі кніжак. Талстога, Пушкіна, Тургенева, Шолахава і яшчэ...

— Памятаю, памятаю,— сказаў Пратасеня.— Тады цябе і празвалі інтэлектуалам.

— Зрабіў я для тых кніжак палічку, прыладзіў яе да сцяны. Добра так атрымалася, прыгожа, я і па сталярнаму дзелу кумекаю. Ну пагартаю калі каторую кніжку, але я больш люблю пра сучаснасць чытаць, а там — адны класікі... І от аднаго разу мяне асяніла. Сяджу я за сталом, пазіраю на тыя кніжкі на паліцы, а хтосьці нібы падказвае мне: «Чалавеча, ды гэтыя ж класікі могуць саслужыць табе найлепшую службу. Бяры і кладзі да іх свае заначкі, ніхто зроду не здагадаецца зазірнуць туды. Жонка нічога чытаць не чытае, бо ніколі часу не мае, а дзеці яшчэ малыя, ім да класікаў далёка». От я і пачаў даручаць свае грошы, што на чорны дзень з палучкі пакідаў, то Анне Карэнінай, то Яўгенію Анегіну, то Грышку Мелехаву...

— Вой, дык гэта ж нехта як у сук уляпіў, калі назваў цябе інтэлектуалам! — зноў зарагатаў Захар Пратасеня.

— Айцец, ты самы геніяльны з усіх мужоў! — прачула сказаў Барыс Сівец.— Табе няйначай трэба помнік паставіць ад усіх нас, гаротных! Пры жыцці!

— Але слухайце, што было далей... А далей было вось што. Выпала мне нейк узяць сваю траячачку... ну, самі ведаеце, нашто. Падпільнаваў я, калі жонка адвярнулася на кухню, і — да паліцы. Схапіў Талстога, разгарнуў на сто дванцаць пятай старонцы... дарэчы, я заўсёды клаў дзе б ні было на сто дванцаць пятай старонцы, каб потым доўга не шукаць... дык вось, разгарнуў я Льва Мікалаевіча Талстога, а там...

— Дуля з макам?..— чамусьці шэптам спытаў Пратасеня.

— Мяне ажно ў пот кінула. Ператрос я ўсю «Анну Карэніну», ператрос Пушкіна, Шолахава, Тургенева... усіх класікаў, адным словам. Смалы я знайшоў, а не траячкі!

Тут усім зрабілася не да смеху. Захар Пратасеня круціў галавою, а Барыс Сівец адно моргаў вачыма.

— Сабачы, аднак, нюх у гэтых жанок! — сказаў нарэшце Сівец.— Тфу!..

— Заходзіць тут у пакой жонка, а я якраз стаўляю на паліцу апошнюю кніжку, «Злачынства і пакаранне» Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага,— гаварыў далей Іван Пераход.— Зірнуў я на яе, а яна і брывом не варухнула, бы нічога і не было, і ведаць яна нічога не ведае. Змоўчаў і я. Бо што тут скажаш. Таксама зрабіў выгляд, быццам ні пра якую траячку і чуць не чуў.

— Няўжо пасля таго табе адбіла запачкі рабіць? — з недаверам спытаў Пратасеня.— Нябось, зноў што-небудзь такое-гэткае адмачыў.

— Ды як вам сказаць...

— Не тойся, айцец, не тойся! — пажвавеў Барыс Сівец.— Давай сюды ўвесь свой вопыт, усю тэорыю і практыку!

— Падумалася мне тады вось што. Ну добра, думаю, знайсці табе траячку ў гэтых двух дзесятках кніжак было не так ужо і цяжка. За якую гадзіну або дзве можна ўсе да адзінай старонкі перагартаць. А каб гэта было кніжак у дзесяць разоў болей? Або каб у сто разоў? Знайшла б ты тады тую няшчасную траячку?

— Ні ў жысць бы не знайшла! — натхнёна сказаў Пратасеня.— Тут ужо ніякі нюх ёй не памог бы!

— Ну, думаю, ты хаця і хітрамудрая, але я перахітру і перамудру цябе!.. І ў першую ж палучку пашыбаваў у кнігарню. Можа, ведаеце, гэта недалёка адсюль — налева, а тады зноў налева. Купіў Сіманава, Галіну Нікалаеву, Шамякіна і яшчэ нейкіх трох невядомых. На ўсе тыя грошы ўзяў, што звычайна запачваў. У наступную палучку яшчэ сем кніжак прыцёг. Тады — яшчэ. Давялося зрабіць другую паліцу, потым трэцюю, чацвёртую. Да самай верхатуры ўзняліся мае паліцы. А я купляю кнігі і купляю. Не хапае мне ўжо тых паліц — і на буфеце ляжаць кнігі, і на падаконніках, і ў кутку за канапай. Раблю цяперака стэлажы, каб на ўсю сцяну было, ад падлогі і да столі. У адной нейкай карціне бачыў я якраз такія, ці то ў акадэміка яны былі, ці то ў якогась пісьменніка. Пакуль што на ўсе стэлажы кніжак, вядома, яшчэ не хопіць, але нічога, гады праз тры... а калі паднатужуся, то і раней, усё чыста пазабіваю кніжкамі. От няхай тады пашукае!

— Трасцу яна знойдзе! — усё больш натхняючыся, заявіў Пратасеня.— Гэта ж столькі старонак трэба перагар-

таць! Тысячы! Сотні тысяч! Ачмурэць можна, звар'яцець! А то і наогул дуба даць!.. Не, такая работа нікому не па сіле, нават бабе!.. Але ж во ўдумаў, дык удумаў! Ну і Іван!

І ён ляпнуў Перахода па плячы.

— А скажы, айцец,— раптам спытаў Барыс Сівец,— ты хаця сам пачытваеш тыя кніжкі?

— Ды як табе сказаць... Прыходзіцца. Часу вольнага ў мяне многа, раней дык во з вамі бавіў яго, у губу браўшы, а цяперака не маю за што, бо кожную заробленую лішне капейчыну трэба ў кнігарню несці. Прыходзіцца пачытваць. І скажу вам шчыра, цікa-а-выя часам трапляюцца кнігі, проста не адарвешся.

— То ты і зараз пойдзеш... налева?

— Налева. А вы?

— Мы? — Сівец зірнуў на Пратасеню.— Куды, айцец, пойдзем мы, га?..

Пратасеня павярнуў галаву направа, аблізнуўся, пракаўтнуў слінкі. Тады паглядзеў налева.

— Можа, пойдзем зірнём, як Іван тыя кніжкі купляе?

— А тады ўжо заадно і на стэлажы кінем вока. Хадзем, айцец.

— Дужа ж цікавы ў Івана метад.

— І здаецца, абсалютна надзейны.

*1973*

# ГОРКАЯ РАДАСЦЬ

Летась свой чарговы адпачынак я здолеў выкарыстаць толькі ў снежні. Заўком даў мне пуцёўку ў адзін з мясцовых дамоў адпачынку, і мяне гэта ўзрадавала, бо які ж інтэрас ехаць узімку на Чорнае альбо на Балтыйскае мора. Увесь снежань стаяла цудоўнае надвор'е — марознае, ядранае, з зыркім сонцам удзень і з шчодрымі снегападамі ўначы.

Дом стаяў у лесе. Выйдзеш на ганак — і проста перад табою, бы салдаты ў ганаровай варце, нерухома стаяць гонкія сосны з зацярушанымі снегам плячыма-сукамі. Вакол ціха-ціха, толькі зрэдку завітае знекуль быстры ветрык-весялун, пагайдаецца на вяршалінах дрэў, сыпне з іх жменек колькі снежнай крупкі, і зноў усё ўлагоджваецца, аціхае.

Сярод абслугі больш за ўсіх мела клопату цётачка Верачка, што рабіла тут за дворнічыху. Яе гэтак усе і звалі — цётачка Верачка, хоць гэта была зусім яшчэ маладая жанчына, гадоў ёй было, мусіць, дваццаць два, сама болей дваццаць тры. А звалі яе гэтак, напэўна, таму, што пры ёй заўсёды, з ранку да вечара, круціўся хлопчык, яе сынок Барыска. Пра Барыскаў узрост мы мелі самыя дакладныя звесткі. Ён сам ахвотна адказваў кожнаму, калі хто пытаўся ў яго, колькі яму гадоў:

— На леташні Новы год мне грукнула тры гадкі з паловаю, а на гэты Новы год грукне чатыры з паловаю.

Чаму ён вёў такі даволі дзіўны адлік пражытаму па свеце часу, я ўведаў толькі пад самы канец, калі ўжо збіраўся ад'язджаць з дома адпачынку.

Так, цётачцы Верачцы хапала клопату. Дарожкі, старанна падчышчаныя і падмеценыя напярэдадні, за ноч

зноў завальвала снегам, і трэба было зноў вызваляць іх з белага палону. Яна брала шырокі фанерны, абабіты па нізе бляхай шуфель, вялізную і важкую мятлу і праз увесь дзень вяла нялёгкую вайну са снегам. І цалюткі дзень пры ёй быў Барыска. Ён меў свой невялічкі шуфлік і старанна «памагаў» мацеры. Здаралася, праўда, што ягоны імпэт вынішчаўся, і тады Барыска кідаў свой шуфлік і прыбіваўся да каго-небудзь з адпачываючых, што шпацыравалі па дарожках, і вёў з імі бясконцыя гутаркі пра ўсё на свеце, а больш за ўсё пра тое, што трэба рабіць, каб не змарозіць ногі. Сам Барыска быў апрануты цёпла,— на ім сіняе палітэчка, падперазанае чырвоным шалікам, шапка з доўгімі вушамі, а на нагах чорныя валёнкі з галёшамі,— але ён, відаць, ведаў некага, хто змарозіў сабе ногі, і лічыў сваім неадменным абавязкам адвесці гэтую бяду ад кожнага. Парады яго зводзіліся галоўным чынам да той неабвержнай ісціны, што ў вялікую дарогу нельга выпраўляцца ў чаравіках або нават у ботах, а трэба абавязкова абуваць валёнкі.

Цётачка Верачка жыла з Барыскам у інтэрнаце пры доме адпачынку, у іх быў свой невялічкі пакойчык, але пакідаць ёй сына там не было з кім. Таму і гойсаў ён цэлы дзень на марозе.

Звычайна кожнаму, каго толькі сустракаў Барыска, ён гаварыў:

— Драстуй! — І пры гэтым шырока і неяк асабліва лагодна ўсміхаўся.

З ім віталіся і міжвольна таксама пачыналі ўсміхацца. І кожны абавязкова пытаўся:

— Ну як, Барыска, жыццё?

— Памалепечку,— заўсёды адно і тое ж адказваў Барыска.— Спадзяёмся на лепшае.

Ён заўсёды некуды спяшаўся і хадзіў подбегам. Аднаго разу я спытаў у яго:

— Куды гэта ты ляціш?

— Дык жа работы многа.

— А ці ж падабаецца табе твая работа?

— Дзе там яна падабаецца! Але ж некаму трэба яе рабіць.

Быў сярод адпачываючых чалавек дужа маленькага росту, амаль ліліпут. Выйшаў гэты чалавек на ганак, выняў цыгарэту і закурыў. Барыска падскочыў да яго і закрычаў:

— Зараз жа кінь курыць! Малым курыць нельга, хіба ты не ведаеш?!

Чалавек сумеўся. Памаўчаў, а пасля сваім басам (у яго пры невялікім росце і хударлявай, амаль дзіцячай постаці быў моцны голас) раўнуў:

— Я не малы!

Тады ўжо сумеўся Барыска. Ён залыпаў на такое дзіва сваімі сіненькімі, бы валошкі, вачаняткамі, падумаў і сказаў:

— Усё роўна кінь курыць.

Чалавек больш нічога не сказаў. Пачакаўшы крыху, Барыска павярнуўся і нібы з крыўдаю сказаў сам сабе:

— Пайду ў кацельню. Нешта качагар сёння слаба паліў, трэба, мусіць, памагчы яму. Вазьмуся кідаць торф у топку.

Назаўтра зноў надваліла за ноч снегу, і Барыска зноў памагаў маці. Ён насыпаў шуфлікам у вядзерца снег і праз два ці тры крокі высыпаў яго на дол. Карысці з такое яго работы было, вядома, аніякай, бо часцей за ўсё ён высыпаў свой снег там, дзе маці пахадзіла ўжо мяцёлкай. Але цётачка Верачка не сварылася на сына, яна нават падахвочвала яго.

Заўважыўшы, што я назіраю за ім, Барыска кінуў шуфлік і сказаў:

— Драстуй!

— Добры дзень, Барыска, добры дзень! — адказаў я.— Ну як жыццё?

— Памаленечку. Спадзяёмся на лепшае.

— Але ж і работа ў цябе цяжкая.

— Анічога, я ўцягнуўся.

— То, можа, усё ж адпачнеш крыху?

— Дык жа снегу многа найшло. Гэта ён раней... ну, калі цябе яшчэ тут не было... дык тады толькі вучыўся ісці. Пойдзе трошкі і перастане. Зноў пойдзе і перастане. А цяперака навучыўся, дык ідзе і ідзе. Каб ён хаця згарэў, адно гора з ім.

Барыска схапіў сваё вядзерца і панёс снег. І тут здарылася нечаканае. Ён праходзіў за матчынай спіною, яна не бачыла яго і, размахнуўшыся шуфлем, моцна выцяла сына дзяржальнам па галаве. Барыска паваліўся на дол. Я кінуўся да яго. Напалоханая маці таксама. Мы паставілі Барыску на ногі і не паспелі і слова вымавіць, як ён сам са здзіўленнем сказаў:

— Ты што — здурнела, гэтак біцца?!

Я зарагатаў, зарагатала і цётачка Верачка. Падзівіўшыся на нас, раскрыў рот у сваёй шырокай лагоднай усмешцы і Барыска.

Ён так і не заплакаў.

Як пасля высветлілася, шапка ўсё ж змякчыла ўдар шуфля. Праўда, цётачка Верачка казала, што гуз на галаве ў Барыскі ўскочыў ладны.

Неяк мы выправіліся з Барыскам на пагулянку, доўга блукалі з ім па дарожках і сцежках, і ён расказваў мне розныя гісторыі пра адпачываючых, часам вельмі смешныя. У яго была добрая памяць, і ўсё, што ні пачуе, ён моцна трымаў у галаве.

— А ў нашым лесе ваўкі ёсць,— раптам сказаў Барыска.— Вялікія-вялікія.

— Ты іх бачыў?

— Не, сам я не бачыў. Але адна дзяўчынка бачыла. Шэры воўк, самы вялікі, нават хацеў быў з'есці яе.

— Але ж не з'еў, га?

— Яна яго абдурыла.

— Разумная, відаць, дзяўчынка.

— Ага, разумная.

— Як жа ёй удалося абдурыць такога ваўка?

— У тае дзяўчынкі бабуля была. Вунь у тым баку яна жыла,— паказаў Барыска рукою некуды ў правы бок.— Там яе хатка была.— Барыска падумаў і дадаў: — Можа, яна нават і цяпер стаіць. Толькі там ніхто болей не жыве.

— Ваўкоў баяцца?

— Мусіць, баяцца.

— То як жа дзяўчынка абдурыла таго ваўка?

— Надумалася яна схадзіць да свае бабулі, бо даўно не бачыла. Ідзе і нічога не ведае. А бабулю воўк ужо з'еў, сядзіць у хаце і аблізваецца. Убачыў ён, што ідзе дзяўчынка, надумаўся і яе з'есці. Узяў сабе і лёг у пасцель замест бабулі. І коўдраю пакрыўся. Думае, прыйдзе дзяўчынка, падбяжыць да пасцелі, а я тады вазьму і з'ем яе. Але дзяўчынка адразу здагадалася, што ў пасцелі не бабуля, а шэры воўк. Яна скоранька выскачыла з хаты, узяла дзверы на палку і пазвала паляўнічых. Тыя — бах! бах! — і застрэлілі ваўка.

Прызнацца, у такой інтэрпрэтацыі казку пра Чырвоную Шапачку і Шэрага Ваўка мне яшчэ не даводзілася слухаць.

— А калі гэта было? — спытаў я ў Барыскі.

— Летась было,— упэўнена сказаў Барыска.

— А дзе ж тая дзяўчынка?

— Ды тут недзе недалёка жыве. Адна жыве, ні мамы ў яе няма, ні таты.

— Як жа яна адна жыве?

— Людзі ёй памагаюць. Во і я, як падрасту, буду памагаць.

Пад канец нашай пагулянкі я надумаўся спытаць у Барыскі:

— А ў школу ты скора пойдзеш, Барыска?

— У школу я не пайду! — як адрэзаў ён.

— Чаму ж гэта так? — здзівіўся я.

— Не пайду.

— Але ж там цябе будуць вучыць, там...

— Не пайду! — амаль злосна перапыніў мяне Барыска.— Наш бацька хадзіў летась у школу, а тады ўцёк ад нас з настаўніцай.

— Як гэта, уцёк?

— З'ехаў ад нас... на гэтую... на цаліну. Кінуў нас з мамаю, мы во і гаруем.

Я адчуў, як да горла ў мяне падкаціўся нейкі даўкі камяк. Адсопшыся, я спытаў:

— І даўно ён з'ехаў?

— На леташні Новы год, калі мне было тры з палове гадкі. А на гэты Новы год мне ўжо грукне чатыры з палове. Нічога, скора я ўжо вырасту.

Ён задумаўся, нібы штосьці ўспамінаючы, потым сказаў:

— От толькі міліцыя ў нас дрэнная.

— Чаму?

— А чаго яна бацьку нашага не шукае? Ні пісьмаў ён не шле, ні грошай. А на нашу зарплату хіба пражывеш? Да нас далучыўся мой сусед па пакоі, чэмпіён рэспублікі па стаклеткавых шашках — малады хлопец у спартыўнай куртцы з маланкамі. Ён чуў апошнія Барыскавы словы і палічыў патрэбным уступіць у гаворку.

— То ты схадзіў бы ў міліцыю, палаяў іх.

— Гары яно, мароз вунь які стаіць, не дайду.

Калі мы вярнуліся да нашага корпуса, там непадалёк цётачка Верачка вяла сваю бясконцую вайну са снегам. Барыска сказаў да чэмпіёна па стаклеткавых шашках:

— Дзядзька, падай мне мятлу!

Чэмпіён усміхнуўся і пайшоў быў да ганка.

— Ты што — маленькі, не разумееш?! — крыкнуў яму наўздагон Барыска.

Давялося чэмпіёну вярнуцца і падаць мятлу Барыску.

І вось надышла пара ад'язджаць дамоў. Настрой у той дзень у мяне быў цудоўны — я такі добра адпачыў у гэтым старым заснежаным лесе, пасвяжэў і нібы нават памаладзеў. Раніцою ішоў апошні раз у сталоўку. І раптам пачуў ззаду:

— Драстуй!

За мною подбегам шыбаваў расчырванелы Барыска.

— А-а, дарагі мой Барыска! Добры дзень, добры дзень! Ну як жыццё?

— Цяпер ужо лепей! — радасна сказаў Барыска.— Аліменты мы пачалі палучаць!

Ягоныя вочкі-валошкі аж прамяніліся. А рот разышоўся ледзь не да вушэй.

Ах, Барыска, Барыска! Як бы мне хацелася парадавацца разам з табою — ды толькі не гэтай, не горкай радасцю!

Аўтобус адыходзіў у дзесяць. Барыска з кожным з нас развітаўся за руку. У чэмпіёна па шашках тэрмін яшчэ не скончыўся, але ён таксама надумаўся «падскочыць» на гадзінку ў горад.

— Барыска, паедзем са мною? — не то жартам, не то ўсур'ёз прапанаваў ён маламу.— Да абеду вернемся назад. Паедзем, га?

Барыска адказаў зусім сур'ёзна:

— Няма калі. Работы многа.

*1973*

# САЛДАТЫ НЕ АДСТУПАЮЦЬ

На палубе цеплахода было людна і шумна. На правым борце, бліжэй да кармы, забівалі «казла» пажылы чыгуначнік, два шахцёры і геолаг. Гульня ішла пад выбухі гучнага смеху. Налева ад аматараў даміно група студэнтаў горача абмяркоўвала французскі фільм «Іх было пяцёра», які ўчора паказвалі пасажырам цеплахода. Побач сядзелі прэферансісты, яны раз-пораз выгуквалі дзіўныя, не для кожнага зразумелыя словы: рэміз, пас, віст, мізэр. Воддаль ад прэферансістаў адзінока сядзеў шыракаплечы пахмуры хлопец, падобны на барца-асілка; ён пяшчотна варушыў мяхі новенькага бліскучага акардэона, і той даверліва расказваў свету аб параненым кімсьці сэрцы свайго гаспадара...

Цеплаход ішоў па Цымлянскім моры. Большасць пасажыраў, відаць, прызвычаілася ўжо і да цеплахода, і да самога мора, хоць яшчэ параўнаўча нядаўна ніякага мора тут не было, і таму цеплаход з'явіцца тады ў гэтых мясцінах ніяк не мог. Напэўна, не ўпершыню плылі па Цымле, як пачалі для зручнасці называць Цымлянскае мора ў народзе, і гэтыя вось шумныя забойшчыкі даміно, і студэнты, і тыя заўзятыя прэферансісты, і акардэаніст-асілак. Геолаг нават сказаў сваім партнёрам:

— Наша Цымля зрабілася ўжо абжытым морам. А я яшчэ памятаю, як тут буяў кавыль.

Раніцою далёка па небасхіле паказалася была невялічкая алавяна-сіняя хмарка. Хутка набліжаючыся, хмарка гэтак жа імкліва расла і расла. А калі яна падышла зусім блізка, у паветры адразу дыхнула холадам. І тады пачало здавацца, што цяпер не жнівень, а золкі, пранізлівы

лістапад. Мора пацямнела, зрабілася нейкае шурпатае, няўтульнае. Чакалі, што будзе шторм.

Але хмара раптам павярнула і падалася ў другі бок. Адразу сцішыўся вецер, мора пасвятлела, і неба зноў стала зырка-блакітнае.

Дзіўна паводзіць сябе Цымлянскае мора! Мабыць, яно яшчэ не асвойталася як след са сваім існаваннем на свеце...

На левым борце на палубе сядзелі двое: Іван Сцяпанавіч Бурак, бухгалтар хлебазавода, і Сяргей Васільевіч Сяржантаў, вайсковец у чыне падпалкоўніка. Першы з іх быў пажылы ўжо чалавек з раскошнай барадой каштанавага колеру, з шырокім спакойным і задаволеным тварам. Вочы яго пазіралі на ўвесь навакольны свет нібы з нейкай абыякавасцю. Падпалкоўнік выглядаў маладзей за бухгалтара, нават значна маладзей, але, мяркуючы па званню, таксама меў ужо за плячыма багата гадоў. Росту ён быў невысокага, твар меў адкрыты, просты. Звярталі на сябе ўвагу ягоныя рукі — яны ўвесь час былі ў руху, нібы дапамагалі падпалкоўніку гаварыць, спрачацца і нават слухаць.

Іван Сцяпанавіч і падпалкоўнік Сяржантаў пазнаёміліся сёння за снеданнем. Высветлілася, што яны землякі, абодва з Палесся, і гэтая акалічнасць адразу зблізіла іх. Увесь дзень яны былі разам. Разам слухалі радыё, разам абедалі, потым гулялі ў паддаўкі, а перад вячэрай, не згаворваючыся, узялі за губу па шклянцы «Цынандалі».

Цяпер яны сядзелі на палубе і, перад тым як пайсці спаць, абменьваліся думкамі і курылі. Падпалкоўнік смаліў адну папяросу за другой, прагна зацягваючыся дымам. Іван Сцяпанавіч смактаў люльку. Ён набіў яе тытунём трэці раз за дзень: першы раз высмактаў пасля снедання, другі — пасля абеду і цяпер вось закурыў трэці раз. Перад самым сном ён выкурыць яшчэ адну люльку. Так, чатыры люлькі на дзень, не больш і не менш.

— Калі чалавеку за пяцьдзесят, ён павінен ужо стрымліваць свае жаданні,— павучальным тонам знаўцы жыцця гаварыў Іван Сцяпанавіч.

Зноў успомнілі родныя мясціны, колішніх агульных знаёмых. Але галоўнае, да чаго яны зноў і зноў варталіся ў гаворцы, было дзіўнае мора, па якім яны плылі, канал, шлюзы, гідрастанцыя — усё тое, што за кароткі час стварыў савецкі чалавек сярод голага стэпу.

Іван Сцяпанавіч і падпалкоўнік ехалі тут упершыню, і ўсё было для іх новае, цікавае. Асабліва цікавае, вядома, для падпалкоўніка.

— Гэта ж падумаць толькі — дваццаць два мільярды кубаметраў умясціла ў сабе вось гэтае мора! — раскідаючы ад захаплення рукі, гаварыў Сяржантаў.— Дваццаць два мільярды!

— Лічба ўнушальная,— спакойна згаджаўся Іван Сцяпанавіч.

І яны пачалі прыгадваць розныя вядомыя ім абставіны, падзеі, факты, якія мелі дачыненне да гісторыі будаўніцтва, часам не заўважаючы, што пачынаюць сям-там пакрысе перабольшваць альбо нават проста выдумляць тое, чаго ў сапраўднасці не было і быць не магло.

— Летась увосень тут, кажуць, такі штармяга разгуляўся быў, што куды там тое Чорнае мора! — сякануў рукою паветра падпалкоўнік Сяржантаў.

— Было, было,— пацвердзіў Іван Сцяпанавіч з такім выглядам, быццам на ўласныя вочы бачыў той незвычайны шторм.

Потым дарожныя знаёмыя перайшлі да размовы аб горадзе, да якога яны трымалі кірунак, пачалі ўспамінаць векапомныя дні сорак другога года...

Плёскаліся аб борт цеплахода хвалі. Раскінуўшы велізарныя крыллі, лунаў над морам арол. У высокім бясхмарным небе загудзеў рэактыўны самалёт, загудзеў і сціхнуў, знік.

Іван Сцяпанавіч зірнуў угору.

— Вось і гэтыя летуны хутка ўжо стануць пройдзеным этапам,— выбіваючы аб поручні люльку, прамовіў ён.— Чым жа яшчэ здзівіць нас розум чалавека?

— Яшчэ многім, бо мяжы для чалавечых магчымасцей няма.— Сяржантаў пстрыкнуў партсігарам і закурыў новую папяросу, з асалодаю ўдыхнуў дым і выпусціў яго праз нос.

— Ну, гэта вы ўжо хапілі залішне,— хаваючы люльку ў кішэню, сказаў Іван Сцяпанавіч.

— Чаму? Чалавек — бязмежны творца.

— І ўсё ж ёсць межы і для гэтага бязмежнага, як вы кажаце, творцы. Ёсць!

— Чакайце, чакайце! — загарэўся Сяргей Васільевіч і зноў сякануў паветра рукою.— Вашы словы сведчаць...

— Не, не,— тонам, які не дапускаў пярэчанняў, пера-

пытаў яго Іван Сцяпанавіч.— Вы ж, паважаны мой зямляк, не будзеце адмаўляць народную мудрасць, якая сцвярджае: вышэй галавы не падскочыш. Заўважце — не падскочыш!

— Гэта не народная мудрасць. Гэта — філасофія кансерватызму.

— Неперакапаўча, і я застаюся пры сваёй думцы.

Іван Сцяпанавіч быў з тых людзей, якія, дайшоўшы ў сваіх развагаваннях альбо назіраннях да пэўных вывадаў, не маглі ўжо ні адмовіцца ад іх, ні перагледзець і змяніць.

Кінуўшы за борт недакураную папяросу, падпалкоўнік спакойна, без ранейшага запалу сказаў:

— Хочаце, я раскажу вам адну гісторыю. Даўно гэта было, яшчэ ў час вайны, але, можа, вам цікава будзе паслухаць. Гісторыя якраз мае дачыненне да пытання аб магчымасцях чалавека.

— Ну, ну.— Бурак паглядзеў на гадзіннік.— Спаць яшчэ рана, час у нас ёсць.

— Гісторыя гэта такая, што пачынаць гаворку пра яе давядзецца з сябе, хоць я тут, як кажуць, збоку прыпёка...

Падпалкоўнік выняў партсігар, але чамусьці не закурыў, а паклаў партсігар назад у кішэню.

— Дык вось. Ваяваць я пачаў салдатам, у першы бой уступіў дваццаць шостага чэрвеня сорак першага года, аднак да лістапада сорак другога ні разу не быў паранены. Шанцавала, ці што. У якіх толькі пераплётах не быў, у якія абставіны не трапляў, адусюль выходзіў без ніводнай драпіны. А вось у дзень, калі мы пайшлі ў генеральнае наступленне пад Сталінградам... вось тут, якраз у гэтых мясцінах тое было... у той дзень мяне так сцебанула, што апрытомнеў я толькі праз некалькі дзён.

Памятаю: расплюшчыў вочы, гляджу — нада мною белая столь, з яе звісае электрычная лямпа і гарыць яна так зырка, што ажно вачам балюча. Але я гляджу проста на святло і імкнуся зразумець, дзе я, куды трапіў. Раптам чую: побач, з правага боку, пехта застагнаў. Я памкнуўся ўзняцца, але ледзь толькі паварушыў рукою, як востры боль так праняў мяне, што я зноў страціў прытомнасць.

Апрытомнеў другі раз, пэўна, таму, што зноў пачуў той самы працяглы глухі стогн. Чалавек побач скрыгатаў зубамі, пасля пачаў выкрыкваць:

— Бі! Крышы!..

Лежачы на спіне, я не бачыў таго, хто крычаў, а павярнуцца не адважваўся, бо ўжо ведаў: варта мне толькі варухнуцца, як зноў адчую нясцерпны боль у руцэ. Я ляжаў і прыслухоўваўся. У выкрыках майго невядомага суседа было столькі заклікальнай сілы, што калі б гэта было на полі бою, то ён, напэўна, падняў бы ў атаку нават зусім знясіленых.

— Бі!.. Крышы!..— выкрыкваў ён.

А ў адказ пачуўся другі — ціхі і пяшчотны — жаночы голас:

— Не трэба, Васілёк... Родненькі, не трэба. Пацярпі крыху яшчэ.

— Б-і-і...— ужо не крыкнуў, а прахрыпеў чалавек і сціх.

Тады я зразумеў усё — і дзе знаходжуся, і што са мною: я ў шпіталі, паранены.

«Але куды ж я паранены? — разважаю.— У руку? Мусіць, не толькі ў руку, бо шыю таксама не магу павярнуць — яна скрозь забінтаваная...»

— Сястрыца...— паціху клічу я.

— Што, родненькі? — чую той самы ціхі, пяшчотны голас.— Апрытомнеў?

Нада мною нахіляецца твар ужо немаладой жанчыны. На ёй белы халат і белая касынка. На мяне пазіраюць яе ласкавыя блакітныя вочы.

— Апрытомнеў? — яшчэ раз перапытала сястра.— Гэта Васіль цябе растрывожыў. У яго моцная гарачка.

Сястра паказала галавою ў бок майго суседа. Блакітныя вочы яе неяк адразу пацямнелі, з-пад вейкаў выкаціліся дзве буйныя слязіны.

— Кепска яму? — шэптам спытаў я.

— Вельмі,— адказала сястра і глыбока ўздыхнула.— Яго з падбітага танка выцягнулі... Гарэў... Жывога месца на ім няма.

Па голасу сястры, па яе вачах я зразумеў: дні майго суседа злічаны... Мне зрабілася вусцішна.

Сястра расказала, што ўчора ў шпіталь прыйшло да гэтага самага Васіля Чумака — так звалі майго суседа — пісьмо. Яно доўга блукала, пакуль знайшло адрасатаў. Спярша яго паслалі ў часць, дзе служыў Васіль, адтуль пераслалі ўжо ў шпіталь. Пісьмо было ад Васілёвай маці. Жудасную вестку паведамляла яна сыну. За сувязь з пар-

тызанамі фашысты спалілі ўсё іх сяло, ні двара не пакінулі. Голае поле ды чорныя коміны засталіся на тым месцы, дзе была некалі вялікая і прыгожая вёска Лужкі. Спаліўшы Лужкі, гітлераўцы абвясцілі, што яны надалей забараняюць людзям сяліцца і будавацца на гэтым месцы. Уся Васілёва радня загінула. Цудам выратавалася адна толькі маці. Яна доўга хавалася ў лесе, пакуль не трапіла да партызан. Адтуль і напісала сваё пісьмо-трохкутнічак.

— А Васіль ведае пра гэта? — ціха спытаў я ў сястры.

— Не, мы не чыталі яму пісьмо. Як прыйшло, мы прачыталі самі і вырашылі — не варта яму чытаць. Ён у такім стане... Пісьмо даканае яго. Галоўны ўрач катэгарычна забараніў. Мы нават успамінаць пра Лужкі баімся.

Чумак застагнаў. Сястра кінулася да яго.

— Васілёк, родненькі... Ну чаго, чаго табе? Пацярпі крышачку, пацярпі.

Я падумаў, што і праўдзе галоўны ўрач мае рацыю. Васіль не вытрывае, даведаўшыся пра жудасны лёс родных Лужкоў. Не, не трэба паказваць яму тое пісьмо.

Раніцою ў палату прыйшоў урач. Гэта быў маленькі, хударлявы і сівы, хоць яшчэ і не вельмі стары чалавек. Ні вусоў, ні барады ў яго не было, затое на галаве дыбам стаяла капа белых, як снег, валасоў. Ён падышоў да мяне быстрай імклівай хадою, схапіў тэмпературны лісток, зірнуў на яго і, падумаўшы, нечакана спытаў:

— Ну, ці хутка ў наш клуб на танцы пойдзем, га? Праўда, у шпітальных пантофлях танцаваць не вельмі зручна, але нічога, прызвычаішся!..

Я не ведаў, што сказаць у адказ. А ўрач, паслухаўшы мой пульс, спытаў:

— Дык, значыць, радавы Сяржантаў? Так?

— Так,— чамусьці перашуча адказаў я.

Урач усміхнуўся.

— Цікавае ў вас прозвішча... А як жа яно, голубе мой, будзе, калі вы да сержанта дaслужыцеся, га? — Урач зрабіў рукой «пад казырок» і басам «далажыў»: — Дазвольце звярнуцца, таварыш сержант Сяржантаў?.. Смешна, праўда?

Мне і папраўдзе стала смешна, і я засмяяўся.

— Правільна! — сказаў урач.— Смейцеся! Смех — гэта адзін з самых моцных лячэбных фактараў.

Ён пачаў на незразумелай для мяне мове штосьці тлумачыць сястры, мусіць, прызначаў лякарствы і працэду-

ры. Потым, па-змоўніцку падміргнуўшы мне, падаўся да другіх параненых.

На другі дзень мой сусед, цяжка дыхаючы, прахрыпеў:

— Адваяваўся Васіль Чумак... Канцы!..

Яму рабілася ўсё горш і горш. Ён амаль увесь час быў у непрытомнасці, а калі прытомнеў, то безнадзейна гаварыў пра блізкую і немінучую смерць. Чумак быў увесь забінтаваны. Бінты былі ў яго і на галаве, і на твары, і на руках. Напэўна, на ім і сапраўды не было жывога месца... Яго часта некуды вазілі, потым прывозілі зноў...

— Адваяваўся...— яшчэ раз прашаптаў ён.— Мабыць, заўтра... сканаю.

Я здрыгануўся.

Цяжка бачыць чалавека, які памірае. Тым больш калі ён малады і павінен быў бы яшчэ жыць ды жыць!

— Ну, што ж,— пасля доўгай паўзы прамовіў Васіль.— Зрабіў я нямала... Усё, што мог, зрабіў.

І вось надышла раніца наступнага дня. Я не спаў амаль усю ноч, моцна нылі раны, але на досвітку палягчэла, і я пачаў драмаць.

Раптам пачуў, што дзверы ў нашу палату асцярожна прачыняюцца. Я расплюшчыў вочы. Бачу: у палату ўваходзіць невысокі каржакаваты чалавек у белым халаце, мяркуючы па ўсім, вайсковец. За ім ідуць урач, сястра і яшчэ двое ці трое вайскоўцаў, таксама ў халатах.

— Вось тут, таварыш генерал,— сказаў урач, звяртаючыся да чалавека, што ўвайшоў першым.

Генерал азірнуўся наўкола і ціха, нібы просячы прабачэння за тое, што прыйшоў у такі ранні час, прывітаўся:

— Добры дзень, таварышы.

— Дзень добры,— пачуліся галасы ў адказ.

Толькі Васіль Чумак нічога не адказаў. Ён раптам пачаў дыхаць яшчэ цяжэй, чым звычайна.

Генерал падышоў да першага ложка, сеў на падстаўлены кімсьці табурэт, спытаў у хворага:

— Даўно вы паранены, таварыш?

— Ужо з месяц,— адказаў той.

— Як вас лечаць?

— Добра. Ды толькі ж вельмі многа жалеза ўвагналі ў мяне фашысты.

— Нічога, усё павымаюць. І не агледзецеся, як паставяць вас на ногі,— упэўнена сказаў генерал. Памаўчаўшы, ён спытаў: — У вас будуць да мяне просьбы?

— Дзякую, таварыш генерал, ніякіх просьбаў няма.

— Жадаю вам хутчэй папраўіцца! — Генерал узяў руку хворага ў сваю і асцярожна пацінуў.

Потым генерал некалькі хвілін гутарыў з малодшым сяржантам, які ляжаў ля акна. Генерал падрабязна распытваў яго аб сям'і, аб дзецях. А пад канец папрасіў напісаць яму, як сустрэнуць воіна на заводзе пасля дэмабілізацыі і як рабочыя памагаюць фронту.

— Адрас мой такі...— і генерал назваў нумар палявой пошты і сваё прозвішча.

— Абавязкова напішу! — сказаў малодшы сяржант.

Так генерал абышоў усіх. Засталіся я і Васіль Чумак.

— Радавы Сяржантаў,— прадставіў мяне ўрач, калі генерал прысеў каля майго ложка, і дадаў жартаўліва: — Марыць даслужыцца да сяржанта. Хоча быць сяржантам Сяржантавым!

Генерал усміхнуўся.

— А мне здаецца... бачу па вачах... што радавы Сяржантаў марыць даслужыцца да палкоўніка... не, да генерала! — сказаў генерал і павярнуўся да сястры.— Як вы думаеце — даслужыцца?

Сястра пачырванела, на яе кірпатым носе ярка выступілі вяснушкі, якіх я раней не заўважаў.

— Бярыце вышэй,— падумаўшы, адказала сястра.

— А што? І сапраўды, благаславім яго на маршала!

— Толькі на маршала, і не ніжэй! — засмяяўся я.

Генерал падышоў да Чумака, сеў побач і некаторы час моўчкі пазіраў на хворага.

— Цяжка? — неяк асабліва пранікнёна спытаў ён.

— Цяжка,— адказаў Чумак і ўздыхнуў.— Відаць, памру, таварыш палкоўнік... прабачце, таварыш генерал.

Тут я зразумеў, што генерал і салдат даўно знаёмыя, што гэта не першая іх сустрэча. Мабыць, генерал камандаваў злучэннем, у якім служыў Чумак, і Васіль ведаў яго яшчэ тады, калі той быў палкоўнікам.

— Гэта вы дарэмна. Вам яшчэ трэба жыць... Доўга трэба жыць. Жыць і змагацца!

Генерал гаварыў цёпла, задушэўна, як дбайны бацька з дарагім сынам.

— Не ведаю...— прашаптаў Чумак.

— Салдаты не адступаюць, ніколі не адступаюць! Гэта наш брат, генерал, часам вымушаны даваць загад на адступленне, а салдат заўсёды імкнецца толькі наперад.

Так што ў вас адна дарога — ісці наперад і перамагаць! Перамагаць ворага, сябе самога і нават самую смерць. Не адступаць нават перад смерцю. А дактары вам памогуць. Яны, я ўпэўнены, зробяць усё дзеля таго, каб памаглы вам.

Генерал нахіліўся да Чумака:

— Вас, здаецца, завуць Васілём, таварыш Чумак?

— Ага.

— У мяне сын таксама Васіль. Лётчык.

— Няхай бы ў танкісты ішоў, як бацька.

— Ну, у лётчыкаў наконт гэтага свае меркаванні.

Перадыхнуўшы, Чумак спытаў:

— Як там, таварыш генерал, наша дывізія... добра ваюе? Хлопцы нашы... га?

— Нядрэнна. Вярхоўны Галоўнакамандуючы абвясціў асабоваму саставу дывізіі падзяку за ўдзел у разгроме арміі фон Паўлюса. Даём фашыстам прыкурыць!

Генерал яшчэ бліжэй нахіліўся да Васіля.

— Лужкі чакаюць вас, таварыш Чумак.

— Лужкі? — насцярожана перапытаў Васіль.— Яны вызвалены?

Я сумеўся. Пабялела з твару сястра. Пераступіў з нагі на нагу ўрач. У палаце зрабілася ціха-ціха, ніхто, здавалася, нават не дыхаў.

— Гітлераўцы знішчылі іх, ператварылі ў «мёртвую зону». Вы павінны вярнуцца ў Лужкі, адбудаваць іх, каб зрабіліся яны яшчэ лепшыя і прыгажэйшыя, чым раней.

У цішыні выразна было чуваць цяжкае дыханне Васіля.

— Адбудуеце? — Генерал зазірнуў Васілю ў самую глыбіню вачэй.

Я пераадолеў свой боль і таксама глядзеў на Васіля.

Генерал зноў пачаў гаварыць. І такая перакананасць гучала ў яго ных словах, такая вера ў сілы чалавека, што адчувалася — думкі аб безнадзейнасці становішча ў Чумака паступова знікаюць, а на іх месца прыходзіць надзея і нават упэўненасць.

Нібы загад камандзіра свайму салдату, прагучалі словы генерала:

— Вам трэба яшчэ многа зрабіць у жыцці! Вельмі многа!

— Зраблю! — выдыхнуў Чумак. І яшчэ раз паўтарыў: — Зраблю, таварыш генерал!

Генерал пацалаваў салдата ў вусны.

— Да пабачэння, таварыш Чумак. Упэўнены, што яшчэ пачую пра вас і вашы справы. Да пабачэння!

— Да пабачэння, таварыш генерал! — ужо новым, з адценнем цвёрдасці і рашучасці, голасам сказаў Чумак.

Генерал устаў, паглядзеў на ўсіх нас, усміхнуўся сваёй шчырай адкрытай усмешкай.

— Жадаю ўсім вам хутчэй ачуняць!

— Дзякуем! — амаль у адзін голас адказалі мы.— А вам, таварыш генерал, жадаем поспехаў у баях. Ганіце фашыстаў да самага Берліна!

Падпалкоўнік закурыў, зацягнуўся дымам. Чуваць было, як пальцы яго рукі лёгка застукалі па метале поручняў.

— А Васіль што ж?..— нецярпліва спытаў Бурак.

— Дома. Старшынёй калгаса ў Лужках робіць. Я да яго якраз і еду ў госці. Між іншым, пазаўчора прачытаў у газеце, што яму прысвоілі званне Героя Сацыялістычнай Працы. Вось так, шаноўны Іван Сцяпанавіч!

*1973*

# АДЗІНОЧНАЯ КАМЕРА

## 1

Ён астаўся адзін. На ўсім белым свеце — адзін.

Не, вакол яго былі людзі — і ў доме, і на вуліцы, і нават у кватэры былі — жонка і дзеці: дваццацігадовы сын-студэнт і дачка-васьмікласніца. Ды сувязь з імі, зносіны з імі былі страчаны цалкам. І жонка, і дзеці, і наогул усе людзі існавалі самі па сабе, а ён — сам па сабе. Ды і ці можна было ўжо назваць існаваннем тое становішча, у якім ён апынуўся?..

Гэта здарылася чатыры з паловаю месяцы таму назад, сярод начы. Тады ён раптам прачнуўся ад дзікага, проста нясцерпнага болю ў галаве. Боль быў кароткі, як стрэл: здалося, што яму ляснулі з нечага ў галаву, і тая разлязелася на кавалкі. Павел Пятровіч закрычаў — моцна, на ўсю сілу, і вельмі здзівіўся, што не пачуў свайго голасу. Потым яшчэ больш здзівіўся з таго, што ніхто не кінуўся на дапамогу, а жонка, якая ляжала побач на ложку, нават не варухнулася. Ён хацеў быў закрычаць зноў, але боль ужо аціх, толькі ў галаве з'явілася адчуванне нейкага незразумелага, невядомага дагэтуль цяжару, які націскаў з усіх бакоў, асабліва на патыліцу. Павел Пятровіч наважыўся памацаць галаву рукою і раптам жахнуўся: рукі ў яго не было. Ён хацеў падняць другую, але і яе таксама не было. У страшэнным узрушэнні ён памкнуўся ўскочыць з ложка, але зрабіць гэта яму не ўдалося, бо і ног у яго не аказалася. І наогул не было нічога, аніводнае часцінкі цела, нібы ўсё адразу некуды знікла, прапала. І тады ён зразумеў, чаму ніхто не кінуўся яму на дапамогу, чаму жонка не азвалася на ягоны крык,— ніякага крыку і не было, бо голас таксама знік, прапаў. Яму адняло ўсё — і рухавасць, і мову.

А цяжар у галаве большаў, ён пачаў ціснуць і спераду, і дужа балюча зрабілася вачам, быццам хтосьці мерыўся выціснуць іх з вачніц. Потым здалося — нешта недзе моцна трэснула: ці то лямпачка над столлю, ці то ложак пад ім, ці то сэрца ў грудзях...

Павел Пятровіч страціў прытомнасць.

Раніцай яго адвезлі ў бальніцу.

Там адбывалася тое самае — ён то прытомнеў, то зноў ляжаў без памяці. Гэтак было некалькі дзён, і дактары нават сумняваліся, ці будзе ён жыць. Але яны рабілі ўсё, што маглі, каб ўратаваць яго, і на другі тыдзень ён перастаў траціць прытомнасць. Ён усё чуў, усё бачыў, усё разумеў, аднак ні хоць адно слова сказаць, ні зрабіць хоць які рух не мог. Ні мова, ні рухомасць так і не вярнуліся. Два месяцы ён адбыў у бальніцы. Увесь гэты страшэнна доўгі час ад яго амаль не адлучалася Настася, ягоная жонка. Дзеці навучыліся збольшага гатаваць сабе і ёй, і от яна адскочыць на якую гадзіну дамоў, каб укінуць у рот сёетое з ежы ды зрабіць што-колечы па гаспадарцы, і зноў бяжыць у бальніцу. Яна змарнела настолькі, што хоць самой кладзіся на бальнічны ложак.

Тады яна забрала яго дамоў.

Яна штодня гаварыла, што скора яму стане лепей, што ён ачуняе і ўсё будзе добра, але Павел Пятровіч ведаў, што лепей яму ўжо не стане, што ён ужо не ачуняе і добра яму ўжо ніколі не будзе.

Ён ляжаў у сваёй невялічкай кватэры на другім паверсе старога драўлянага, амаль струхлелага дома, які даўно чакаў зносу, і адно думаў, што ўжо ніколі не спусціцца ўніз, не пабачыць свету, не пачуе людзей і сам нічога не скажа ім. Ён мог гаварыць цяпер толькі сам з сабою, у думках. «Я нібы ў адзіночнай камеры,— сказаў ён сабе аднаго разу.— Як той вязень без тэрміну зняволення».

Ён ляжаў у дальнім пакоі, і ўсе дамачадцы чамусьці размаўлялі ледзь не шэптам, хадзіць стараліся таксама як найцішэй, хоць яму хацелася, каб яны рабілі якраз наадварот — гаманілі на ўвесь голас і тупалі на ўсю моц. Дзеці рэдка заходзілі да яго ў пакой, а калі і заходзілі, твары ў іх былі разгубленыя, бы вінаватыя, і трымалі яны сябе як напятыя. Жонка карміла яго, паіла, абмывала, мяняла бялізну, а ён быў як бервяно, якое дзе і як пакладзеш, так яно і ляжыць. Ён глядзеў на яе працавітыя натруджаныя

рукі, якія не ведалі ні хвіліны спачынку, і яму вой як хацелася прыпасці да іх губамі, каб хоць гэтак выказаць сваю ўдзячнасць за ўсё тое, што яна робіць для яго, але і гэтага ён зрабіць не мог. У яго быў цяпер толькі адзін сродак зносін з тымі, хто вакол яго — вочы. Але іхнюю мову не навучылася яшчэ як след разумець нават Настася, яна, напрыклад, ніяк не магла даўмецца, чаму ён так пільна глядзіць на яе рукі, і спачатку сама гэтак жа ўзіралася ў іх, а пасля пачала хаваць за спіну. Беспамылкова яна вызначала толькі два, але затое галоўныя, выразы ягоных вачэй — сцвярджэнне і адмаўленне. І яшчэ — калі ён хвалюецца або злуецца: тады зрэнкі расшыраліся, а бялкі наліваліся чырванню.

— Нічога, Паша, нічога, усё будзе добра,— не стамлялася гаварыць яна,— ты скора паздаравееш, скора станеш на свае ногі і пабяжыш, куды толькі табе захочацца, ды яшчэ і песню заспяваеш, хоць ты раней і не любіў спяваць. Я ведаю, чаму ты не любіў спяваць — ты саромеўся свайго голасу, затое цяпер ты не станеш саромецца, ты будзеш спяваць і спяваць, а я буду слухаць і цешыцца, слухаць і цешыцца.

«Трасцу я буду спяваць»,— адказваў ён Настасі вачыма, і хоць яна бачыла, як расшыраюцца ў іх зрэнкі і чырванеюць бялкі, яна гаварыла сваё далей, і голас у яе рабіўся ўсё больш мяккі і ласкавы.

— А потым мы паедзем на курорт, куды-небудзь на Чорнае мора. Мы ж з табою ні разу не былі на курорце, усё толькі рабілі і рабілі, а на адпачынак забываліся. Не, не, я праўду кажу, ты не думай, што я маню. Дактары кажуць — табе вельмі прыдасца Мацэста, гэта каля самenькага Сочы. Там вада дужа гаючая, і ты канчаткова паздаравееш.

«Трасцу я паздаравею»,— уздыхаў Павел Пятровіч і прасіў вачыма, каб яна перастала малоць гэтую сваю святую лухту, але Настася не разумела яго або рабіла толькі адзін выгляд, што не разумее, і ўсё гаварыла і гаварыла.

— А чаго б табе зараз хацелася з'есці, мой любы, мой харошы? — пыталася яна.— Можа, катлету даць, га? Не хочаш? Тады я табе дам грэцкай кашы з малаком, яна дужа карысная. Таксама не хочаш? А-а, ведаю, табе хочацца дранікаў. То я хуценька напяку іх, ты от пачакай хвіліначак колькі, а я хуценька ўпраўлюся! Гэта ж я і забы-

лася, што ты вельмі любіш дранікі. Пачакай трошачкі, я зараз!

Ніякіх дранікаў ён не хацеў. Яму раптам падумалася, што цяпер ён, бадай, з найвялікшай ахвотаю хапянуў бы паўнюткую шклянку гарэлкі, а закусіў бы селядцом з цыбуляй. Так, так, іменна шклянку гарэлкі, а на закусь — селядца з цыбуляй, вось ад чаго ён бы цяпер не адмовіўся. Зведаў бы хаця, што гэта за праява такая — гарэлка, бо ніколі ў жыцці, ніводнага разу не ўзяў у рот нічога спіртнога. Нават піва і таго не пакаштаваў. Ён яшчэ ў маладыя гады забараніў сабе спажываць тое, ад чаго людзі даходзяць да становішча, у якім апынуўся яго бацька, хранічны алкаголік: аднойчы таго знайшлі на вуліцы мёртвым.

«Так, так, цяпер мне сама што глынуць бы таго акаяннага зелля, ад якога можна, кажуць, хоць на нейкі час забыцца на ўсё на свеце. Забыцца на сваё ўбоства, хоць трошкі ўзбадзёрыць сябе і, магчыма, нават паверыць у тое, што ты і напраўдзе здатны на паездку да таго райскага Чорнага мора, у тую благаславенную Мацэсту, і што ты наогул ніякі не жывы труп, а здаравейшы за ўсіх здаравякоў, асілак з асілкаў!.. Ды Настася нізавошта не здагадаецца, чаго б я з велізарнейшай асалодаю пакаштаваў зараз, пра гэта ёй у галаву ані не прыйдзе, яна ж ніколі не бачыла ў нашай хаце гарэлкі, не ведае, што такое п'яны, або хоць бы проста падпіты, муж... Эх, мілая Настася, святы мой чалавек, ты не ведаеш не толькі гэта, але і штосьці больш важнае — з кім пражыла жыццё, хто быў побач з табою ўсе гэтыя доўгія гады!.. Нічога ты не ведаеш, і цяпер ужо не даведаешся. А меўся ж я сказаць табе ўсё. Меўся... але от адняло мне мову, і я нічога ўжо не скажу... Не здолею сказаць...»

Еў ён цяпер мала, апетыту ў яго ані не было, і калі б не Настася, ён наогул перастаў бы есці. Яна карміла яго з лыжкі і з відэльца, налягаючы найбольш на вітаміны, і яму прыходзілася вунь колькі піць усялякіх сокаў і каўтаць рознакаляровых дражэ. А тады яшчэ таблеткі, парашкі, мікстуры... А то прыходзілі сёстры і стаўлялі побач з ложкам на высокім штатыве чортаву «кропельніцу», і ён з нейкім шчымлівым пачуццём назіраў, як са шклянога слоіка крапае ў гумавую трубачку і бяжыць па ёй у яго-нае цела нейкая празрыстая вадкасць. Тады яму цокала думка, што цяпер ён увесь чыста складаецца з адных хімічных рэчываў і вітамінаў і нічога іншага ў ім ужо няма.

Сёння была пятніца, гэта ён ведаў пэўна. Спазнаваць дні ён умеў, толькі чыслаў не ведаў і пра тое, які цяпер месяц, таксама мог толькі здагадвацца. Магчыма, думаў ён, быў яшчэ ліпень, а магчыма, ужо і жнівень настаў. Дзяцей дома не было — сын з'ехаў са студэнцкай будаўнічай брыгадай у Сібір, а дачка во нядаўна пабегла з сяброўкамі ў кіно. Сказала, што, як вернецца, раскажа яму пра фільм. Ды яна і ў нядзелю гэтак гаварыла, а як прыйшла з кіно — адразу за ежу, і па абяцанне сваё забылася. А магчыма, і не забылася, а падумала, што ён забыўся, і не стала турбаваць напамінкам ні яго, ні сябе. Павел Пятровіч не крыўдаваў на яе за гэта, ён дужа любіў Галю і дараваў ёй многае,— мабыць, таму, што яна была меншая ў сям'і, а меншым дзецям заўсёды перападае больш бацькоўскіх пяшчотаў.

— Налета мы абавязкова паедзем з табою ў Мацэсту,— зноў пачала сваё Настася, папраўляючы яму падушку пад галавою.— А можа, у Цхалтубу. Праўда, там мора няма, але вада таксама, кажуць, проста цуды робіць. Мёртвых стаўляе на ногі, а не тое што...

«Гэта яна хоча, каб я падтакнуў ёй,— здагадаўся Павел Пятровіч.— Каб я таксама сказаў, што мы паедзем, што я згодзен».

І ён два разы лыпнуў вачыма: так, так, ён, вядома ж, за тое, каб паехаць, ён не пярэчыць, наадварот — галасуе «за»! Абедзвюма сваімі хімічна-вітаміннымі рукамі! Ён нават зірнуў на свае рукі — на адну і на другую, а тады ўзняў вочы ўгору.

Усміхаючыся і ківаючы галавою ў знак таго, што яна зразумела яго, Настася ўключыла тэлевізар і падалася на кухню мыць посуд. Яна часам, сама не заўважаючы гэтага, пачынала гаварыць з ім на мігі, як з глуханямым.

Якое гэта шчасце, што ёсць на свеце ні з чым не параўнаны цуд — тэлевізар! «У маёй адзіночнай камеры я без яго проста прапаў бы»,— узрушана сказаў сам сабе Павел Пятровіч.

На экране быў пісьменнік Сяргей Сяргеевіч Смірноў. Ён вёў перадачу «Апавяданні пра гераізм».

І тады раптам зрэнкі вачэй у Паўла Пятровіча імгненна расшырыліся, а бялкі наліліся чырванню... «Не, не! — закрычаў ён усімі звілінамі мазгоў.— Гэтага я не хачу бачыць, не хачу чуць! Не хачу!..»

Ён моцна заплюшчыў вочы. Але заткнуць вушы не мог. І словы з перадачы біліся ў барабанныя перапонкі, і тым было вельмі балюча, нясцерпна балюча. «Выключы яго, Настася, выключы гэты праклята тэлевізар! Я не хачу нічога бачыць, нічога чуць! Выключы, мілая Настася! Бо я звар'яцею, калі ты не выключыш!..»

Тэлевізар і напраўдзе аціх. Павел Пятровіч спачатку здзівіўся, чаму так сталася, а тады падумаў: гэта нечага вярнулася Настася і, убачыўшы, што ў яго заплюшчаны вочы, рашыла, што ён заснуў. І выключыла тэлевізар. Дзякуй жа табе, родная Настася! Тысячу разоў дзякуй!

Ён не расплюшчваў вачэй. Каб супакоіцца і пазбыцца цяжкіх думак, пачаў лічыць. Адзін, два, тры, чатыры...

— Паша, ты спіш? — пачуў ён раптам Настасін голас.— Прачніся, калі ласка. Пагляндзі, хто да цябе завітаў.

Настася яшчэ была каля тэлевізара, у левым кутку, а направа, у дзвярах, стаяў высокі хударлявы мужчына з гладка паголенай галавой, у пакамячаным гарнітуры — светла-сінія штаны і шэрая клятчастая куртка з сінтэтыкі,— які надаваў незнаёмаму выгляд падарожніка. «Нібы турыст нейкі,— зазначыў Павел Пятровіч.— Але хто гэта, хто такі? І навошта я яму спатрэбіўся?..»

— Здарова, Паша! — ненатуральна гучна, як да глухога, загаварыў тым часам незнаёмы.— Не пазнаеш? Ну вядома ж, не пазнаеш! Я і сам цябе не пазнаў бы, каб сустрэў дзе на вуліцы. Гэта ж колькі гадкоў не бачыліся? Лічы, ажно трыццаць, во колькі! Дык што ж тут дзіўнага, што ты не пазнаў мяне. Нічога дзіўнага няма. Праўда, Настася Філімонаўна?

— Вы сядайце, сядайце,— сказала Настася, паказваючы мужчыну на крэсла, што стаяла непадалёк ад ложка.

— Дзякую, гаспадынька. Наш народ даўно прыкмеціў, што ў нагах справядлівасці няма.

— У нагах праўды няма, так кажуць,— заўважыла Настася.

— Ага, точна, точна, дзякую вам. Хоць расседжвацца я не збіраюся. Справы, ці ведаеце, справы. У наш атамна-касмічны век чалавеку ні на што не хапае часу, нават на тое, каб пасядзець са старым другам, пагаманіць, паўспамінаць. Але хто б мог падумаць, што з Паўлам такое здзеецца! Што — ён і не чуе нічога?

— Чаму ж, Паша чуе добра, вельмі добра, усё чыста чуе.

— Га, тады гэта іншая справа,— ужо цішэй сказаў чалавек і нерасмыкнуў плячыма.— То ты ж малайчына, Паша, яй-богу, малайчына! Тады я адкрыюся табе, бо бачу, што ты мяне дагэтуль так і не пазнаў. Ведаеш, хто я? Васька Котавіч, вось я хто. Змікіціў?

Настася бачыла, як паступова пачалі расшырацца зрэнкі і ружавець бялкі вачэй у мужа. «Хвалюецца,— падумала яна.— Ды як жа не хвалявацца, калі такая сустрэча, такая неспадзеўка!..»

— Успомніў? Пачакай, я табе яшчэ сёе-тое нагадаю. Адзін год... Здаецца, гэта было ў восьмым класе... не, у дзевятым, мы той год ігралі з табой у самадзейнасці, помніш? Ставілі «Рэвізора» Мікалая Васільевіча Гогаля. Я быў за гараднічага, а ты за Хлестакова. А можа, гэта было ў дзесятым класе? Ну, канечне ж, у дзесятым! Ты тады здорава іграў гэтага самага Хлестакова!

— Вы штосьці блытаеце,— мякка сказала Настася і прысела на мужаў ложак, ля яго ног.

— Блытаю? Хм, хм...— Мужчына пільна зірнуў на Настасю, на Паўла Пятровіча, тады ўзняў вочы ў столь.— Відаць, і праўда блытаю. Старэчы, ведаеце, склероз, ха-ха-ха... Точна, Настася Філімонаўна, точна: мы з Пашам пасля сёмага класа больш і не бачыліся, дарогі нашы разышліся. Як гэта спявалася ў нашай даўняй песні, яшчэ ў грамадзянскую вайну? «Дан приказ ему на запад, ей в другую сторону...» Эх, бягуць гадкі, Настася Філімонаўна, бягуць... Не паспееш азірнуцца — а ўжо і стары, а там...— Ён шумна ўздыхнуў, палез рукою ў кішэню штаноў, выняў бялюткую насоўку, развінуў яе, працёр вочы, потым зноў акуратна склаў у чатыры столкі і гэтак жа акуратна засунуў у тую самую кішэню. І яшчэ раз шумна ўздыхнуў.

«Дзіўна,— думала Настася,— ён выглядае значна маладзей за Паўла. Яму нізавошта не дасі сорак восем гадоў. Ну ад сілы сорак. А то дык і сорак не дасі. Калі б не сказаў, што ён вучыўся разам з Пашам, я б падумала, што яму гадоў трыццаць пяць, ну, можа, трыццаць сем, не больш...»

— А я спярша не паверыў, што ты хворы,— зноў пачаў гаварыць чалавек да Паўла Пятровіча.— Жонка твая кажа — няможна да яго, ён у цяжкім стане, а я думаю сабе: эге, гэта яна не хоча, каб пабачыліся старыя дружбакі, бо пойдуць успаміны, а дзе ўспаміны — там і чарка, а

жонкі ж дужа не любяць, калі іхнія мужы заліваюць за каўнер.

— За гальштук,— зноў машынальна направіла яго Настася.— Але гэтага я якраз не баюся. Павел у мяне непітушчы.

— Няўжо? Тады вам дужа пашанцавала... Вось я і кажу. Не паверыў я, значыцца, тваёй жонцы. Маніць яна мне, думаю. Трэба будзе, думаю, у што б там ні было прарвацца. І прарваўся. Ажно бачу — праўда... А жонка ў цябе слаўная. Дзе ты такую ўхапіў?

— А мы тут і ажаніліся, у гэтым горадзе,— сказала Настася.— Павел як дэмабілізаваўся пасля вайны, прыехаў сюды, паступіў на наш завод. Мы і пазнаёміліся. Праз два гады згулялі вяселле.

— І дзеці ў вас ёсць?

— Двое. Сын і дачка.

— Вялікія?

— Сын у педінстытуце вучыцца, а дачка сёлета ў восьмы клас пойдзе.

— А што ж я іх не бачу? Дзе яны?

Настася пачала расказваць. Мужчына слухаў уважліва і нібы нават зацікаўлена.

Павел Пятровіч не зводзіў вачэй з мужчыны. Не моргаючы, ён прыглядаўся да яго твару, да адзежы, да рук. Найбольш ён узіраўся ў ягоныя вочы — светла-шэрыя, крыху звужаныя, з выразам надзвычайнай самаўпэўненасці і нават пагарды да субяседнікаў.

Гэтага чалавека ён не ведаў. Не бачыў яго дагэтуль ніколі. Не страчаўся з ім ні разу нават выпадкова.

Так — не страчаўся. Не бачыў. Не ведаў.

Затое заўсёды ведаў другое: ён прыйдзе. Павінен прыйсці. І чакаў яго. Чакаў даўно — усе гэтыя доўгія пасляваенныя гады.

І вось ён прыйшоў...

«Як гэта ён сказаў? Васька Котавіч? Котавіч... Ад слова, значыцца, кот... Не, ты не кот, ты звер куды больш страшны!»

## 2

Горадам Паўлавага маленства быў амаль ужо забыты ім цяпер Новасібірск. Там ён рабіў першыя крокі па зямлі, там сказаў першае слова, там прачытаў першую

кнігу. Але яшчэ да таго, як ён навучыўся чытаць і пісаць, ён ужо ўмеў трымаць у руках напільнік і ведаў, як карыстацца дрылем. І так атрымалася, што ён паступова прыкіпеў усёй душою да машын і наогул да тэхнікі. Атрымалася гэта, вядома, не само па сабе, а праз тое, што бацька ягоны быў інжынерам-машынабудаўнікам і часта расказваў сыну пра сваю працу, і не толькі расказваў, але і на свой завод вадзіў, дзе ўсё паказваў і тлумачыў.

Любімымі яго прадметамі былі фізіка, хімія і матэматыка. Ён чытаў многа тэхнічнай літаратуры — у бацькі была даволі багатая бібліятэка, у якой поруч з кнігамі на рускай мове стаялі тамы і на іншых мовах. Каб уведаць, што там у іх ёсць цікавага, Павел узяўся грунтоўна вывучаць замежныя мовы. У восьмым класе ён ужо свабодна чытаў і гаварыў па-нямецку і па-англійску, здзіўляючы гэтым сваіх аднакласнікаў і нават настаўнікаў,— тады, да вайны, не надта пяліся вывучаць мовы другіх народаў.

Бацька быў таленавітым інжынерам і добрай душы чалавекам, але па натуры слабавольным і бесхарактарным. Неяк так сталася, што ён прыахвоціўся да гарэлкі і ўсё часцей стаў прыходзіць дамоў п'яны.

Скончылася гэта трагічна. Калі Павел перайшоў у дзевяты клас, бацькі ў яго не стала.

Маці і раней часта хварэла — у яе было штосьці з сэрцам — а пасля гэтага ёй зусім стала блага. Дактары параілі ёй перамяніць клімат, ды яна і сама хацела з'ехаць куды-небудзь з горада, дзе страціла мужа, якога вельмі любіла. У адным з паўднёвых гарадоў жыла яе старэйшая сястра, от маці з Паўлам і падалася да яе. У саракавым годзе Павел скончыў дзесяцігодку. Ён марыў аб тэхнічным інстытуце, не ўяўляў сваёй будучыні без інжынернай дзейнасці. Але, як кажуць, бяда не ходзіць адна. Матчына сястра — яна была незамужняя — спяшаючыся аднаго разу на работу, трапіла пад трамвай і асталася без ног. На Паўлавы плечы лёг увесь цяжар клопату аб дзвюх хворых жанчынах. Ён пайшоў працаваць на суднарамонтны завод — спачатку вучнем токара, але хутка стаў токарам, а потым і фрэзероўшчыкам. Асвоіў ён таксама даўбежны і стругальны станкі, не кажучы ўжо аб свідравальным. Прапанаваў некалькі рацыяналізацый. Перад самай вайной яго, васемнаццацігадовага юнака, прызначылі майстрам цэха.

Эвакуіравацца разам з заводам Павел не здолеў — не было як пакінуць бездапаможных маці і цётку.

Пацягнуліся чорныя дні акупацыі.

Першы час яны жылі з таго, што ўдавалася Паўлу выменяць у навакольных станіцах. Спачатку пайшлі на абмен цётчыны туфлі, сукенкі, паліто, потым матчыны рэчы. А як не стала чаго несці з дому, Павел надаўся шукаць якое работы. Яго ўзялі ў дэпо змазчыкам.

Аднак трэба было дбаць не толькі пра жывот, але і пра тое, каб у хаце было хоць трошкі цёпла. Палілі мэблю, кнігі. Потым Павел пачаў па начах цягаць з дэпо вугаль — балазе яны жылі непадалёк. Гэта было вельмі рызыкоўна, але іншага выйсця Павел не бачыў. І аднаго разу яго затрымаў патруль. Паўла прывялі ў камендатуру. Дзяжурны афіцэр пачаў допыт — хто такі, адкуль, дзе ўзяў вугаль. Каб афіцэр лепей зразумеў яго тлумачэнні, якія ён прыдумаў па дарозе, Павел пачаў гаварыць па-нямецку.

— О, — здзівіўся афіцэр.— Ты ведаеш нямецкую мову? То, можа, ты немец?

Павел адказаў, што ён не немец, а мову вывучаў у школе.

— Усе рускія вывучалі ў школе нямецкую мову, і ніхто яе не ведае,— зарагатаў афіцэр.— Рускім удаецца завучыць толькі «гутэн таг» і «аўхвідэрзэен». На большае яны не здатны.

Павел чамусьці рашыў пахваліцца і сказаў, што акрамя нямецкай ведае яшчэ і англійскую мову.

— О! — зноў здзівіўся афіцэр.— Няўжо ў рускіх школах адначасова вывучаюць дзве замежныя мовы?

Не, сказаў Павел, ён займаўся самастойна. А наогул ён ніякі не злодзей, ён рабочы чалавек, гэта можна праверыць, а вугаль купіў у нейкага старога на рынку, а што ідзе позна дамоў, дык на гэта ёсць прычыны...

Афіцэр перапыніў яго і спытаў:

— А навошта табе спатрэбілася вывучаць аж дзве замежныя мовы? Можа, для таго, каб паслужыць, калі прыйдзе час, вялікай Германіі? Або, наадварот, для таго, каб больш эфектыўна шкодзіць ёй? Адказвай, толькі кажы праўду.

Павел пабляднеў і не знайшоў, што сказаць.

— Раніцай я далажу аб табе пану каменданту,— скончыў гаворку афіцэр.— А цяпер — у камеру.

Усю ноч Павел прадрыжаў у камеры, і не столькі ад холаду, хоць холад быў сабачы, колькі ад страху, што яго расстраляюць або павесяць за крадзеж. Паклікалі яго толькі ўдзень, гадзін у дванаццаць. Камендантам быў высокі і хударлявы немец у пенснэ. Зноў пачаліся роспыты — хто, адкуль, дзе ўзяў вугаль. Задаваў камендант і іншыя пытанні, якія не мелі ніякага дачынення да асобы Паўла і да праклятага вугалю, і Павел толькі пасля зразумеў, што гэтыя пытанні маюць на мэце адно — праверыць яго веданне нямецкай мовы.

Пасля камендант сказаў сваім ціхім, спакойным і нават лагодна-ветлівым голасам:

— Вы зрабілі злачынства супраць Германіі, супраць фюрэра. Вы паквапіліся на маёмасць, якая належыць нямецкай нацыі, і павінны несці за гэта адказнасць. Мы вымушаны вас павесіць. Так, павесіць. І мы зробім гэта на вачах у вашых блізкіх, на вачах усяго горада, каб нікому не было панадна абкрадаць нямецкі народ, нямецкую армію, якая выконвае сваю вялікую свяшчэнную місію.— Ён зрабіў паўзу, зняў і працёр пенснэ, зноў асядлаў імі гарбаты нос, потым гаварыў далей.— Але мы, немцы, гуманныя, мы зусім не такія, якімі малююць нас бальшавікі. Дарэчы, вы не бальшавік, не?

— Не... — выціснуў з сябе Павел.

— І ў камсамоле не былі?

— Не...

Гэта была праўда, Павел не ўступіў у свой час у камсамол, калі ўступалі яго аднагодкі, ён падумаў тады, што сходы і розныя нагрузкі возьмуць у яго шмат часу, які так патрэбен хворым маці і цётцы.

— Я веру вам. І магу пахадайнічаць за вас, улічваючы, што ў вас на руках дзве бездапаможныя жанчыны, якія без вас загінуць. Дарэчы, што ў вашай маці?

«Выходзіць, яны ўсё ведаюць, усё праверылі. Паспелі, выходзіць, схадзіць дамоў, а мо нават і ў дэпо».

— Сэрца...

— А-а, сэрца. З сэрцам жарты дрэнныя. Яно, вядома, не вытрымае, калі маці пабачыць, як будуць вешаць яе адзінага сына. Дык вось, мы можам даць вам магчымасць скупіць сваю віну, ўратаваць маці і цётку. Вы ж іх любіце, ці не праўда?

— Што я павінен зрабіць? — ціха спытаў Павел.

— Вы павінны сумленна і шчыра служыць вялікай

Германіі. Мне патрэбен перакладчык. Вы згодны стаць маім перакладчыкам?

«Ён патрабуе не так ужо і многа,— узрадаваўся Павел.— Падумаеш — перакладчык. Звычайная работа».

Так ён апынуўся на новай службе. І не надаў асаблівага значэння паперы, якую яму далі падпісаць у той жа дзень. «Простая фармальнасць,— сказаў ён сам сабе.— Звычайнае нямецкае імкненне да парадку і пунктуальнасці». Дома ён, вядома, нічога не сказаў аб перамене ў сваім службовым становішчы, а тое, што ён пачаў хадзіць на работу ў чыстым, вытлумачыў тым, што яго перавялі ў кантору. Ён, маўляў, цяпер учотчык.

Суседзі адразу перасталі хадзіць да іх, і гэта дужа здзіўляла маці. Яе здзіўляла і тое, што Павел стаў часцяком затрымлівацца на рабоце, і тады да іх прыходзіў нямецкі салдат і паліў у печы,— вугалю ў іх цяпер хапала. Паўлу даводзілася шукаць хоць трошкі падобныя на праўду тлумачэнні. Ды ён бачыў — маці не верыць гэтым ягоным тлумачэнням.

Між тым у Паўла з'явіліся новыя абавязкі. Яго пачалі клікаць у гестапа, каб ён прысутнічаў на допытах, таксама ў якасці перакладчыка... Адбываліся допыты часцей за ўсё ноччу...

Ніколі, ніколі не забыць яму тых допытаў!.. І паглядаў, якія кідалі на яго зняволеныя — падпольшчыкі, партызаны, а то і проста ні ў чым не вінаватыя, але сумленныя савецкія людзі,— не забыць ніколі!.. Да скону дзён сваіх.

У студзені сорак трэцяга памерла маці. А праз два тыдні ён адвёз на могілкі і цётку.

І астаўся зусім адзін.

Цяпер нішто ўжо не трымала Паўла на ягонай акаяннай службе. Ён мог уцячы, знікнуць, тым больш што зрабіць гэта было няцяжка — у яго быў пропуск, які дазваляў яму хадзіць па горадзе ў любы час дня і ночы. Але...

Ён атрымаў у спадчыну ад бацькі нямала добрых якасцей — прагу да ведаў, працавітасць, інтэлігентнасць, сціпласць і шмат яшчэ чаго. Але атрымаў ён і другое — бесхарактарнасць, слабавольнасць. Яны, гэтыя апошнія якасці, аказаліся тады рашаючымі. Ён не ўцёк, не знік. Ён па-ранейшаму хадзіў па сваю сабачую службу, кожны дзень адно праклінаючы сябе за гэта.

Камендант Рудольф Пільц быў здаволены ім і не раз гаварыў яму пра гэта. Павел стрымана дзякаваў.

А савецкія войскі, ведучы кровапралітныя баі, няўпынна прасоўваліся на захад. У нямецкіх зводках усё часцей гаварылася аб «планамерным скарачэнні лініі фронту». Па ўсім адчувалася, што баі ідуць недалёка ад іхняга горада.

У пачатку лютага сорак трэцяга года, нешта чысла трэцяга ці чацвёртага, пад вечар, Рудольф Пільц запрасіў Паўла ў свой кабінет. Яны былі толькі ўдвух. Пільц узяў дзверы на ключ, выняў з шафы і паставіў на круглы філіграннае работы столік каля канапы пляшку французскага каньяку і дзве маленькія чарачкі. Рабіў ён гэта моўчкі і з нейкім нібы таямнічым выглядам. Тады зусім нечакана загаварыў па-руску.

— Сядайце, Павел Пятровіч, і адчувайце сябе як дома.

— Вы ведаеце рускую мову? — паглядзеў Павел.

— І англійскую, і французскую,— самаздаволена сказаў Пільц.— Разведчыку веданне моў гэтак жа неабходна, як доктару — уменне беспамылкова ставіць дыягназ. Я маю на ўвазе добрага доктара, а не проста лекара.

— Хіба вы разведчык, пан камендант?

— Не задавайце лішніх пытанняў. Дасюль я якраз за тое і цаніў вас, што вы не задавалі лішніх пытанняў. І што дакладна адказвалі на пытанні, якія задаюць вам. І што старанна выконвалі загады і просьбы, з якімі звяртаюцца да вас. Дык вось, сядайце, калі вас запрашаюць сесці. Бо як гэта кажуць рускія? У нагах справядлівасці няма, так?

Пільц наліў каньяк у чарачкі. Павел прысеў на краёчак канапы, па другі бок століка.

— Прапаную выпіць, Павел Пятровіч. Па адзінай, як кажуць рускія ў такіх выпадках.

— Я не п'ю, пан камендант. Ніколі не піў.

— Ведаю. Але, можа, хоць раз у жыцці пакаштуеце? Каньяк, між тым іншым, з лепшых сховішчаў Францыі.

— Калі дазволіце, я хацеў бы ўстрымацца.

— Чорт з вамі, можаце не піць. Дарэчы, гэтая ваша рыса мне таксама падабаецца. А я от не магу адмовіць сабе ў асалодзе перакуліць чарку добрага каньяку. І нічога, акрамя каньяку, не ўжываю. Можа, вы чулі, што Чэр-

чыль п'е таксама толькі каньяк? Праўда, ён жлукціць яго конскімі дозамі. Што ж, кожнаму сваё. Ваша здароўе!

Маленькімі глыточкамі, смакуючы, Пільц выпіў сваю чарачку, асцярожна паставіў яе на ранейшае месца.

— Вы хочаце спытаць, адкуль я ведаю рускую мову? Вывучыць яе памаглі мне вы самі, рускія. Так, так, не здзіўляйцеся. Яшчэ зусім нядаўна, перад паходам Германіі на ўсход, я працаваў на адным маскоўскім заводзе. Як я туды трапіў? Эмігрыраваў з Германіі ў Савецкую Расію, як антыфашыст, даўно эмігрыраваў, як толькі на чале дзяржавы і народа стаў Адольф Гітлер.

Пільцу зрабілася горача, ён расчырванеўся. Чамусьці пільна зірнуўшы на Паўла, ён расшпіліў каўнер і сказаў:

— А цяпер, каб не кульгаць, трэба на другой.— Ён зноў паліў сабе і выпіў — такімі самымі маленькімі глыточкамі — усё з чаркі да апошняй кроплі.— Я нават меў білет члена кампартыі. Асабіста ведаў Тэльмана. Нябога, ён цяпер...— Пільц кашлянуў.— Кожнаму сваё.

Павел сядзеў на той самай канапе, на якой сядзеў і Пільц, толькі з другога краю. Сядзеў як на гарачым вуголлі, адчуваючы амаль фізічны боль і баючыся нават паварушыцца, бо тады гэты боль, здавалася, стане нясцерпным. «Задушыць бы яго, гада печанага! — пранеслася думка ў галаве.— Схапіць за горла і задушыць!.. Але ж я нават і дацягнуцца да яго не паспею, як ён стрэліць у мяне. Вунь і кабура ў яго расшпіленая, і сам ён увесь час напагатове, хоць выгляду не паказвае. Хітрая лісіца. Аднак, што яму яшчэ ад мяне трэба?..»

— У вас не абы-якая галава, і вы, вядома, разумееце, што той мой антыфашызм — камуфляж,— тым часам гаварыў далей Пільц.— Так, я разведчык. Усё сваё свядомае жыццё быў разведчыкам. А тое, што я зараз у ролі каменданта — гэта вымушаная неабходнасць. І да таго ж — часовая. Я атрымаў загад і заўтра еду ў Берлін, каб зноў вярнуцца ў разведку.

Пра тое, што Пільц паедзе ў Берлін, Павел ужо чуў краем вуха. Афіцэры камендатуры яшчэ ўчора гаварылі між сабою пра гэта. Але ніхто з іх і слова не сказаў, куды іменна і чаго ён паедзе. Проста гаварылі, што гер камендант пойдзе цяпер угору. Відаць, ніхто з іх нічога не ведаў. «Каб ты не даехаў туды, куды ты паедзеш,— пажадаў яму ў думках Павел.— Каб з табою ў дарозе якая бяда здарылася, каб цябе трасца якая ўзяла, каб ты...»

Пільц устаў і пачаў хадзіць па кабінеце. Павел памкнуўся быў таксама ўзняцца, але Пільц жэстам паказаў яму, каб ён сядзеў на месцы. Закурыўшы цыгарэту і зрабіўшы некалькі зацяжак, Пільц пачаў гаварыць зноў.

— У вас на языку круціцца пытанне... не, калі гаварыць больш правільна, гэтае пытанне круціцца ў вас у галаве, яно проста свідруе вашы мазгі. «Чаму,— думаеце вы,— ён такі адкрыты са мною, што гэта з ім раптам здарылася?» Ахвотна адкажу вам.— Пільц прыпыніўся перад Паўлам, выразна сказаў: — Нічога асаблівага не здарылася, тым больш — раптам. Проста, шаноўны Павел Пятровіч, вы — таксама разведчык.

— Я?.. — пабляднеў Павел.

— Вы. Так, так — вы! Наш разведчык. Мой! — Пільц зноў пачаў пахаджаць па пакоі.— Вы, вядома, памятаеце тую паперку, якую падпісалі, калі пачыналі працаваць у мяне. Я мушу ўдакладніць адну акалічнасць. Тэкст быў надрукаваны на машынцы, памятаеце? Там гаварылася, што вы добраахвотна — заўважце, добраахвотна! — даеце згоду служыць вялікай Германіі ў якасці перакладчыка камендатуры. І далей ішоў ваш подпіс. Але вы, магчыма, не звярнулі ўвагі на тое, што паміж тэкстам і вашым подпісам аставалася яшчэ пустое месца. І кропка ў канцы пастаўлена не была. Дык вось, пасля таго, як вы падпісалі дакумент, на ім з'явіўся дадатковы тэкст. На той жа самай машынцы было надрукавана яшчэ колькі слоў. Па-першае, пасля слова «камендатуры» з'явілася — «і гестапа». Значыць, вынікае, што вы добраахвотна далі згоду працаваць перакладчыкам камендатуры і гестапа. А гэта ўжо, згадзіцеся, істотна мяняе справу. І галоўным чынам у вачах вашых суайчыннікаў, вядома. Па-другое, і гэта самае галоўнае, вы давалі згоду працаваць таксама і на нашу разведку. І кляліся служыць верай і праўдай.

У Паўла закружылася ў галаве, усё паплыло перад вачыма. Каб не зваліцца з канапы, ён схапіўся рукамі за столік. Заўважыўшы яго стан, Пільц падышоў і патрос Паўла за плечы.

— Можа, усё ж возьмеце каньяку? Усё як рукой зыдыме. Не хочаце? Тады выпіце вады.— Пільц узяў на сваім пісьмовым стале шклянку, наліў з графіна вады, даў Паўлу. Павел прагна пачаў піць, але рукі дрыжалі, і ва-

да вылівалася цераз край, цякла па падбародку і па шыі за каўнер, лілася на калені. Аддаўшы шклянку Пільцу, Павел выцер збольшага рукавом пінжака твар і шыю, абтрос штаны. І ашклянелымі вачыма ўтаропіўся на Пільца.

Закурыўшы новую цыгарэту, Пільц гаварыў:

— Вы можаце сказаць, што гэта шантаж. Правільна, шантаж. Але майце на ўвазе, што ўсе разведкі ўсіх краін ва ўсе часы карысталіся шантажом як самым верным сродкам вярбоўкі сваіх агентаў. У сіло шантажу траплялі і не такія галовы, як ваша. Я мог бы прачытаць вам цэлы трактат на гэту тэму, зрабіўшы экскурс у вельмі далёкае і ў больш блізкае мінулае, ды часу ў мяне, на вялікі жаль, няма. Вы павінны самі ўсё ўзважыць і прыняць адзіна правільнае рашэнне. Дарэчы, дзе ваш пропуск? Дайце яго сюды.

Павел машынальна выцягнуў пропуск з кішэні і аддаў яго Пільцу. Той развінуў яго, паглядзеў на фота.

— Пропуск мы таксама далучым да вашага дасье, дзе ёсць ужо адпаведныя характарыстыкі і іншыя матэрыялы, у тым ліку і адбіткі вашых пальцаў.— Ён усміхнуўся.— А фота ваша тут вельмі ўдалае, вы тут як выліты. Майстар ведаў сваю справу. Між іншым, у нас ёсць і другія вашы фота. Вы ў сёмым класе. Вы з мамай, калі вам споўнілася васемнаццаць. Вы на фоне станкоў — гэта калі вы рабілі фрэзероўшчыкам. Ну і яшчэ сякія-такія, не буду ўсе пералічаць. Той салдат, што прыходзіў да вас дамоў паліць у печы, калі вы затрымліваліся на службе, не траціў дарма час. Тым больш што вы не хавалі вашага сямейнага альбома, ваша мама нават сама паказвала яго салдату. А рабіць копіі са здымкаў ён умеў выдатна.

Пільц сеў за пісьмовы стол, пагартаў нейкія паперы. Пасля ўзяў тэлефонную трубку, але перадумаў і паклаў яе на месца. Нейкі час маўчаў, потым загаварыў нібы сам з сабою.

— Гэту вайну мы прайгралі. Не, рускія нас яшчэ не разбілі, да канца яшчэ далёка, мы будзем змагацца да апошняга салдата, але... Бліцкрыг не ўдаўся, а на працяглую вайну мы не разлічвалі і не былі гатовы да яе... Так, гэту вайну мы прайгралі. І мы вымушаны рыхтавацца да новай. Мы пачалі ўжо рыхтавацца. Рыхтавацца да

нашага апошняга крыжовага паходу, які прынясе нарэшце шчасце і працвітанне нямецкай нацыі. І той, хто будзе памагаць нам, не астанецца пакрыўджаным, майце гэта на ўвазе. Мы, немцы, умеем быць шчодрымі да нашых сяброў. Але мы ўмеем быць і бязлітаснымі да адступнікаў.

Пільц зноў сеў на канапу. Дзіўна, але ён нават не спытаў у Паула, ці згодзен той працаваць на немцаў надалей. Выходзіць, ён быў проста ўпэўнены, што Павел не адмовіцца.

— Вось вам новы дакумент, вельмі надзейны для прад'яўлення вашым органам улады. Так, так, вы скора сустрэнецеся са сваімі суайчыннікамі ва ўмовах, дзе ўжо не будзе нас, немцаў. Ні вашага прозвішча, ні імя мы не мянялі, так будзе лепей. А вось у гэтым пакеце — грошы. Трошкі нашых марак, іх вам хопіць на першы час. Астатняе — савецкія. Іх тут многа, перакапаецеся самі. Не турбуйцеся, яны не фальшывыя. Нам не было патрэбы рабіць фальшывыя грошы, мы ж столькі захапілі ў свой час вашых банкаў!.. Заўтра вы павінны знікнуць з горада, бо праз тры дні нашы войскі пакінуць яго. Самі разумееце, што заставацца вам тут небяспечна, вас адразу выдадуць і вы будзеце несці адказнасць па ўсёй строгасці вашых законаў. Таму заўтра наша машына даставіць вас у суседні горад, у Заполле. Машына пакіне вас, не даязджаючы двух кіламетраў да горада. Далей вы пойдзеце пешка. Вось гэтая паперка,— Пільц працягнуў Паўлу яшчэ нейкі дакумент,— дасць вам магчымасць без усякіх прыгод увайсці ў горад, ніхто вас не затрымае. У Заполлі вы павінны стаць дзе-небудзь на кватэру і чакаць прыходу бальшавікоў. Па маіх разліках гэта адбудзецца дзён праз дзесяць, сама болей праз дванаццаць. Тады вы знішчыце гэтую паперку і пры першай жа магчымасці з'едзеце з Заполля. І любымі сродкамі, любой цаною дабярыцеся да горада Кірава. Чулі пра такі горад? Раней ён называўся Вятка. Запомніце, як след запомніце: Кіраў, былая Вятка. Уладкуйцеся там на работу, на любую, якая вам па душы. І жывіце сабе ціха і спакойна. Пастарайцеся забыцца на ўсе непрыемнасці, якія былі ў вашым жыцці. Цудоўную перспектыву я вам прапаную, ці не праўда?

Пільна зірнуўшы на Паўла, Пільц далей ужо гаварыў па-нямецку.

— А ў свой час да вас прыйдзе чалавек. Магчыма, гэта здарыцца праз пяць год, магчыма, праз дзесяць, а мо і праз дваццаць. Але ён прыйдзе, абавязкова прыйдзе. І скажа вам, што рабіць далей. Хутчэй за ўсё, ён загадае вам пераехаць у іншае месца, туды, дзе вы зможаце прынесці найбольш карысці. Вядома, спачатку ён перадасць вам прывітанне ад мяне. Толькі не ўздумайце тады зрабіць выгляд, што ніякага Рудольфа Пільца вы не ведаеце. Бо ў такім выпадку ваша дасье адразу апынецца ў органах савецкай бяспекі, а гэта будзе каштаваць вам... вы самі ведаеце...

Ад лагоднага Пільцавага голасу не асталося і звання. Цяпер ён гаварыў жорстка, уладна.

— Я не выключаю і такой сітуацыі, што ў Заполлі, як толькі прыйдуць бальшавікі, вас мабілізуюць у армію. Што ж, тады маліцеся богу, каб ён пакінуў вас жывым. Няхай хоць калекам, але жывым. У якасці інваліда вайны вы будзеце мець для нас яшчэ большую каштоўнасць. Маліцеся, Павел Пятровіч, маліцеся і ўдзень і ўначы. Хаця вы ж чалавек няверуючы. У такім разе за вас буду маліцца я. І, спадзяюся, бог пачуе маю малітву. А як дэмабілізуецеся, неадкладна афармляйце праязны літар у Кіраў. Толькі ў Кіраў! Вы зразумелі мяне?

Цяпер Павел пасмялеў. І здолеў адказаць на запытанне Рудольфа Пільца даволі цвёрдым голасам:

— Зразумеў, пан камендант.

— Я рады за вас. Як гэта кажуць рускія? Бог звязаў нас адною вяровачкай, так? — Пільц пацягнуўся да бутэлькі з каньяком.— А яшчэ рускія сцвярджаюць, што бог любіць тройцу. Я ж выпіў толькі дзве чаркі. Я п'ю трэцюю за вашу ўдачу!

Ён адным глытком спаражніў чарку.

Назаўтра раніцай да дома, дзе жыў Павел, пад'ышла закрытая машына. З яе выскачыла некалькі гестапаўцаў. Двое накіраваліся ў дом, астатнія абкружылі яго. Неўзабаве Паўла вывелі на вуліцу і штурханулі ў машыну.

«Гэтую дэманстрацыю,— падумаў Павел,— Пільц зрабіў для суседзяў. Каб тыя лічылі, што мяне схапіла гестапа. Разлік дакладны».

Пакруціўшыся па вуліцах, машына выскачыла за горад і ўзяла кірунак на Заполле.

Далей усё было так, як і гаварыў Пільц.

Амаль што так.

У Заполле Павел прыйшоў нешта гадзіны ў тры. Яго папраўдзе ніхто не затрымаў, хаця яму тройчы давялося прад'яўляць дакументы. Пад вечар Паўлу ўдалося стаць на кватэру да адпае старое жанчыны.

На адзінаццаты дзень немцы ўцяклі з Заполля. У горад уварваліся савецкія танкі. Як і раіў Пільц, Павел перш за ўсё спаліў тую ягоную паперку, пры адным позірку па якую немцы старанна казыралі яму. А яшчэ Павел пазбавіўся пакунка, дзе былі грошы. Спачатку ён хацеў і грошы спаліць, але перадумаў і «забыўся» іх у жанчыны, што дала яму прытулак. А сам пайшоў прасіцца, каб яго ўзялі ў армію.

«Не, гер Рудольф Пільц, болей мы не стрэнемся,— зларадна думаў Павел, адзяваючы форму савецкага салдата.— Я кроўю змыю сваю ганьбу. А на тым свеце ты мяне не знойдзеш. Ты і шукаць мяне там не будзеш».

Ды, мабыць, Рудольф Пільц і папраўдзе маліўся за Паўла, бо Павел дайшоў да самага Берліна і застаўся жывым. Ён нават паранены не быў, хоць кулям не кланяўся і ад снарадаў ды бомбаў не ўцякаў на злом галавы. Ён рабіў на вайне тое ж, што і ўсе, і от жа ж неяк уцалеў, хоць у яго на вачах загінула столькі людзей, што і палічыць было немагчыма. Толькі аднаго разу яго кантузіла, і ён колькі тыдняў праваляўся ў шпіталі. Ды ад тае кантузіі потым і знаку не асталося, прынамсі, звонку.

Ні ў які Кіраў, былую Вятку, ён пасля дэмабілізацыі не паехаў. У яго быў цяпер адзін клопат — куды б гэта зашыцца як найдалей. Спачатку падумаў падацца ў Сярэднюю Азію. Самарканд, Бухара, Фергана... Гэтыя вядомыя яшчэ са школьных падручнікаў старадаўнія з адценнем таямнічасці назвы амаль увесь час, пакуль чакаў дэмабілізацыі, не выходзілі з галавы і нават у сне сніліся. Потым ён падслухаў неяк гаворку двух сержантаў, якія збіраліся ехаць на свой Далёкі Усход, і пачаў трызніць Хабараўскам, Уладзівастокам, бухтай Залаты Рог... Але, разважыўшы, прыйшоў да вываду, што ні на Далёкі Усход, ні ў Сярэднюю Азію кіравацца яму не варта. Бо якраз туды і папрастуюць цяпер усе тыя, каму ёсць што хаваць ад людскога вока — хоць чужога, хоць свайго. І Павел вырашыў паляжыцца на волю лёсу. А лёс у дадзеным выпадку аказаўся ў асобе старшыны Нічыпара Блазнюка, родам з Беларусі. Блазнюку лёгка ўдалося ўгаварыць Паўла трымацца разам.

Так ён апынуўся ў Беларусі.

Павел паставіў сабе за мэту жыць ціха, непрыкметна, нічым і нідзе не вылучацца. Ён нікому, нават Нічыпару Блазнюку, не сказаў, што мае вунь колькі спецыяльнасцей і што нават за майстра рабіў. Змоўчаў і пра тое, што ў яго за плячыма дзесяцігодка, усім гаварыў, што мае толькі сем класаў. Уладкаваўшыся на завод,— уласна кажучы, ніякага завода не было, былі адны руіны,— Павел спачатку, калі ішлі аднаўленчыя работы, насіў цэглу ды мясіў раствор, пасля скончыў кароткатэрміновыя курсы і стаў за электраманцёра. Нічыпар Блазнюк праз тры гады зрабіўся майстрам цэха, праз пяць — начальнікам участка, а Павел усё лазіў з кіпцямі па слупах, ставіў у кабінетах разеткі ды выключальнікі, укручваў лямпы ў патроны, мяняў перагарэлыя пробкі. Блазнюк скончыў завочна тэхнікум і падаўся ў інстытут; Паўла ніяк не маглі зацягнуць у вячэрнюю школу. «Цяпер сем класаў — гэта амаль нічога,— тлумачылі яму.— Трэба расці, авалодваць ведамі, пашыраць кругагляд». Павел ведаў сваё: не высоўвацца, не кідацца ў вочы, быць цішэй вады, ніжэй травы. Нічога яму не трэба, хопіць і таго, што ён мае, няхай усе пакінуць яго ў спакоі, няхай не лезуць у душу, не акружаюць клопатам і ўвагай. Паступова Павел дамогся свайго: на яго ўсе махнулі рукой, нават Нічыпар Блазнюк.

Ён корпаўся з ненавіснымі разеткамі, выключальнікамі і пробкамі, а ў галаве былі станкі, машыны, аўтаматычныя лініі... Колькі ён зрабіў рацыяналізацый, колькі абмазгаваў вынаходстваў — і ніхто не пакарыстаўся імі, ніхто нават не пачуў пра іх.

У яго была добрая сям'я. Жонка шчыра і аддана любіла яго, дзеці раслі здаровымі і паслухмянымі, добра вучыліся. Але і ад сям'і Паўлава душа была замкнёна на сто замкоў.

Па начах яго сталі мучыць кашмары. То з'яўляўся Рудольф Пільц і пачынаў душыць Паўла, і той дапраўды задыхаўся і хрыпеў, і ад гэтага хрыпу прачыналася Настася і спалохана будзіла яго; а то прыходзіў следчы з органаў бяспекі і паказваў Паўлу ягонае дасье, і тады Павел ускрыкваў і падхопліваўся з ложка, каб бегчы немаведама куды.

— Калі ж гэта яна перастане ўжо сніцца табе, тая вайна! — з роспачу гаварыла ў такіх выпадках Наста-

ся.— Схадзіў бы ты да доктара, можа, ён даў бы якое рады. Гэта ж так пакутавацьǃ..

Павел як сам не свой ішоў на кухню, у знямозе апускаўся на табурэтку і так сядзеў да самае раніцы. Жонка не турбавала яго, бо аднаго разу ён быў шалёна накрычаў на яе за гэта.

Ён зрабіўся нервовы, часам яго раздражняла самая нязначная дробязь. Гэта здаралася не толькі дома, але і на рабоце.

Павел зразумеў, што няма больш страшнага суда, чым суд уласнае памяці.

Бывалі хвіліны, калі яму хацелася расказаць пра ўсё першаму стрэчнаму на вуліцы, на заводзе, на стадыёне, куды ён пачаў хадзіць на футбол з надзеяй хоць там пазбыцца чорных сваіх думак, і дзе пазбыцца іх яму таксама не ўдавалася.

Апошнім часам ён рашыў, што скажа ўсю праўду Настасі, бо не мог ўжо трымаць яе ў сабе.

Ды не паспеў. Звалілася раптам на яго чортведама скуль жудасная немач, пазбавіўшы і мовы, і рухавасці. Ён не мог ужо ні сказаць нічога, ні нават рукой паварушыць, каб хоць напісаць.

Што гэта было — новыя пакуты або збавенне ад усіх пакут?..

## 3

— А я тут, Паша, у камандзіроўцы,— сказаў прыхадзень.— Быў і на вашым заводзе, там выпадкова пачуў прозвішча — Звягінцаў. Спярша не надаў гэтаму ніякага значэння, а пасля, ужо ў гасцініцы, раптам падумаў: «А ці не ён гэта, мой школьны сябрук Пашка?» Заскочыў у адрасны стол, мне і далі даведачку, дзе ты жывеш. От так і знайшоў я цябе праз столькі год. Праўду кажуць, што гара з гарою не сходзяцца, а чалавек з чалавекам абавязкова стрэнуцца.— Ён пільна паглядзеў на Звягінцава і падкрэслена дадаў: — Павінны стрэцца. Абавязаны стрэцца.

Не, Павел Звягінцаў не ведаў яго. Не бачыў дагэтуль ніколі. Не страчаўся з ім нават выпадкова. Аднак недзе падсвядома чакаў, што ён усё ж прыйдзе.

І вось ён прыйшоў. Адтуль прыйшоў. Ад Рудольфа Пільца.

— А дзе вы цяпер жывяце? — спытала Настася.

— У Маскве-матухне. Служу там у Міністэрстве замежных спраў.

— Вунь куды дапялі.

— Бываю за мяжою. Даводзілася не раз па ўласныя вочы бачыць загніваючы капіталізм. Агідна робіцца, калі глядзіш па каторага з гэтых загніваючых.

«Гэта ты толькі што прыдумаў, вось тут, у кватэры,— зазначыў Звягінцаў.— Не ў Міністэрстве замежных спраў ты робіш, а ў ведамстве Рудольфа Пільца. От толькі дзе яно цяпер атабарылася, тое ведамства? У Заходняй Германіі? У Англіі? Або ў Злучаных Штатах? А сам ты, канечне ж, маеш дакументы замежнага турыста, да якіх ніхто не прычэпіцца, іх расстараўся табе сам Рудольф Пільц. Калісьці ён і мне даў быў дакумент, абсалютна надзейны дакумент, немцы тады нават казыралі мне. Толькі я той дакумент знішчыў, спаліў, а ты свой не знішчыш, табе трэба даць справаздачу. Так, маўляў, і так, дарагі гер Рудольф Пільц, бачыў я вашага рэзідэнта, якога ў свой час гэтак лоўка завербавалі, страчаўся з ім, нават на кватэры ў яго быў, толькі карысці ад яго цяпер аніякае. Я нават употайкі здымачак зрабіў, вы ж забяспечылі мяне мініяцюрным фотаапаратам, вось паглядзіце на здымачак, якраз добра атрымаўся. Бачыце, у якім ён стане, гэты Павел Пятровіч Звягінцаў, яго разбіў параліч. Так што закрывайце ягонае дасье, яно нам болей не спатрэбіцца».

— І грошы вам, відаць, добрыя плоцяць? — спыталася Настася і сама засаромелася свайго пытання.

— Грошы плоцяць добрыя, не скарджуся,— адказаў прыхадзень.— Хапае і па хлеб, і да хлеба. От толькі даводзіцца шмат ездзіць. То ў адну краіну, то ў другую, і часам надоўга.

— То гэта ж і добра — ездзіць па новых мясцінах, бо столькі можна чаго пабачыць. А мы з Паўлам нідзе і не былі, нічога не бачылі. Хоць ён-то быў, усю Германію прайшоў, але калі тое было.

— Нічога, яшчэ паездзіце, якія вашы гады,— без усякае надзеі ў голасе сказаў прыхадзень.— Дасць бог, ачуняе Павел, і тады...

«Так, цяпер дасье будзе нарэшце закрыта. Але сам я ўсё роўна астануся ў сваёй адзіночнай камеры... Зрэшты, я трапіў у яе не цяпер, калі мяне апанавала гэтая ня-

шчадная немач, я ўсё жыццё быў у адзіночнай камеры, з тае самае хвіліны, як стрэўся на маім шляху Рудольф Пільц».

— Ну што ж, я мушу развітацца,— сказаў, устаючы, прыхадзень.— Бо спраў у мяне яшчэ да самае макаўкі. Змікіціў, Паша? Жадаю табе ўсяго, чаго ты сам сабе жадаеш. Бывайце, Настася Філімонаўна, мне вельмі прыемна было пазнаёміцца з вамі. Шкада, не пабачыў вашых дзетак. Перадайце ім ад мяне прывітанне. Бывайце!

«Затрымай яго, затрымай, Настася! Паведамі аб ім куды трэба. Ён не мае права быць тут, у нашым горадзе, у нашай краіне. Ён — гэта вайна. Няхай не цяпер, але — вайна. Калі-небудзь, у будучым. Можа, не з намі, не са мною і табою, але ў нас ёсць дзеці, значыць — з імі. Таму ён не павінен хадзіць па нашай зямлі. Ён наогул не павінен хадзіць ні па чыёй зямлі. Ягонае месца — у самой зямлі, пад тоўстым і цяжкім пластом! Затрымай яго, Настася!..»

Ён нема закрычаў. Ды ніхто не пачуў таго крыку.

І сам ён таксама не пачуў.

*1973*

# БЛІСКАВІЦА

## 1

У зямлянцы было добра нацеплена, гэта я ведаў пэўна, бо днявальныя круглыя суткі палілі ў дзвюх печках, і, акрамя таго, сто шэсцьдзесят чалавек, што ляжалі на нарах упрытык адзін да аднаго, па восемдзесят чалавек з аднаго і з другога боку, сваімі целамі і дыханнем таксама рабілі немалое цяпло. А мяне як узялі дрыжыкі адразу пасля вячэры, дык я і дагэтуль, хоць ужо настала пара адбою, ніяк не мог угрэцца. І чым далей, тым мацней мяне калаціла. Мой сусед па нарах Анатоль Белавус акрамя майго шыняля паклаў на мяне зверху яшчэ і свой, але і гэта не памагала.

— Не ведаю, ці бедаваць з гэтае прычыны, ці радавацца,— сказаў Анатоль Белавус.

— Якая ж тут радасць, калі я, напэўна, захварэў,— ляскаючы зубамі, адказаў я.

— Затое цяпер на фронт не пашлюць...

— Дурань!

— Заўтра ўсе мы рушым на станцыю, а ты застанешся,— гаварыў далей сваё Анатоль.— Цябе пакладуць у шпіталь.

— Ні ў які шпіталь я не пайду.— Я аблізнуў засмяглыя губы.— Дай мне, калі ласка, вады, усё ў роце перасохла. Табе гэта не цяжка?

— Зараз, хвілінку.

Анатоль паспешліва злез з нараў. Я чуў, як ён бразнуў алюмініевай конаўкай аб цынкавы бачок з вадою, што стаяў непадалёк у праходзе між нараў пасярод зямлянкі, як адкруціў кран, як зацурчала вада ў конаўку.

— На! — сказаў Анатоль, асцярожна ўладкоўваючыся побач са мною.— Ты можаш падняць галаву?

— Магу.— Мне і папраўдзе ўдалося крыху прыўзняцца, абапіраючыся на левы локаць. Анатоль паднёс да майго рота конаўку, і я прагна пачаў піць.

— Досыць,— сказаў Анатоль.— Многа піць не трэба. Я пакіну конаўку тут, калі яшчэ захочаш — скажаш.

Над нашымі галовамі ўздоўж сцяны была прымайстравана паліца, куды мы клалі свае немудроныя салдацкія пажыткі. Туды і паставіў Анатоль конаўку.

— Гэта ў мяне, відаць, малярыя,— сказаў я.— Яна і раней мяне калаціла, але ўжо гады два не было яе.

— Можа, і малярыя. А можа, і што другое. Трэба, мусіць, паклікаць доктара, га, Пятрок?

— Не трэба ніякага доктара. Да раніцы ўсё пройдзе. Пакалоціць, і перастане.

— А калі гэта ў цябе запаленне лёгкіх? — Ён прыклаў руку да майго лба.— Вунь які гарачы. Значыць, тэмпература.

— Глупства,— сказаў я, хоць недзе ў падсвядомасці пачынаў ужо разумець, што гэта ў мяне і папраўдзе не малярыя, а штосьці іншае, можа, нават і запаленне лёгкіх, а калі і не запаленне, дык, прынамсі, грып. Дыхаць мне рабілася ўсё цяжэй і цяжэй. Але разам з тым мяне яшчэ не пакідала спадзяванне, што ўсё абыдзецца, што гэта я проста крыху застудзіўся, калі мыліся ў лазні, і потым, калі пераабмундзіроўваліся на ўсё новае, і от варта мне цяпер добра ўгрэцца — і ўсё пройдзе, і я зноў буду здаровы, як і ўсе, і разам з усімі раніцай рушу на станцыю, дзе нас пагрузяць у эшалон і мы паедзем на фронт.— Глупства, Толя! — паўтарыў я, нацягваючы шынель на галаву і падкурчваючы ногі.— Да раніцы ўсё скончыцца, сам пабачыш!

— Славяне, хто конаўку сцібрыў? — гукнуў хтосьці на ўсю зямлянку.

— Напіся з крана,— адказаў Анатоль.— Тут чалавек захварэў.

— Аддай конаўку,— сказаў я Анатолю.— І не крычы на ўвесь свет пра маю хваробу.

— Ведаем мы гэтых хворых,— гаварыў тым часам далей ранейшы голас.— Ха, перад самай адпраўкай захварэў. Ясная дзела — пафілоніць надумаўся. Бачылі мы такіх філонаў.

— Не балбачы абы-што! — узняў голас Анатоль.— Не мерай усіх на свой аршын!

— Перастань, Толя,— папрасіў я.— Дай мне яшчэ напіцца і аддай копаўку.

— Вазьмі, выпі глыток. А копаўка няхай стаіць. Не вялікі ён пан, пап'ецца і з крана. На фронце будуць выпадкі, калі любой лужыне рады будзе.

— Адкуль ты ведаеш, як яно там будзе. Ты ж не быў на фронце.

— Здагадваюся. Не рай там і нават не бацькоўская хата. Можа і такое надарыцца, што па некалькі дзён ні табе крошкі хлеба ў роце, ні кроплі вады.

— Цяпер такога не можа быць. Цяпер жа не сорак першы год і нават не сорак другі.

Сапраўды, цяпер была зіма сорак чацвёртага года, а мы з Толікам Белавусам з'яўляліся салдатамі мінамётнага батальёна 333-га палка 39-й Омскай запасной дывізіі — дывізіі, якая рыхтавала папаўненне фронту. Кожныя два тыдні адсюль, з-пад вёскі Чаромушкі, што стаяла на беразе Іртыша, адпраўляліся маршавыя батальёны, якія перад тым праходзілі кароткатэрміновую баявую падрыхтоўку — хлопцаў вучылі страляць, акопвацца, весці наступальныя бoi і шмат яшчэ чаму, што трэба было ведаць салдату на вайне. Адзін аднаго мы ведалі мала, бо знаходзіліся разам параўнаўча нядаўна, не больш за месяц. Былі мы галоўным чынам маладыя хлопцы, якім надышоў тэрмін прызыву, але страчаліся сярод нас і старэйшыя, і нават пажылыя людзі — хто з тылавых шпіталяў пасля ранення на фронце і лячэння, а другія пасля заканчэння розных адтэрміновак і броняў. Я трапіў у батальён проста са школьнай парты, з дзесятага класа, а мой сусед Анатоль Белавус казаў, што ўжо чатыры гады рабіў на нейкім заводзе. Але ні я, ні нават ён дагэтуль не трымалі зброі ў руках і мінамёт убачылі ўпершыню толькі тут, у запасной дывізіі. Тым не менш абыходзіцца з ім мы ўжо ўмелі, бо ён аказаўся вельмі простым па канструкцыі, і нават зрабілі з яго па некалькі стрэлаў — і з адкрытай і з закрытай пазіцый. Абмундзіраваны мы былі ў зялянковага колеру бушлаты і такія ж галіфэ, прычым далёка не першага тэрміну нашэння, а на нагах мелі чаравікі з абмоткамі, якія да нас таксама пабачылі багата іншых ног. Уся тая абмундзіроўка апі не грэла, а мы ледзь не цалюткі дзень былі на холадзе, і ён праймаў нас да самых касцей, і таму самым прывабным месцам на зямлі здавалася нам наша цесная для цэлае роты,

з нарамі замест ложкаў, зямлянка, у якой заўсёды панаваў паўзмрок, бо яе асвятляла толькі адна газоўка, і дзе паветра было не сказаць каб надта чыстае. На занятках па баявой падрыхтоўцы, якія амаль увесь дзень праводзіліся ў полі, на марозе, мы думалі толькі аб нашай зямлянцы, прагна чакаючы яшчэ ад самае раніцы, калі нарэшце трапім зноў у яе, адагрэемся і скінем абрыдлыя, наскрозь прамёрзлыя чаравікі. Нічога іншага з амбундзіравання мы не скідалі, спалі не распранаючыся. Ды ўчора ўсе гэтыя нягоды скончыліся. Зранку стала вядома, што на занятмкі мы болей не пойдзем. Пасля снедання і палітінфармацыі нас павялі ў лазню, дзе мы скінулі свае зашмальцаваныя бушлаты і галіфэ, ладна падношаныя чаравікі і абмоткі, мытую-перамытую бялізну і, памыўшыся, атрымалі ўсё чыста новенькае, як кажуць, з іголачкі — шапку-вушанку, шынель, гімнасцёрку, цёплую бялізну, ватовыя штаны, а самае галоўнае — валёнкі, і ў дадатак яшчэ мякенькія байкавыя анучы...

Выходзіла, што мы заўтра ці паслязаўтра павінны рушыць у дарогу, якая мо для многіх з нас будзе апошняй...

Але пра гэта ніхто не думаў. Мы адчувалі цяпер сябе сапраўднымі воінамі і, калі выйшлі з лазні і пачулі каманду на пастраенне, займалі свае месцы ў страі нейкія ўнутрана не такія, як дагэтуль,— сур'ёзныя, засяроджаныя, з тварамі, поўнымі рашучасці і адвагі. Мы былі гатовыя хоць зараз кінуцца ў бой і біцца з ворагам зацята, самаадданна, нічога не шкадуючы дзеля перамогі. Нам здавалася, што там, на фронце, толькі нас і не хапае, і менавіта мы са сваімі пяцідзесяціміліметровымі ротнымі мінамётамі даб'ём Гітлера ў ягоным логаве.

Што ж, мы былі такія ж наіўныя, як і ўсе, хто не бачыў фронту, не нюхаў пораху, не адбіваў танкавых атак і сам не хадзіў у атакі,— карацей кажучы, не бачыў вайны з усімі яе жахамі.

— Вайна ёсць вайна,— сказаў Анатоль.— Праблема конаўкі там не з самых галоўных.

— А ну цябе з тваёй конаўкай к чорту! — узлаваўся я.

— Гэта добра, што ты злуешся. Злосць і смех — аснова жыццяздольнасці,— заўначыў Анатоль.

Мне робіцца няёмка ад майго раптоўнага выбуху злосці, і я праз хвіліну мякка кажу майму суседу:

— Спі, Толік. Мне нічога болей не трэба. Спі.

Усе паўкола ўжо даўно пазасыпалі. Стомленыя перад'ездпымі турботамі людзі ў спе пасапвалі, уздыхалі, пахрапвалі, ускрыквалі, мармыталі. Не спім толькі мы з Апатолем. Я адчуваю, што мне яшчэ доўга пе заснуць, а мажліва, і наогул гэтая поч у мяне будзе без сну, а вось чаму пе спіць Апатоль? Няўжо ён узяўся па сваёй ахвоце даглядаць мяне?

— Спі, Толік,— зноў кажу я яму.— Мне нічога болей не трэба. Мяне ўжо амаль перастала калаціць, хутка і зусім стане добра. Спі, браток.

Гэта была няпраўда, мне апі не рабілася лепей, але Анатоль нічым не мог памагчы мне. Няхай сабе спіць, няхай не турбуецца, не перажывае праз мяне. Яму ж, мабыць, дужа хочацца спаць.

— Бачу я ўсё сам,— кажа Анатоль.— Заўтра цябе ўсё ж забяруць у шпіталь... А вось што ты не спіш — гэта вельмі дарэчы. Я хачу табе штосьці расказаць... Даўно збіраўся, ды ўсё неяк не выпадала... То ты цяпер набярыся, калі ласка, цярплівасці і выслухай мяне. Гэта вельмі важна, каб ты выслухаў усё да канца. Каб выслухаў і зразумеў. Я хачу адкрыць табе адну тайну.

Анатоль быў прыкметны хлопец — высокі, шыракаплечы, з правільнымі рысамі твару, на якім заўсёды блукала нейкая незразумелая для мяне задуменнасць,— асабліва задуменнымі былі яго блакітныя вочы, якія ён часта прыжмурваў і позірк якіх ніколі не быў звернуты на субяседніка, а скіроўваўся кудысьці ўбок,— і таму мяне не вельмі здзівілі цяпер Анатолевы словы. Пачуўшы іх, я адразу падумаў, што мусіў даўно здагадацца, што ў Анатоля павінна быць нейкая тайна — такі ўжо ён чалавек.

— Гавары, гавары! — зашаптаў я. Па натуры я быў чалавек цікаўны і, нягледзячы на хваробу, увесь ператварыўся ў слых.— Я слухаю цябе, Толік.

Вось што мне расказаў у тую ноч Анатоль.

Зрэшты, ён быў ніякі не Анатоль. І прозвішча ў яго было не Белавус...

— ...Ты слухай і маўчы. І не перапыняй мяне, калі ласка. Але калі табе што спатрэбіцца, скажы. Вады, скажам, захочацца выпіць або яшчэ што трэба будзе, не саромейся, гавары.

Я табе пра сябе раскажу. Хто я такі і адкуль тут узяўся. Гэта ўсё лухта, што я табе раней гаварыў, ды і іншым... ну, што я на заводзе рабіў, што быў за токара. Ні на якім заводзе я не рабіў, і пра тое, чым займаецца токар, ведаю толькі прыблізна. Ніводнага токара я і ў вочы не бачыў.

Перад вайной я быў студэнтам. Вучыўся ў Мінску. Марыў стаць адвакатам. Смешна, але маім героем, нават маім богам быў славуты рускі адвакат Плявака. Ты, мажліва, нават і не чуў пра такога, а я прачытаў, ды не толькі прачытаў, але і старанна вывучыў усе яго прамовы, многія і цяпер помню ледзь не на памяць.

Усё ішло ў мяне добра, я вучыўся на адны пяцёркі, быў круглым выдатнікам. У саракавым годзе я скончыў тры курсы універсітэта, перайшоў на чацвёрты. На летнія канікулы паехаў дамоў, на сваю Лепельшчыну,— ёсць такая мясціна ў Беларусі, на граніцы з Польшчай. Там жылі мае бацькі... Ці жывуць яны і цяпер там і, наогул, ці жывыя яны — не ведаю... Як ты мог заўважыць, я пісем ні ад каго не атрымліваю, і сам нікому не пішу. Але прычынаю тут не вайна. Я ўжо з ліпеня саракавога года ні з кім не маю перапіскі.

Ехаць мне тады трэба было праз Оршу, там перасесці на цягнік Орша — Лепель. Прыехаў я ў Оршу днём, а цягнік на Лепель меўся адысці толькі ўвечары. Трэба было неяк прабавіць час, але нічога пэўнага я прыдумаць не мог. Пашвэндаўся па вакзале, выйшаў на прывакзальную плошчу, пакруціўся каля ларкоў, але нічога не купіў. У мяне быў толькі невялічкі фібравы чамаданчык, як цяпер памятаю, цёмна-сіняга колеру, і ён не замінаў мне. Наважыўся быў з'ездзіць у горад, але на аўтобус была вялікая чарга, і я перадумаў. Зноў вярнуўся ў вакзал. Падышоў да газетнага кіёска. На прылаўку акрамя газет і часопісаў было многа кніжак, і я стаў прыглядацца, якую б купіць. Пагартаў некаторыя з іх, але нічога цікавага для сябе не выбраў. Хацеў ужо адысціся ад кіёска, ды раптам зірнуў на кіяскёрку. Зірнуў і... аслупянеў. Можаш мне не верыць, але так яно і было — я літаральна скамянеў. Бо перада мной стаяла дзяўчына незвычайнай прыгажосці. Я яшчэ ніколі не бачыў такога прывабнага дзявочага твару. Я не ўмею, не здолею апісаць табе яе прыгажосць, але ў мяне тады было такое адчуванне, быццам я ўбачыў нейкі незвычайны цуд. Мабыць, я гля-

дзеў на дзяўчыну залішне доўга і на ўсе вочы, і яна адчула гэты мой, напэўна, утрапёны позірк, бо таксама зірнула на мяне і сказала:

— Вы хочаце што-небудзь узяць? Кнігу або часопіс? Магу прапанаваць вам...

Я не чуў, што яна гаварыла далей. Чуў толькі яе голас — мяккі, ласкавы і быццам даўно знаёмы. Яна падышла яшчэ бліжэй да мяне і звыклымі рухамі сваіх маленькіх далікатных рук папраўляла на прылаўку часопісы і кнігі. Усё ў гэтых яе рухах было таксама прывабнае, невыказна прывабнае. Яна ўжо не пазірала на мяне, адно рабіла сваю справу і гаварыла, гаварыла, а я глядзеў то на яе твар, то на яе рукі і не мог сказаць у адказ ні слова.

— Гэта вельмі цікавы раман,— пачаў нарэшце разумець я яе словы і ўбачыў, што яна паклала перада мною нейкую кнігу.— Пісьменнік сам яшчэ малады, гэта яго першы твор, але напісаны ён з высокім майстэрствам і вельмі хвалюе. Я вам шчыра раю яго...

— Дзякую... — сказаў я нарэшце.— Я сам выберу, дзякую вам.

Яна зноў на нейкае кароткае імгненне зірнула на мяне. У гэтым яе позірку ані нічога не адбілася. І ўжо ў наступнае імгненне дзяўчына скіравала свой позірк на другі канец прылаўка, дзе ляжалі газеты і дзе сабралася ўжо чалавек колькі пасажыраў. Дзяўчына і адышлася туды.

Стаяць вось так слуп слупам было ўжо няёмка, і я падаўся прэч ад кіёска. Зноў выйшаў на плошчу з яе мітуснёю і разнагалосым гоманам. Доўга стаяў, нічога не цямячы і не бачачы, адно думаючы пра той незвычайны цуд, што з'явіўся нядаўна перада мною. Ён існуе і зараз, ён зусім блізка ад мяне, вось у гэтым цагляным будынку за спіною — вельмі блізка і ў той жа час надзвычай далёка, і будзе адгэтуль усё аддаляцца і аддаляцца, бо я праз нейкі час паеду адсюль, а ён, цуд, застанецца тут, і, можа, здарыцца такое, што я ўжо ніколі болей і не пабачу яго...

Угледзеўшы з правага боку амаль незанятую лаўку, я пайшоў і прымасціўся на яе з краёчку, паставіў каля ног свой чамаданчык і зноў надоўга задумаўся... Ах, як гэта несправядліва, што дзяўчына-кіяскёрка жыве і працуе не ў Мінску альбо на Лепельшчыне,— там я абавязкова пазнаёміўся б з ёю, знайшоў бы спосаб пазнаёміцца!.. А

што зробіш тут? Не падыдзеш жа да яе, не скажаш: «Добры дзень, мяне завуць вось так, а як ваша імя?» Я сядзеў і адно праклінаў сябе, свой лёс і тое, што мне трэба сёння паехаць з Оршы. Я лічыў сябе самым няшчасным чалавекам на зямлі...

## 2

Мой сусед на нарах у зямлянцы змоўк. Перачакаўшы крыху, я нецярпліва спытаў:

— А далей? Што было далей? Няўжо ты так і не пазнаёміўся з ёю?

— Зараз... — Ён шумна ўздыхнуў.— Зараз я буду зноў расказваць...

Ён намаўчаў яшчэ нейкую хвіліну.

— Я нікому яшчэ пра гэта не расказваў,— неяк глуха сказаў ён потым.— Гэтак, як табе зараз,— нікому. Але мне трэба расказаць табе, разумееш — трэба!

— Дык гавары, я слухаю цябе.

— А не дужа я цябе стамляю?

— Нічога, я здолею слухаць. Колькі трэба, столькі і буду слухаць.

— Цябе ўсё яшчэ калоціць?

— Цяпер ужо меней.

— Даць яшчэ вады?

— Дай трошачкі. Мабыць, скора ўжо і зусім перастане калаціць.

— На, выпі.

Прыўзняўшы галаву, я зрабіў некалькі глыткоў з конаўкі. Хацелася выпіць болей, але сусед адняў конаўку ад маіх губ і паставіў яе на паліцу.

— А перапыніўся я вось чаму. Май на ўвазе, што пасля таго, як я раскажу табе гэтую гісторыю... вельмі незвычайную, дарэчы, але шчырую і да самых апошніх драбніц праўдзівую... я звярнуся да цябе з адной просьбай. Мне хочацца ўжо цяпер ведаць, што ты выканаеш яе. Абяцай мне, што ты выканаеш маю просьбу, абавязкова выканаеш, якія б перашкоды ні стаялі на тваім шляху.

— Абяцаю.

— Але ж ты не ведаеш, якая гэта просьба.

— Не ведаю. Але абяцаю.

— Дай чэснае слова. Не, пачакай. Спярша падумай.

А раптам я запатрабую ад цябе нечага такога, чаго ты не зможаш або не захочаш выканаць?

— Такога ты не запатрабуеш.

— Чаму ты гэтак думаеш?

— Я чамусьці ўпэўнены, што нічога благога ты ад мяне патрабаваць не станеш.

— Дзякую, Пеця!

— Даю чэснае слова, што я выканаю тваю просьбу!

— Дзякую, шчыра дзякую, Пеця! Ты нават і не здагадваешся, які камень ты зняў з мае душы. Цяпер мне лягчэй будзе расказваць.

— Гавары, я слухаю.

— Зараз, зараз. Не зважай, што я задужа падрабязна расказваю. Але мне вельмі важна ўзнавіць усе дэталі тае даўняе гісторыі. Усё-ўсё, што тады адбылося. І што адбылося пазней...

Перад тым, як пачаць гаварыць далей, ён зноў крыху памаўчаў, відаць, збіраючыся з думкамі. Я больш не прыспешваў яго.

На розныя галасы храпла наша мінамётная рота. Нехта штосьці дужа мармытаў праз сон, нехта ўздыхаў, а яшчэ нехта патужліва ўскрыкваў,— мабыць, бачыў у сне штосьці непрыемнае ці, можа, нават страшнае.

Не спалі па-ранейшаму толькі мы з суседам. Ды яшчэ днявальны — ён час ад часу хадзіў ад грубкі да грубкі, шуруючы ў іх качаргою або падкідаючы дровы.

— Ну то слухай жа...

— ...Колькі я сядзеў на той лаўцы, праклінаючы свой лёс, цяжка сказаць. Магчыма, гадзіну, а магчыма, і болей. Ды спахапіўся, што трэба ісці кампасціраваць білет. Спахапіўся, напэўна, таму, што раптам выявіў — ужо бралася на вечар.

Падаўся ў вакзал, знайшоў патрэбную касу. Чарга была невялікая, і я хутка закампасціраваў свой білет. І як толькі адышоўся ад касы, пачуў голас дзяжурнай, якая ішла па зале ў чырвонай фуражцы і гучна гаварыла:

— Цягнік Орша — Лепель стаіць на першым пуці маскоўскага боку. Выхад на перон толькі па білетах. Тыя, хто праводзяць, павінны набыць перонныя білеты. Прадаюцца яны ва ўсіх касах.

Не ведаю чаму, але я вярнуўся і пабыў перонны білет.

У Оршы на вакзале два пероны — з аднаго і з другога боку. Адзін называецца маскоўскім, другі ленінградскім. Значыць, мне трэба было падавацца на маскоўскі.

Дзяжурная на выхадзе здзіўлена зірнула на два мае білеты, але нічога не сказала і перроннага білета не адабрала, як гэта звычайна рабілася.

Адшукаўшы свой восьмы вагон і сваё месца ў ім — а яно было верхняе,— я паклаў туды чамаданчык і хацеў ужо сам залезці на лаўку, але раптам мне нясцерпна захацелася яшчэ раз зірнуць на дзяўчыну ў кіёску. Я адчуў, што проста не змагу паехаць, калі не пабачу яе. І тады, расштурхоўваючы пасажыраў, я кінуўся назад з вагона.

Адразу, як толькі расчыніў дзверы ў залу, я ўбачыў яе. Цяпер я паспеў разгледзець, што яна была ў простай палатнянай сукенцы светла-залацістага колеру, з якою зліваліся яе падстрыжаныя, амаль такога ж колеру валасы. Калі я падышоў бліжэй, дык угледзеў, што вочы ў дзяўчыны шэрыя, а над правым брывом прыляпілася невялічкая радзімка.

Так, я не памыліўся — яна папраўдзе была вельмі прыгожая, прыгажэй за ўсіх прыгажунь свету!..

Я падышоў да прылаўка і левай рукой пачаў гартаць нейкі часопіс, а сам глядзеў толькі на яе, на кіяскёрку. Дзяўчына дала газету нейкаму чалавеку з таўстымі акулярамі, узяла ў яго манетку, кінула ў драцяную скрыначку і павярнула галаву ў мой бок.

— Вы так і не выбралі сабе нічога? — пазнаўшы, мабыць, мяне, спытала яна.— Вы, напэўна, з лепельскім едзеце?

— Я вас люблю! — сам не чакаючы, што скажу такое, ляпнуў я.

— Што?.. — пабляднела яна і прыціснула руку да грудзей.

— Я вас люблю... — ужо цішэй паўтарыў я.

Яна чамусьці азірнулася па баках, тады зрабіла крок назад, да паліц, і збянтэжана глядзела на мяне, цяпер ужо залівачыся чырванню.

Нехта, хто стаяў побач са мною, хіхікнуў. Толькі тады я зразумеў, што зрабіў вялікае глупства, паставіўшы і сябе, і дзяўчыну ў смешнае становішча. Трэба было не-

адкладна знайсці нейкі выхад. І мне здалося, што я знайшоў яго.

— Я кажу...— гучна і выразна вымавіў я,— я кажу — дайце мне кнігу, якая называецца «Я вас люблю».

— А-а...— Яна паспрабавала ўсміхнуцца, але ўсмешка атрымалася нейкая вымучаная, штучная, і дзяўчына яшчэ больш зачырванелася.— Такой кнігі ў мяне няма.

— Шкада,— як мага больш натуральна сказаў тады я.

— Я нават і не чула пра такую кнігу.— Яна агледзела свой прылавак, зірнула на паліцы.— А хто аўтар?

— Здаецца, Дастаеўскі.

— У Дастаеўскага такога рамана няма, гэта я ведаю пэўна.

— Няма? Тады, мабыць, аўтар Леў Мікалаевіч Талстой.

Падумаўшы, дзяўчына сказала:

— І ў Талстога няма... «Анна Карэніна» ёсць, «Вайна і мір» ёсць, «Уваскрэсенне». А такога рамана... як вы сказалі?

— Я вас люблю.

— Такога рамана няма.

— Але гэта зусім і не раман. Гэта казка. Яе прыдумаў адзін вельмі нешчаслівы чалавек.

— Вы гаворыце... прабачце... штосьці не зусім зразумелае.

— Шчыра кажучы, гэта нават не казка. Гэта быль. Адна чыстая, святая праўда. Вялікая і неабдымная, як свет.

— Вы спозніцеся на цягнік, ён хутка адправіцца,— сказала яна.— Вам трэба спяшацца.

— Але, мне трэба спяшацца. А вам трэба заставацца. Бывайце!

— Шчаслівай вам дарогі,— сваім мяккім і цяпер ужо паспакайнелым голасам сказала яна.

Тут я ўспомніў пра свой перонны білет, набыты невядома дзеля чаго. Я выняў яго з нагруднай кішэні і паклаў перад дзяўчынай.

— І будзем лічыць,— са смуткам сказаў я,— што вы праводзілі мяне. Бывайце!..

Павярнуўшыся і не азіраючыся, я шпарка пашыбаваў да выхада.

На перон я выскачыў, калі цягнік ужо рухаўся. І якраз перада мною быў восьмы вагон. Я ўжо прымерыўся

ўскочыць на падножку, калі раптам заўважыў, што трымаю ў руцэ штосьці такое, чаго ў мяне раней не было...

Тут я проста жахнуўся. У мяне, аказваецца, быў часопіс. Той самы часопіс, які я пачаў машынальна гартаць, калі падышоў да кіёска, і які чамусьці так і застаўся ў маёй руцэ.

Я кінуўся назад, у вакзал. Я не мог паехаць з гэтым часопісам. Дзяўчына, безумоўна, бачыла яго ў маёй руцэ. Што яна магла падумаць пра мяне?!.

— Даруйце,— сказаў я, падбегшы да яе,— гэта я ўзяў незнарок. Я ўзяў выпадкова. Даруйце, калі ласка!

— А бог з ім, з часопісам,— хвалюючыся, сказала яна.— Бяжыце, бяжыце хутчэй!

І я пабег. Ды на пероне ўбачыў толькі чырвоны агеньчык хваставога вагона. Па інерцыі я пабег быў за ім — ды дзе там! Цягнік імкліва набіраў хуткасць, і чырвоны агеньчык усё меншаў і меншаў, аддаляючыся...

Я самотна прыпыніўся ў канцы перона і — далібог не маню! — адчуваў сябе рэччу, якую забыліся ў апошнюю хвіліну ўзяць з сабою.

Тады ўспомніў пра свой чамаданчык, які застаўся ў вагоне. Мне чамусьці ані не было шкада яго. Хаця потым, пасля, я часта бедаваў, што яго няма са мною, а галоўнае — што няма цёплага шарсцянога світэра, які ляжаў там на самым дне. Ды гэта было потым, пазней, і ўжо зусім у іншых умовах...

## 3

Сусед зноў аціх. Цяпер я не турбаваў яго, не прасіў хутчэй расказваць далей. Ведаў, што гэты перапынак яму патрэбны, каб супакоіцца, унутрана сабрацца перад самым, мабыць, галоўным.

Пасля працяглай паўзы ён спытаў:

— Як ты сябе адчуваеш?

— Ужо значна лепей. Калаціць мяне перастала. Вазьмі свой шынель.

— А можа, ён яшчэ патрэбны табе? Можа, ты думаеш, што мне холадна?

— Не, мне ён больш не патрэбны, я ўгрэўся. Вазьмі.

— Калі так, то вазьму. Шчыра кажучы, у зямлянцы і сапраўды стала крыху халаднавата. Мабыць, днявальны задрамаў.

— Мабыць, задрамаў. Калі хочаш, гукні яго, няхай падкіне дроў у печы.

— Ат, не варта. Накіну во шынель, і добра будзе. Скажы, ты ніколі не курыў?

— Не, не курыў. У шостым класе мы спрабавалі пацягваць у туалеце, але для мяне гэта было балаўство і больш нічога. А потым пачалася вайна, тытунь стаў вельмі дарагі, і было не да яго. Мабыць, і добра, што не навучыўся. Бачу, як людзі пакутуюць часам праз гэтае курава. А ты — курашчы?

— Я таксама ніколі не курыў, нават у школе. Не цягнула.

— А чаму ты загаварыў пра гэта?

— Успомніў, што тады я — мабыць, са злосці, ці што — купіў у ларку пачак папярос «Эпоха» і закурыў. Не заўважыў, як высмактаў дзве папяросы запар, але тут мяне пачало нудзіць, і я выкінуў тую «Эпоху» ў урну.

Ён яшчэ памаўчаў.

— Табе піць не хочацца?

— Не, не хочацца.

— Тады я аднясу конаўку назад.

— Ага, аднясі.

Ён узяў конаўку, злез з нараў. Я пачуў, як конаўка бразнула аб бачок. Потым зацурчала вада з крана. Відаць, сусед сам захацеў піць. Потым ён схадзіў да аднае грубкі, да другой,— напэўна, падкінуў у іх дроў. Вярнуўшыся, ён накрыўся шынялём і зноў нейкі час маўчаў.

— Спытаў я пра курава яшчэ і таму,— сказаў тады ён,— што мне раптам дужа захацелася закурыць. Умоўны рэфлекс, ці што... Хацеў быў нават папрасіць у днявальнага. Ды падумаў, што ён мог бы і не даць.

— Даў бы,— сказаў я.— Я ведаю крыху гэтага хлопца, ён з трэцяга ўзвода. Мы разам ехалі з ваенкамата сюды. Ён даў бы. А хочаш — я пайду папрашу.

— Ляжы, не трэба табе ўставаць. Пайду сам. Мне б толькі разы два пацягнуць. Чорт, успомніў вось — і захацелася...— неяк вінавата і нібы просячы прабачэння сказаў сусед, зноў злазячы з нараў.

Некалькі хвілін яго не было. Я пачуў ягоны кашаль недзе каля ўваходных дзвярэй. Неўзабаве ён вярнуўся і, дыхаючы на мяне тытунём, сказаў:

— Дрэнь усё ж гэтае курава. Не паспеў зацягнуцца, як мяне ледзь не вырвала. Як і тады.



4 Я. Васілёнак, т. 2

— Я чуў, як ты закашляўся.

— Ага, адразу схапіў кашаль. А днявальны тады кажа да мяне: «Ты ўжо, браток, мабыць, не курэц на гэтым свеце». Чаму ён так сказаў, га?

— Не ведаю,— адказаў я, а сам падумаў: «Гэта днявальны, відаць, нерайначыў словы, калі пра безнадзейна хворага чалавека кажуць, што ён ужо не жылец на гэтым свеце. Напэўна, днявальны вырашыў, што мой сусед дужа на штосьці хворы, калі гэтак кашляе».

— А ён папраўдзе добры хлопец,— неяк сумна сказаў мой сусед.— Не паспеў я падысці да яго, як ён сам прапанаваў мне закурыць.— Пасля новай паўзы ён дадаў: — Рэдка мне даводзілася апошнім часам сустракаць добрых людзей.

Я нічога не сказаў яму на гэта. Мабыць, у яго былі нейкія свае прычыны, каб гаварыць гэтак.

— Будзеш слухаць далей?

— Ага, буду.

— Не заснеш?

— Што ты!

— Тады слухай...

— ...Ужо ладна ўцямнела, уключылі электрычнасць. Я зусім не ведаў, што мне рабіць далей. Наступны цягнік на Лепель меўся быць толькі заўтра, гэтай жа парою. Значыць, цэлыя суткі я вымушаны ацірацца ў гэтай Оршы, дзе ў мяне ніводнае роднае душы, нават ніводнага проста знаёмага чалавека.

Акрамя, вядома, дзяўчыны-кіяскёркі.

Але хіба мог я цяпер паказацца ёй на вочы?..

Дзверы ў вакзал з перона аказаліся замкнёныя. Вісеў замок і на весніцах, праз якія можна было трапіць з перона на плошчу. Давялося неўзаметку пераскочыць цераз штыкеты — балазе яны былі не дужа высокія.

Зайсці ў вакзал я так і не адважыўся. Надумаўся паехаць у горад і там пашукаць сабе якога прытулку на ноч. Калі нічога не выйдзе з гасцініцай, разважаў я, забяруся ў які-небудзь парк — павінен жа ў горадзе быць нейкі парк! — і перабуду там ноч на лаўцы. А напярэдне пашукаю, дзе б пад'есці. А калі не знайду — нічога страшнага, пацярплю да раніцы.

Цяпер чарга на аўтобус была ўжо невялікая, стаяла

ўсяго некалькі чалавек. Я стаў за нейкай пажылой жанчынай у мужчынскім пінжаку. Аўтобус — гаварылі ў чарзе — павінен быў вось-вось прыйсці.

Цябе, магчыма, здзіўляе, што я гэтак добра запомніў усё, што адбывалася тады ў Оршы, хоць прайшло з таго часу безліч дзён. Я і сам дзіўлюся, чаму нічога не забылася, усё засталося, усё зафіксавалася ў памяці — абсалютна ўсё, да самай пязначнай драбніцы...

Так, усё засталося — і, відаць, пазаўсёды, да скону дзён маіх!

Аўтобус нарэшце прыкаціў, з яго выйшлі пасажыры, што прыехалі з горада. Тады пачалі ўціскацца праз дзверы мы, што збіраліся ехаць у горад. Заняў месца непадалёк ад вадзіцеля і я. Набралася нас мо толькі на палавіну аўтобуса. Шафёр пачакаў яшчэ хвілін пяць, тады завёў матор. І тут нібы хто падштурхнуў мяне з майго месца. Я ўскочыў і кінуўся з аўтобуса прэч. Ён пайшоў без мяне.

Не, не мог я цяпер паехаць у горад. Мне трэба было яшчэ раз пабачыць дзяўчыну-кіяскёрку. Хоць бы здаля. Не падыходзячы да яе. Стаць дзе-небудзь збоку, неўзаметку, і палюбавацца ёю. Яшчэ раз падзівіцца на незвычайны цуд, што раптам напаткаўся мне і завалодаў усімі маімі думкамі.

Я падаўся ў вакзал.

І тут здарылася нечаканае.

У дзвярах я тварам у твар сутыкнуўся з ёю.

— Усё ясна,— сказала яна і чамусьці засмяялася.— Мы спазніліся на цягнік, і мы злосныя на ўвесь божы свет і ў першую чаргу на «Саюздрук». Гэта значыць, на мяне!

Міжвольна і я пачаў усміхацца.

— Спазніўся — гэта праўда. А злавацць, тым больш на вас, хіба можна!

— То мо вы скажаце яшчэ, што нават рады з таго, што спазніліся?

— Вось іменна — рады! — вельмі шчыра прызнаўся я і, паддаючыся яе весялосці, таксама засмяяўся.

Яна, вядома, зразумела мае словы як жарт, але я і напраўдзе быў рады, што гэтак сталася і што я во маю магчымасць зноў бачыць яе і нават размаўляць з ёю.

Мы адышліся ад дзвярэй; калі сказаць больш дакладна — яна адцягнула мяне ўбок, бо мы заміналі людзям. На тую хвіліну зрабіць гэта сам я, напэўна, не здагадаўся б і мог бы стаяць там ля дзвярэй хоць вечнасць.

— Што ж вы будзеце рабіць? — цяпер ужо занепакоена спытала яна.

— А нічога! — зусім весела і бесклапотна сказаў я.— І калі вы не верыце...

— Чаму — не веру?

— Таму, што я рады, што...

— Веру, веру. Хто ж не ведае, што вы толькі і марылі пра тое, каб адстаць у Оршы ад цягніка! Гэта ж была ваша самая светлая мара яшчэ ад дзён маленства.

Яна жартавала, а я раптам успомніў, што аднойчы ў маленстве і папраўдзе дужа хацеў адстаць ад цягніка. Нечага пакрыўдзіўся быў на бацькоў, з якімі ехаў да цёткі ў Ленінград, і думаў: «Вось адстану ад вас на якой-небудзь станцыі, тады вы будзеце ведаць, як крыўдзіць мяне. Паскачаце, пашукаеце, ды трасцу знойдзеце. Вы паедзеце ў Ленінград, а я паеду сабе ў Маскву. І ніколі вы мяне болей не ўбачыце...»

І стала мне тады дужа шкада сябе, настолькі шкада, што я ўрэшце перадумаў адставаць.

Успомніўшы гэта, я зарагатаў. Дзяўчына вельмі здзівілася з гэтага майго нечаканага рогату. Тады я расказаў ёй пра той выпадак, і яна таксама доўга рагатала.

Потым яна пацягнула мяне ў вакзал, загадала даць ёй мой білет і некуды знікла. Хвілін праз колькі з'явілася зноў. Сказала, што была ў дзяжурнага і адтэрмінавала мой білет. Не ведаю, як ёй гэта ўдалося, але на білеце і сапраўды стаяў адпаведны штампік і чырвоным алоўкам была старанна перакрэслена кампасціроўка.

Я падзякаваў дзяўчыне і, чамусьці засаромеўшыся, не ведаў, што сказаць яшчэ. Маўчала нейкі час і яна, мабыць, пра штосьці думаючы.

— А наперадзе ноч,— сказала нарэшце яна.— Ці ёсць у вас у Оршы хоць якія-небудзь знаёмыя?

— Акрамя вас — ні душы.

— І гэтай адзінай вашай знаёмай душы вы нават імя не ведаеце.

— Скажыце, буду ведаць. Мяне завуць...

Як толькі я сказаў ёй сваё імя, яна раптам здзіўлена зірнула на мяне, а тады зноў узялася рагатаць. Ды так, што ў яе аж слёзы на вачах выступілі.

Я сумеўся, бо не разумеў, чаго ёй зрабілася гэтак смешна. Няўжо маё імя выклікала ў яе такі прыступ рогату? Але ж імя ў мяне было зусім не смешнае. Наадварот, я лі-

чыў яго вельмі прыгожым, я нават ганарыўся ім. І вось жа маеш — рагоча, не спыняецца дзяўчына!..

Крыху супакоіўшыся, яна працягнула мне сваю руку і сказала:

— Мар'яна.

Я спярша яшчэ больш сумеўся, а тады таксама зарагатаў.

У нас, аказваецца, былі аднолькавыя імёны! Яна была Мар'яна, а я — Мар'ян.

Сапраўды, было з чаго рагатаць!

А далей высветлілася, што агульнае імя — гэта яшчэ не ўсё. Мы абое нарадзіліся — уяві сабе! — у адзін і той жа дзень — 14 чысла! І ў адным і тым жа месяцы — у жніўні! І, што ўжо зусім неверагодна,— нават год нараджэння ў нас супаў. Дзіва, дый годзе! Каб хто расказаў мне пра гэткае, я, магчыма, нават не паверыў бы.

— А ты? Ты мне верыш?

## 4

Я яму верыў. Не ведаю чаму, але верыў. Мабыць, было ў ягоным голасе, у паглядзе вачэй і наогул ва ўсім абліччы штосьці такое, што выклікала прыхільнасць і абсалютны безаглядны давер.

— Мне вельмі важна, каб ты верыў,— з нейкай тужлівай надзеяй сказаў мой сусед.— У гэтай маёй гісторыі шмат незвычайнага і нават неверагоднага, але ўсё, пра што я расказваю,— чыстая праўда, я нічога не выдумляю, нічога не прыхарошваю і нічога не чарню, перадаю табе ўсё так, як яно і было.

— Я веру табе,— шчыра сказаў я.— Ды і з якое рады ты ўзяўся б маніць мне? Каб развеяць хворага? Дык прасцей было б расказваць анекдоты, а не выдумляць пра сябе чорт ведае што.

— Гэта дужа добра, што ты мяне правільна разумееш. І якое ж гэта шчасце, браце мой, што маім суседам па гэтых, мабыць, апошніх у маім жыцці нарах... а ў мяне хапала нараў!.. якое шчасце, кажу, што маім суседам аказаўся менавіта ты!

— А каб быў хто другі — няўжо ты не расказаў бы тое, што расказваеш мне?

— Не ведаю... Магчыма, і не расказаў бы.

— Відаць, усё-такі расказаў бы і некаму другому. Настала напэўна ў цябе такая часіна, што табе трэба выказацца, пільна трэба.

Ён — ужо ў каторы раз сёння — задумаўся і маўчаў доўга. Я не перашкаджаў яму думаць. Бо мяне і самога ўзяў одум. Я наспрабаваў уявіць сабе тую дзяўчыну-кіяскёрку, але ў мяне нічога не атрымлівалася. Магчыма, таму, што мне не было з кім параўнаць яе. Усе дзяўчаты, якіх я ведаў дасюль — у школе, на нашай вуліцы — не падыходзілі на ролю Мар'яны. Усе яны, нават самыя прывабныя, не былі, па маю думку, дастаткова прыгожымі, каб закахацца ў іх вось так, з першага імгнення — і назаўжды. А тая аршанская Мар'яна была, безумоўна, прыгажосці незвычайнай. Нават, як уяўлялася мне, фантастычнай.

А адкуль у яго, думаў я яшчэ, такое імя — Мар'ян?.. Нейкае нібы і не наша... І гэта ж трэба было, каб у дзяўчыны аказалася гэткае самае імя!..

Мар'ян і Мар'яна.

Што ж у іх было потым? Няўжо лёс разлучыў іх? Звёў раптам на кароткі час — ад цягніка да цягніка — і разлучыў потым назаўсёды?

— Ты спіш? — ціха спытаў сусед.

— Што ты! — паспешліва сказаў я.— Ані не сплю!

— Я зараз зноў буду расказваць... Зараз...

Мне было ўжо вельмі горача, я ляжаў увесь узмакрэлы. Стараючыся не патурбаваць суседа, я асцярожна адхінуў шынель.

— Ты дужа не раскрывайся,— сказаў Мар'ян.— Табе трэба як след прапацець.

— Я ўжо і так прапацеў.

— Піць хочаш?

— Дужа хачу.

— Чаму ж не сказаў?

— Думаў — перацярплю.

— Дарэмна.

Ён даў мне напіцца. Тады выцер ручніком мне твар.

— Дзякую, Мар'ян.

Я ўпершыню сказаў услых яго імя. Мне здалося, што ён нават здрыгануўся.

Праз хвіліну ён спытаў:

— Ты можаш слухаць далей?

— Магу і буду,— адразу адказаў я.— Расказвай, Мар'ян.

— ...Тады я яшчэ не ведаў, не ўсведамляў да канца, што ўжо цалкам закаханы ў Мар'яну, не ведаў і таго, што і ў яе пачало нараджацца адпаведнае пачуццё,— тады мы проста стаялі пасярод вакзала і дзівіліся з тае незвычайнай акалічнасці, што ў нас агульныя імёны і яшчэ шмат чаго агульнага.

— Няўжо гэта магчыма? — гаварыла яна, азіраючы мяне з галавы да ног, нібы жадаючы пераканацца, што перад ёю жывы чалавек, што я існую, а не з'яўляюся вынікам нейкага недарэчнага жарту альбо розыгрышу.— Гэта ж як у казцы!

— Або як у дрэнным кінафільме,— сказаў я.

— Чаму — у дрэнным? — не пагадзілася яна.

— Ну калі не ў дрэнным, дык, ва ўсякім разе, у непраўдападобным.

— Але ж усё гэта — чыстая праўда! Усё праўда! Праўда! — паўтарала яна, як закліванне.

— Праўда, Мар'яна! — сказаў я.

— Праўда, Мар'ян! — сказала яна.

І мы зноў засмяяліся.

— Але што ж нам рабіць? — заклапочана сказала потым яна, і мяне вельмі кранула гэтае *нам*. Зрабілася неяк хораша-хораша на сэрцы.— Вам жа трэба недзе начаваць.

— Гэта не самая вялікая праблема ў маім жыцці,— сказаў я.— Цяпер лета, а летам, як сцвярджаюць вопытныя людзі, кожны кусцік перапачаваць пусціць.

— Вы і сябе адносіце да людзей вопытных?

— Дзе ўжо мне!

— Вось бачыце. У такім разе варта паклапаціцца не толькі пра кусцік, але і пра дах над ім. Здаецца, я вам і ў гэтым здолею памагчы.

— Якому ж богу мне маліцца, што ён паслаў мне вас?

— Гарадскому аддзелу «Саюздруку» ў асобе яго начальніка таварыша Чухнюка.

— Хвала і пашана таварышу Чухнюку!

— У горадзе, у гасцініцы, дзяжурным адміністратарам працуе... між іншым, сама я жыву тут непадалёк, у станцыйным пасёлку, па вуліцы Новы быт... дык вось, у горадзе, у гасцініцы, адміністратарам працуе мая цётка. Паспрабую пазваніць — а раптам яна якраз сёння дзяжурыць?

— Не варта званіць, Мар'яна,— сказаў я.— Усе свае дакументы, каб было больш надзейна, я паклаў у чамадан.

— А чамадан... паехаў?..— здагадваючыся, жахнулася яна.

— Ту-ту-у!

— Чаго ж вы маўчыце!

— А што ж мне — лямантаваць на ўсю Оршу? Занятак гэты безнадзейны.

— Вы нібы малое дзіця,— пасур'ёзнела Мар'яна.— Хадзем хутчэй да дзяжурнага па станцыі.

Яна зноў пацягнула мяне некуды. Неўзабаве мы апынуліся перад дзвярыма, на якіх была прымацавана шыльда: «Пабочным асобам уваход строга забаронены». Не зважаючы на гэтае катэгарычнае папярэджанне, Мар'яна рашуча прачыніла дзверы, шапнуўшы мне:

— Смялей!

Пакой, у якім мы апынуліся, быў спрэс застаўлены нейкімі незнаёмымі мне прыладамі. За сталом з пакатым верхам сядзеў чалавек з чырвонай фуражкай на галаве і штосьці злосна крычаў, хоць у пакоі нікога не было. Я здагадаўся, што ён крычыць у мікрафон.

Накрычаўшыся, чалавек павярнуўся да нас і зусім іншым, ужо лагодным і цёплым голасам сказаў:

— Мар'яна, ты ж ведаеш, нават табе сюды прыходзіць нельга.

— Сяргей Мітрафанавіч, але ў нас вельмі важная справа,— умольна сказала Мар'яна.— Чамадан паехаў, а гаспадар застаўся!

— Ясна. Праз цябе застаўся? — Дзяжурны па станцыі акінуў мяне не вельмі прыхільным позіркам. Быў ён немаладым ужо чалавекам, з кароткімі вусікамі, з невялічкаю бародкаю і, здаецца, з голай галавою: ва ўсякім разе, на скронях валасоў не было.

— Што вы, Сяргей Мітрафанавіч! — не дужа перакануча запярэчыла Мар'яна.— Ён сам застаўся... выйшаў быў на хвіліну з вагона... і трошачкі спазніўся. А цягнік тым часам пайшоў... лепельскі.

— Ясна, хлопцу ў самую апошнюю хвіліну спатрэбілася купіць свежую газету, бо без яе... Нумар вагона? — раптам спытаў ён у мяне.

— Восьмы,— адказаў я.

— Да якой станцыі меўся ехаць?

Я сказаў да якой.

— Ідзі, дачытвай сваю газету,— буркнуў мне дзяжур-

ны. І, пасміхаючыся, дадаў: — А мо гэта не газета, а раман?

— Дзякуй, Сяргей Мітрафанавіч! — сказала Мар'яна.

— Вы праўду кажаце — гэта раман,— сказаў я дзяжурнаму.— І буду я чытаць яго ўсё жыццё.

Мар'яна пацягнула мяне за дзверы.

— А вы яршысты,— сказала яна, калі мы адышліся ад дзвярэй, і зазірнула мне ў вочы.

— Не люблю, калі дзяды блазнуюць, як дзеці.

— Ён ніякі не дзед. Ён стары халасцяк.

— Тым больш.

— Гэта наш сусед.

— Зрэшты, я сказаў яму праўду.

Яна зноў зазірнула мне ў вочы. Тады паспешліва прамовіла:

— А цяпер давайце зоймемся ўсё ж гасцініцай.

— Пачакайце,— сказаў я.— Гэта вы спецыяльна зачынілі свой кіёск, каб заняцца маімі справамі, так?

— Не бярыце на сябе задужа многа,— сказала яна.— Проста я скончыла работу і, выходзячы з вакзала, выпадкова сустрэла вас.

— Ясна,— сказаў я тонам дзяжурнага па станцыі.

— Што вам ясна? — насцярожана перапытала яна.

— Мар'яна, мілая, вы скончылі работу, і вам трэба дамоў, вас, напэўна, чакаюць...

Яна прыпынілася. Прыпыніўся і я.

— Вы хочаце, каб я пайшла дамоў? — глуха спытала яна.

— Не хачу! — амаль крыкнуў я.— Не хачу! Не хачу! Але... я не маю права затрымліваць вас... не маю права патрабаваць, каб вы...

— Ясна,— сказала тады і яна тонам дзяжурнага па станцыі.

І мы — у каторы ўжо раз сёння — адначасова разрагаталіся.

— А ну, беспашпартны бадзяга, паехалі ў горад! — загадала Мар'яна і ўзяла мяне пад руку.

— Але ж вы збіраліся папярэдне пазваніць.

— А навошта званіць? Так або інакш, дзяжурыць мая цётка або не дзяжурыць, у гасцініцу ўсё роўна ўладкавацца вам трэба.

— І вы ўпэўнены, што без вас я аніяк не ўладкуюся?

— А вы ўпэўнены, што ўладкуецеся?

Я падумаў і прызнаўся:

— Не, не ўпэўнены...

— Вось бачыце. Дарэчы, а грошы ў вас ёсць?

— Грошы ёсць! — сказаў я.— Не такі ўжо я дурань, каб класці грошы ў чамадан.

— Вы разумнік. Бо ў адваротным выпадку мне давялося б зрабіцца растратчыцай, залезці ў дзяржаўную кішэню... да заўтрашняга дня, вядома.

— Абыдземся без дзяржаўнай кішэні.

— То і добра.

У аўтобуснай касе я ўзяў білеты, мы селі ў старую абшарпаную калымагу і паехалі. Калымага неміласэрна калацілася ўсім сваім начыннем, то адкідаючы нас ледзь не пад столь, то кідаючы адно да аднаго, і мы разы са два нават стукнуліся лбамі. Спружыны ў сядзеннях пад намі рыпелі, стагналі, скавыталі. У дадатак да ўсяго недзе пасярэдзіне дарогі матор нашай калымагі аглушальна стрэліў і заглух. Шафёр вылез з машыны, падняў капот, усцёр запалку і колькі часу задумёна пазіраў на аўтобусныя вантробы, пакуль запалка не патухла. Тады шафёр апусціў капот, абышоў машыну, пастукаўшы для нечага нагою па чарзе ў кожнае кола і, узлезшы на сваё месца, флегматычна абвясціў:

— Іскры няма.

Пасажыры пачалі абурацца, лаячы і шафёра і ягонае начальства. Але з машыны чамусьці ніхто не выходзіў.

— Тут ужо недалёка,— сказала Мар'яна,— дойдзем самі.

Мы выйшлі з машыны, і толькі тады за намі падаліся астатнія пасажыры, цяпер ужо маўклівыя, злосныя адзін на аднаго.

Было цёмна, на небе — ні месяца, ні зорак. Куды ісці, на што арыентавацца? Стваралася такое ўражанне, нібы мы стаім сярод голага поля, і каб дабрыць да якога-небудзь жытла, не хопіць і ночы. Я сказаў пра гэта Мар'яне.

— Глупства,— сказала яна.— Пройдзем пару соцень метраў і ўбачым агні горада. Давайце вашу руку і рушым. Я добра ведаю дарогу, да таго ж у мяне каціны зрок, я выдатна арыентуюся ў цемры.

— Адкуль ён у вас, той каціны зрок? Выдумляеце, каб падбадзёрыць мяне. Толькі майце на ўвазе — я не з палахлівых.

— Нічога я не выдумляю. А адкуль ён у мяне, мой незвычайны зрок, я і сама не ведаю. Яшчэ як была малая, выявіла, што ў цемры бачу тое, чаго другія не бачаць. Гэтая здольнасць асабліва выручала мяне, калі мы дзецьмі латашылі яблыкі ды грушы ў чужых садах.

Мы пабраліся за рукі і пайшлі.

Ой, як жа мне прыемна было адчуваць яе руку ў сваёй! Рука ў яе была маленькая, мякенькая, цёпленькая, і я падумаў — хай бы да горада было не кіламетр ці два, а сто, тысяча кіламетраў, каб вось так ісці і ісці ў апраметнай цемры і адно адчуваць Мар'яніну руку ў сваёй.

## 5

Мяне зноў пачало калаціць, і я, стараючыся, каб не заўважыў Мар'ян, стаў нацягваць на сябе шынель.

Ды ён заўважыў. І, перастаўшы расказваць, пачаў памагаць мне.

— Нічога, нічога,— сказаў я,— не трэба, я сам. Ты гавары далей.

— Давай зробім перапыначак,— сказаў Мар'ян.— Перачакаем, пакуль табе зробіцца лепей. Я вельмі шкадую, што нічога не магу зрабіць для цябе.

— Абыдзецца. Во зноў угрэюся, і пройдзе,— сказаў я, калоцячыся ўсім целам.— Мне скора стане зусім добра.

Я маніў — і яму, і сабе. Бо мне рабілася ўсё горш і горш. На нейкі час я ці то страціў прытомнасць і пачаў трызніць, ці то проста заснуў. Хутчэй за ўсё — заснуў. І ўбачыў у сне... Мар'яну. Яна была ў белай, да самых пятаў, сукенцы, а на галаве ў яе быў вянок з васількоў. Яна ішла мне насустрач, але не па зямлі, а недзе над зямлёю, проста ў паветры. Я падумаў, што Мар'яна ідзе гэтак таму, каб не забрудзіць свае ногі — чамусьці босыя, а наўкола была нейкая чорная, як каламазь, твань.

— Я бачыў тваю Мар'яну,— сказаў я, ачнуўшыся.— Во, толькі што бачыў.

— Ага, ты трызніў. Штосьці мармытаў пра босыя ногі.

— Гэта яна была босая, Мар'яна. І ішла проста ў паветры.

— А-а...— сказаў Мар'ян.— А я не мог даўмецца, пра што ты гаворыш.

— Мар'яна таксама гаварыла... Не, не проста гаварыла, а штосьці прасіла. Але што іменна — я не зразумеў. Яна

была далекавата ад мяне, і я дрэнна чуў яе словы. Тады я памкнуўся да яе... і ачнуўся.

— А чаму ты рашыў, што гэта была іменна Мар'яна?

— Бо яна была вельмі прыгожая.

— А якая... якая ўсё ж яна была?

— Я ж табе сказаў — прыгожая.

Мар'ян наклаў свой шынель на мяне, надаткнуў і мой, і свой мне пад бакі. Пасля пачаў гаварыць раздумліва і ціха, нібы сам з сабою.

— Так, яна была прыгожая... але нейкай не нашай, не славянскай прыгажосцю. Мабыць, у рысах яе твару было штосьці мангольскае, і іменна гэта рабіла яе незвычайнай, вельмі жаноцкай і прывабнай. Ва ўсякім разе — для мяне.

Не, у сваім сне-трызненні я бачыў не такую Мар'яну... Падумаўшы крыху, я зразумеў, што бачыў *сваю* Мар'яну, тую дзяўчыну, што здавён малявалася мне ў думках як ідэал прыгажосці, як адна-адзіная ў свеце, якую толькі і можна пакахаць...

— Я доўга спаў? — спытаў я.

— Мабыць, з паўгадзіны. І гэта добра, што ты хоць трохі паспаў. Цяпер табе павінна зрабіцца лепей.

— Ага, павінна,— пагадзіўся я.— А дыхаць мне ўжо і зараз значна лягчэй. Нібы нейкі цяжар ад грудзей адваліўся.

— Ты і напраўдзе дыхаеш не так шумна.

— Вось пабачыш, раніцай мне будзе зусім добра! А зараз... расказвай, калі ласка, далей. Абяцаю, што не засну, пакуль ты не раскажаш усё да канца.

— Скора ўжо і канец будзе.

— Я слухаю, Мар'ян.

— Ты памятаеш, на чым я перапыніўся?

— Памятаю, а як жа! Вы з Мар'янай ішлі праз парк і гаварылі...

— Правільна, ты ўсё памятаеш,— сказаў Мар'ян.— То слухай далей...

...— Нарэшце мы мінулі той парк, перайшлі мост цераз раку. Мар'яна сказала:

— Цяпер, лічыце, мы ўжо ў горадзе. Да гасцініцы тут зусім недалёка.

І сапраўды, адчувалася, што мы ідзём нейкаю вуліцай і паабапал стаяць маўклівыя хаціны. У некаторых яшчэ гарэла святло, другія былі ўжо цёмныя.

Мы ішлі павольна, і нас час ад часу пераганялі нейкія людзі — магчыма, сярод іх былі і пасажыры з нашага аўтобуса.

— Але ж дзіўны ў вас парк,— заначыў я.— Ні людзей у ім няма, ні нават святла.

— А ў ім наладжваюцца гулянні толькі па суботах і нядзелях. А сёння, самі ведаеце, панядзелак.

— Так, так, сёння панядзелак. Цяжкі дзень. Таму і аўтобус наш сапсаваўся.

— І вы на цягнік спазніліся,— засмяялася Мар'яна.

— Ну, тут панядзелак ні пры чым.

— А што ж — пры чым?

Я сумеўся.

— Вы ж ведаеце — часопіс.

— А-а...— сказала Мар'яна.— «Работніца і сялянка».

— Няўжо «Работніца і сялянка»?

— І вы перагарталі часопіс некалькі разоў.

— Я і не заўважыў...

Гэта было падобна на прызнанне ў тым, што на тую хвіліну я думаў зусім не пра часопіс, што ў мяне ў галаве было зусім іншае — а іменна, яна, Мар'яна. Я яшчэ больш сумеўся і змоўк.

Маўчала і Мар'яна.

Тады нечакана для самога сябе я спытаў:

— Мар'яна, а чаму гэта вы надумаліся газетамі ды часопісамі на вакзале гандляваць? Іншай работы не знайшлі?

— Вы забыліся сказаць — і кнігамі.

— Так, і кнігамі.

— Вельмі проста — мне падабаецца, як вы кажаце, гандляваць. Асабліва — гандляваць кнігамі. І што на вакзале — таксама падабаецца. Увесь час новыя людзі, розныя, не падобныя на звычайных гараджан альбо звычайных сельскіх жыхароў — не, яны іншыя, яны пасажыры, яны ў дарозе, і клопаты, і турботы ў іх свае, адменныя. Хто з Масквы ці з Ленінграда едзе, а хто, наадварот, у Ленінград ці ў Маскву. А некаторыя яшчэ далей — у Сібір, на Далёкі Усход або ў Сярэднюю Азію. І — уявіце — кнігі мае таксама едуць з імі. У мяне часам бывае такое адчуванне, нібы я і сама некуды еду — у Сярэднюю Азію, у Сібір, на Далёкі Усход. А потым вяртаюся і зноў ад'язджаю. Вяртаюся і ад'язджаю. Нібы я ўвесь час у дарозе.

— Быць у дарозе толькі ў думках — гэтага мала,— сказаў я.

— Пакуль што мне хапае і гэтага. А там відаць будзе, мо і напраўдзе выпраўлюся ў якую дарогу. У якую-небудзь вельмі вялікую дарогу.

— Тады і я прызнаюся вам... От вы любіце прадаваць кнігі, а я — люблю купляць іх. Страшэнна люблю купляць! Калі ўбачу дзе ў кнігарні цікавую кнігу — магу пайсці на любую ахвяру, абы толькі прыдбаць тую кнігу. У мяне дома ўжо цэлая бібліятэчка сабралася.

— А Ясенін у вас ёсць? — нечакана спытала Мар'яна.

— Не, Ясеніна няма...

— А ў мяне ёсць! Аж тры тамы. Гэта з яго нага збору твораў у чатырох тамах.

— Дык і вы збіраеце кнігі?

— Гэта я выпадкова купіла. Адзін пасажыр летась прадаў. Відаць, у дарозе застаўся чамусьці без грошай. Падышоў да майго кіёска і, вельмі саромеючыся, спытаў, ці не ведаю я каго, хто б купіў у яго Ясеніна. І паказвае мне тры тамы — першы, другі і чацвёрты, трэцяга ў яго чамусьці не было. Ну, я і купіла.

— А яшчэ якія ў вас кнігі ёсць?

— Больш ніякіх...

Памаўчаўшы і, як мне здалося, неўзаметку ўздыхнуўшы, яна дадала:

— Калі гаварыць шчыра, мне проста няма за што купляць кнігі. Я ў сям'і старэйшая, у мяне ёсць яшчэ два брацікі, адзін у сёмым класе, другі ў пятым. А тата наш памёр... ужо чатыры гады таму... І я змушана была пасля дзесяцігодкі ісці працаваць, бо вучыцца далей не выпадала...

Зноў крыху памаўчаўшы, яна спытала:

— А вы любіце вершы Ясеніна?

— Не,— сказаў я,— не люблю.

— А што вы чыталі з яго ных вершаў?

— Ну... гэты... там ёсць такія радкі: «Плюйся, ветер, охапками листьев, ты такой же, как я, хулиган».

— А яшчэ што?

— Штосьці і яшчэ чытаў...— няўпэўнена адказаў,— яшчэ ў школе, хлопцы давалі, але цяпер ужо і не памятаю, што іменна...

— То як жа вы можаце гаварыць, што не любіце паэта, калі амаль нічога не чыталі яго нага?

— А чаму я павінен любіць кулацкага паэта?

— Які дурань сказаў вам, што Ясенін — кулацкі паэт?

— Чаму — дурань? Гэтак нас вучылі ў школе. Гэта афіцыйная думка.

— Вам проста не пашанцавала па настаўніка рускай літаратуры. А вось наша Ніна Антонаўна прывучала нас, каб мы самі разбіраліся, дзе сапраўдная паэзія, а дзе — падробка пад паэзію.

— І яна ўбіла ў вашы галовы, што Ясенін — гэта і ёсць сапраўдная паэзія?

— Так, Ясенін — гэта сапраўдная руская паэзія. Шкада, няма часу, а то я пачытала б вам яговыя вершы, я ведаю многа чаго на памяць, і вы самі пераканаліся б, што гэта такое — паэзія Ясеніна.

— Дык чытайце!

— Але мы прыйшлі ўжо, вось і гасцініца,— і яна паказала на будынак, да якога мы якраз падыходзілі.

Я не разгледзеў і не запомніў таго будынка, нават не ведаю, як называлася вуліца, на якой ён стаяў,— мае думкі, як ты сам разумееш, былі па той час заняты іншым.

— Вы пачакайце тут,— сказала Мар'яна,— а я пайду на перагаворы. Як парламенцёр. Але давайце спачатку прыдумаем якую-небудзь больш-менш праўдападобную гісторыю...

— Якую гісторыю? — не зразумеў я.

— Наконт таго, што мы з вамі добра знаёмыя... даўно знаёмыя... Бо не магу ж я сказаць цётцы Мальвіне, што прыйшла хадайнічаць за зусім незнаёмага чалавека.

— Але ж мы і напраўдзе добра знаёмыя! — усклікнуў я.— Мы цэлую вечнасць знаёмыя!

— Вы так лічыце? — Яна пільна паглядзела на мяне.

— Я так лічу! А тое, што мы сустрэліся толькі сёння, не мае ніякага значэння. У мяне такое адчуванне, нібыта я ведаю вас даўно і вы мяне таксама ведаеце даўно. Не, наша знаёмства пачалося не сёння і скончыцца не заўтра. Яно не мае пачатку ў агульнапрынятым сэнсе слова і не будзе мець канца!

— Паслухайце, вы, часам, не на юрыдычным факультэце вучыцеся?

— На юрыдычным,— сумеўся я.— Але як вы здагадаліся?

Яна засмяялася.

— Вельмі проста. Якраз з гэткім імпэтам кажуць свае прамовы адвакаты, калі абараняюць злачынцаў.

І Мар'яна засмяялася яшчэ мацней.

— Не трэба смяяцца, Мар'яна,— сказаў я і зрабіў крок да яе. Цяпер мы стаялі зусім блізенька адно да аднаго. Я паклаў сваю руку ёй на плячо і адчуў раптам, што маю руку нібы агнём апякло.— Не трэба смяяцца, прашу вас. Мы ніякія не злачынцы, мы...

— Я не з вас смяюся, я з сябе смяюся,— перапыніла яна мяне. Пасур'ёзнеўшы і не адводзячы свайго позірку ад майго і не прымаючы маёй рукі са свайго пляча, Мар'яна гаварыла далей: — Дык якую версію мы прымем? Бачыце, я аперырую тэрмінам з вашай навукі. На жаль, мае веды юрыспрудэнцыі далей гэтага не ідуць.

— Скажыце вашай цётцы, што я ваш жаніх, а вы мая нявеста.

— Не блазнуйце, Мар'ян. Давайце дамовімся так: вы — мой колішні школьны таварыш. Мы з вамі вучыліся разам у школе, з першага да шостага класа.

— Чаму іменна да шостага?

— Я прыгадала, што і сапраўды са мною вучыўся адзін хлопец, які пасля шостага класа разам з бацькамі паехаў у Віцебск. Звалі яго Толікам. Ага, ён быў Толік Белавус. Дарэчы, ён быў нечым падобны на вас... аддалена, але падобны.

— То, можа, і мне назвацца Толікам Белавусам? Дакументаў жа ў мяне ўсё роўна няма ніякіх.

— Правільна. Значыць, вы цяпер — Анатоль... скажам, Іванавіч, бо ягонага імя па бацьку я не памятаю, а мо і наогул не ведала... Анатоль Іванавіч Белавус. Запомніце?

— Памяць у мяне добрая, не турбуйцеся.

— А ўсё астатняе будзе чыстая праўда. Вы адсталі ад цягніка, убачылі ў кіёску мяне, пазналі, потым расказалі пра сваю бяду, і я ўзялася памагчы вам. Вельмі натуральна.

— За выключэннем аднаго,— сказаў я.— Калі мы знаёмыя ажно з першага класа, то павінны звяртацца адно да аднаго на «ты».

— Вось што значыць юрыст! — зноў засмяялася Мар'яна і наклала сваю руку на маю, каб зняць яе з пляча. Але не зняла. Я ўвесь неяк сцішыўся, замёр. Яна правяла сваёй рукою па маёй адзін раз, і другі, і трэці.— Ну што ж, Толік Белавус, чакай мяне тут і маліся, каб усё было добра.

— Чакаю цябе, Мар'яна, і веру, што ты прынясеш мне ўдачу!

Толькі тады яна зняла маю руку са свайго пляча, але

адпусціла яе не адразу, а на нейкі момант затрымала ў сваёй руцэ і ледзь улоўна пацiснула. Потым яна імкліва павярнулася і знікла за дзвярыма гасцініцы.

А я стаяў перад дзвярыма на вузенькім тратуарчыку як скамянелы, і толькі сэрца ў грудзях моцна калацілася, але і яно раз за разам давала перабоі — мабыць, да апошняга абцяжаранае абрынутым на яго пачуццём, якое для адных робіцца шчасцем, для другіх — бядою.

Яе доўга не было.

Каб не прыцягваць увагу людзей, якія хоць і зрэдку, але ўсё ж ішлі ў гасцініцу і выходзілі з яе альбо проста праходзілі міма, я адышоўся ад дзвярэй і пачаў пахаджаць уперад і назад. «Відаць, нічога ў Мар'яны не атрымліваецца з яе місіяй,— думаў я,— і давядзецца мне шукаць прытулку ў якім-небудзь парку. Можа, нават і ў тым, паўз які мы праходзілі. Але трэба будзе спачатку праводзіць Мар'яну, да саменькага яе дому».

І ад гэтае думкі зноў моцна закалацілася сэрца, і захацелася заспяваць што-небудзь узнёслае, але спяваць я не ўмеў, таму проста замармытаў: «Та-ра-ра-рам-там-там... Там-та-ра-ра-рам...»

— Гэта што — жалобны марш якога-небудзь індзейскага племені? — пачуў я раптам за спіною Мар'янін голас.

Павярнуўшыся да яе, я адказаў гэткім жа тонам:

— Не, гэта ўрачысты гімн у гонар вашае цёткі, якая непахісна стаіць на варце парадку і законнасці і наадрэз адмовілася пусціць у даверану ёй гасцініцу бяспашпартнага бадзягу.

— Мая цётка... на шчасце, якраз яна дзяжурыць сёння!.. Мая цётка лепшае думкі пра Толіка Белавуса, чым ён пра яе!

— Няўжо вам удалося...

— Табе! — папраўіла мяне Мар'яна.

— Няўжо табе ўдалося пераканаць цётку ў тым, што Толік Белавус не нейкі там прайдзісвет, а даволі прыстойная асоба?

— Я пераканала цётку ў тым, у чым пераканана сама.

Я зноў хацеў пакласці ёй руку на плячо, але яна ў гэты момант павярнулася да дзвярэй гасцініцы.

— Прабач, Мар'яна, за дурное пытанне... але скажы мне: ты маеш на ўвазе Толіка Белавуса альбо... мяне?

— На дурныя пытанні не адказваюць,— сказала яна.— Хадзем. Над цётчыным акенцам вісіць прыгожая шыльдач-

ка: «Вольных месц няма». Але цётка некаму пазваніла, відаць, нейкаму высокаму начальніку, і той дазволіў зняць бронь з «люкса». Ты будзеш начаваць у «люксе»!

— Пра гэта я марыў усё жыццё! — жартаўліва сказаў я.

— А можа, у цябе не хопіць грошай на той «люкс»? — занепакоена спытала раптам Мар'яна.— Ён каштуе дваццаць пяць рублёў!

— Падумаеш — дваццаць пяць! У мяне ёсць аж трыццаць шэсць!

— То ты вельмі багаты чалавек! — таксама жартаўліва ўсклікнула тады і Мар'яна.

Я расчыніў перад Мар'янай дзверы, прапусціў яе наперад, а другія дзверы яна расчыніла сама, і мы апынуліся ў невялікім вестыбюлі, дзе за перагародкаю (палавіна яе была з дрэва, а другая палавіна, верхняя, з матавага шкла) была відаць праз акенца мажная паўпатварая кабета з пранізлівым позіркам вялікіх цёмных вачэй. Над акенцам сапраўды вісела шыльда: «Вольных месц няма».

— Во гэта і ёсць Толік Белавус,— сказала Мар'яна да кабеты.— А гэта,— сказала яна да мяне, паказваючы вачыма на кабету,— мая дарагая цётачка, Мальвіна Ягораўна. Будзьце знаёмыя.

— Вельмі прыемна,— нізкім грудным голасам сказала Мальвіна Ягораўна.— Мне Мар'яна сказала пра вас колькі добрых слоў!

— Мар'яна валодае здольнасцю бачыць у чалавеку перш за ўсё станоўчыя якасці,— зазначыў я.

— А вы маеце і адмоўныя?

— Як і кожны чалавек.

— Хацелася б, каб іх у вас было як найменей.

— І мне таксама хацелася б гэтага.

— У вас востры язык,— стрэліла ў мяне пранізлівым позіркам Мальвіна Ягораўна. І спытала ў Мар'яны: — Ён і ў школе быў такі самы?

— Такі самы,— давялося схлусіць Мар'яне.— Ён ані не перамяніўся з таго часу. Але што яму, вы казалі, трэба запоўніць?

— Вось гэты бланк.— І Мальвіна Ягораўна падала Мар'яне нейкі лісток паперы.

Пасярэдзіне вестыбюля стаяў круглы абшарпаны стол і тры крэслы пры ім. На стале была вучнёўская чарніліца-невылівашка з уваткнутаю ў яе зялёнаю ручкаю, а побач — масіўнае мармуровае прэс-пап'е.

Мар'яна з лістком у руках села за стол першая, тады сеў побач і я. Яна паклала перада мною той лісток.

— Пішы і пастарайся нічога не пераблытаць,— ціха сказала яна мне.

На лістку, аказваецца, трэба было напісаць прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, месца нараджэння, адкуль і чаго прыехаў, на які час, і яшчэ адказаць на пяць ці шэсць іншых пытанняў. Самым складаным было адказаць на тое, які нумар майго пашпарта. Заўважыўшы, што я задумаўся, Мар'яна зазірнула ў мой лісточак і шапнула:

— Пішы мой нумар.

— А ты памятаеш яго?

— Чамусьці памятаю: 163446.

— У цябе выдатная памяць.

— Не вельмі. Але нумар пашпарта немаведама чаму запомніла. Мабыць, прадчувала, што ён спатрэбіцца.

— Ты мяне здорава выручыла.

— Я зайздрошчу табе,— сказала Мар'яна.— Ты будзеш начаваць у нейкім таямнічым «люксе». Ніколі не бачыла «люксаў».

— То зойдзем — і зірнеш.

— Што ты, няёмка! — сказала Мар'яна.

— Падумаеш — няёмка!.. Ты толькі зірнеш, і мы адразу пойдзем.

— Куды — пойдзем?

— Як гэта — куды? Я ж павінен праводзіць цябе дамоў. Не ісці ж табе адной сярод ночы. Аўтобус той будзе стаяць да скону веку.

— А і праўда, я буду баяцца ісці адна,— прызналася Мар'яна.

— Ну вось бачыш.

Я аддаў Мальвіне Ягораўне лісток, заплаціў грошы, атрымаў квіток. А яшчэ Мальвіна Ягораўна дала мне ключ і сказала:

— Другі паверх, нумар дваццаць шосты.

І тады раптам Мар'яна спытала ў Мальвіны Ягораўны:

— Цётачка, а можна мне зірнуць на той ваш «люкс»?

Мальвіна Ягораўна стрэліла ў яе знішчальным позіркам сваіх вялікіх вачэй і сказала:

— Не палажана.

— Ну цётачка, родненькая, я толькі на адну хвілінач-ку! Зірну — і адразу назад!

— Пабочным асобам знаходжанне ў нумарах забаронена,— папулярна растлумачыла Мальвіна Ягораўна.

— Якая ж я пабочная асоба? — усклікнула Мар'яна.

Мальвіна Ягораўна зноў стрэліла ў яе вачыма.

— Тым больш не паложана заходзіць жанчынам да мужчын і наадварот.

— Ат, якое глупства!— ужо злуючыся сказала Мар'яна.

Тут у вестыбюль уваліліся чацвёра мужчын з чамаданамі і пайшлі ў наступ на Мальвіну Ягораўну, патрабуючы начлегу. Мальвіна Ягораўна паказала ім на шыльдачку. Узняўся вэрхал.

— Гайда! — сказаў я Мар'яне, цягнучы яе за руку.

Мы кінуліся да лесвіцы і адным духам узляцелі на другі паверх. Дзверы з лічбай «26» аказаліся ў самым канцы калідора. Я паспешліва адамкнуў іх, і мы апынуліся ў «люксе». У ім панавала цемра. Я сказаў:

— Зараз пашукаю выключальнік. Звычайна яны бываюць недзе каля дзвярэй. Зараз будзе святло.

— Пачакай, не запальвай,— сказала Мар'яна.— Давай паспрабуем адгадаць, што яно такое — гэты таямнічы «люкс».

— Давай,— згадзіўся я.— Мы ўбачым тут... ведаеш што?.. палац, якому пазайздросціў бы нават сам турэцкі султан!

— Не, мы ўбачым зараз спачывальню якой-небудзь старажытнай княгіні... напрыклад, княгіні Праслаўны.

— Навошта мне спачывальня княгіні Праслаўны? Калі ты не згодна на палац турэцкага султана, то няхай будзе хоць бы замак індыйскага магараджы. Але каб абавязкова быў фантан. Я дужа люблю фантаны!

— Чаго гэта цябе цягне толькі па замежнае? Вазьмі што-небудзь наша.

— Добра, бяру наш церам-церамок... толькі каб фантан у ім усё ж быў. Невялічкі такі персанальны фантанчык, няхай нават з адным струменьчыкам.

— Дару табе церам-церамок з персанальным фантанам! — урачыста сказала Мар'яна.

— Дзякуй табе, Мар'яна! — гэтак жа ўрачыста адказаў я.— Пастараюся як след аддзячыць табе!

Намацаўшы рукою выключальнік, я запаліў святло. І адразу ж пачуў гучны Мар'янін смех. Павярнуўшыся ад сцяны, я таксама зарагатаў. Мы знаходзіліся ў самым звычайным невялічкім пакойчыку, да таго ж асветленым вель-

мі слаба — са столі звісала адна лямпа, нават без абажура. У пакоі з правага боку каля сцяны стаяў металічны ложак (праўда, нікеляваны), з левага — шафа на адну створку, а перад акном — пісьмовы стол. І было ў пакоі яшчэ два крэслы з цыратавымі сядзеннямі. Чаму гэты звычайны гасцінічны нумар называўся «люксам», было не зразумела.

— Ну што ж,— сказаў я,— гэтая хароміна ніколькі не горшая за той будан, у якім некаторым людзям удаецца знайсці рай.

— А я ведаю, чаму ён называецца «люксам»! — сказала Мар'яна.

— Чаму?

— Таму, што ў ім ёсць тэлефон!

І сапраўды, на стале стаяла чорная прамавугольная скрыначка з двума ражкамі, на якіх ляжала тэлефонная трубка.

— Так што няма чаго табе асабліва крыўдаваць — замест персанальнага фантана табе даецца персанальны тэлефон,— сказала Мар'яна.

— Прыходзіцца задавальняцца хоць такою кампенсацыяй. Вось толькі шкада — званіць няма каму.

— І да таго ж невядома яшчэ, ці працуе ён.

— А гэта мы зараз праверым.

Я падышоў да стала, узяў трубку, прыклаў да вуха. І адразу ж пачуў голас тэлефаністкі: «Нумар?» Я паклаў трубку назад.

— Працуе,— сказаў я Мар'яне.— А ў цябе дома няма тэлефона?

— Адкуль жа ён у мяне будзе?

— Шкада. А то я пазваніў бы табе, і мы гаварылі б усю ноч!

— Пра што?

Я падумаў.

— Ты чытала б мне вершы Ясеніна.

— І ты, слухаючы іх, заснуў бы.

— Не заснуў бы! — рашуча запярэчыў я.— Я слухаў бы цябе да самае раніцы!

— Як бачыш, гэта немагчыма.

— На жаль.

— Мне трэба ісці, Мар'ян. Я і так затрымалася ў цябе залішне доўга. Што там падумае цётка Мальвіна...

— Давай прысядзем на дарогу,— прапанаваў я.

— Давай,— згадзілася яна.

Мы паселі на крэслы — яна на тое, што стаяла каля ўвахода, непадалёк ад ложка, а я прымасціўся на другое, каля стала.

Памаўчаўшы, я сказаў:

— Дазволь у цябе спытаць...— І асекся, не могучы вымавіць тое, што круцілася ў мяне на языку.

— Я ведаю, пра што ты хочаш спытаць,— сказала Мар'яна.— Не, я не замужам. Што ты хочаш яшчэ ведаць пра мяне?

— А больш я нічога не хачу ведаць! — узрушана сказаў я і ўстаў з крэсла. Устала і Мар'яна.

І раптам зазваніў тэлефон. Гэта было так нечакана, што мы абое ўздрыгнулі. Потым тэлефон зазваніў яшчэ — больш настойліва і патрабавальна. Я ўзяў трубку.

— Толік, гэта вы? — пачуўся жаночы голас. Я здагадаўся, што звоніць Мар'яніна цётка.

— Гэта я, ага,— чамусьці вельмі ціха адказаў я і зірнуў на Мар'яну. Яна штосьці паказвала мне па мігі, але я не разумеў, што іменна.

— Мар'яна яшчэ ў вас? — спытала Мальвіна Ягораўна.

— Не, яе няма,— не вагаючыся, сказаў я.

— То дзе ж яна? — заклапочана спытала Мальвіна Ягораўна.

— Пайшла дамоў,— напрапалую маніў я далей, бо адступаць ужо не было куды.— Пабыла трошкі і пайшла.

— Дзіўна...— прамовіла Мальвіна Ягораўна.— Чаму ж я не бачыла, як яна выходзіла?.. А-а, магчыма, гэта было якраз тады, калі я ўладкоўвала тых мужчын з Мінска.

— А вы ўсё ж уладкавалі іх? — Цяпер я ўжо не пазіраў на Мар'яну, я не мог бачыць яе вачэй.

— Давялося аддаць ім кабінет нашага дырэктара. Але з умоваю, каб да васьмі гадзін раніцы іхняга і духу там не было. Бо ў восем я змяняюся, а ў дзевяць прыходзіць дырэктар.

— Няўжо ў яго такі вялікі кабінет? — вельмі натуральна здзівіўся я.

— Не, кабінет не дужа вялікі. Там стаіць пісьмовы стол, канапа і восем крэслаў. Крэслы мы выставілі ў калідор, і такім чынам нам удалося пакласці на падлогу яшчэ тры матрацы. З бялізнаю, вядома.

— Добра, што ў вас якраз знайшліся лішнія матрацы.

— Знайшліся... Ну што ж, спакойнай вам ночы, Толік.

— Дзякую, Мальвіна Ягораўна. І вам таксама жадаю спакойнай ночы.

Але яна чамусьці не клала трубку на апарат. Трымаў сваю каля вуха і я.

— Дазвольце вам заўважыць,— сказала нарэшце Мальвіна Ягораўна,— што на вашым месцы я ўсё ж праводзіла б Мар'янку... Хоць бы да аўтобуса.

— Я і хацеў быў праводзіць, але яна не дазволіла. Сказала... сказала, што вы можаце блага пра яе падумаць.

— Гэта на яе падобна. Яна ў нас такая.

— Яна ў вас харошая! — не стрымаўся, каб не сказаць, я.

Мальвіна Ягораўна тады нарэшце паклала трубку. Паклаў сваю і я.

— Што мы нарабілі! — у роспачы сказала Мар'яна і, бы знямоглая, апусцілася на крэсла.— Што мы нарабілі!..

— Гэта я нарабіў, даруй мне, Мар'яна,— злуючыся на сябе, глуха сказаў я.— Сам не ведаю, чаму я сказаў гэтак... Даруй мне, калі ласка, даруй!

— Я сама вінаватая. Гэта я паказвала табе, каб ты сказаў, што мяне няма тут... вось ты і сказаў. Я сама вінаватая.

— Не, вінаваты я! Я не зразумеў, што ты мне паказвала, я ўзяў сам і ляпнуў, нібы мяне д'ябал пацягнуў за язык.

Яна маўчала, апусціўшы галаву і не пазіраючы на мяне.

— Мар'яна, мілая, не трэба гэтак злаваць на мяне, я вельмі прашу цябе! — умольна сказаў я.— Ну хочаш, я стану перад табою на калені?

— Гэтага яшчэ не хапала...— падняўшы нарэшце галаву, неяк асабліва мякка сказала Мар'яна.— Не трэба, ты ж ні ў чым не вінаваты.

— Зрэшты, нічога страшнага і не здарылася...— пачаў быў я, але Мар'яна перапыніла мяне:

— Здарылася, Мар'ян. Няўжо ты не разумееш? Я ж цяпер не магу пайсці адсюль... да самае раніцы, да васьмі гадзін, пакуль не зменіцца цётка. Бо калі яна ўбачыць мяне, яна і напраўдзе бог ведае што падумае.

— А можа, удасца як-небудзь прашмыгнуць? Давай паспрабуем,— прапанаваў я.

— Не ўдасца, не варта і спрабаваць. Колькі цяпер часу?

Я зірнуў на свой вялікі наручны гадзіннік, які падарыў мне бацька, калі я паступіў ва універсітэт.

— Дванаццатая гадзіна.

— Цяпер яна пільна сочыць за ўсім, што робіцца вакол. А ў дванаццаць замкне ўваходныя дзверы на ключ, схавае ключ у стол і будзе сядзець у сваім мяккім крэсле да раніцы.

— А дзверы толькі адны?

— Адны... Прыходзячы да нас, цётка часта расказвае пра свае начныя дзяжурствы і пра розныя прыгоды з насельнікамі гасцініцы. Так што там цяпер і мыш не прашмыгне незаўважанай, а ты кажаш — давай паспрабуем.

— Ну што ж, калі так ужо сталася, то заставайся, Мар'яна. І вер мне... прашу паверыць мне, што я...

— Я веру табе, Мар'ян,— перапыніла яна мяне.— Сама не ведаю чаму, але веру.

— Дзякую табе, Мар'яна, я апраўдаю твой давер!

Яна раптам усміхнулася.

— Чаго ты? — сумеўся я.

— Ведаеш, чаго мне зараз больш за ўсё хочацца? — яшчэ шырэй усміхаючыся і гэтай усмешкай нібы падводзячы рысу пад нашай гаворкай пра недарэчнасць яе становішча, сказала Мар'яна.— Ведаеш?

— Ну?

— Есці! — ужо амаль смяялася Мар'яна.— Мне раптам страшэнна захацелася есці! Бачыш, якая проза. Ты патрабуеш ад мяне вершаў Ясеніна, а я ад цябе — накарміць мяне. На вялікі жаль, ты нічым не здолееш памагчы мне прагнаць мой раптоўны голад.

— Здолею! — сказаў я.

— Якім чынам?

— Рэстаран жа, мабыць, яшчэ адчынены?

— Хто яго ведае.

— А дзе ён знаходзіцца?

— Я ніколі не была ў рэстаране.

— Спытаю ў твае цёткі, яна ж павінна ведаць.

— А можа, не варта табе хадзіць? Перацярплю як-небудзь да раніцы.

— Навошта табе цярпець? Ды я і сам, прызнацца шчыра, добра-такі выгаладаўся. Зараз адскочу. Адна нага тут, другая там.

— Толькі замкні мяне. І патушы, калі ласка, святло.

— Добра.

— А ў што ж ты возьмеш? У цябе ж нічога няма. Хоць бы газеціна якая была.

— Што-небудзь там прыдумаю.

— Пачакай, я пашукаю.— Мар'яна пацягнула шуфляду стала.— Во, ёсць нейкая старая газета. Усё ж лепей, чым нічога. На, і не забудзь замкнуць мяне.

— Не забуду.

Я ўзяў газету, склаў яе ў некалькі столак, засунуў у кішэню.

— А ты, можа, паляжыш пакуль што на ложку? — нясмела прапанаваў я.

— Не, я лепш пасяджу.

— Як хочаш.

Я выключыў святло, выйшаў у калідор і замкнуў дзверы на два абароты ключа.

Спусціўшыся ўніз і падышоўшы да Мальвіны Ягораўны — яна сядзела на сваім месцы і чытала нейкую кнігу,— я бадзёрым голасам сказаў:

— Мальвіна Ягораўна, вы не ведаеце — рэстаран яшчэ адчынены? А то я штосьці выгаладаўся.

— Павінен быць адчынены,— усміхаючыся мне як старому знаёмаму, адказала Мальвіна Ягораўна.

— А дзе ён знаходзіцца, як да яго патрапіць?

Яна растлумачыла, і я, падзякаваўшы, выскачыў на вуліцу.

Рэстаран я знайшоў хутка. У ім было поўна людзей, усе столікі былі занятыя. А паколькі нічога з гарачых страў я ўсё роўна не мог узяць з сабою, я адразу накіраваўся да буфетчыцы. На зашклёным прылаўку ўбачыў на талерачках невялічкія порцыі нейкай каўбасы, а яшчэ — крыху большыя порцыі нейкага халоднага мяса. Высветлілася, што гэта пячонка. Я папрасіў буфетчыцу даць мне дзве порцыі пячонкі і чатыры порцыі каўбасы.

— І хлеба адпаведна,— дадаў я.

— Сядайце за столік, вас абслужыць афіцыянтка,— чамусьці непрыязна сказала буфетчыца.

— Але ўсе столікі занятыя. Акрамя таго, я хачу ўзяць усё гэта з сабою. Разумееце, прыйшоў да мяне ў госці чалавек, а пачаставаць няма чым. Адпусціце, калі ласка, я буду вам вельмі ўдзячны.

— Выпіць знайшлося, а закусіць — не? — кпліва сказала буфетчыца.

— Не, выпіць таксама няма, але мы непітушчыя.

— Так я вам і паверыла.

— Слова гонару! Магу нават прызнацца — да мяне прыйшла знаёмая дзяўчына... даўно знаёмая.

— Ха, дзяўчат пячонкаю ды каўбасою не частуюць!

— А чым — частуюць?

— Ну, піражным, цукеркамі.

— Тады дайце яшчэ два піражныя і сто грамаў цукерак. Не, дайце дзвесце грамаў цукерак! Самых найлепшых, шакаладных!

Буфетчыца зліталася і адпусціла мне ўсё, што я прасіў. І нават дала паперы загарнуць піражныя і цукеркі. У мяне атрымаліся тры пакупачкі. З імі я і памчаў назад у гасцініцу.

Праходзячы паўз акенца Мальвіны Ягораўны, я пастараўся схаваць за спіну гэтыя свае пакупачкі. Ды яе спрактыкаванае вока цяжка было падмануць. І яна сказала з падазронасцю:

— Аднак вы хутка ўправіліся павячэраць.

— Ага, мне пашанцавала — людзей было мала,— як мага больш спакойна сказаў я.— Нават з сабою сёе-тое прыхапіў, каб раніцою было што перакусіць.

— А вы, як я пагляджу, прадбачлівы малады чалавек,— сказала Мальвіна Ягораўна.

— Ага, я прадбачлівы,— пацвердзіў я.

— Можа, вас чаем пачаставаць? — спытала Мальвіна Ягораўна.— У мяне якраз закіпеў чайнік на плітцы.

— Не, дзякую, я ўжо буду спаць,—сказаў я і падаўся да лесвіцы.

— Тады раніцой прыходзьце чаяваць. Вы рана ўстаеце? Можа, пабудзіць вас?

— Не, я буду спаць позна. Мне няма куды спяшацца. Ды і стаміўся я сёння... перахваляваўся...

— Я разумею вас. Тады спіце сабе на здароўе, колькі вам захочацца. Вас ніхто турбаваць не будзе.

Мабыць, гэта мне толькі здалося, што Мальвіна Ягораўна паставілася да мяне з падазронасцю. А ў апошніх яе словах гучала нават шчырасць і сардэчнасць.

Я падышоў да свайго нумара. Чамусьці доўга не мог патрапіць ключом у адтуліну. Потым, уставіўшы нарэшце ключ і павярнуўшы яго ў замку, я некалькі разоў тузануў за ручку, ды дзверы не адчыняліся... Тады нарэшце я ўспомніў, што замкнуў дзверы на два абароты.

Апынуўшыся нарэшце ў пакоі, я запаліў святло... і аслупянеў. У мяне, як кажуць, вочы на лоб палезлі.

Мар'яны ў пакоі не было.

Я разгублена стаяў каля дзвярэй, дзівячыся, як яно

магло здзеесца такое. Пакой жа быў замкнёны, гэта я ведаў поўна... А вось Мар'яны няма...

Нічога не разумеючы, я падышоў да стала, паклаў на яго свае пакупкі і азірнуўся наўкруг.

Не, Мар'яны нідзе не было.

І тады, неяк інстынктыўна, я ціха і безнадзейна сказаў:

— Мар'яна... дзе ты?..

— Я тут...— нібы з-пад зямлі пачуўся яе голас.

— Дзе, дзе ты? — усклікнуў я, не зусім яшчэ верачы сваім вушам.

Раптам шафа расчынілася і з яе, трымаючы ў руках свае туфлікі, басаном выскачыла Мар'яна.

— Вой, як ты напалохала мяне! — адразу заўсміхаўшыся, прамовіў я.

— А сама я тут яшчэ больш напалохалася! — сказала Мар'яна.— Ледзь богу душу не аддала.

— Хто ж цябе гэтак напалохаў? Кажы хутчэй, што здарылася?

Надзеўшы туфлікі — чорныя лодачкі,— Мар'яна села на сваё ранейшае месца.

— Як толькі ты пайшоў,— пачала расказваць Мар'яна, усё яшчэ бледная ад нечага перажытага ёю,— як толькі ты пайшоў... не, гэта было не адразу, а хвілін, мабыць, праз дзесяць... я пачула ў калідоры нечыя крокі... Не ведаю чаму, але я адразу падумала, што гэта ідзе цётка Мальвіна. Перад дзвярыма... ну вось перад гэтымі... крокі сцішыліся. Я вырашыла, што цётка зараз возьме і адамкне дзверы...

— Але ж я ўзяў ключ з сабою! — сказаў я.

— У іх там ёсць запасныя ключы, я ведаю. На ўсякі выпадак.

— І тады ты...

— І тады я, уся калоцячыся ад страху, схапіла ў рукі свае туфлі і — шась у шафу! Добра, што дзверы ў шафе аказаліся не рыпучыя... а ў нас дома яны так страшэнна рыпяць, што, калі б і тут былі такія, цётка адразу пачула б і пра ўсё здагадалася.

— Няўжо яна заходзіла ў нумар?!

— Не, не зайшла. Пастаяла крыху каля дзвярэй, тады асцярожна падалася назад. А я ўжо не магла вылезці з шафы, стаяла як скамянелая. Усё здавалася: варта толькі вылезці — і яна адразу зойдзе. Ты нават не ўяўляеш сабе, якога страху я нацярпелася!

— Уяўляю! — сказаў я.— Але ўсё, дзякуй богу, міну-

лася... і нас чакае вячэра. Не дужа, праўда, раскошная, але... усё, што я здолеў выпрасіць у буфетчыцы.

— А ты замкнуў дзверы?

— Не, не замкнуў.

— Ідзі хутчэй замкні. А то мне ўсё яшчэ боязна.

Я замкнуў дзверы, пакінуўшы ключ у замку.

— Цяпер нам сам чорт не страшны! — сказаў я.

Тым часам Мар'яна разгарнула пакункі.

— Ого! Нават піражнае і цукеркі! — зусім па-дзіцячы ўзрадавалася Мар'яна.— Як гэта ты здагадаўся ўзяць?

— Гэта не я здагадаўся, гэта буфетчыца навяла мяне на розум,— прызнаўся я.

— Слава кемлівым буфетчыцам! — абвясціла Мар'яна.

Мы размаўлялі вельмі ціха, амаль шэптам.

## 6

Цяпер мне было горача, вельмі горача, хоць я ляжаў раскрыты. Чамусьці я і не заўважыў, калі скінуў з сябе шынялі. А мо я зноў траціў прытомнасць?..

— Што са мною было? — спытаў я ў суседа.

— Ты раптам паўтарыў за мною: «Слава кемлівым буфетчыцам!» і памкнуўся ўскочыць. Але я не пусціў цябе.

— Не памятаю... А ўсё, што ты расказваў, памятаю добра.

— Ты на некалькі хвілін зноў страціў быў прытомнасць.

— Мажліва.

— Гэта добра, што ты хутка ачуўся. А я ўжо думаў — гэта ў цябе цяпер надоўга. Хацеў ісці па доктара. І адно шкадаваў, што не паспеў зрабіць тое, што павінен быў зрабіць... тое, дзеля чаго я і расказваю табе ўсю гэту гісторыю.

— Што ты маеш на ўвазе?

— Вазьмі вось гэту паперку. І схавай яе вельмі надзейна. І барані божа, каб ты нідзе не згубіў яе. Тут я яшчэ назаўчора ўсё напісаў... Маё сапраўднае прозвішча, імя. Адрас маіх бацькоў, іх імёны. Калі ты ўцалееш пасля вайны, абяцай мне, што ты з'ездзіш да іх і раскажаш ім усё пра мяне. Бо яны апі нічога не ведаюць. Я тады так і не даехаў дадому.

— Не даехаў?..

— Не даехаў... Абяцай мне, што ты знойдзеш маіх бацькоў!

— Вядома, знайду, Мар'ян, абавязкова знайду. Але ты і сам уцалееш... павінен уцалець.

— У мяне прадчуванне... заб'юць мяне. Не загінуў тады, то загіну цяпер.

— На вайне не абавязкова ўсе гінуць.

— Але і не абавязкова ўсе выжываюць. Хачу аднаго... вельмі хачу, каб ты выжыў!

— А мне што. Я пастараюся.

— Пастарайся, браток. Схаваў паперку?

— Схаваў. Там і яе адрас?

— Не, яе адраса там няма.

— Чаму?

— Я ж табе не ўсё яшчэ расказаў. Ты не ведаеш, што потым здарылася.

— А што-небудзь... здарылася? — устрывожана спытаў я.

— Здарылася... Жудаснае і непапраўнае.

— Расказвай, Мар'ян, я буду цябе ўважліва слухаць.

— А ты здольны слухаць далей?

— Ага, мне стала значна лепей.

— Трымайся, браток.

Уздыхнуўшы, ён пачаў расказваць зноў.

— ...Тая ноч, як і папярэдні дзень, запомнілася мне з усімі падрабязнасцямі і найдрабнейшымі дэталямі, але часу ў нас з табою засталося не так ужо і багата, таму я пра сёе-тое раскажу табе ў агульных рысах.

Павячэралі мы весела і з добрым апетытам. Тады ўзяліся чытаць вершы. Мар'яна ведала многа чаго з Ясеніна на памяць. Чытала яна хораша, неяк асабліва пранікнёна. Я таксама прачытаў тры вершы Маякоўскага. Адзін час... гэта было ў восьмым класе... мы чамусьці ўсе захапіліся былі Маякоўскім. Нейкі юбілей ягоны адзначаўся — вось я і запомніў тры вершы. У мяне, наогул, памяць выдатная.

Мы не толькі чыталі вершы, але і расказвалі адно аднаму пра сябе, пра свае сем'і, пра свае маленства — наогул, пра ўсё чыста.

Мы і не заўважылі, як праляцела ноч.

Нам было вельмі хораша.

Пад раніцу Мар'яна раптам сказала, смеючыся:

— А ведаеш, у мяне ёсць жаніх.

— Не выдумляй, няма ў цябе жаніха,— заявіў я.

— Праўда, ёсць. Ну, не зусім жаніх, але... так лічаць усе.
— Хто — усе?
— Мая маці. І цётка Мальвіна таксама.
— Хто ён такі? — спахмурнеў я.
— Увогуле неблагі хлопец. Мішка Міхалюта. Працуе памочнікам машыніста. Часта заходзіць да нас — мы жывём на адной вуліцы. Некалькі разоў запрашаў у кіно.
— І ты хадзіла?
— Два разы хадзіла.
— Ён, мабыць, прызнаваўся ў каханні?
— Прызнаваўся.
— А ты? Ты кахаеш яго?
— Ні во столечкі! — Мар'яна паказала на кончык мезенага пальца.
— І правільна робіш. А яму ты гаварыла пра гэта?
— Гаварыла.
— А ён што?..
— Кажа, што я ўсё роўна павінна стаць ягонаю жонкай. Маўляў, хопіць і таго, што ён кахае мяне. А нядаўна ён ведаеш што сказаў? Што калі я не пайду за яго замуж, то ён застрэліць і мяне, і сябе.
— Ха, застрэліць. З чаго ён збіраецца страляць? З крывога ружжа, ці што?
— У яго ёсць наган.
— Адкуль ты ведаеш?
— Ён сам паказваў мне.
— Мабыць, пугач які-небудзь. Цацка.
— Не, самы сапраўдны. Гэта ягонага бацькі наган. Бацька яшчэ з грамадзянскай вайны прынёс. Хаваў яго, перахоўваў... а сам ён стары ўжо чалавек... і нарэшце забыўся, дзе схаваў апошнім разам. А Мішка выпадкова знайшоў яго. Бацьку, вядома, не сказаў пра гэта, але схаваў, кажа, у падзейнае месца.
— Гэта мне пачынае не падабацца! — сказаў я.
— Ат, ён толькі страшыць.
— Не, трэба будзе адабраць у яго той наган, і неадкладна. Не ведаеш, гэты твой Мішка сёння дома?
— Павінен быць дома. Учора ў паездцы быў, сама бачыла, як ён у дэпо ішоў з чамаданчыкам.
— Ты мне пакажаш ягоны дом?
— Ты гэта сур'ёзна?..
— Зусім сур'ёзна. З наганамі жарты дрэнныя.

— То ты сам хочаш адабраць яго?

— Сам.

— А калі ён не аддасць?

— Аддасць, як міленькі. Не забывай, што я будучы юрыст, і таму ўсе законы ведаю. А ў адносінах да тых, хто трымае без адпаведнага дазволу агнястрэльную зброю, ёсць пэўны артыкул крымінальнага кодэксу, і даволі жорсткі артыкул.

— Не, так не гадзіцца. Ён жа здагадаецца, што гэта я сказала табе пра наган... што я данесла на яго.

— А ты і павінна была, дарэчы, зрабіць гэта. Ну, не данесці, а ўгаварыць яго, каб ён сам здаў зброю, трымаць якую не мае ніякага права.

— Дужа яго ўгаворыш. Так ён і паслухае. Ён і табе не аддасць, от пабачыш.

— Аддасць. Я і апамятацца яму не дам. Зноў нагадваю табе, што я будучы юрыст, адвакат. Прыйдзецца, канечне, крыху наманіць яму, але гэта для карысці справы. Ну, напрыклад, скажу, што я з адпаведных органаў. І гэтым органам, маўляў, стала вядома, што ў яго ёсць наган. І што калі ён добраахвотна здасць яго ў дадзеным выпадку — мне, то яму нічога не будзе. А калі не здасць, то закон жорстка пакарае яго. Адным словам, я ведаю, як падступіцца да яго.

— Дапусцім, што ён аддасць табе той наган. А потым? Што ты будзеш рабіць потым? Няўжо і сапраўды данясеш на Мішку?

Я засмяяўся.

— Я разбяру той наган на часткі... я ведаю, як гэта робіцца... і мы з табою пакідаем гэтыя часткі ў якое-небудзь балота. У вас ёсць паблізу падхадзяшчае балота?

— Было, але яго асушылі. Затое ёсць канава. Вялікая такая канава, у ёй заўсёды многа вады, яна цячэ з дэпо.

— Тады мы пакідаем усё ў тую канаву. І няхай гэта застанецца нашым маленькім сакрэтам. Добра?

— Не ведаю...

— Усё абыдзецца, вось пабачыш. А пасля мы пойдзем да тваё маці.

— Да маці? — здзівілася Мар'яна.

— І скажам ёй, што мы хочам ажаніцца!

— Мы?.. Хочам?.. Ажаніцца?..— Мар'яна падскочыла з крэсла, потым зноў села, тады зноў узнялася.

Я падышоў да яе. Зазірнуў у вочы — у самую іхнюю блакітную глыбіню.

— Я люблю цябе, Мар'яна! Я палюбіў цябе адразу... як толькі ўбачыў!

— Хіба гэта магчыма... гэтак нечакана... — ціха-ціха сказала яна.

— Магчыма, Мар'яна, мілая мая, адзіная ў свеце! Магчыма! І ты сама ведаеш, што магчыма. Ну, скажы — ведаеш?

Яна апусціла вочы, нейкую хвіліну маўчала, потым зноў узняла вочы на мяне.

— Ведаю,— аднымі вуснамі адказала яна. Тады падняла рукі, абхапіла мяне за шыю і пацалавала — кароткім і сарамлівым дзявочым пацалункам.— Я таксама люблю цябе, Мар'ян! Дзіўна, мы знаёмыя толькі некалькі гадзін, а вось бачыш — я люблю цябе.

Тады я абняў яе за стан, прытуліў да сябе і пачаў цалаваць. Цалаваў я доўга, настолькі доўга, што ў мяне закружылася галава, і я нават пахіснуўся. Пахіснулася і Мар'яна.

— Мы сёння ж пойдзем у загс і запішамся! — заявіў я.

— Як жа мы запішамся? — усміхнулася Мар'яна.— У цябе ж няма ніякіх дакументаў.

— Праўда, я і забыўся. Тады я з'езджу на сваю станцыю, атрымаю чамадан і вярнуся. Але спачатку, сёння ж, мы скажам усё тваёй маці.

— А да сваіх бацькоў ты хіба не завітаеш?

— Завітаю, вядома. Яны ў мяне харошыя. А зараз пойдзем да тваёй маці.— Я зірнуў на гадзіннік і падкруціў завод.— Мальвіна Ягораўна павінна ўжо змяніцца. Хадзем. Толькі перад тым, як мы пойдзем да цябе, я заскочу спачатку да гэтага Мішкі і вазьму ў яго наган.

— Ой, Мар'ян, мне чамусьці боязна робіцца, як падумаю пра гэта...

— Пра што — пра гэта? — перапытаў я.

— Ну, пра наган. А раптам Мішка не захоча аддаць? У яго вельмі ўпарты характар. Я баюся за цябе, Мар'ян... любы мой...

— Усё будзе добра, ён і не пікне. І выкінь, калі ласка, усякія благія думкі з галавы.

— І ўсё ж — будзь асцярожны, прашу цябе. Абяцай мне, што ты будзеш асцярожны!

— Абяцаю. Я буду асцярожны... і хітры. Тут патрэбна хітрасць. І, калі хочаш, нахабства... у пейкай ступені. Без яго не абысціся. Хадзем. Але спачатку дасш сваё піроясное. І цукеркі.

— Гэта тваё піроясное, я сваё з'ела.

— Піроясныя я не люблю, я для цябе браў.

— А цукеркі любіш?

— Магу часам з'есці адну.

— То вазьмі дзве.

— Хопіць мне і аднае.

— Добра, не будзем спрачацца...— Яна дакранулася пальцамі да майго пляча.— Ведаеш, мне хочацца... Так, мне хочацца, каб мы ніколі, ніколі ў жыцці... не спрачаліся!

— Чаму ж? Бывае, што трэба і паспрачацца. Калі неабходна давесці сваю думку, пераканаць другога ў чымнебудзь альбо самому пераканацца. А вось сварыцца!.. Сварка прыніжае людзей, абражае іх годнасць, іх чалавечую вартасць.

— Якраз гэта я і мела на ўвазе, толькі сказала недакладна. Мы ніколі не станем з табою сварыцца, праўда? Гэта так агідна, калі людзі, ды яшчэ блізкія, сварацца!..

Раптам за акном шуганула бліскавіца, і праз момант пямоцна ўдарыў гром. Мар'яна ўскрыкнула і даверліва прыхінулася да мяне. Я абняў яе.

— Гэта недзе далёка,— сказаў я.

— Мне здалося — нехта стрэліў...— нібы апраўдваючыся за сваю палахлівасць, сказала Мар'яна.

Я пагладзіў яе па галаве.

— Мабыць, дождж будзе,— сказаў я.

— Напэўна... — ужо больш спакойна прамовіла Мар'яна.— Даўно ўжо яго не было ў нас... Хадзем хутчэй!

Мы падаліся з гасцініцы. Папярэдне я выглянуў у калідор, ці няма там каго, тады выпусціў Мар'яну і замкнуў свой нумар. Потым пайшоў наперадзе і, аддаючы новай дзяжурнай ключ, хвіліну ці дзве пагаварыў з ёю — проста так, ні аб чым.

Тым часам Мар'яна за маёй спіною прашмыгнула на вуліцу.

Я дагнаў яе.

— Я адчуваю сябе... злачынцам,— сказала Мар'яна.— Мне здаецца, што ўсе людзі гэтак і пазіраюць на мяне — як на злачынцу.

— Выкінь гэтае глупства з галавы,— сказаў я, хоць і сам чамусьці адчуваў сябе цяпер ніякавата.— І не звяртай ні на што і ні каго ўвагі. Глядзі толькі на мяне.

— Увесь час — на цябе?

— Увесь час. Дай я вазьму цябе пад руку. Можна?

— Вядома. Наогул, ты не пытайся ў мяне дазволу, а рабі, што табе хочацца.

— Ого! Мне, напрыклад, хочацца ўзяць цябе на рукі і панесці.

— А што... вазьмі і панясі... Не, не тут, тут людзей многа... сорамна... а як будзем ісці паркам. Мы пойдзем з табою пеша, праўда? Тым паркам, паўз які ішлі ўчора ўвечары.

— Канечне, мы пойдзем пеша. Навошта нам той аўтобус. Ды яго, напэўна, яшчэ і не адрамантавалі.

— Дождж, мабыць, пройдзе стараною. Я пакажу табе, які ў нас цудоўны парк. Можа, на кіламетр цягнецца, а можа, і болей. А які ён стане праз некалькі год!

— Тады мы будзем вадзіць у яго на пагулянкі нашых дзяцей.

— У нас... будуць дзеці?

— Вядома. У нас будзе многа дзяцей!

— Гэта хораша, калі ў сям'і многа дзяцей... Але ж мы самі яшчэ амаль дзеці. Не забывай, што ты студэнт.

— Я магу пайсці працаваць, а вучыцца буду завочна.

— І мне таксама трэба будзе, мабыць, падвучыцца. У мяне ж толькі дзесяцігодка.

— Ты таксама можаш вучыцца завочна, калі захочаш. Куды б табе хацелася пайсці вучыцца?

— Некалі я марыла стаць настаўніцай.

— Ну што ж, пойдзеш у педінстытут. Скажам, на літаратурны факультэт, ты ж любіш літаратуру.

— А яшчэ раней я нейкі час марыла быць доктарам. Доктарам па дзіцячых хваробах.

— У Мінску ёсць медінстытут.

— А цяпер... цяпер мне хочацца стаць юрыстам, гэткім жа, як і ты.

— Юрыста з цябе не атрымаецца.

— Чаму ты гэтак лічыш?

— Мне так здаецца.

— Ты мяне дрэнна ведаеш. Я здатна на многае.

— Мабыць, ты па-сапраўднаму любіш дзятву. Вось і

трэба табе прыдбаць адпаведную спецыяльнасць. Настаўніка або доктара.

— Мы яшчэ падумаем пра гэта. Усё як след абдумаем і ўзважым.

— А хочаш — заставайся ў сваім кіёску. Ты ж казала, што табе падабаецца твая работа.

— Падабалася... дасюль.

— А цяпер раптам перастала падабацца?

— Перастала падабацца — гэта не тое азначэнне. Пасля таго, як мы сустрэліся... мне ўжо хочацца нечага большага, значнага. Ты разумееш мяне?

— Разумею. Мне і самому хочацца сігануць некуды... на нейкую небывалую вышыню. Кудысьці далёка і высока! Я яшчэ не ведаю нават, куды іменна. Але — далёка і высока. Разам з табою! Наогул, мы заўсёды і ўсюды павінны быць разам!

Я пацiснуў яе руку, якую трымаў у сваёй. Яна паклала на маю руку другую сваю руку і таксама пацiснула.

— А вось і парк! — сказала Мар'яна.

Мы і папраўдзе былі ўжо ў парку. Агледзеўшыся, я перш за ўсё ўбачыў маладзенькую, але гонкую беластвольную бярозку. Мабыць, на яе пазірала і Мар'яна. Не згаворваючыся, мы кінуліся да яе, а падбегшы, пачалі дурэць, як малыя...

Потым, злавіўшы Мар'яну, я ўзяў яе на рукі і панёс. Яна была лёгкая, а ў мяне раптам узялося аднекуль столькі сілы, што я мог бы несці яе хоць на край свету.

Яна абхапіла мяне рукамі за шыю, прыгарнулася да маіх грудзей і цалавала мяне ў шчаку, у вочы, у вусны. А я нёс яе і нёс.

— Ты стаміўся,— сказала яна нарэшце,— адпусці мяне, я сама пайду.

— Я ані не стаміўся,— запярэчыў я.

— Тады нясі яшчэ... Мне так хораша... І не забывайся час ад часу насіць мяне на руках потым... калі мы будзем мужам і жонкаю.

— Не забуду! — цвёрда паабяцаў я.

Я яшчэ пранёс яе крыху. Але раптам яна нечага ўся сцялася, потым выпрасталася і саскочыла долу.

— Што з табою? — занепакоіўся я.

— Паглядзі...— яна паказала вачыма наперад.

Насустрач нам ішоў чалавек. Ён быў яшчэ далекавата

ад нас, але ўжо можна было пазнаць, што чалавек гэта малады і ідзе ён вельмі хутка. На ім былі цёмна-сінія штаны і белая кашуля з кароткімі рукавамі і адкрытай шыяй. Правую руку чалавек трымаў у кішэні, а левай энергічна махаў у такт хадзе.

— Гэта Мішка...— ціха і неяк прыгнечана сказала Мар'яна.

— Чаго ён тут? — здзівіўся я.

— Мяне шукае.

— Адкуль ён ведае?..

— Мабыць, быў у нас, і маці сказала, што я не начавала дома. Тады ён кінуўся да цёткі Мальвіны. Тая, напэўна, і сказала яму, што бачыла мяне ўчора ў гасцініцы... з табою. Вось ён і шыбуе ў гасцініцу.

— Значыць, аўтобус яшчэ не адрамантавалі,— паспрабаваў пажартаваць я, але адчуў, што жарт гэты не да месца і што Мар'яна яго не прыняла.— Нічога, ідзём! — сказаў тады як мага больш спакойным голасам.

— А можа... давай лепш уцячом?..— няўпэўнена прапанавала Мар'яна.

— Цяпер ужо нікуды не ўцячэш,— заўважыў я.— Ён нас бачыць гэтак жа, як і мы яго.

— А можа, ён яшчэ не пазнаў нас...— прашаптала Мар'яна.

— Быць у ролі баязліўца і ўцекача мне яшчэ не даводзілася. Думаю, што і не давядзецца. Ты пастой тут, а я пайду пагавару з ім.

І я рушыў наперад.

— Я не магу застацца, Мар'ян,— па-ранейшаму шэптам, але цвёрда сказала Мар'яна.

Я рашуча махнуў рукою — маўляў, застанься! — і прыскорыў хаду. Але Мар'яна, можа, толькі на нейкія паўкроку адставала ад мяне.

Мішка быў ужо зусім блізка. Я паспеў заўважыць, што правая кішэня ягоных штаноў адтапырана больш, чым гэта трэба было для адпае рукі. Я ўжо не сумняваўся, што ў яго было там, у кішэні.

Ранейшы мой план вымантачыць у яго зброю цяпер не падыходзіў. Цяпер мне трэба было адбіраць наган сілаю. Я быў упэўнены, што здолею зрабіць гэта, і яшчэ прыскорыў хаду. Але і Мар'яна таксама пайшла шпарчэй, яна была цяпер поруч са мною.

Паміж намі і Мішкам заставалася метраў дзесяць, як

ён раптам прыпыніўся. А я зрабіў яшчэ два ці тры крокі насустрач яму.

Тады Мішка імкліва выхапіў руку з кішэні. У руцэ ў яго быў наган, і ствол ягоны быў накіраваны проста на мяне. Я кінуўся да Мішкі. Ды Мар'яна апярэдзіла мяне. У жанчын рэакцыя наогул хутчэйшая за мужчынскую...

У наступнае імгненне грымнуў стрэл. Мар'яна ўскрыкнула і пачала валіцца на дол. Я паспеў падхапіць яе і асцярожна апусціў на траву.

Тая куля, што прызначалася мне, трапіла ў Мар'яну...

Мабыць, Мішка вельмі разгубіўся, бо другога свайго стрэлу ў мяне не зрабіў. Я выкарыстаў гэтую ягоную разгубленасць, скочыў да яго і схапіў абедзвюма рукамі ягоную правую руку, у якой быў наган.

І тут зноў грымнуў стрэл. Наган вываліўся з Міхалютавай рукі, і я машынальна падняў яго. А сам Міхалюта тым часам неяк паволыла, бы нехаця, апусціўся на зямлю.

Ды я не звяртаў ужо на яго ніякай увагі.

Я нахіліўся над Мар'янай. Яна ляжала нерухома, была маўклівая, а твар рабіўся ўсё больш бледны. Сукенка ж на грудзях чырванела...

— Мар'яна!.. — застагнаў я.— Мілая мая, родная, каханая!.. Адгукніся, Мар'яна!..

Яна маўчала.

Тады я памкнуўся падняць яе, каб панесці. Я не ведаў, куды трэба несці, але заставацца нам тут не мела ніякага сэнсу.

Ды я не паспеў нічога зрабіць. Адкуль збегліся людзі, адабралі ў мяне наган, які я ўсё яшчэ трымаў у руцэ, і, прызнацца, далі добрых кухталёў,— яны лічылі, што гэта я застрэліў і дзяўчыну, і хлопца. Я не абараняўся, не адбіваўся. Магчыма, яны і зусім забілі б мяне, але тут падаспеў міліцыянер. Ён не даў адбыцца самасуду.

Міліцыянер сказаў нейкаму чалавеку бегчы напрасткі на дарогу і спыніць любую машыну. Яшчэ чатыром чалавекам сказаў падняць Мар'яну і Міхалюту і панесці таксама ў тым кірунку... І сам пайшоў, загадаўшы мне ісці перад ім. За намі рушыўся цэлы натоўп узбуджаных людзей. Яны перагаворваліся між сабою, некаторыя штосьці выгуквалі.

На шашы ўжо стаяла машына — старая аблезлая паўтаратонка. Людзі перанеслі Мар'яну і Міхалюту цераз не-

высокія шчыкеты. Мы з міліцыянерам таксама пералезлі на той бок. Калі Мар'яну клалі ў кузаў машыны, я зняў свой пінжак і папрасіў, каб паклалі яго пад Мар'яну. Міліцыянер здзіўлена зірнуў на мяне, але ўзяў пінжак і перадаў людзям. Потым ён загадаў мне і яшчэ тром чалавекам таксама залезці ў кузаў і сам залез.

— У бальніцу Сямашкі,— сказаў міліцыянер шафёру.— Хутчэй!

«Позна ўжо,— гаварыў я сам сабе ў думках,— позна... Ніхто Мар'яне ўжо не паможа, і вінаваты ў гэтым адзін я. Калі б не было мяне, не было б і таго праклятага стрэлу...»

У гэты момант нечакана зноў шуганула бліскавіца, аглушальна грымнуў гром і адразу ж лінуў дождж. Машына памчала ў кірунку горада. Я ўкленчыў перад Мар'янай, паклаў свае рукі ёй пад галаву, прыкрываючы яе сабою ад дажджу. Я глядзеў на бледны змярцвелы Мар'янін твар, і такі боль праціnаў усё маё цела... не, усю маю душу!.. што я ледзь стрымліваў сябе, каб не закрычаць на ўвесь голас, не зарыдаць у роспачы і адчаі.

У бальніцы тыя ж самыя людзі з дапамогаю жанчын у белых халатах паклалі Мар'яну на стол з калёсікамі на ножках. Я глядзеў толькі на Мар'яну, я бачыў толькі яе адну. Яе некуды павезлі. «У аперацыйную...— здагадаўся я.— Ды толькі марна ўсё гэта. Куля патрапіла напэўна ў самае сэрца. Столькі крыві было...»

Дзяжурны ўрач пачаў штосьці пісаць.

— Хто яна такая? — спытаў ён у міліцыянера.

— Спытайце ў яго,— паказаў міліцыянер на мяне.

— Як яе прозвішча? Імя? — звярнуўся тады ўрач да мяне.

— Мар'яна...— непаслухмяным языком ледзь вымавіў я. У мяне чамусьці перасохла ў горле.

— А прозвішча?

— Не ведаю...

— Хто яе ведае? — звярнуўся ўрач да прысутных.

— Я ведаю,— сказаў адзін з іх — той, што адабраў у мяне наган і першы даў мне кухталя.— Яна працуе... працавала на вакзале, у газетным кіёску.

Я не слухаў ужо, што тлумачыў чалавек дзяжурнаму. Бо боль ува мне ўсё мацнеў, і зрабілася ўжо да таго нясцерпна, што я застагнаў і заскрыгатаў зубамі.

Потым міліцыянер з тымі самымі людзьмі адвёў мяне ў

міліцыю. Там склалі пратакол. Я назваўся імем і прозвішчам, пад якімі быў запісаны ў гасцініцы. Я не мог назваць свайго сапраўднага імя і прозвішча, не мог!.. Лічыў — калі я прызнаюся, што я ніякі не Анатоль Белавус, дык ачарню Мар'яну, пакладу пляму на яе гонар. Бо яна ж сказала цётцы Мальвіне, што прывяла ў гасцініцу свайго даўняга знаёмага Анатоля Белавуса. Акрамя таго, я не хацеў, каб пра тое, што здарылася са мною, даведаліся мае бацькі... Я павінен быў застацца Анатолем Белавусам. І застаўся ім.

А далей... далей было тое, што і павінна было быць. Кароткае следства... Суд... Я не адмаўляў высунутых супраць мяне абвінавачанняў, бо шчыра лічыў аднаго сябе вінаватым у тым, што здарылася ў парку.

Мяне судзілі па артыкуле крымінальнага кодэкса, які карае за наўмыснае забойства.

Тут я хачу сказаць табе пра адну акалічнасць. Мушу зрабіць адно невялікае адступленне, каб ты больш правільна зразумеў мой тагачасны стан і ўвогуле пра тое, што адбылося на судзе.

Павінен сказаць, што я здаўна развіваў у сабе красамоўства, яшчэ з тае пары, калі вучыўся ў школе — тады я часта ўдзельнічаў у розных дыспутах на самыя разнастайныя тэмы. Я любіў гэтыя дыспуты і заўсёды выходзіў у іх пераможцам. І пасля, ужо ва універсітэце, не было на нашым факультэце студэнта больш красамоўнага за мяне. Кажу гэта табе шчыра, без выхвалення...

Але калі мяне судзілі, усё маё красамоўства некуды знікла і я не мог сказаць у сваю абарону ніводнага слова, нічога такога, што крапула б суддзяў, што паслужыла б на маё апраўданне. Я толькі адказваў на пытанні, а ад апошняга слова наогул адмовіўся. Цяпер я разумею, што проста не хацеў шукаць для сябе апраўдання,— наадварот, я прагнуў, каб мяне пакаралі як мага больш жорстка. Бо я лічыў, што вінаваты не той, чыя куля аказалася фатальнай для ахвяры, а той, хто прывёў яе, ахвяру, да гэтага. А прывёў, вядома ж, я. Калі б не было мяне, нічога б з Мар'янаю не здарылася. Ды і з Міхалютам таксама.

На судзе было многа людзей. Мяне крыху здзівіла, што не было ў зале і Мар'янінай маці. Праўда, я не ведаў яе, але каб яна была, то напэўна пазнаў бы. Была на судзе Мальвіна Ягораўна і нават давала паказанні. Выгляд у яе пры гэтым быў разгублены. Яна і не абвінавачвала мяне,

і не абараняла, а толькі адказвала на пытанні — адкуль мяне ведае, колькі разоў бачыла, што я ёй гаварыў. Яна нават сказала, што не можа пэўна адказаць на пытанне, ці заставалася Мар'яна ў тую ноч са мною ў нумары,— яна, маўляў, не ведае гэтага, не бачыла на свае вочы. І пра нашу тэлефонную размову змоўчала.

Галоўнымі сведкамі былі тыя трое мужчын, якія першымі апынуліся ў парку каля нас з Мар'янай і якія далі мне тады ладных кухталёў; пра гэта, зрэшты, ні яны, ні я не сказалі ні слова.

Мяне прыгаварылі да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу. Прыгавор я сустрэў спакойна, нават з палёгкай — ува мне адразу сцішыўся той боль, які ахапіў мяне тады, у парку, і не знікаў ні на хвіліну пасля. «Так, так, за смерць Мар'яны я павінен заплаціць сваёй смерцю»,— сказаў я ў думках сам сабе.

Ні касацыйнай скаргі, ні просьбы аб памілаванні я не падаваў. І доўгіх два тыдні чакаў у турме, калі нарэшце мяне павядуць у маю апошнюю дарогу.

Але аднаго разу мяне паклікалі і сказалі, што расстрэл заменены мне дзесяццю гадамі зняволення.

Дамоў я нічога не напісаў — ні тады, ні пасля. Ды і што я мог напісаць?..

Праз месяц мяне, разам з іншымі зняволенымі, павезлі ў Сібір. Мне было ўсё роўна, куды мяне павязуць і што я буду там рабіць. Я адчуваў толькі, што са мною адбыліся вялікія змены — і ў характары, і ў паводзінах, і наогул... Я замкнуўся ў сабе, зрабіўся абыякавы да ўсяго на свеце і толькі адно худнеў. «Ну і што ж,— думалася мне тады,— не сканаў ад Міхалютавай кулі ў аршанскім парку, не сканаў ад кулі, што прызначалася мне паводле прыгавору, дык сканаю недзе на бальнічным ложку, або ў бараку на нарах, або буду ісці і раптам звалюся на дол і аддам богу — ці чорту — сваю грэшную душу».

Страсянуўся я толькі тады, калі дачуўся, што пачалася вайна — Гітлер напаў на нашу краіну. Ад тае хвіліны мною завалодала адна думка, адно імкненне — трапіць на фронт. Але як ты патрапіш туды, калі маеш амаль поўную шпульку гадоў зняволення?!

І год мінуў, і другі, і трэці...

Ды от нарэшце і атрымаў я магчымасць выправіцца на вайну. Як гэта мне ўдалося — не мае значэння. Ды і расказваць няма ўжо часу... Хутка будзе пад'ём...

Не, я імкнуся на фронт не дзеля таго, каб шукаць сабе смерці. Ні смерцю сваёй, ні жыццём сваім я ўжо не памагу Мар'яне. І ні тым, і ні гэтым не ўсё роўна не ўваскрэсіш... Там, на фронце, я буду аддана і добрасумленна — кажу гэта з усёй шчырасцю — біцца з ворагам. Але — адчуваю — смерць там сама мяне знойдзе. Жадаю толькі аднаго — каб гэта здарылася не адразу. Каб я здолеў знішчыць як мага больш фашыстаў. Я буду біць іх, пакуль хопіць сілы, пакуль змагу дыхаць!

От і ўся мая гісторыя...

Скажы: ты паверыў мне? Ты верыш мне?

## 7

Я не здолеў адказаць Мар'яну. Памкнуўся, але не здолеў. Галава ў мяне раптам закружылася, я перастаў адчуваць сваё цела, і язык ані не слухаўся мяне. Я зноў падаў у нейкую бездань...

Болей я не бачыў Мар'яна...

Як пазней высветлілася, у мяне ў тую ноч пачалося запаленне лёгкіх. Больш за два тыдні я пракачаўся ў шпіталі, быў адзін час у вельмі цяжкім стане, але нічога, вылузаўся.

Калі пачаў хадзіць... не, нават яшчэ раней, калі здолеў гаварыць і разумець тое, што мне кажуць, я даведаўся, што мая рота ўжо выправілася на фронт. «Значыць, і Мар'яна ўжо няма тут,— з нейкім шчымлівым пачуццём падумаў я.— Не пашанцавала мне... Але ж вайна яшчэ не скончылася, ваюю і я».

Тут я ўспомніў пра Мар'янаву запіску. Пачаў шукаць сваё абмундзіраванне, але яго нідзе не было відаць. Я ляжаў у адной бялізне, а на ложку ў нагах вісеў сіні халат... «Нічога, недзе ж яно ёсць»,— супакойваў я сябе.

Крыху пазней — тады я ўжо хадзіў — я знайшоў малодшага сержанта, у падначаленні якога была наша шпітальная канцёрка. Гэта быў пажылы нізкарослы і хударлявы чалавек з нестраявых. Ён вельмі здзівіўся, калі я пачаў распытваць у яго пра сваё абмундзіраванне. На яго думку, салдата не павінна турбаваць такое пытанне. Салдату ў свой час дадуць усё, што яму належана.

— Але мне патрэбна маё абмундзіраванне! — захваляваўся я.— Імення — маё, тое, што было на мне, калі мяне паклалі ў шпіталь!

— А што яно — нейкае асаблівае ў цябе? Мо з лампасамі, генеральскае? — пажартаваў малодшы сержант.

— Яно ў мяне новае. Пашукайце, калі ласка, вы яго лёгка знойдзеце, яно зусім новенькае,— пачаў упрошваць я малодшага сержанта.— Яно мне патрэбна толькі на адну хвіліначку!

— А-а, новенькае...— малодшы сержант безнадзейна махнуў рукою.— Тады шукай ветру ў полі.

— Чаму?..— прадчуваючы нядобрае, непапраўнае, ашаломлена спытаў я.

— Бо яго здалі на склад дывізіі. Нам трымаць новае не паложана. Яго выдаюць, сам ведаеш, толькі маршавікам. Нічога, салдат, калі як след ачуняеш, падбяром і табе адпаведную амуніцыю. Канечне, з падношанага, але трапляецца, бывае, і даволі людскае.

Так, шукаць цяпер сваё абмундзіраванне было яшчэ больш безнадзейным заняткам, чым шукаць іголку ў стозе сена...

Выходзіла, што тая запіска, якую даверыў мне Мар'ян, знікла канчаткова для мяне, і не было ніякай надзеі, што яна калі-небудзь вернецца ў мае рукі. Цудаў жа на свеце не бывае...

Як я лаяў сябе!.. хоць і разумеў, што лаяць, па сутнасці, няма за што. Бо хто мог прадбачыць, што так атрымаецца з маім абмундзіраваннем?! Гэтага не мог прадбачыць і сам Мар'ян...

Пасля лячэння ў шпіталі я зноў трапіў у вучэбную роту, на гэты раз да артылерыстаў. Напрадвесні, пасля адпаведнага тэрміну вучобы, мяне, як і іншых маіх новых саслужыўцаў, зноў абмундзіравалі ва ўсё новенькае, пагрузілі ў эшалон і павезлі на фронт.

Ваяваў я да самага канца, да перамогі. Ніякіх асаблівых подзвігаў не здзейсніў, хоць за адзін бой пад Кенігсбергам камандзір палка сам прышпіліў мне на гімнасцёрку медаль «За адвагу». Быў некалькі разоў паранены, але не моцна, і кожны раз хутка вяртаўся зноў на перадавую.

Я часта ўспамінаў Мар'яна і, успамінаючы, думаў: а як яно будзе, калі ён усё ж уцалее на вайне? Трэба ж будзе яму адкрыцца, не зможа ён болей заставацца Анатолем Белавусам. У зняволенні мог, а на волі не зможа... І што тады будзе?..

І яшчэ я думаў: а раптам я сустрэнуся дзе-небудзь на фронце з Мар'янам? Здараюцца ж такія выпадкі, я не раз

чуў пра падобнае, ды і сам неяк бачыў, як сустрэліся зусім нечакана два школьныя прыяцелі.

Так, многае здараецца на фронце. Ды не бывае толькі аднаго — цудаў... Прынамсі тых, на якія спадзяешся, якія чакаеш...

Але хоць і не цуд, а толькі штосьці вельмі аддалена падобнае на яго, усё ж адбылося. Там жа, пад Кенігсбергам, дзе я быў адзначаны медалём, мне трапіў у рукі шматок нашай франтавой газеты — я збіраўся загарнуць у яго кавалак сала, якім пачаставаў мяне наш старшына са сваіх асабістых невычэрпных запасаў. Загортваючы сала, я раптам наткнуўся на знаёмае прозвішча: Белавус. Я ліхаманкава развінуў газеціну і пачаў чытаць... Гэта быў, мяркуючы па ўсім, нарыс, але ні пачатку, ні канца ён не меў — яны былі адарваныя. Тым не менш пра галоўнае я даведаўся: Анатоль Белавус (Мар'ян, мой дарагі Мар'ян!) смела і аддана біўся з ворагам, ён нават зрабіў нейкі подзвіг, за што быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны.

Выходзіла, што мы і напраўдзе былі і ваявалі недзе побач, ва ўсякім разе на адным фронце.

Той газетны шматок я захоўваю і дасюль.

Але з Мар'янам я так і не сустрэўся.

Пазней, значна пазней, пасля вайны ўжо, з аднаго афіцыйнага адказу на маё пісьмовае запытанне я даведаўся, што Анатоль Іванавіч Белавус у канцы красавіка 1945 года прапаў без вестак...

У пасляваенныя гады я зрабіў нямала захадаў, каб выканаць Мар'янаву просьбу — знайсці ягоных бацькоў. Браў чарговыя адпачынкі і ездзіў па Лепельшчыне. Пабываў у самім Лепелі, абышоў і аб'ездзіў шмат якія навакольныя вёскі і мястэчкі. Натрапіў нават на двух Мар'янаў, але ніводзін з іх не толькі не быў патрэбным мне Мар'янам, але і нічым не здолеў памагчы мне ў маіх пошуках.

...Нядаўна я зноў ездзіў па Лепельшчыне. І зноў — марна пакуль што...

Ды я не спыню пошукаў. Я не магу, не маю права спыніць іх...

*1973*

# ТАЦЯНА ЛАРЫНА

Ад самае раніцы сёння ў ашчаднай касе нешта было мала людзей, зусім не так, як звычайна. Гэта тым больш здзіўляла Тацяну, што сёння нядзеля. А ў святочны дзень чалавека апаноўвае адзін толькі клопат — каб дзе што купіць, каб дзе як выдаткаваць грошы. Дзеля гэтага чалавеку спачатку трэба завітаць у ашчадкасу і запоўніць расходны ордэр. А адразу ж усім грошы не дасі, таму збіраецца чарга.

Сёння ўсё было не так. Каса проста пуставала.

Напачатку, як толькі Тацяна адчыніла дзверы, прыбег жвавы мужчына ў расхрыстанай вышыванай кашулі і з вялікімі цёмнымі акулярамі. Ён схапіў з бар'ера прыходны ордэр, скаранька напісаў у ім што трэба, потым, гэтак жа спяшаючыся, выцягнуў з кішэні белых часучовых штаноў загорнуты ў газету пачак грошай, імгненна пералічыў іх і, калі аддаваў касірцы Зіне, чамусьці азірнуўся. Рука ў яго пры гэтым задрыжала. А мо гэта толькі здалося Тацяне?.. Узяўшы ў Зіны сваю ашчадную кніжку, мужчына старанна праверыў, ці правільна ўсё запісана, а тады пайшоў з выглядам чалавека, які сумленна і да канца выканаў свой абавязак. За ўвесь час, што мужчына быў у ашчадкасе, ён так і не зняў ні на хвіліну сваіх цёмных акуляраў, хоць у памяшканні было не дужа светла, бо вокны выходзілі на паўночны захад.

Пасля, хвілін мо аж праз дзесяць, наведала ашчадкасу старэнькая бабуля з падслепаватымі слязлівымі вачыма. Яна была ў нейкіх латаных-пералатаных лахманах, але на кніжцы ў яе аказалася такая сума грошай, што Тацяна, зазірнуўшы ў картку, ажно сумелася. Бабулька атрымала працэнты за мінулы год і адразу ж імкліва падалася

на вуліцу, нібы баялася, што ў ашчадкасе перадумаюць і адбяруць у яе гэтыя працэнты. Гаваркая касірка Зіна адразу ж паведаміла Таццяне, што грошы на кніжку бабулька паклала неўзабаве пасля вайны, што з таго часу яна не ўзяла і не паклала больш ні капейкі, адно бярэ штогод працэнты, але робіць гэта чамусьці не ў пачатку года, як некаторыя, а цяпер, у жніўні.

— То, можа, яна на курорт на гэтыя працэнты едзіць? — пажартавала іхняя начальніца Ніна Іванаўна; яна трымала ў адной руцэ маленькае люстэрка, а другой падфарбоўвала свае пульхныя пажадлівыя губы.— Бо інакай навошта яшчэ патрэбны жанчыне грошы ўлетку?..

Касірка Зіна гучна засмяялася, а Таццяна падумала: «Тут, у ашчаднай касе, якіх толькі людзей не пабачыш і пра што толькі не пачуеш!»

За дзве гадзіны, што мінулі пасля адкрыцця ашчадкасы, прыходзіла яшчэ чалавек колькі, але ў параўнанні з другімі днямі гэта было так мала, што Ніна Іванаўна, Зіна і Таццяна пачалі ўсё часцей пазіраць на дзверы, адно дзівячыся, што гэта такое здарылася з людзьмі сёння. Нарэшце Зіна не вытрывала і, паціскаючы плячыма, прамовіла:

— Гэта, можа, свята якое сёння, а мы не ведаем?

Ніна Іванаўна таксама паціснула плячыма, а Таццяна зноў падумала: «А як яно будзе ў нашай касе праз дзесяць год?.. А праз дваццаць?.. Цікава — больш будзе людзей ці — наадварот, менш?»

І тут жа Таццяна ўсміхнулася сама сабе. «У нашай касе...» Вось і яна ўжыла гэтае слова — «наша», як даўно ўжываюць яго Ніна Іванаўна і Зіна. Вядома, яны працуюць тут па некалькі год. А яна? Сёння ў яе апошні дзень практыкі. Заўтра Таццяна сюды ўжо не прыйдзе. І не толькі заўтра, а і ніколі, напэўна. На той год, пасля заканчэння тэхнікума, яе пашлюць куды-небудзь у другі горад, і ні Зіны, ні Ніны Іванаўны, ні наогул гэтай ашчаднай касы Таццяна больш ужо не ўбачыць. Ніякая яна, значыць, не «наша», яна — іхняя.

Праўда, за час практыкі Таццяна паспела прывыкнуць да яе, ды і Ніна Іванаўна з Зінай сталі вельмі блізкімі. І ёй, відаць, будзе крыху шкада расставацца з імі. Але пройдзе час, і ўсё забудзецца. З'явяцца новыя людзі, новыя інтарэсы, і можа толькі гады ў рады прыгадаецца ёй сёлетняя практыка — прыгадаецца, каб адразу ж і забыцца.

Хаця не, усё ж пештачка яна будзе помніць, відаць, доўга. Ага, як доўга! Бо гэта ж якраз тут, пад час гэтае практыкі, удалося Тацяне здзейсніць нарэшце адну сваю даўнюю мару. Справа ў тым, што ёй даўно ўжо хацелася займець даўгое вячэрняе плацце з чорнага панаксаміту, такое, якое яна неяк бачыла на адной жанчыне ў тэатры. Яно было незвычайнае, тое плацце, проста якоесьці казачнае, і так жа ж зграбна атуляла жанчыну, што Тацяна з тае пары ні пра якія іншыя ўборы думаць не магла. Шмат даводзілася ёй пасля бачыць другіх вячэрніх плаццяў на жанчынах, аднак тое, першае, ніяк не забывалася, толькі яно адно і стаяла заўсёды перад вачыма.

Тацяна жыла толькі на сваю стыпендыю, бо бацькоў у яе не было, і таму спачатку ёй здавалася, што мара яе так і астанецца марай, прынамсі, да таго часу, пакуль не скончыць тэхнікум і не стане на якую работу. Аднак паступова думка аб тым казачным уборы ўсё мацней і мацней авалодвала ёю, і нарэшце прыйшоў такі дзень, калі Тацяна сказала сабе, што без яго проста жыць не зможа. Яна павінна прыдбаць сабе такое плацце, чаго б гэта ёй ні каштавала. З таго дня яна пачала эканоміць, дзе толькі можна было. Кожная капейчына была ў яе цяпер палічана. Яна адмаўлялася і ад таго, і ад гэтага і нават у кіно амаль што перастала хадзіць, хоць вельмі любіла глядзець новыя карціны.

Эканомія гэта добра далася ёй у знакі, бо па сваёй натуры Тацяна не належала да людзей скупых або проста ашчадных. Дзяўчына жыла як жылося. І часта здаралася так, што ёй не хапала стыпендыі да канца месяца, не хапала таму, што Тацяна не ўмела і не старалася ўмець разлічваць грошы на ўсе трыццаць дзён. Гэта ані не турбавала яе, нават і не засмучала. «Нічога, затое праз які тыдзень я шыкану»,— гаварыла сабе Тацяна кожны раз у такіх выпадках, перабіваючыся, як кажуць, з хлеба на квас. І вось цяпер, апантаная сваёй ідэяй, цалкам захопленая адною марай, яна зусім перайначыла сябе, стала дбаць не толькі пра заўтрашні дзень, але і пра тое, каб заўтрашні дзень перакінуць як і на паслязаўтрашні. Цяпер яна ўсё разлічвала загадзя, усё абдумвала, узважвала і не дазваляла сабе ніякіх лішніх выдаткаў.

І вось у пакуначку, які Тацяна хавала на самым дне чамадана, ляжала ўжо даволі кругленькая сума... Тут вельмі дарэчы прыйшлася практыка. Імення пад час практыкі

ў ашчаднай касе, атрымліваючы, акрамя стыпендыі, яшчэ амаль столькі за сваю работу, Таццяна здолела дalажыць у пакупачак якраз тое, чаго ёй дагэтуль нeставала.

Сёння ў яе апошні дзень практыкі. Таццяна развітаецца з жанчынамі, а заўтра з раніцы пабяжыць у магазін і выйдзе адтуль самым шчаслівым чалавекам у свеце.

— Аб чым задумалася, Танечка? — пачула яна раптам голас Ніны Іванаўны.

— Вядома аб чым,— замест Таццяны адказала Зіна.— Аб будучыні.

— А чаго аб ёй думаць,— зноў сказала Ніна Іванаўна.— Усё роўна яна ніколі не бывае такой, як хочацца.

Зіна падумала і, уздыхнуўшы, прамовіла:

— Гэта праўда. Асабліва ў жанчыны.

— Чаму ў жанчыны асабліва? — здзівілася Таццяна.

— А таму, што жанчына «предполагает», а мужчына «располагает»,— засмяялася Зіна.

Таццяна хацела была запярэчыць, але перадумала. Сёння ў яе не было жадання ні з кім спрачацца, асабліва з Зінай і Нінай Іванаўнай, якіх яна, можа, ніколі ўжо больш не пабачыць.

А Зіна, перастаўшы смяяцца, раптам зусім сур'ёзна сказала:

— Але на курорт сёлета я ўсё роўна паеду! Паеду, і ўсё тут! Як надумала, так і зраблю!

Пра свой курорт Зіна гаварыла амаль штодня. І гаварыла заўсёды так, нібыта спрачалася з некім, нібыта старалася пераканаць усіх у неабходнасці гэтага курорта, хоць ніхто ёй не пярэчыў, ніхто не адгаворваў яе. Падобна было, што яна пераконвала сама сябе.

— Вы зусім не ўяўляеце, якое яно — Чорнае мора! — гаварыла далей Зіна.— Гэта такая любата, што і слоў не знойдзеш, каб усё сказаць.

Можна было падумаць, нібыта Зіна толькі тое і рабіла ў жыцці, што ездзіла на Чорнае мора. На самай жа справе — гэта Таццяна ведала пэўна — яна ні разу не была там. Відаць, сёлета яна і сапраўды паедзе. Праўда, Ніна Іванаўна казала, што Зіна і летась збіралася паехаць, але нешта ці нехта перашкодзілі ёй.

— Паедзем разам, Таццяна? — Зіна ўстала ад свайго століка ля незгаральнай шафы, падышла да Таццяны і абняла яе за плечы.— Праўда, давай паедзем, а? На злосць усім!

— Каму гэта ўсім? — насцярожана спытала Ніна Іванаўна.

— А проста — усім! — трасянуўшы галавою, гарэзліва прамовіла Зіна.— Махнём у Крым, у самую Ялту. Або, яшчэ лепш, на Каўказ. Ты толькі падумай, Таццяна, як гэта прыгожа гучыць: «Каўказскае ўзбярэжжа Чорнага мора»! Колькі хараства ў гэтых словах!

— Я не магу,— не адрываючы позірку ад папер, што ляжалі перад ёю на стале, ціха сказала Таццяна.

— Не, ты яшчэ падумай, Таццяна, ты падумай,— сакатала Зіна; яна ўсё яшчэ стаяла каля Таццяны.— Яно варта, каб як след падумаць.

— Я ўжо думала,— сказала Таццяна, хоць напраўдзе яна ніколі не задумвалася над Зінінымі словамі.— Нічога ў мяне не выйдзе.

— Як сабе хочаш,— з ранейшай лёгкасцю прамовіла Зіна і падалася да сваёй незгаральнай шафы.— А ў мяне абавязкова выйдзе, вось пабачыш!

— Летась у цябе таксама выйшла...— кпліва сказала Ніна Іванаўна.

— Што было летась, таго не будзе сёлета,— упэўнена заявіла Зіна.

«Вось і ў яе ёсць мара,— падумала Таццяна.— У кожнага чалавека павінна быць мара. Вялікая ці маленькая, але павінна быць. Абавязкова павінна быць. Інакш і жыць не цікава было б. Ну, як гэта можна — ні аб чым не марыць? Хай гэтыя мары падчас будуць дробязныя, як маё плацце, абы яны не закрывалі вачэй на вялікае, на тое, без чаго нельга ў жыцці...»

— А напраўдзе, дзяўчаткі, чаму гэта ў нас сёння так мала людзей? — зноў сказала Зіна.— Можа, што здарылася? А мы седзімо тут і нічога не ведаем. Нават і радыё няма ў нас.

Яна захвалявалася і пачала мітусліва перакладаць з месца на месца паперы на стале. Потым спытала:

— А ў газетах нічога сёння не было? А то я не паспела дома прагледзець...

Ніна Іванаўна паспешліва сказала, што таксама не трымала сёння ў руках газеты, бо перад работай давялося заняцца тэрміновымі хатнімі справамі.

— Не, нічога такога асаблівага не было,— сказала Таццяна.— Праўда, я адну толькі «Чырвоную змену» выпісваю.

— «Чырвонка» заўсёды друкуе навіны са спазненнем,— заявіла Ніна Іванаўна.— Трэба было «Звязду» выпісаць. Або нават «Правду», яна цяпер на той самы дзень прыходзіць. А яшчэ лепш — «Известия». У «Известиях» цяпер усё самае свежанькае.

— Чаму толькі ў «Известиях»? — запярэчыла Зіна.— І ў другіх газетах бываюць цікавыя артыкулы. У «Комсомольской правде» многа бывае фельетонаў. Пра дружбу і каханне таксама многа. Страшэнна люблю чытаць пра дружбу і каханне.

— Нічога вы не знаеце,— з важным выглядам праказала Ніна Іванаўна і таямніча прымоўкла.

Гэтая Ніна Іванаўна заўсёды ведала штосьці такое, аб чым Таццяна і не здагадвалася, і не падазравала нават. І дзе толькі, цікава, брала яна тыя свае звесткі?..

Тым часам Ніна Іванаўна паглядзелася ў люстэрка і зноў трошкі падмалявала свае губы. Не пазіраючы на яе, Зіна скептычна заўважыла:

— Калі вы так ужо добра пра ўсё дасведчаны, чаму ж вы нічога не ведаеце, што такое робіцца сёння?

— Значыць, нічога ніякага няма. Бо калі б што якое было, канечне б ведала. Праўда, Танюсечка?

Таццяна проста цярпець не магла, калі хто называў яе гэтак. Яна вельмі неахвотна адгукалася на Таню або на Танечку, ці — што было ўжо зусім нясцерпна — на Танюсечку. Дзяўчына любіла толькі сваё поўнае імя — Таццяна. Людзі адразу заўважалі гэта і стараліся не ўжываць яе памяншальных імён. Так было ў тэхнікуме, у інтэрнаце і тут, у ашчадкасе. Зіна таксама звала яе Таццянай. І вось толькі адна Ніна Іванаўна ўпарта не хацела называць яе інакш, як Танюсечкай. «Танюсечка, зрабіце от гэта... Танюсечка, запоўніце вунь той рэестр... Танюсечка, а ці нельга...»

«Нельга! — кожны раз хацелася крыкнуць Таццяне.— Нельга называць мяне так!»

Але яна не крычала. Яна толькі старалася нічым не паказаць, што ёй гэта дужа непрыемна.

А ўсё гэта было праз тое, што дзяўчына мела імя і прозвішча, якімі вельмі ганарылася. Яна была Таццяна Ларына. І не ў думках, не дзякуючы якой дзявочай фантазіі або гульні ўяўлення, а напраўдзе. Так, яна мела такое самае імя, што і тая неўміручая дзяўчына, якую стварыў геній паэта. Мела, хоць доўгі час нават і не здагадвалася,

што яно азначае для людзей. А потым, калі зразумела гэта, зноў жа доўга дзівілася, чаму іменна ў яе такое імя.

Бацькоў сваіх Таццяна не ведала, яна выгадавалася ў дзіцячым доме, дзе таксама ніхто нічога не чуў пра яе бацькоў. Упершыню задумалася дзяўчынка над тым, хто яна і адкуль, на адным з урокаў па рускай літаратуры, калі праходзілі «Яўгенія Анегіна». Тады яе надзвычай уразіла тое, што пушкінская гераіня мела такое самае імя, якое мела і яна. І ўсе вучні таксама здзівіліся, яна бачыла гэта па іх тварах, але ўголас ніхто не выказаў ніякага здзіўлення: дзетдомаўцы ўмеюць быць тактоўнымі, асабліва ў пытаннях, што тычацца паходжання і сваяцтва іх таварышаў.

Тады Таццяна вырашыла заняцца пошукамі.

Высветлілася, што ў дзетдом, дзе яна тады была, Таццяна трапіла з другога, які знаходзіўся ў Заранску. У часе канікулаў Таццяне ўдалося з'ездзіць туды. Але там яна мала што ўведала. З дакументаў відаць было толькі, што пад такім імем яна была запісана «ў час паступлення». А «паступіла» яна, калі ёй было веку адзін толькі месяц. Ніякіх другіх звестак у дакументах не было. І распытаць хоць пра якія-небудзь падрабязнасці таксама не было ў каго — тут цяпер працавалі новыя людзі. І ўсё ж ёй пашанцавала. Нехта з супрацоўнікаў раптам успомніў, што на чыгуначным пасёлку жыве жанчына, якая працавала ў гэтым дзіцячым доме адразу пасля вайны. Таццяна кінулася шукаць яе і такі знайшла. Памяць у жанчыны была добрая, і яна даволі лёгка прыгадала, як і пры якіх абставінах Таццяна апынулася ў дзетдоме. Прынёс яе, аказваецца, адзін пажылы пастаўнік, што жыў тады непадалёк. Выходзячы ў той дзень раніцаю з дому, ён заўважыў на ганку нейкі пакунак, загорнуты ў старую ватоўку. Разгарнуўшы яго, убачыў маленькае дзіця. Пастаўнік і прынёс яго ў дзетдом. Ён і даў дзяўчынцы імя — Таццяна Аляксандраўна Ларына. А чаму іменна такое, жанчына не ведала. Яна была занята нейкім сваім клопатам. Пра старога ж настаўніка сказала, што ён гады праз два памёр, але пакуль жыў, то часта наведваўся да сваёй хросніцы, прыносіў ёй ласункі. Жыў ён адзінока, сям'я яго загінула ў вайну.

Таццяна дні тры тады гасцявала ў жанчыны. Тая ўспамінала ўсё новыя і новыя падрабязнасці з дзён Таццянінага маленства, пра якія сама дзяўчына нічога ўжо не памя-

тала. Разам з жанчынай Тацяна і пасмяялася і паплакала...

Можна было меркаваць, што той невядомы стары настаўнік выкладаў рускую літаратуру. І, мабыць, вельмі любіў Пушкіна. Таму і стала яна Тацянай Ларынай. А Аляксандраўнай — гэта, канечне, у гонар самога паэта, бо тая, пушкінская Тацяна, была, як вядома, Дзмітраўнай.

З тае пары Тацяна бясконца чытала і перачытвала Пушкіна, які стаў самым яе любімым паэтам. А «Яўгенія Анегіна» вывучыла нават на памяць. І недзе ў душы стала лічыць сябе сваячкай і ледзь не нашчадкам вялікага паэта. Праўда, у гэтым яна нікому не прызнавалася, ані нікому.

І зрабілася ёй пасля гэтага не так ужо сіратліва, не так адзінока і самотна на белым свеце.

...І вось — на́ табе маеш: Танюсечка!..

— Танюсечка, праўду я кажу? — прысюсюкваючы, паўтарыла Ніна Іванаўна.

Тацяна аж сцулілася. А Зіна кашлянула і са спагадаю зірнула на Тацяну.

Але якраз на гэтую хвіліну ў ашчадную касу ўвайшоў Тацянін збавіцель.

Гэта быў высокі малады чалавек у шэрым аднабортным касцюме і ў такім жа шэрым капелюшы, з блакітным у белую гарошынку гальштукам. А на яго твары Тацяне перш за ўсё кінуліся ў вочы вузенькія цёмныя вусікі.

— Добры дзень, грамадзяначкі! — весела сказаў малады чалавек.— Са святачкам вас!

— З якім? — нецярпліва азвалася першай Зіна.

— Як гэта — з якім? — здзіўлена перапытаў малады чалавек.

— А што, што такое, а? — утаропілася ў наведвальніка Ніна Іванаўна.

— Няўжо вы дагэтуль нічога не ведаеце?

— Ды не мучце, не мучце! — сказала Тацяна.

— От жа цемната, ну што ты скажаш! — незласліва засмяяўся малады чалавек.— Дык ведайце: мы цяпер не абы-дзе, а — там! — І ён урачыста падняў сваю руку з выцягнутым указальным пальцам высока ўгору.— Там!

— У космасе? Зноў чалавек? — усклікнула Зіна.

— Ад самае раніцы шугае. З дзевяці гадзін.

— Я так і думала! — заявіла Ніна Іванаўна.— Я так і адчувала!

— Ён наш? — чамусьці ціха спытала Таццяна.

— А чый жа яшчэ! — Малады чалавек паглядзеў на Таццяну і цяпер гаварыў ужо толькі да яе.— Маёр Герман Сцяпанавіч Цітоў, во як яго зваць. Між іншым, ён мой зямляк. Алтайцы мы.

— Ён з Алтая? — перапытала Зіна.

— Ага. З нашага Алтая.

Зіна закідала яго новымі пытаннямі:

— А куды ён ляціць? Вакол Зямлі, як і Гагарын? Ці мо куды далей?

— Вакол Зямлі. Але доўга, відаць, будзе лётаць. Бо ўжо на трэці віток пайшоў. Віток за вітком робіць. Гэта значыць круціцца і круціцца, адзін раз за другім.

Малады чалавек з пераможным выглядам агледзеў усіх па чарзе і зноў сказаў да Таццяны:

— А вы тут седзіцё сабе і нічагусенькі не ведаеце. Зусім адсталі ад жыцця.

Ён з ахвотаю пачаў расказваць усё, што паспеў пачуць па радыё аб палёце Касманаўта-два. Перадавалі ўжо нават і біяграфію лётчыка, і хто ў яго бацькі, і хто жонка.

Таццяна слухала маладога чалавека, і незвычайная лёгкасць апаноўвала яе. З'яўлялася такое адчуванне, нібы і сама яна знаходзіцца ў нейкім палёце і гэты палёт будзе цягнуцца доўга-доўга, можа, нават бясконца, праз усё яе жыццё.

Яна проста не зводзіла вачэй з маладога чалавека. І таму, напэўна, што ён першы прынёс гэту незвычайную вестку, малады чалавек і сам здаваўся незвычайным. Таццяна пераконвала сябе, што ён выгадна вылучаецца з усіх вядомых ёй людзей, хаця чым менавіта, яна так і не магла зразумець.

— Дык вы, кажаце, таксама з Алтая? — спытала Зіна.

— Вядома, з Алтая. З самога Барнаула. Чулі пра такі горад? Сталіца нашага краю. Цудоўны горад.

— А тут вы ў камандзіроўцы хіба?

— На завочную сесію прыехаў. У педінстытут.

— З Барнаула ды к нам на сесію? — здзівілася Ніна Іванаўна.

— Чаму з Барнаула. Я цяпер тут працую, у Беларусі. Грымасы лёсу,— усміхнуўся малады чалавек.

— Якія грымасы? — не зразумела Ніна Іванаўна.

— Наогул...

Малады чалавек выняў з пінжака бумажнік.

— У мяне адно дзельца да вас. На акрэдытыву хачу палучыць. Грошы не дужа вялікія, адных пяцьдзесят рублёў. То як — можна?

Ніна Іванаўна адразу зрабілася строгая.

— Напішыце што трэба на адвароце, вось тут. Пашпарт у вас з сабою?

— А як жа.

Малады чалавек адышоўся ад бар'ера, сеў за столік, узяў ручку, але перадумаў і выняў сваю аўтаматычную.

— А каб цябе, ледзь не напісаў — пяцьсот. Ніяк не магу прывыкнуць да гэтых новых грошай.

Тым часам ад дзвярэй да бар'ера імкліва кінулася жанчына ў стракатым кароткім плашчы. Таццяна ведала жанчыну, яна ледзь не штодня бывала ў ашчадкасе. Сёння замест звычайных светлых валасоў у яе былі рыжыя. Здаецца, гэта яшчэ больш памаладзіла жанчыну, хоць яна і без таго была маладая.

— Чулі, жанчынкі? — адразу засакатала яна, падаючы Ніне Іванаўне ашчадную кніжку разам з расходным ордэрам.— Пайшоў на чацвёрты віток!

— Ужо на чацвёрты? — азваўся малады чалавек.— От што значыць наш алтаец!

— Уяўляеце, паслаў прывітанне афрыканцам! Я ў захапленні ад гэтага Германа!

— У нас на Алтаі ўсе такія,— зноў азваўся малады чалавек.

Жанчына скасавурыла вочы на яго.

— Бачыце, прысвоіў ужо нават Германа.

— Не прысвоіў, а канстатую факт. Гэта ж усім цяпер вядома, хто ён і адкуль. Ён нарадзіўся ў нас на Алтаі, у нас і гадаваўся. Бацькі яго і цяпер там жывуць.

— А вы от нешта збеглі з таго вашага Алтая. Клімат, відаць, не падышоў.

Жанчына ўзяла даволі вялікую суму грошай — Таццяна бачыла, як Зіна налічыла ёй ладны стосік чырвоных дзесятак,— потым кінула на маладога чалавека знішчальны позірк і паважна падалася да выхада.

— Грымасы лёсу, грамадзяначка,— буркнуў ёй услед малады чалавек.

— Жонка прафесара Тукоўскага,— сказала Зіна да Таццяны.— Ён старэйшы за яе год на трыццаць.

— На трыццаць два,— удакладніла Ніна Іванаўна.

— Яно і відаць,— зноў буркнуў малады чалавек.— Такія во і разбіваюць сем'і.

Ён падышоў да бар'ера. Ніна Іванаўна праверыла яго акрэдытыў, зазірнула ў пашпарт, зрабіла запіс у рэестры і перакінула акрэдытыў з пашпартам на Зінін столік. Да століка перайшоў і малады чалавек.

Зіна пачала лічыць грошы.

Таццяна паглядзела чамусьці на Зініны рукі. «Якія ў яе прыгожыя пальцы,— падумала яна, машынальна лічачы следам за Зінай грашовыя паперкі.— Адна, дзве, тры... Такія пульхненькія, мякенькія. Чатыры, пяць... Мабыць, вельмі прыемна бывае, калі такія пальцы дакрануцца да тваёй рукі. Вельмі, напэўна, прыемна».

— Нікога яна не разбівала,— сказала Зіна, аддаючы маладому чалавеку пашпарт, у які наклала і грошы.— Яго першая сям'я загінула ў вайну. А гэта жанчына, калі хочаце ведаць, вельмі любіць яго.

Малады чалавек хуценька паклаў пашпарт з грашыма ў кішэню пінжака.

— Зноў грымасы,— прамовіў ён і пашыбаваў да дзвярэй.

Таццяна паглядзела яму ўслед. І раптам нейкая невыразная, незразумелая трывога працяла яе, і яна аж скалапулася. Гэта была нават не трывога, а штосьці такое, чаму і назву цяжка было даць. Бы нехта спадцішка шаппуў ёй страшэнную абразу.

Яна зірнула на Ніну Іванаўну, пасля на Зіну. Тыя займаліся кожная сваёй справай. Іх прывычныя засяроджаныя твары адразу супакоілі Таццяну. Праз момант яна і сама ўжо дзівілася: чаго гэтак папалохалася?.. Нічога ж не здарылася, ніхто нічога не зрабіў і не сказаў...

«Насланнё нейкае, дый годзе»,— падумала Таццяна і, каб канчаткова збавіцца ад таго непрыемнага халадку, які казытнуў быў яе недзе пад сэрцам, гучна спытала ў Зіны:

— Скажыце, адкуль гэта ў вас такія пальцы? Дзе вы іх гадавалі?

— Магу адкрыць табе сакрэт,— змоўніцкім тонам сказала Зіна.

— Ну-ну?.. — аж загарэлася Таццяна.

— Я іх гадавала ў малацэ.

— Як — у малацэ?

Перачакаўшы трошкі, каб яшчэ больш заінтрыгаваць Таццяну, Зіна ледзь не шэптам прамовіла:

— А так. Сама кладуся спаць, а іх — у малако. На ўсю ноч.

Таццяна засмяялася. Засмяялася і Ніна Іванаўна. І толькі сама Зіна аставалася сур'ёзная. Яна зрабіла выгляд, што ёй пільна трэба знайсці нешта ў паперках, якія ляжалі ў шуфлядзе стала, і старанна пачала корпацца там. Гэта яна ўмела рабіць лоўка: дойме людзей аж да рогату, а сама ані не ўсміхнецца.

Зноў пачалі з'яўляцца наведвальнікі. Іх усё большала. Да Ніны Іванаўны станавіліся па тры, а то і па чатыры чалавекі адразу. Таццяна ўзялася памагаць Ніне Іванаўне.

— Вам прывітанне, шаноўная,— сказаў Таццяне таўставаты і зусім лысы чалавек з шырокім вуграватым носам, калі яна ўзяла яго ашчадную кніжку.— Персанальнае.

— Ад каго?..— сумелася Таццяна.

— Ад таварыша Цітова! — задаволены сваім жартам, зарагатаў чалавек.

— Скажаце!..

— Ён толькі што зрабіў чацвёрты віток. А як ляцеў над намі, адбіў тэлеграму. Вітаю, маўляў, і ўсё такое іншае. Усіх нас вітае. Гэта значыць — і вас.

— А вы чулі,— сказала да чалавека жанчына пэўнага ўзросту ў высокім, нібы гарлач, капелюшы,— у яго быў абед з трох блюд. Гэта ж думаць! Першае, другое і нават трэцяе!

— Магу вас запэўніць, тыя блюды надзвычай каларыйныя.

— Ну але, але. А от ці смачныя, а? Ці такія, як, напрыклад, гогаль-могаль?

— Што да смаку, то тут я мушу з вамі паспрачацца, шаноўная. Справа ў тым, што стан бязважкасці, на маю думку, павінен вельмі адмоўна ўплываць на такое, ведаеце, самае распаўсюджанае наша пачуццё, як смак. Вельмі адмоўна.

— Няўжо? — спалохана спытала жанчына.— Гэта ж думаць!

Пакуль афармлялі ім што трэба было, пакуль Зіна лічыла грошы жанчыне, а потым прымала пачачак рублёвак ад мужчыны, новыя знаёмыя не пакідалі гаварыць пра

абед у космасе. Яны і на вуліцу пайшлі разам, выказваючы кожны свае меркаванні наконт тых трох касмічных блюд.

Таццяне падала сваю кніжку высокая кабета з вялікімі і, відаць, дужымі, як у мужчыны, рукамі.

— А што, калі — бронь божа! — ён не зможа сесці?..— з трывогаю праказала яна і паглядзела на столь. Таццяна таксама зірнула туды.

— Сядзе! — упэўнена сказаў маладзенькі міліцыянер у новенькай гімнасцёрцы, на якой зырка паблісквалінагоны з дзвюма беленькімі зорачкамі.

— Вы так лічыце? — павярнулася да яго кабета.

— Точна!

— А то нешта ж вельмі боязна. Што, думаю, як возьме дый не сядзе? Сапсуецца там што-небудзь або паогул што здарыцца...

— Не хвалюйцеся, грамадзянка, у нас, у ваенных, усё заўсёды ведаеце як? Як штык!

— То і дзякуй богу. Значыцца, сядзе?

— Як ніць даць!

Праз колькі часу ў ашчаднай касе зноў стала ціха і бязлюдна.

Аддалася нейкім сваім думкам Ніна Іванаўна. Лётуценнымі вачыма ўтаропілася некуды ў левы кут пакоя Зіна. І Таццяна таксама развіталася з ашчаднай касай і паляцела хоць і не ў космас, але і не за блізкі свет...

Дзе яна, тая мясціна, што стане налета жыццёвым Таццяніным прытулкам? Ці хоць што людскае будзе? Ці спадабаецца, ці палюбіцца яна? А якое надарыцца ёй жытло?.. О, каб удалося займець хоць які-небудзь, хоць маленечкі, хоць во такенечанькі, але асобны, зусім асобны пакойчык! Таццяна яшчэ ніколі не жыла ў асобным пакоі. Як памятае яна сябе, заўсёды яна была на людзях. Мяняліся ложкі, мяняліся месцы, дзе іх ставілі, але заўжды побач былі нечыя яшчэ, такія ж няўтульныя, над аднолькавымі коўдрамі, казённыя ложкі. Канечне, весела жыць на людзях. Але ж выпадае часам чалавеку такая хвіліна, калі яму во як трэба пабыць аднаму, каб ані нікога не было паблізу, каб аніводнае вока не мела як кінуць на цябе, можа, не такі ўжо і благі, але зусім табе цяпер непатрэбны, нежаданы і таму невыносны пагляд. І калі казаць зусім шчыра, не заўсёды ж чалавеку павінна быць адно толькі весела. Для нечага ж дадзены чала-

веку і смутак, і туга. А яны вой як не любяць, каб на іх дзівіліся. Або, напрыклад, слёзы. Калі ім надыдзе паліцца з тваіх вачэй, дык чужыя вочы тут зусім лішнія.

Ніколі не мела Тацяна і свае ўласнае шафы. Тацяніны сукенкі, кофты, спадніцы заўсёды віселі або ляжалі разам з нечымі яшчэ сукенкамі, кофтамі, спадніцамі. Пачуццё гідлівасці не было самым моцным з ліку тых пачуццяў, якімі прырода падарыла Тацяну, аднак і абыякавасцю да ўсяго навакольнага яна тым больш не вызначалася. І зусім не раўнадушнасць ахоплівала яе, калі, вымаючы з інтэрнацкае шафы якую сваю адзежыну, даводзілася чуць на той пахі і «Белага бэзу», і «Ландыша серабрыстага», і «Духмянага гарошку», і нават «Букета маёй бабулі».

«Відаць, я ўсё ж страшэнная эгаістка,— падумала раптам Тацяна.— Але ж, божа ж ты мой, як мне хочацца мець асобны пакой і асобную шафу!..»

У той шафе, вядома, на самым пачэсным месцы будзе вісець даўгое, аж да самай падлогі, плацце з чорнага панаксаміту. І як толькі адчыніш шафу, плацце так і кінецца на вочы, цешачы сэрца сваёю высакароднай чорнасцю.

Ціха, каб не напалохаць задуменную Зіну, Тацяна спытала:

— Скажыце, Зіна, мне будзе да твару... вы чуеце мяне, Зіна?

— Чую...— не адразу адказала Зіна, не мяняючы, аднак, сваёй паставы.

— Скажыце, Зіна, мне будзе да твару чорны панаксаміт? А?

— Чорны? — перапытала Зіна, не паварочваючыся да Тацяны.— Чорны цяпер не ў модзе.

— Не ў модзе?.. — спалохалася Тацяна.

— Тыя панаксаміты наогул ніхто ўжо не носіць. Гэта перажытак мінулага.

Тацяна сядзела сама не свая. Твар яе, і без таго бялявы, стаў зусім белы.

— Што вы такое гаворыце, Зіна...

— Панаксаміту надышлі канцы,— засмяялася Зіна і толькі цяпер паглядзела на Тацяну.

Тацяна хуценька апусціла галаву, каб Зіна не заўважыла, што з ёй робіцца. Пасля і зусім нагнулася над стол, робячы выгляд, быццам ёй неадкладна спатрэбілася на-

правіць панчоху. Тады зняла яшчэ і басаножку, паляпала ёю аб падлогу, нібы штосьці вытрасаючы.

— Трымай цяпер кірунак на парчу,— сказала Зіна.

Добра, што ў ашчадную касу зноў пачалі заходзіць людзі, і Тацяне не трэба было ўжо хаваць свайго твару ад Зіны. Да таго ж наведвальнікі паведамлялі ўсё новыя і новыя падрабязнасці пра палёт Цітова, і Зіна толькі і слухала іх.

А Тацяна амаль і не чула нічога. «Не, не, гэтага не можа быць! — пераконвала яна сама сябе.— Проста Зіна нешта блытае. Канечне, блытае. Бо як жа гэта так? Гэткі цудоўны матэрыял, гэткі прыгожы, а галоўнае — вунь які дарагі, і раптам... Не, не!»

Памагаючы Ніне Іванаўне, Тацяна паступова пачала супакойвацца. І ўжо канчаткова супакоілася, калі падумала: «Гэта яна зноў разыгрывае мяне. Яна проста, відаць, жартуе, от і ўсё!»

— А ведаеш,— сказала Зіна, калі зноў выпала так, што ў ашчадкасе нікога не было,— я вось толькі што падлічыла, мне асталося працаваць адных дваццаць пяць дзён. Роўна дваццаць пяць. А з першага верасня я ўжо — лататы! На Чорным моры ў верасні сама што сезон. Ён ведаеш як называецца? Аксамітны! Аксамітны сезон, во.

«От жа ж бачыш, нават сезон і той аксамітны,— у думках сказала Тацяна Зіне.— Аксамітны — значыць, самы лепшы. І плацце з аксаміту — самае найлепшае».

— Адкуль гэта бяруцца смелыя людзі? — раптам спытала Ніна Іванаўна.— Чаму адны смелыя, а другія баязліўцы? І цікава, якіх людзей больш на свеце — смелых ці баязліўцаў?

— Больш за ўсё сярэдніх,— адказала Зіна.— Такіх, як я.

Тацяна горача сказала:

— Ну што вы такое на сябе нагаворваеце? Вы ніякая не сярэдняя.

— А якая ж?

Тацяна падумала.

— Проста... вы харошая, вось вы якая.

— Дзіўна, пра гэта мне чамусьці абсалютна нічога не вядома,— засмяялася Зіна.

— Праўда. Вы харошая,— паўтарыла Тацяна.

— А ці смелая? — зноў задала пытанне Ніна Іванаўна.

— Аднойчы... гэта было вельмі даўно, яшчэ ў дзяцін-

стве... мне раптам дужа захацелася скочыць з нашага балкона. А жылі мы тады на другім паверсе...

— І вы, канечне, скочылі? — сказала Тацяна. І адразу, не чакаючы адказу, бо ані не сумнявалася, што так яно і было, загаварыла пра сваё: — А ў мяне ніколі не было такіх жаданняў... ну, падобных... Мне чамусьці ніколі не хацелася зрабіць што-небудзь такое, што выклікала б цікаўнасць людзей. Папраўдзе.

— Я не скочыла,— сказала Зіна.

Тацяна ацiхла. І мо цэлую хвіліну глядзела на Зіну. Але па Зініным твары нельга было зразумець — ці праўду яна гаворыць, ці не. Напэўна, усё ж няпраўду. Яна ж любіць жартаваць. Любіць разыгрываць.

— А я вам не веру,— сказала Тацяна.

— Не скочыла, не. Відаць, я надта доўга прымервалася, прыглядалася, і гэта заўважыла маці. Яна схапіла ручнік і прагнала мяне з балкона. І пасля ўвесь час сачыла за мной. Толькі гэта я шмыгну на балкон, яна адразу хапае ручнік і — за мной. Наогул, мілая мая Тацяна, мне заўсёды, усё жыццё хто-небудзь перашкаджае. Усё жыццё. А мне ўсё жыццё хочацца некуды скочыць.

Зіна сказала гэта без асаблівага жалю або смутку. Наадварот, можна было падумаць, быццам яна нават і рада, і здаволена тым, што ёй заўсёды перашкаджаюць, бо іначай яна нарабіла б у жыцці шмат якіх скачкоў.

Тацяне ніхто ніколі нідзе не перашкаджаў. Проста, напэўна, таму, што ў гэтым не было ніякай патрэбы. Ні на якія такія скачкі яна проста не здатная. Можа, і наогул яна ні на што не здатная. Ну і што ж, ну і няхай сабе. І ніхто ад гэтага нічога не страціць, хоць і не выйграе, праўда, таксама ніхто нічога.

На шостым вітку Германа Цітова вакол Зямлі Ніна Іванаўна, падмаляваўшы апошні раз свае губы, зачыніла ашчадную касу.

Чарговы рабочы дзень скончыўся.

Канечне, чарговы толькі для Ніны Іванаўны і Зіны. Для Тацяны ён — апошні. Больш яна сюды не прыйдзе. Практыцы надышоў канец. Заўтра можна пайсці ў абласное ўпраўленне, атрымаць паперку, а тады пачынаць рыхтавацца да новага навучальнага года, таксама апошняга.

— Добра, што заўтра ў нас выхадны,— сказала Ніна Іванаўна.— А то я сёння нешта вельмі стамілася.

Але, сёння чамусьці ўсе вельмі стаміліся, хоць наведвальнікаў перабыло за дзень не так ужо і багата. Адчувала стомленасць і Таццяна. Гэта, напэўна, таму, што сягоняшні дзень — апошні... Аднак не, не таму. Вельмі ж ужо незвычайны быў ён, гэты дзень. Столькі прынёс узрушанасці, столькі хвалявання, столькі гамонкі. Такога не падаралася за ўвесь час практыкі.

— Заўтра спаць буду аж гадзін да дванаццаці,— закінуўшы рукі за галаву і пацягваючыся, прамовіла Ніна Іванаўна.— Няхай усе мае хаця разочак пабудуць галоднымі. Няхай хаця разочак пазлуюцца як след, у ахвотку. Пабунтуюць няхай, урэшце.

— Дзевачкі...— нейкім глухім голасам сказала раптам Зіна.— Дзевачкі...— паўтарыла яна зноў.— От я і з'ездзіла...

— Што?..— чамусьці шэптам сказала Ніна Іванаўна. Глухі Зінін голас і асабліва гэты шэпт Ніны Іванаўны да таго напалохалі Таццяну, што яна аж падхапілася з крэсла. Яшчэ нічога не разумеючы, ні пра што не здагадваючыся, Таццяна адно пазірала то на Зіну, то на Ніну Іванаўну.

— На самае Чорнае мора з'ездзіла,— тым жа глухім голасам зноў сказала Зіна.— На самы паўднёвы бераг...

— Каса?..— здагадалася Ніна Іванаўна.

Зіна кіўнула галавой.

— Многа?

— Семдзесят пяць.

— А божачка!..

Цяпер зразумела ўсё і Таццяна. Правяраючы касу, Зіна выявіла нястачу. У яе не хапае семдзесят пяць рублёў. Аж семдзесят пяць!

— Зіна, вы палічыце яшчэ! — закрычала Таццяна.— Зіна, гэтага не можа быць!

— Я ўжо лічыла. Два разы лічыла.

— Трэба палічыць яшчэ. Куды ж яны маглі дзецца? Яны нікуды не маглі дзецца!

— Аднак жа от некуды дзеліся,— гаварыла Зіна ўжо нейкім другім, хутчэй за ўсё абыякавым голасам. Быццам яна ўжо змірылася з гэтай нечаканай бядою.

— Палічыце, Зіна, палічыце яшчэ. Давайце палічым усе разам.

— Сапраўды,— сказала Ніна Іванаўна,— давайце будзем шукаць. Чортведама што!..

Яны пачалі правяраць дакументы. Тацяна праглядала расходныя, Ніна Іванаўна прыходныя. Расходных было менш, і Тацяна не спяшалася. Кожную паперку яна аглядала з усіх бакоў, звярала суму лічбамі з сумай прапіссю і толькі тады адкідала костачкі на лічыльніках. Ёй трапіліся тры акрэдытывы. Адзін з іх, успомніла Тацяна, быў таго маладога чалавека з Алтая, земляка Германа Цітова. Аказваецца, яго зваць Фёдарам Фёдаравічам Воранавым...

І, як і тады, калі гэты Воранаў выходзіў з ашчаднай касы на вуліцу, Тацяну раптам зноў ахапіла нейкая трывога, нейкі неспакой. Яна яшчэ раз агледзела акрэдытыў, уважліва перачытала ўсё, што было там запісана. Акрэдытыў быў на сто рублёў. Пяцьдзесят з іх Воранаў атрымаў раней, астатнія ўзяў сёння. Тацяна ўспомніла, што ён якраз так і гаварыў — пяцьдзесят рублёў...

Усё было правільна.

Адкуль жа тады гэтая трывога, гэты неспакой?..

Тацяна прыгадала яшчэ: яна тады машынальна, следам за Зінай, лічыла грошы. І налічыла пяць паперак. Пяць паперак па дзесяць рублёў. Значыцца, пяцьдзесят рублёў.

Так, усё было правільна.

Ніна Іванаўна перакідала свой стос дакументаў хутчэй за Тацяну. Калі і Тацяна скончыла сваю работу, яны ўзяліся лічыць грошы ў касе. Зіна тым часам моўчкі сядзела на крэсле, адкінуўшыся на спінку і бязвольна апусціўшы рукі на калені. Яна не галасіла, нават не плакала, нават не глядзела ў той бок, дзе за яе сталом корпаліся Ніна Іванаўна і Тацяна. Быццам яе ўжо і не цікавіла тое, што яны там рабілі. Быццам яна ўжо ўсё для сябе вырашыла.

Тацяна яшчэ не пераставала спадзявацца, што адбылася нейкая прыкрая памылка, што грошы абавязкова знойдуцца. За ўвесь час яе практыкі тут, у гэтай ашчаднай касе, не было яшчэ ніводнага выпадку нястачы. У Зіны заўсёды ўсё было ў ажуры. Яна была вопытная касірка, працавала тут не адзін год, і проста немагчыма было сабе ўявіць, што з ёю можа здарыцца такая непрыемнасць.

Але вось Ніна Іванаўна адкінула на лічыльніках апошнюю костачку і спынілася. Рукі яе ўпалі на стол. А вочы доўга яшчэ глядзелі на лічыльнікі, і па іх Тацяна зразумела, што спадзяванні яе не спраўдзіліся.

Так, грошай у касе не хапала. Лічыльнікі паказвалі тую самую суму — семдзесят пяць рублёў...

— Паспрабуй успомніць, Зіначка,— умольна сказала Ніна Іванаўна.— Можа, ты як-небудзь успомніш, каму перадала іх? Ну, паспрабуй успомніць...

— Нічога я не ведаю...— Зіна ўстала, але тут жа зноў апусцілася на крэсла.— Нічога... І наогул, давайце не будзем больш пра гэта. Я нарабіла бяды, мне і адказваць.

— А ведаеце што? — раптам сказала Таццяна.— Я ўспомніла! Але, але, я ўспомніла!

— Што ты ўспомніла? — ледзь не закрычала Ніна Іванаўна.

Таццяна намацала сябе рукою за лоб, павярнулася да Зіны.

— Вы яму перадалі... ну, гэтаму... земляку Цітова. Але, але, я ўспомніла! Іменна яму!

— Земляку Цітова?..— разгублена перапытала Зіна.— Таму, што па акрэдытыву браў?.. Але чаму яму? Што ты ўспомніла?

— Мне яшчэ тады здалося,— хутка пачала гаварыць Таццяна,— ну тады, калі вы лічылі яму грошы. Мне тады ўжо нешта здалося. Але тады я яшчэ не ведала, што яно такое. А от цяпер здагадалася. Вы адлічылі яму не дзесяткамі, а па дваццаць пяць рублёў. Пяць паперак па дваццаць пяць рублёў.

— Гэта пэўна? — спытала Ніна Іванаўна.— Ты гэта пэўна ведаеш?

— Так, так! — горача ўсклікнула Таццяна. Пасля дадала: — Мне так здалося...

— Чаму ж ты адразу не сказала? Яшчэ тады?

— Дык гэта мне цяпер так здалося. А тады... тады я нічога не заўважыла. А можа, і заўважыла, ды не падумала. А от цяпер... па-мойму, тыя паперкі былі не чырвоныя. Яны былі бэзавыя. Ну, але, бэзавыя!

Таццяна хуценька адшукала акрэдытыў Воранава, і яны пачалі разглядаць яго. Спачатку пакруціла яго ў руках Ніна Іванаўна, потым узяла Зіна. Яна доўга ўглядалася ў яго, наморшчвала лоб, думала...

— Не, не помню,— сказала яна нарэшце.— Хоць забіце, не помню.

— Ён, ён...— зноў пачала адстойваць сваё Таццяна, але ўжо не з тою упэўненасцю, як раней.— Па-мойму, гэта ён. Больш ніхто, як ён...

— Калі б ты сказала адразу...— Зіна сумна паківала галавою.— А цяпер што ж...

— Шукай у полі ветру,— дадала Ніна Іванаўна.— Трэба было сказаць адразу. Як убачыла, тут і трэба было сказаць.

— Сказаць!.. Але ж я нічога не ўбачыла. Каб жа ўбачыла!

Таццяна стала раптам адчуваць, што ранейшая ўпэўненасць пачала невядома чаму пакідаць яе. Сапраўды, адкуль яна ўзяла, што там былі тады паперкі бэзавага колеру, а не чырвонага? А магчыма, што яны былі якраз чырвоныя? Яна ж дакладна нічога не бачыла. Яна не ўзіралася тады ў тыя паперкі. Можа, яны былі бэзавыя, а можа, і не бэзавыя...

Але чаму ж тады ахапіла была яе нейкая трывога ў той момант, калі малады чалавек браў грошы, калі клаў іх у кішэню? Трывога чамусьці ж была, гэта Таццяна добра памятае. Узнікла яна і яшчэ раз, калі ён выходзіў з ашчадкасы на вуліцу. Відаць, недзе ў падсвядомасці, у нейкім куточку мазгоў якраз і адбілася розніца ў колерах, інтуітыўна зафіксавалася, што грошы былі не тыя, якія трэба...

— Дык ты нічога пэўна не ведаеш? — спытала Ніна Іванаўна.

— Пэўна не ведаю... Але нешта мне здалося, што так яно і было...

Зіна, якая ўсё яшчэ круціла ў руках акрэдытыў, уголас прачытала:

— Воранаў... Фёдар Фёдаравіч Воранаў...

— Гэтак і паклёп на чалавека нядоўга ўзвесці,— сказала Ніна Іванаўна.

Яны нейкі час маўчалі.

— Трэба яго знайсці,— падала парэшце думку Таццяна. — Знайсці і спытаць. Можа, ён і сам, калі што было, нічога не заўважыў. Памятаеце, ён увесь час гаварыў пра Цітова. Што ён ягоны зямляк, што ён таксама з Алтая. Трэба знайсці і спытаць. І калі што якое, дык ён і аддасць.

Ніна Іванаўна і Зіна па-ранейшаму маўчалі.

— Праўда, ён жа аддасць. Гэта ж не ягоныя грошы, а чужыя. Нават не чужыя, а дзяржаўныя. Чаму ж ён не аддасць? Калі хочаце, я памагу шукаць. От заўтра з раніцы і пойдзем. А то можна яшчэ і сёння, яшчэ ж не позна.

— Дзе ты яго знойдзеш...— прамовіла Ніна Іванаўна.— Ён жа нейкі прыезджы...

Зіна нарэшце ўстала з крэсла.

— Нічога не трэба шукаць,— рашуча сказала яна.— Што з воза ўпала, тое прапала.

Яна дастала з сумачкі ашчадную кніжку, разгарнула яе і кінула на стол Ніне Іванаўне.

— Ніна Іванаўна, здыміце, калі ласка, семдзесят пяць рублёў. Я зараз напішу расходны ордэр.

Спяшаючыся, Зіна схапіла з бар'ера бланачак і стала хутка пісаць на ім. Потым схапіла другі, бо першы, відаць, сапсавала.

— Яшчэ астанецца восем рублёў,— з сумнаю ўсмешкай сказала Зіна, аддаючы ордэр Ніне Іванаўне.— На завод.

Таццяна імкліва падышла да Зіны, зазірнула ёй у вочы.

— Давайце напалам. У мяне таксама ёсць грошы, я збірала, праўда.— Голас у Таццяны дрыжаў, яна адчувала, што вось-вось расплачацца.

— Нічога, мая дзевачка, нічога,— таксама дрыжачым голасам сказала Зіна.— Падумаеш, не з'езджу адзін раз на курорт. Нічога страшнага.

Таццяна ўсё ж не стрымалася і ўсхліпнула.

— Ну вот яшчэ! — строжачыся, сказала Зіна.

І сама нарывіста адвярнулася, хаваючы твар ад Таццяны.

Калі прыехаў інкасатар, яны ціхенька сядзелі поруч, і вочы ва ўсіх трох былі чырвоныя. Але інкасатар гэтага не заўважыў, а мо толькі зрабіў выгляд, што не заўважыў.

— Парадачак, дзяўчаткі! — весела сказаў ён.— Ціск нармальны, вільготнасць семдзесят працэнтаў, тэмпература васемнаццаць градусаў па Цэльсію. Так што яшчэ палётаем, праўда?

— Палётаем, а хіба ж не,— як нічога і не было, адказала Зіна.

Забіраючы торбу з грашыма, інкасатар сказаў:

— Гэта ж думаць, такія багатыя нявесты тут сядзяць! Шкада, наспяшаўся я ажаніцца.

Ён кожны дзень гаварыў гэтыя словы і сам потым рагатаў на ўвесь голас. Зарагатаў ён і сёння. Звычайна Зіна яму што-небудзь адказвала, гаварыла які-небудзь жарт. І сёння яна таксама адказала, але ніякага жарту ў яе не атрымалася.

— Ды ўжо ж, багатыя. Во цэлых восем рублёў маем.

Інкасатар нічога не зразумеў, але пускацца ў гаворку яму не было калі, таму ён моўчкі пасунуўся да сваёй машыны, толькі пільна паглядзеў на Зіну.

Развітваючыся на вуліцы з Зінай і Нінай Іванаўнай, Таццяна зусім не ведала, што гаварыць, як трымаць сябе. У яе было такое адчуванне, быццам гэта яна вінаватая ў тым, што здарылася. І віну гэту ёй нічым не загладзіць.

Зіна дакранулася рукою да яе локця. Сапраўды, дотык Зініных пальцаў быў надзвычай пяшчотны.

— Бывай, Таццяна Ларына,— мякка і неяк вельмі пранікнёна сказала Зіна.— Не хочацца верыць, што мы расстаёмся назаўсёды. Ты калі паедзеш у той свой тэхнікум?

— Мабыць, паслязаўтра.

— Жадаю табе шчасця. Многа і надоўга.

— Дзякую. Шчыра дзякую. І вам таксама жадаю.

Яны абняліся. Таццяна зноў ледзь не заплакала. Яна, зусім не прывыклая да пяшчот, нязграбна тыцнулася носам у Зініну шчаку і адчула сябе яшчэ больш няёмка. Шчымела ў горле, і ніяк не ўдавалася вымавіць ніводнага слова.

Потым яны абняліся з Нінай Іванаўнай і таксама пажадалі адна адной шчасця.

І пасля зноў стаялі, пераступаючы з нагі на нагу, ківалі галовамі і зноў гаварылі.

— Як кажуць, гара з гарою...

— Вядома, чаго ў жыцці не бывае...

— Можа, яшчэ і сустрэнемся калі, праўда...

Нарэшце Зіна павярнулася і пайшла. Тады рушыла з месца і Ніна Іванаўна. Яна адразу перайшла на другі бок вуліцы, каб завярнуць за вугал,— гэтак, відаць, ёй было бліжэй дадому.

Таццяна падалася ў адваротным кірунку. Крокаў праз пяць ці шэсць яна азірнулася назад. І ў гэты момант азірнулася і Зіна.

— Мы яшчэ скочым, праўда? — крыкнула Зіна.— Мы яшчэ сваё скочым!

Таццяне карцела пабегчы назад, да Зіны. Дагнаць бы яе і потым доўга ісці побач, разам. І ўвесь час быць каля яе, блізенька. Але Зіна таксама ўжо завярнула за вугал і знікла з вачэй.

Расставанне заўсёды ўносіць у душу смутак. А гэтае расставанне было асабліва тужлівае. Здарылася так, што

па ўсім свеце ў Таццяны было не так ужо багата людзей, да якіх яна адчувала блізкасць, і зусім ужо невядомае было ёй пачуццё роднасці. Яна не ведала братніх і сястрынскіх пачуццяў. А от да Зіны, сама не разумеючы чаму, яна адчула гэтую роднасць. Хоць за ўвесь час яны мала калі былі разам, акрамя як на рабоце, і ім амаль не даводзілася гутарыць аб чым-небудзь па-шчырасці, адкрыта, Таццяне чамусьці здавалася, што калі б была ў яе сястра, то гэтай сястрою магла быць толькі Зіна. Такога пачуцця ў Таццяны раней не ўзнікала. Цяпер яно немаведама чаму з'явілася, а ўжо трэба расставацца.

Было крыўдна і балюча.

У сталовай, дзе Таццяна звычайна харчавалася, ёй удалося паабедаць даволі хутка, бо сёння і тут людзей было няшмат.

Затое людна і шумліва было на вуліцах. Відаць, сёння ўсе дамы ў горадзе апусцелі, а ўсе людзі падаліся ў гурт, каб быць разам, бліжэй адзін да аднаго. Як толькі Таццяна выйшла са сталовай, яна адразу апынулася ў мітуслівым людскім віры.

Ніякага пэўнага плана ў яе не было. Што рабіць далей, як прабавіць сённяшні вечар, Таццяна проста не ведала. Яна падумала, што варта было б схадзіць ва універмаг і яшчэ раз падзівіцца на той чорны панаксаміт. Але універмаг, напэўна, ужо зачынены.

Што ж яшчэ?

Можна было б, канечне, дазволіць сабе сёння схадзіць у кіно. Ды не вельмі штосьці ёмка хадзіць у кіно адной. А ісці ў інтэрнат, каб дамовіцца з кім-небудзь з сяброўак, нешта не хацелася. Тут Таццяна пашкадавала, што не дагнала тады Зіны. Не варта было пакідаць яе сёння адну. Ёй адной горка і моташна. Трэба было, канечне, пабыць з ёю. Яны і ў кіно схадзілі б разам. А калі не ў кіно, дык куды-небудзь на танцы, там неблагая танцпляцоўка. Патанцаваўшы, можна было б пагуляць яшчэ і па горадзе.

Хоць не, сёння Зіне наўрад ці захочацца куды пайсці. Яна будзе сядзець дома і, напэўна, плакаць. На людзях стрымлівалася, нават бадзёрылася, а дома дасць волю слязам. Гэта ж не жартачкі — семдзесят пяць рублёў!.. От і зноў не ўдасца ёй паехаць на курорт, на тое цудоўнае Чорнае мора. Таццяна ведала, што Зіна жыве са старэнькай маці, больш нікога ў яе тут у горадзе няма. Паплача сама Зіна, паплача і яе маці... То, можа, і правільна, што яна

не пайшла за Зінай. Той цяжка было б стрымлівацца далей. А яна гордая, слёз нізавошта не захоча паказаць.

Тацяна ўсё ішла і ішла і не заўважыла, як апынулася на галоўнай магістралі. Тут было яшчэ больш людна. Але пераважала моладзь — юнакі і дзяўчаты. Здаецца, дзяўчат было больш.

Сярод гэтага гамаплівага бестурботнага патоўпу Тацяна стала адчуваць сябе асабліва адзінокай. Відаць, толькі яна адна не мела кампаніі, усе астатнія ішлі па двое, па трое, а то і цэлымі чародкамі. Тацяна збочыла на другую вуліцу, што перасякала галоўную.

Тут крыху цішэй. І прыцемак здаецца гусцейшым. Колькі цяпер часу, Тацяна не ведала. Ды гэта яе і не турбавала. Напэўна, было не дужа яшчэ позна. Апошніх паведамленняў, канечне, яшчэ не перадавалі.

З дынамікаў, што віселі на ліхтарных слупах уздоўж вуліцы, неслася бравурная маршавая музыка. Але Тацяна не вельмі ўслухоўвалася ў яе. Думкі Тацяніны зноў і зноў вярталіся да Зіны, да тых злашчасных грошай, якія Зіна камусьці перадала. Хто ўсё ж быў той чалавек, які спакойна ўзяў семдзесят пяць рублёў, што яму не належалі? Сапраўды, хто ён?.. А мо гэта быў не адзін чалавек. Мо іх было некалькі? Магло ж здарыцца і так, што Зіна на працягу дня некалькім чалавекам перадавала, пераплачвала грошы,— то па пяць, то па дзесяць рублёў. Магло, мабыць, здарыцца і такое.

На нейкі момант дынамікі змоўклі, і тады адразу на ўсёй вуліцы запанавала цішыня. Людзі нібы па якой камандзе перасталі гаманіць і смяяцца, і нават хадзілі цішэй, стараючыся не так чутна шоргаць нагамі па асфальце. А некаторыя і зусім прыпыніліся. Яны збіраліся пад дынамікамі і нечага чакалі.

Тацяна і сама спынілася каля адной такой групы.

Побач з ёю аказалася пара маладых людзей. Ён трымаў яе пад руку, і ёй, напэўна, было вельмі хораша з ім, бо яна часта пазірала на яго сваімі вялікімі задумнымі вачыма і тады ўсміхалася цёплай і надзвычай мілай усмешкай. Тацяна, не таячыся, адкрыта любавалася імі. І раптам стала адчуваць, што і сама пачала ўсміхацца і што ёй нечакана зрабілася вельмі лёгка і вельмі неяк утульна. «Цікава, яны ўжо муж і жонка ці яшчэ не? — падумала Тацяна.— Мабыць, яшчэ не. Канечне, яшчэ не муж і жонка. Бо вельмі ж ужо далікатна трымае ён яе пад руку.

А кажуць жа, што, калі хлопец робіцца мужам, ён адразу мяняецца, і дзе ўжо дзяецца тая яго пяшчотнасць і далікатнасць...» Тацяна і сама ведала аднаго такога чалавека. Яе пазнаёмілі з ім летась, калі ён толькі пачынаў заляцацца да адной яе таварышкі па інтэрнату. Тады Тацяна нават пазайздросціла той дзяўчыне, пазайздросціла, што ў яе такі ветлівы і абыходлівы кавалер. Але як толькі ажаніліся яны, дзе тое што і дзелася. Нібы хто падмяніў чалавека. Твар у яго зрабіўся пыхлівы, нейкі надзьмуты, хлопец ужо ніколі не браў сваю маладзіцу пад руку, а толькі яна брала яго. Часцей жа за ўсё яны наогул хадзілі наводдаль адно ад аднаго, прычым ён крочыў наперадзе, а яна дробненька тупала ззаду. І калі Тацяне надаралася сустракаць іх, ёй рабілася да таго прыкра і балюча, быццам гэта зневажалі яе самую і не толькі яе адну, а і ўсіх жанчын наогул.

Дынамік усё яшчэ маўчаў, і людзі пачалі прыкметна хвалявацца.

Старэнькая бабуля, якая трымала ў руках даволі вялікую сетку, напакаваную спрэс пакупкамі, шумна ўздыхнула і перахрысцілася. А мужчына ў светлым касцюме і ў чорнай сарочцы, паглядзеўшы на людзей вакол сябе, сіпаватым голасам сказаў:

— Я гэта і думаў.

Да яго адразу павярнулася тая дзяўчына, што стаяла пад руку з хлопцам, і спалохана спытала:

— Што? Што вы сказалі?..

Мужчына акінуў яе позіркам з галавы да ног.

— А от тое і сказаў.

Тады да мужчыны павярнуліся ледзь не ўсе, хто толькі стаяў каля слупа з дынамікам. І ўсе глядзелі на яго. Адны са здзіўленнем, другія недаўменна, трэція нават разгублена. Паступова людзі бліжэй пасоўваліся да мужчыны і неўзабаве абкружылі яго з усіх бакоў. Ніхто нічога не гаварыў, усе чакалі, што скажа яшчэ мужчына. А ён і сам ужо сцішыўся і адно лыпаў з-пад густых навіслых броваў маленькімі, быццам прыпухлымі вочкамі.

А дынамік усё маўчаў. Тацяне здавалася, што ён маўчыць ужо немаведама колькі. Чаму ён маўчыць? Што там такое здарылася? Людзі чакаюць, а ён — ані слова, ані гуку. І не даўмеешся, што і думаць.

От гэтак жа, як і тут, стаяць, напэўна, каля рэпрадуктараў людзі ва ўсім горадзе. І не толькі ў горадзе, а і ва

усёй краіне. Нават ва ўсім свеце. Але, але, так яно і ёсць — усе людзі Зямлі, усе тры мільярды чакаюць, што скажа радыё.

І, вядома, чакаюць вестак з космасу і ў далёкім Алтаі. Канечне, землякі Цітова асабліва хвалююцца, а найбольш — яго маці. А вось адзін з яго землякоў тут, у гэтым горадзе. Мо і ён таксама стаіць цяпер недзе пад рэпрадуктарам?..

Не, ён не мог узяць тых грошай. Ён жа так шчыра ганарыўся зямляцтвам з Германам Цітовым. Гэтага з ім проста не магло здарыцца. Бо які ж ён тады зямляк?..

І ўсё ж... Перад Тацянінымі вачыма зноў паўстала тое, калі Зіна лічыла Воранаву грошы, а яна, Тацяна, следам за Зінай машынальна пералічвала асігнацыі. І зноў з'явілася перакананне, што асігнацыі былі бэзавага колеру. Бэзавага, а не чырвонага.

— Гаворыць Масква! — грымнуў раптам дынамік.

Словы былі іменна тыя, якія яна і чакала, і голас якраз той, які і павінен быў іх сказаць, і ўсё ж Тацяна захвалявалася. Яна падалася наперад, бліжэй да рэпрадуктара, хоць і без таго чуваць было добра.

Відаць, дыктар таксама хваляваўся. І хоць голас яго гучаў пранікнёна і нават узнёсла, у ім усё ж адчуваліся і другія ноткі — ноткі неспакою, якога ён прыхаваць не мог.

Тацяна добра ведала гэты голас, ён заўсёды гучаў тады, калі па радыё перадавалі самыя важныя паведамленні. Кажуць, гэты дыктар і ў вайну яшчэ паведамляў усё самае важнае. Яна і прозвішча яго чула. Пачакай, як гэта яго прозвішча?.. Ат, якое гэта мае цяпер значэнне. Прозвішча выскачыла з галавы, ну і што ж, ну і няхай сабе. Голас усё роўна гучыць, ён гаворыць якраз тое, што гэтак патрэбна цяпер Тацяне, патрэбна людзям, што стаяць побач, патрэбна ўсім у горадзе. Патрэбна ўсім тром мільярдам чалавек на планеце Зямля.

— Вы гэта і думалі? — кпліва сказаў да мужчыны ў чорнай сарочцы малады чалавек, які па-ранейшаму трымаў сваю сяброўку пад руку.

— Пагледзімо яшчэ. Пагледзімо!..— прамовіў мужчына. Цяпер ён не глядзеў ужо ні на кога, позірк яго блукаў недзе над галовамі людзей.

Не сказаўшы больш ні слова, ён падаўся прэч.

— Эх, вы!..— кінула яму наўздагон дзяўчына. Кінула з пагардаю, з грэблівасцю.

Дыктар пачаў перадаваць паведамленне напава, і Таццяна вельмі ўзрадавалася. Аказваецца, яна нічога не запомніла, усё неяк прапусціла, і ў галаве не асталося ніводнай падрабязнасці, акрамя аднаго: што там усё добра. «Гэта ж трэба! — упікнула сябе Таццяна.— Слухала і нічога не чула!..»

Цяпер яна слухала спакойна і ўважліва. Мімаходзь адзначыла ў думках, што і ўсе астатнія таксама стаяць і слухаюць. Знік толькі адзін чалавек.

Аказваецца, Герман Цітоў лёг спаць. Ён так і сказаў. Вы, маўляў, як сабе хочаце, а я кладуся спаць. Перад гэтым ён працаваў, нават уключаў ручное кіраванне. Таццяна паспрабавала ўявіць сабе, як гэта ён уключаў тое кіраванне, але нічога пэўнага ўявіць так і не ўдалося.

— Усё. Вырашана канчаткова. Ён будзе Германам.

Гэта зноў сказаў хлопец. Сказаў ціха, да аднае толькі дзяўчыны, але Таццяна пачула. Яна крадком зірнула на іх. Хлопец запытальна глядзеў на сваю сяброўку, чакаючы, відаць, што яна яму скажа.

Вось, аказваецца, як яно павярнулася. Гэтыя маладыя людзі, выходзіць, муж і жонка. І ў іх будзе сын. І звацца ён будзе Германам.

То і няхай у іх будзе сын. Няхай будзе іменна сын. Цудоўненькі такі хлопчык, здаровенькі, прыгожанькі, разумненькі. Няхай будзе Герман!

— Я прывыкла ўжо да Юрыя,— сказала дзяўчына.

— А можа, злучым неяк разам? І Юрыя і Германа. Напрыклад, так: Юргер.

— Во, нейкае гер-гер выходзіць,— паморшчылася дзяўчына.

— Тады, можа,— Гагаціт?

— Не выдумляй,— засмяялася дзяўчына.— Гэтага яшчэ не хапала.

— Тады падумаем яшчэ.

— Падумаем.

Праўда, няхай яшчэ падумаюць. І Герман — добра, і Юрый — таксама добра. Няхай падумаюць. Падумаюць разам. І наогул няхай усё робяць разам. Заўсёды.

Ага, а прозвішча дыктара — Левітан. Правільна, Левітан. Таццяна магла цяпер пайсці адсюль. Тым больш што ісці добра, лёгка, нібы табе ўдалося неяк пабыць тую са-

мую касмічную бязважкасць. І ты можаш ісці колькі хочаш і куды хочаш і ніколі не адчуеш ніякай стомы. А ў Левітана імя таксама касмічнае: Юрый. Як у Гагарына. А прозвішча земляка Цітова — Воранаў. Фёдар Фёдаравіч Воранаў. І няпраўда гэта, што асігнацыі былі бэзавыя. Яны былі чырвоныя. Пяць чырвоных асігнацый па дзесяць рублёў. Усяго пяцьдзесят рублёў. Якраз столькі, колькі і было ў яго на акрэдытыве. Чужых грошай ён не браў. Ён іх не мог узяць. Тады ёй проста нешта здалося. Здалося тое, чаго сапраўды не было. Бо калі б гэта быў, напрыклад, той мужчына ў светлым касцюме і жалобнай сарочцы, тады іншая справа. Ад такога ўсяго можна чакаць. А ад Воранава — не. Ён зусім не такі. Ён жа таксама з Алтая, з радзімы касмічнага героя.

У Таццяны было такое адчуванне, быццам ёй штосьці падарылі. Нібы от узялі і нечакана зрабілі нейкі вельмі прыемны падарунак.

На яе ложку ў інтэрнаце ляжала запіска. У ёй роўным буйным почыркам прыгажуні Шуры Зварыкінай было напісана: «Многа! Многа! Паважаная! Таццяна Ларына! Калі Вы маеце жаданне спаткацца з Яўгеніем Анегіным, дык гэта Вы можаце зрабіць вельмі лёгка. Вам неабходна прыбыць у карэце з Вашым фамільным гербам у выглядзе дзвюх перастутаючых пожак у дваранскі клуб «Ракета», што на Савецкай авеню, роўна ў 21 г. 00 м. На той выпадак, калі Ваша карэта не зусім спраўная, можаце пакарыстацца аднοй з нашых, Вы іх лёгка пазнаеце па нашым фамільным гербе, на якім, як Вы, напэўна, памятаеце, ёсць словы: «Аўтобус працуе без кандуктара». Прыміце і ўсё такое іншае. Вашы добразычліўцы». Таццяна ўсміхнулася і зірнула на будзільнік, што стаяў на стале. Было дваццаць пяць мінут на дзесятую. Шкада, яна спазнілася. А сёння і сапраўды ішла карціна «Яўгеній Анегін», цяпер Таццяна ўспомніла. Вельмі шкада. Ах, Шура, Шура, няўжо яна не магла ўчора сказаць пра паход у кіно? А-а, ясна: гэтае рашэнне прыйшло да яе толькі сёння і прытым зусім нечакана, як і звычайна. Яна больш за ўсё тым і вызначалася, што ніколі нічога не вырашала загадзя, заўсёды прымала рашэнні ў самую апошнюю хвіліну і самыя нечаканыя. Дзіўна, але Шура ўмела прымушаць дзяўчат выконваць гэтыя яе рашэнні. Чамусьці ўсе слухалі яе, усе даўно і па добрай ахвоце прызналі за ёю права камандаваць астатнімі. Шура наогул цікавы чалавек. Нішто яе

ніколі не турбуе, нішто не раздражняе, але і радасці вялікай таксама нішто не прыносіць. Ствараецца ўражанне, што гэта іменна яе мелі за ўзор тыя, што прыдумлялі галоўную запаведзь раўнадушных: «Трэба жыць як набяжыць».

А якая запаведзь прыдумана для яе, для Тацяны?

Тацяна падумала і сказала сабе, што яна яшчэ не ведае тае запаведзі.

Наогул, яна яшчэ так мала ведае. А на свеце ж столькі ўсяго цікавага, неспазнанага. І ёсць, канечне, людзі, якія ведаюць вельмі-вельмі многа. Пазаўчора Тацяна прачытала ў часопісе артыкул пра аднаго з такіх людзей — пра Луначарскага. Артыкул быў вялікі, але і ў ім, як высветлілася, аўтару не хапіла месца, каб расказаць пра ўсё аб Луначарскім, і ён паабяцаў у канцы, што яшчэ вернецца да гэтай тэмы. Канечне, звычайнаму чалавеку столькі ведаць немагчыма, тут патрэбен талент, а талент даецца чамусьці не кожнаму. У Тацяны, напрыклад, няма ніякага таленту, яна гэта пэўна ведае. А ў Германа Цітова ёсць — ага, які талент! У Зіны, напрыклад, таксама ёсць. Толькі яна, мабыць, і сама пра гэта не ведае. Не здагадваецца чамусьці. Праўда, Тацяна таксама добра не ведае, які ён у яе, гэты талент, аднак у тым, што ён ёсць, яна ані не сумняваецца. І, можа, Зіна яшчэ здагадаецца пра свой талент, паверыць у яго. Або, можа, знойдзецца хтонебудзь, хто адкрые Зіне яе талент, прымусіць паверыць.

А ў Тацяны ніякага таленту няма, гэта ўжо бясспрэчна. Зрэшты, яна ні на кога і не крыўдуе за гэта. Аднойчы яна вычытала недзе такое выслоўе: «Талент — гэта як грошы; калі няма, дык няма». Што праўда, то праўда. Няма, і ўсё тут, і нічога ўжо не зробіш, і нікому ніякіх прэтэнзій не дасі.

От толькі жыць бы неяк так, каб кожны дзень што-небудзь даведвацца. Кожны дзень што-небудзь пазнаваць. Пражыла дзень і адчула: сёння я ўведала пра такую адну рэч, пра якую ўчора нават і не падазравала, што яна існуе. Перабыла новы дзень і зноў узрадавалася: а сёння ж я стала багацейшая, чым напярэдадні, бо ўдалося напаткаць нешта такое, што астанецца назаўсёды з табою. І так дзень за днём, праз усе дні.

Але, я ведаю пакуль вельмі мала, настолькі мала, што аж крыўдна. Вось прачытала я ў рамане такія словы: «Я сябе параўноўваю з Эдыпам». Прачытала і сумелася.

Сапраўды, хто ён такі, той Эдып? Я нічагуткі не ведаю пра яго, нават не чула такога імя. А той, хто сказаў гэта, чамусьці ведае. Ведае не толькі тое, хто такі Эдып увогуле, але і ведае пра яго штосьці такое, што дае яму магчымасць нешта параўноўваць і рабіць з гэтага нейкія вывады.

Або вось яшчэ. У апошніх паведамленнях учора сказалі: у нас будзе пабудаваны сінхрафазатрон на дзесяць мільярдаў электронавольт. Зноў невядома, што гэта за страхоцце такое — сінхрафазатрон? І чаму — электронавольт, а не проста вольт? Я ж праходзіла па фізіцы электрычнасць, мы нават доследы рабілі. Бралі, напрыклад, дзве катушкі, прымацоўвалі да іх такую жалезную пласцінку, якая завецца якарам, з такою бубачкаю на канцы, потым далучалі да катушак батарэйку ад кішэннага ліхтарыка, і атрымліваўся электрычны званок. Бубачка малаціла па блішчастай місачцы, і тая аж заходзілася звонам. Настаўнік гаварыў, што батарэйка мае чатыры з паловаю вольты, гэта я добра памятаю. Яшчэ я ведаю, што ў нашым інтэрнаце напружанне праводкі дзвесце дваццаць вольт, а ў магазіне, між іншым, прадаюць чамусьці прасы на сто дваццаць сем вольт, і яны нам не падыходзяць. Шура Зварыкіна нават спецыяльна ездзіла ў Мінск, каб купіць прас на дзвесце дваццаць вольт. Адным словам, што такое вольт — ясна. А от што гэта за яно такое — электронавольт?

Але, на свеце іcнуе страшэнна многа рэчаў, аб якіх не маеш абсалютна ніякага ўяўлення.

Я не ведаю, што такое спінінг. Не чытала Эўрыпіда. Не ездзіла на таксі. Не бачыла жывога пісьменніка. Не чула, як звініць сапраўдны бакара. Не ўяўляю, што такое сердалікавая бухта. Не ела антрыкоту.

Я нават не цалавалася. Чэснае слова!

Дзяўчат доўга не было, і Таццяна, не дачакаўшыся іх, пайшла на кухню, уключыла чайнік і з асалодаю выпіла дзве шклянкі пустога чаю з рэшткай пазаўчарашняга батона. І тут жа прыгадала, як Шура Зварыкіна сказала аднойчы: «Ведаеце, дзяўчаткі, які павінен быць чай? Ён павінен быць, як пацалунак любімай жанчыны,— гарачы, моцны і салодкі».

А я ніводнага разу яшчэ не цалавалася...

Цікава: дзе можна прачытаць пра тыя электронавольты? А звычайны вольт, між іншым, гэта вось што такое,

я цяпер успомніла: гэта адзінка рознасці электрычных патэнцыялаў або электрычнага напружання і электрарухаючай сілы.

Перш як легчы спаць, Таццяна адчыніла свой чамадан і выняла з яго невялічкі пакуначак, што ляжаў загорнуты ў газету, па самым сподзе, пад бялізнаю. Тут было ўсё яе багацце. Яе будучае плацце з чорнага панаксаміту. Заўтра яна купіць тое дзіва — роўна чатыры метры. Каб было да самага нізу, да самага долу. А пашые пасля ўжо, зімою. Пра свой набытак яна пакуль што не скажа дзяўчатам.

Таццяна разгарнула пакуначак, яшчэ раз пералічыла грошы. Іх было раўнюткa сто рублёў. Чатыры паперкі па дваццаць пяць рублёў. Ох, і дарага ж вы мне каштавалі, мае галубочкі. Нават шкада расставацца з вамі.

Дзяўчат усё яшчэ не было. Недзе яны сёння забавіліся. Мабыць, пасля кіно пайшлі яшчэ ў парк на танцы.

Яна так і заснула, нікога з іх не дачакаўшыся.

Сон у яе быў неспакойны, трывожны, яна прачыналася колькі разоў з адным і тым жа пачуццём нейкай незразумелай незадаволенасці ці то сабою, ці то яшчэ кім. Быццам яна штосьці рабіла ды не дарабіла да канца, а дарабіць трэба абавязкова, неадкладна. Яна падхоплівалася, садзілася на ложак і спалохана ўзіралася ў цемру, не разумеючы, дзе яна і што з ёю. Аднаго разу яна нават кінулася была спрасонку да дзвярэй, бо ёй здалося, што нехта гукае яе, моцна і настойліва. Засынаючы пасля, яна зноў чула гэты незразумелы покліч, але ўжо далёкі, невыразны.

Раніцаю Таццяна прахапілася адразу, у адно імгненне, хоць звычайна яна доўга яшчэ ляжала з заплюшчанымі вачыма, адольваючы дрымоту, змагаючыся са спакуслівым жаданнем паспаць яшчэ паўгадзінкі або хаця дзесяць мінутак, нават толькі пяць. Дзяўчаты яшчэ спалі. Стараючыся не патурбаваць іх, Таццяна рабіла ўсё ціхенька, асцярожна, але хутка. За якую хвіліну адзелася, прыбрала ложак. Дзверы ўдалося адчыніць зусім нячутна. Яна праслізнула ў калідор, адтуль ва ўмывалку, прывяла сябе збольшага ў парадак і, не паснедаўшы і нават не выпіўшы чаю, выбегла на вуліцу. І ўсё гэта яна рабіла так, нібы нехта ўвесь час падганяў, падштурхваў яе.

«Так, так, я павінна перакапацца. Павінна перакапацца сама, абавязкова. Бо інакш буду пасля ўсё жыццё пакутаваць. Пакутаваць праз тое, што ў нейкі момант блага падумала пра чалавека і пасля нічога не зрабіла, каб пера-

канацца ў адваротным. Мне трэба пайсці да яго. Я ж не мела ніякага права так думаць. Мала што мне здалося. Я пайду да яго, і ён сам мне ўсё пацвердзіць. І калі ўжо на тое, дык я папрашу ў яго прабачэння. Ён, безумоўна, зразумее мяне і даруе. «Фёдар Фёдаравіч,— скажу я яму,— даруйце мне, я ж яшчэ так кепска ведаю людзей. Зусім мала ведаю. Даруйце, калі ласка, і не крыўдуйце. Я, канечне, вінаватая, бо, думаючы гэтак пра вас, я ў нейкай меры кінула цень і на вашага вялікага земляка. Бачыце, якая я дурніца. Але гэта апошні раз, Фёдар Фёдаравіч, чэснае слова. Я яшчэ навучуся разбірацца ў людзях».

План пошукаў вызначыўся адразу. Яна пойдзе ў інстытут, бо ён сам жа гаварыў, што прыехаў на сесію. Там зусім няцяжка будзе знайсці яго. Таццяна ані не сумнявалася, што знойдзе яго хутка. Гэта ж не іголка ў стозе сена. Ды і горад не такі вялікі. Не Масква і нават не Мінск.

На вуліцы Таццяне сустракаліся толькі рэдкія прахожыя, і яна раптам зразумела, што выправілася ў свае пошукі занадта рана. Сапраўды, гадзіннік на рагу паказваў толькі пачатак на сёмую.

Можна было не спяшацца. Нават трэба было перачакаць недзе якую гадзіну, не менш. Таццяна прыгадала, што далей па вуліцы, кварталы мо праз чатыры адгэтуль, ёсць невялікі скверык. Там, бадай, і можна будзе прабавіць час.

Яна пайшла павольней. Дамы тут, у гэтым раёне, былі пераважна невялікія, аднапавярховыя, і амаль перад кожным — палісаднічак. У паветры прыемна пахла то ружамі, то вяргінямі, а то яшчэ нейкімі кветкамі, назвы якіх Таццяна не ведала. «От нават і гэтага я не ведаю, такіх простых рэчаў,— упікнула сябе Таццяна.— А гэта ўжо зусім дрэнна!»

Таццяна з цікаўнасцю стала прыглядацца да домікаў. Якія яны ўсе розныя, непадобныя адзін на другі. От хоць бы гэты. Які ён акуратненькі, чысценькі. Спрэс ашалёваны вузенькімі дошчачкамі, пафарбаванымі ў блакітны колер. А аканіцы з ліштвамі беленькія. Людзі тут, відаць, любяць паспаць, бо аканіцы яшчэ зачынены. То і няхай сабе спяць, калі ў іх няма ніякіх турбот, калі ім нікуды не трэба сёння спяшацца. Магчыма нават, што ў іх сёння выхадны дзень. Учора, у нядзелю, працавалі, а сёння адпачываюць. У Зіны і ў Ніны Іванаўны таксама сёння выхадны дзень. Толькі дзень гэты, як на тое, для іх зусім не вясёлы, асабліва для Зіны. І наўрад ці сніць яна цяпер...

А вунь другі дом. Гэты ўжо зусім не такі. Ён пазірае на вуліцу аж чатырма вокнамі, але два з іх пафарбаваны чамусьці ў зялёны колер, а два ў чырвоны. Відаць, тут жывуць гаспадары, між якімі чамусьці няма згоды, якія нават і не падазраюць, што на свеце існуе людская дружба.

Насустрач Таццяне ішоў каржакаваты шыракаплечы чалавек у чорным капелюшы і ў даўгой чорнай адзежы. Таццяна адразу неяк стулілася і яшчэ больш запаволіла крокі. Кожны раз, калі яна бачыла папа, у яе ўзнікала адно і тое ж жаданне: ёй хацелася затупаць нагамі і закрычаць: «Не смейце! Як вы смееце!» Яна была непахісна пераканана ў тым, што ніводзін адукаваны чалавек не можа сур'ёзна гаварыць аб рэлігіі, а тым больш прапаведваць рэлігійныя погляды, запэўніваць людзей, што ёсць недзе бог і незямны свет. І калі такі чалавек робіць гэта, то ён проста шарлатан, прайдзісвет.

Гэты поп — бачыла Таццяна — быў яшчэ зусім малады чалавек, і хоць ён і меў даволі вялікую рыжую бараду, але барада тая адгадавана, напэўна, нядаўна, бо твар у яго быў без аніводнай маршчынкі і вочы пазіралі зусім па-маладому. Гэта яшчэ больш абурала Таццяну.

Крокі за тры ад Таццяны поп раптам ласкава сказаў:

— Добрай раніцы, дач мая.

Таццяна настолькі разгубілася, што зусім нечакана для сябе адказала:

— Добрай раніцы, бацюшка...

Адказала яна зусім ціха, адным і вуснамі, але поп, вядома, пачуў. І ёй здалося, што ён здаволена ўсміхнуўся. Яна страшэнна раззлавалася на сябе. Ёй зрабілася раптам вельмі сорамна, быццам яе нехта злавіў на якімсьці цяжкім злачынстве. Як толькі яны размінуліся, Таццяна адразу амаль пабегла. І адно лаяла сябе, адно дакарала: «От толькі на гэта я і здатная — на ўцёкі. Толькі на гэта, і больш ні на што».

У скверыку было таксама мала людзей. На адной лаўцы сядзеў старэнькі і вельмі худзенькі дзядок, ён трымаў у руках таўшчэзную кнігу, але не чытаў яе, а, здаецца, драмаў. Крыху далей, на другой лаўцы, сядзела жанчына, таксама вельмі пажылая. Побач з ёю стаяла дзіцячая калясачка. Жанчына часта і з трывогаю пазірала на яе.

Таццяна села на наступную лаўку. Пашкадавала, што не здагадалася ўзяць з сабою якую кнігу або хаця газету. Праўда, газет сёння не было, па панядзелках яны не вы-

ходзяць. А кнігі яна ўжо ўсе здала ў бібліятэку. Каб здагадалася, можна было захапіць Шурынага «Ідыёта», яна ўсё роўна яго не чытае. Месяц ужо, як узяла ў бібліятэцы, а яшчэ і палавіны не адолела. І наогул, чаму яна такая лянівая, гэта Шура? Такая прыгожая, такая харошанькая, і от на табе — лянівая настолькі, што нават на хлопца, кажуць, лішні раз не зірне.

Відаць, асаблівай гарачыні сёння не будзе. Але ні па дождж, ні на вялікую хмарнасць таксама нішто не паказвала. Лёгкі ветрык памалу шапацеў у лістоце высокіх таполяў, і гэта настройвала на спакойны, нават крыху самотны лад. Паступова пачаў знікаць асадак ад непрыемнай сустрэчы з папом.

Людзей стала больш. Але Тацяна не звяртала ні на кога ўвагі, і яе, здаецца, ніхто асабліва не прыкмячаў. Вядома, у кожнага свая справа, свой клопат.

Яна і не заўважыла, калі і як на лаўцы насупраць апынуліся два маладыя хлопцы. Адзін з іх раптам кашлянуў, і тады Тацяна мімаволі зірнула на іх. Хлопцы былі ў аднолькавых ярка-зялёных гарнітурах і чорных туфлях, з аднолькавымі стракатымі гальштукамі, а таму і самі здаваліся нейкімі вельмі аднолькавымі, як на адзін твар. Мабыць, яны працавалі ў начной змене, а цяпер ідуць дамоў. Хаця не, нешта не падобна, каб яны дзе працавалі. У такім гарнітуры не пойдзеш на працу. Ды і рукі ў іх вунь якія чысценькія, выпешчаныя. Але недзе яны ўсё ж былі, нешта рабілі, твары вунь якія нясвежыя, і вочы саплівыя.

Яны маўчалі і адно глядзелі на яе. Глядзелі сваімі аднолькавымі асавелымі, бы шклянымі, вачамі, і невядома было, калі ім надакучыць гэты занятак. Тацяна хацела ўстаць і пайсці, але падумала, што от зноў яна будзе рабіць тое самае, што зрабіла нядаўна, зноў пусціцца на такія самыя ўцёкі,— і асталася. Пачала ўважліва разглядаць свае туфлі. Колер у іх прыемны, бэжавы. Тацяна вельмі любіла гэты колер. І яны яшчэ нішто сабе, яшчэ паносяцца. А от абцасы ладна такі пазбіваліся, трэба будзе неяк падрамантаваць. Сёння, відаць, майстэрні зачыненыя, па панядзелках у іх, здаецца, выхадны. Шкада, бо заўтра не будзе калі.

Хлопцы па-ранейшаму глядзелі на яе і маўчалі.

Нарэшце адзін з іх лянiва прамовіў:

— Антык з гваздзікамі.

— Як казалі ў дзевятнаццатым стагоддзі,— адразу падхапіў другі і шматзначна хіхікнуў.

— Точна?

— Точна!

Тады, нібы ад нейкага штуршка, якога яны толькі і чакалі, хлопцы пачалі перакідвацца словамі, як валейбольным мячом.

— Ты бачыш?

— Бачу.

— Не, ты зразумеў?

— Зразумеў.

— Заўважыў усё?

— Усё заўважыў.

— Яна ўжо — гэта самае.

— Якраз гэта самае.

— Закахалася да самых вушэй.

— Да самых.

— Точна?

— Точна.

І яны гучна, на ўвесь сквер, зарагаталі, здаволеныя сваімі словамі і адзін адным.

Зноў Таццяна хацела ўстаць, але і на гэты раз не ўстала і не пайшла. Канечне, гэтыя пустазвоны абавязкова пасунуцца за ёю. Будуць ісці ззаду, блізенька, і гаварыць свае брыдкія словы. Таццяна азірнулася наўкола. Але паблізу нікога не было. Толькі тая бабуля сядзела на сваёй лаўцы, цалкам занятая дзіцячай каляскай, ды яшчэ далей драмаў маленькі дзядок, у якога кніга ўжо вывалілася з рук долу. А раней жа былі людзі, яны хадзілі тут. А от цяпер узялі і некуды ўсе падзеліся.

— Точна? — зноў пачаў адзін.— Закахалася? Але ў каго? Можа, у цябе?

— Точна! — з ахвотаю азваўся другі.— У мяне.

— А можа, наадварот? Можа, у мяне?

— А хто кажа, што не наадварот? Якраз так яно і ёсць. У цябе. Точна!

Раптам да гэтых двух галасоў далучыўся трэці.

— Ішлі б вы лепей, даражэнькія, сваёй дарогаю. Як ішлі, так і ішлі б, праўда.

Таццяна ўзняла вочы. Перад тымі двума хлопцамі стаяла бабуля. У правай руцэ ў яе была тоўстая чорная палка з нейкай адмысловай белай булдавешкаю — раней Таццяна чамусьці не заўважыла ў бабулі гэтай палкі. Старая па-

ставіла палку перад сабою і, абапіраючыся на булдавешку, спакойна гаварыла:

— Чуеце, га? Ішлі б, кажу, лепей сваёй дарогаю.

— А мы што. Мы нічога,— сказаў нарэшце адзін з хлопцаў.

— Точна. Мы нічога,— падхапіў тады і другі. Таццяне здалося, што гэты другі ўсё ж маладзейшы і крыху бялейшы за першага.

— У мяне вунь малое спіць, а вы тут іржаць узяліся, не раўнуючы, як жарабцы. Ну, ідзіце сабе, ідзіце.

Яна пераставіла палку бліжэй да іх, сказала ўжо больш пагрозліва і больш гучна:

— Ну!..

Таццяна падумала, што от зараз гэтыя бэйбусы накінуцца на старую, пачнуць абражаць яе самымі апошнімі словамі. Можа, яшчэ нават і палку адбяруць. Тады, канечне, яна рынецца на дапамогу. Што б там ні было, а яна рынецца.

Але здарылася зусім не тое.

— То гэтак бы адразу і сказалі,— прымірэнчым голасам прамовіў першы.— Бо мы ж не ведалі.

— Точна. Мы ж не ведалі,— ахвотна згадзіўся другі і падняўся з лаўкі.

Усхапіўся і першы.

— Я і мой друг, мы абодва жадаем усяго найлепшага вашаму малому. Няхай ён расце і мацуецца.

— Точна. Мы жадаем. Няхай расце і мацуецца.

Яны пайшлі прэч — абодва на дзіва падобныя, і нават хада ў іх была таксама аднолькавая — якаясь расслабленая, віхлястая.

Бабуля паглядзела ім услед, паківала галавою і падалася да дзіцячай каляскі. Таццяна ўбачыла, што бабуля накульгвае на адну нагу, таму і вымушана мець пры сабе тую чорную палку з белай булдавешкаю. Відаць, яна наогул вельмі слабая, кволая, бо за плячыма — ага, які век. Коцячы каляску перад сабою, бабуля пашкандыбала на другі бок сквера, а там павярнула на вуліцу і знікла з вачэй.

Таццяна не ўмела выказваць сваіх пачуццяў уголас, а дакладней кажучы — саромелася рабіць гэта на людзях, і хоць адчула надзвычайную пяшчотнасць да бабулі, хоць вельмі хацелася, каб тая ўведала, што ў яе на душы, але так і не здолела скрапуцца з месца і яшчэ колькі часу

сядзела на лаўцы, звяртаючыся адно ў думках да старой са словамі самай шчырай прыязнасці і ўдзячнасці.

Да інстытута адсюль было не так далёка. Цяпер, відаць, можна ўжо было і пайсці.

Калі Тацяна апынулася ля вялікай трохпавярховай будынiны, у якой знаходзіўся педінстытут, і асабліва калі ўвайшла ў вестыбюль, яе крыху здзівіла нейкая незвычайная і непрывычная цішыня, што панавала там. Чамусьці не было чуваць ні моцнай гамонкі, ні вясёлага смеху, не было і тае мітусні і жвавасці, што гэтак характэрны для кожнай навучальнай установы. «Відаць, будучыя настаўнікі загадзя прывучаюць сябе да паважнасці і сталасці»,— падумала Тацяна. Юнакі і дзяўчаты, што трапляліся ёй на вочы, былі нейкія прыціхлыя, нават быццам нечым засмучоныя.

Раней Тацяне здавалася, што варта ёй толькі прыйсці ў інстытут, і яна адразу ж знойдзе Воранава. Можа, нават ён сустрэнецца ёй ля самага ўвахода або сам убачыць яе недзе на калідоры і сам жа падыдзе. Але вось яна пачала хадзіць з аднаго калідора ў другі, адольваць адну лесвіцу за другой, а Воранава нідзе і пачуту не было. Так хадзіла яна мо цэлую гадзіну, і ўсё дарэмна. Тады яна зразумела, што гэтак у яе нічога не выйдзе. Трэба пашукаць якое начальства і запытаць.

У прыёмнай рэктара маладжавая, але ўжо залішне паўнаватая жанчына ў пенснэ абыякавым голасам заявіла Тацяне, што нічым карыснай быць не можа. Яна так і сказала: нічым, маўляў, карыснай быць не магу. І яшчэ яна сказала — цяпер ужо з непрытоеным здзекам у голасе,— што Тацяна не першая і не апошняя шукае розных Воранавых. Такая ўжо, маўляў, жаночая доля — шукаць Воранавых або, напрыклад, Сарокіных ці Зязюліных. Але калі Тацяна, прыгнечаная гэтымі словамі і тонам, якім яны былі сказаны, выходзіла ўжо з дзвярэй, жанчына ўсё ж злітавалася і кінула ёй наўздагон:

— Схадзіце хіба што ў аддзел кадраў.

Сапраўды, як гэта яна не здагадалася адразу! Канечне, ёй трэба было з самага пачатку пайсці ў аддзел кадраў, а не блукаць столькі часу па калідорах і лесвіцах.

Аднак, як на тое, у аддзеле кадраў нікога яна не застала. Вядома, яна прыйшла позна, трэба было раней гэта зрабіць. У аддзеле чакалі начальніка яшчэ тры чалавекі, з выгляду студэнты. Адзін з іх, самы высокі, сказаў, што

пачальнік нікога не прымушае чакаць больш як восем гадзін, і таму ёсць сэнс пачакаць. Студэнт нават прапанаваў ёй сесці — ён паказаў на два раскошныя мяккія крэслы, якія стаялі перад сталом пачальніка. Тацяна падзякавала, але сесці не адважылася — крэслы палохалі яе сваёй манументальнасцю і ўрачыстасцю. Яна асталася стаяць каля дзвярэй.

Студэнты вялі далей нейкую сваю гаворку, на Тацяну яны больш не звярталі ўвагі, і яна, адчуўшы сябе крыху вальней, пачала разглядаць пакой. Тут быў яшчэ адзін стол, меншы за першы і не такі ўрачысты. Побач з ім стаяла зашклёная шафа, напакаваная рознакаляровымі папкамі, і тоўстымі і тонкімі. Сцены чамусьці былі зусім голыя, на іх не было ні партрэтаў, ні хоць бы якіх карцін. Толькі з левага боку ад дзвярэй вісела ці то дыяграма, ці то нейкая схема. Тацяна паспрабавала разабрацца, што на ёй намалявана, але так і не здолела.

Міжвольна Тацяна пачала прыслухоўвацца да таго, аб чым гаварылі за яе спінаю студэнты.

— Ёсць два спосабы. Адзін — катапульціраванне з наступным прызямленнем на парашуце. Другі — непасрэднае прызямленне разам з караблём. Першы, вядома, найбольш бяспечны.

Здаецца, гэта сказаў той, самы высокі.

— Канечне, яго трэба прызямліць першым спосабам.

А гэта, напэўна, голас таго, што сядзіць на падаконніку. У яго яшчэ такі сіні берэт на галаве. А от цяпер чуцён голас ужо трэцяга:

— А па-мойму, другім. Бо першым прызямліўся ўжо Гагарын.

Ён, гэты трэці, чамусьці аніяк не запомніўся Тацяне. Ні ў што ён апрануты, ні які з твару, ні нават якога росту — анічога не зафіксавалася ў вачах.

— Для навукі найбольшую каштоўнасць будзе мець...

«Няўжо ён яшчэ лётае?» — раптам сумелася Тацяна. Яна чамусьці была ўпэўнена, што палёт ужо скончыўся, што Цітоў недзе ўжо сеў, на нейкім тым касмадроме. З якога ўзляцеў, на той і сеў. Бо там, канечне, усё прыстасавана і для ўзлёту і для пасадкі.

А ён, аказваецца, усё яшчэ лётае. Колькі ж ён будзе ў тым космасе? Нешта ўжо і страшна робіцца.

— Трэба, канечне, адпрацаваць як след спачатку адзін спосаб. А тады брацца за другі.

— Але ж для павукі...

Яны гаварылі такім тонам, нібыта іменна ад іх залежала, які спосаб пасадкі будзе выбран для Касманаўта-два. Таццяна міжвольна ўсміхнулася.

Хлопцы пачалі перапытваць адзін аднаго, спрачацца. Асабліва гарачыўся той, трэці. Цікава, які ён? Прыгожы ці не? Мужны ў яго твар або, наадварот, ціхманы?..

Справа ад дыяграмы на сцяне вісеў адзін лісток паперы, якога Таццяна спачатку не заўважыла. Высветлілася, што гэта загад па аддзелу кадраў за нумарам дваццаць сем. Таццяна вырашыла, што загад, які вывешваецца на сцяну, не можа быць дзяржаўнай тайнай, і ўзялася чытаць яго.

«У выпадку выкліку неабходнасці адсутнасці некаторымі супрацоўнікамі аддзела кадраў па асабістых справах могуць быць дазволены толькі праз начальніка аддзела кадраў»,— прачытала Таццяна і ледзь не зарагатала. Прачытаўшы загад яшчэ раз, падумала, што наўрад ці дабярэ яна ў гэтага начальніка якога толку. Можа, пайсці адсюль?.. Не, трэба ўсё ж пачакаць.

Тым часам гаворка за Таццянінай спінай перайшла ўжо на другое.

— Хлопцы, ведаеце, што я часта бачу ў сне?

— Прынцэсу Турандот. Яна прапануе табе руку і сэрца, а таксама палавіну нечага каралеўства за пяцёрку па псіхалогіі.

— А можа, ты бачыш, што камісія пасылае цябе на работу ў Мінск? Тады ты дарэмна стараешся глядзець гэты сон.

— Не, сур'ёзна. Чамусьці я бачу толькі адзін сон. Кожны раз той самы. Быццам у ясны сонечны дзень я іду па людной вуліцы... басанож. Навокал — прыстойна апранутыя людзі, у шыкоўных туфлях, а я, такі бамбіза,— босы. І мне дужа сорамна. І ніяк мне нельга схаваць свае ногі. Усе толькі тое і робяць, што пазіраюць на іх, я гатовы праз зямлю праваліцца. А трэба нільна кудысьці ісці, і я іду, увесь час стараючыся спусціць калашыны штаноў як ніжэй, але босыя ногі ўсё адно відны, і прахожыя толькі на іх дзівяцца. Што тут да чаго, а?..

«Дзіўна,— падумала Таццяна,— я таксама разы са два бачыла амаль гэткі самы сон. Што іду па чысцюткім горадзе сярод чысцюткіх людзей і сароменося сваіх босых і не дужа чыстых ног. Чэсная слова, бачыла».

— Ат, глупства. Лепш паслухайце адну цытату з аднаго пісьма. Дакладней кажучы, з аднае скаргі. У праўдзівасці яе не сумнявайцеся, я бачыў яе на свае вочы. Мой брат працуе ў выканкоме, ён мне і паказваў. Дык вось, слухайце.

Гэта ўжо гаворыць той, што на падаконніку. Што ў берэце.

— «Высветлена, што мая жонка ў маёй асобе мела трэцяга мужа, і яна з'яўляецца распуснай жанчынай, якая сваім целам здолела пераканаць вышэйстаячага пракурора ў адданні мяне пад народны суд другога ўчастка».

Яны ўсе зарагаталі. Не стрымаўшыся, засмяялася і Таццяна. І тады павярнулася да іх.

Перш за ўсё яна зірнула на таго, трэцяга... І аж скалапулася ўся.

Яго твар быў страшны. Ён быў проста жахлівы. Гэта быў не твар, а нейкая знявечаная маска. Таццяна ўспомніла, што тады, калі яна ўвайшла ў пакой, ён стаяў тварам да акна, таму яна не заўважыла, які ён. А цяпер ён пазіраў на яе. А можа, і не на яе, бо зразумець, куды ён глядзіць, было немагчыма. На адным воку ў яго была чорная павязка, а другое, вялікае і чырвонае, без веек і без брыва, пазірала невядома куды. Твар быў увесь пабіты на плямы, сінія і чырвоныя. «Вайна!..— балюча ўдарыла ў сэрца думка.— Вось што нарабіла вайна!..»

У пакой імклівай хадою ўвайшоў невысокі таўставаты мужчына з гладка паголенай галавою. Ад яго патыхала нейкім рэзкім адэкалонам. Ён па-гаспадарску зайшоў за вялікі стол, усеўся ў крэсла, паклаў рукі на стол і сам зрабіўся нейкі манументальны і ўрачысты.

— Давайце, хто першы? — ні на кога не пазіраючы, сказаў начальнік аддзела кадраў.— Толькі хуценька, раз-два.

— Першая вось яна,— сказаў высокі белабрысы хлопец.

— Але ж...— пачала была Таццяна, але начальнік перапыніў яе.

— Давайце, раз-два.

Таццяна сказала, па якой патрэбе яна завітала ў інстытут. Ёй неабходна, сказала яна, знайсці аднаго студэнта, вельмі неабходна. Яна разлічвае, што таварыш начальнік ёй паможа.

— Як, вы сказалі, яго прозвішча?

— Воранаў, Фёдар Фёдаравіч. Ён прыехаў на сесію.

— Ясна. А вы, значыцца, хто яму будзеце?

Раптам грукнулі дзверы. Таццяна машынальна азірнулася і вельмі здзівілася, не ўбачыўшы ў пакоі тых трох хлопцаў.

— Ніхто. Але ён мне вельмі патрэбен.

— Вы сядайце, сядайце. І раскажыце ўсё парадкам.

— Што расказаць?..

— Ну, гэтае самае... што там паміж вамі было. Давайце, раз-два.

— Вы, мабыць, мяне не зразумелі. Мне трэба пагаварыць з таварышам Воранавым. Па адной асабістай справе.

— Я так і зразумеў — па асабістай. Але па якой іменна?

— Гэта не мае значэння.— Таццяна так і не села. Пераступаючы з нагі на нагу, яна старалася не глядзець на твар начальніка аддзела кадраў, вочы якога так і свідравалі яе.

— Чаму ж, мае. Як гэта не мае? Абавязкова мае. Вядома, гэта астанецца між намі.

Таццяна адчула, як уся залілася чырванню. Яна паглядзела цяпер проста ў вочы начальніку. Вочы былі маленькія, яны гарэлі прагнай, нясцерпнай цікаўнасцю.

— Ну, раз-два. Давайце, давайце. А то ў мяне яшчэ гэтае недарэчнае пахаванне. Чым толькі не прыходзіцца займацца.

Таццяна павярнулася і рушыла да выхада. Але каля самых дзвярэй на момант запынілася. Карцела сказаць нешта гэтаму манументальнаму чалавеку за ўрачыстым сталом. Абавязкова трэба было нешта сказаць. Трэба было.

— Пачакайце, гэтак жа нельга — раз-два.— Ён выхапіў з кубка на чарнільным прыборы тоўсты чырвоны аловак і нацэліўся ім у настольны каляндар.— Як, вы сказалі, яго прозвішча? Сарокін?

Словы — самыя патрэбныя — так і не знайшліся. Тыя, што былі б самымі пэўнымі, самымі дакладнымі. Таццяна штурхнула абедзвюма рукамі дзверы і вылецела на калідор. Дзверы спярша абурана рыпнулі, потым гнеўна груknулі.

На калідоры непадалёк ад кабінета стаялі тыя самыя хлопцы. Толькі іх было чамусьці двое. Трэці, самы высокі, некуды знік. Мо пайшоў расказваць яшчэ каму пра тое,

як ён ходзіць у сне басанож? Знайшоў, бачыце, надзвычай цікавую і важную тэму для гаворкі!..

Таццяна хацела скарэнька праскочыць паўз хлопцаў, але той, трэці, з тварам-маскай, нечакана заступіў ёй дарогу.

— Дармо,— проста сказаў ён.— Вы пачакайце, калі ласка, трошкі. Што-небудзь зробім. А вы пачакайце пакуль, ну хоць бы ў вестыбюлі. І, калі ласка, не расстройвайцеся. Добра?

У яго быў вельмі лагодны і вельмі непасрэдны голас. І здавалася, што яна чула яго і раней шмат у якіх выпадках, шмат пры якіх абставінах.

— Добра,— гэтак жа проста адразу сказала Таццяна.— Я пачакаю, добра.

Адзін з іх пайшоў направа, другі налева. А Таццяна скіравалася па лесвіцы ўніз.

У вестыбюлі Таццяна адчула раптам страшэнную стому. Было такое адчуванне, бы яна некалькі гадзін узапар, не разгінаючыся, мыла бялізну. Балела нешта ў паясніцы, торгалася нейкая жылка на левай скроні, а ў галаве стаяў непрыемны тлум.

Крыху лягчэй стала, калі Таццяна села на лаву. Лава мела высокую спінку, і гэта было вельмі дарэчы. Таццяна прымасцілася з самага краю, бліжэй да ўваходных дзвярэй.

Зрэшты, калі тыя хлопцы толькі паабяцалі памагчы, а самі нічога не зробяць, або калі высветліцца, што Воранава ў інстытуце цяпер няма, яна ўсё роўна астанецца тут. Калі на тое пайшло, дык яна гатова праседзець тут нават цэлы дзень. Месца для назірання проста цудоўнае. Павінен жа Воранаў калі-небудзь прайсці праз гэтыя дзверы. Яна дачакаецца яго. У яе хопіць цярплівасці. Не могуць жа прагнаць яе адсюль. Ды і каму якая да яе справа? От ідуць сабе людзі, адны з вуліцы, а другія на вуліцу, і ніхто не звяртае на яе аніякай увагі. Правільна, і не звяртайце, і не трэба.

Сапраўды, цяпер палягчэла. Тлуму ў галаве ўжо няма. І жылка на скроні болей не торгаецца.

Шкада, канечне, што не знайшліся там, у кабінеце, патрэбныя словы. Вельмі шкада. І не толькі шкада, але нават і крыўдна. І заўсёды ў яе чамусьці так выходзіць. Не ўмее яна пастаяць за сябе. Не можа належным чынам адказаць на абразу, губляецца, калі выпадае сутыкнуцца з несправядлівасцю або, напрыклад, бессардэчнасцю, не ад-

разу знаходзіць у сабе сілы зрабіць у адказны момант рашучы крок. Шура Зварыкіна кажа, што яна залішне «мяккая».

Такая ўжо яна няўмека!

Ёй раптам падумалася, што той чалавек у кабінеце, напэўна, пасылае віншаванні сваім знаёмым са святам або з днём нараджэння не іначай як даплатнымі паштоўкамі. Але, але, іменна даплатнымі.

Між іншым, пра якое пахаванне ён казаў?

Але, ён казаў. То дзе ж гэта хто памёр?.. Добры то быў чалавек або, наадварот, благі? Ці многа зрабіў за сваё жыццё карыснага, якую славу аб сабе пакінуў?

Высокі бялявы хлопец з'явіўся перад ёю зусім нечакана.

— Па-першае, мы прызямліліся! — урачыста паведаміў ён, размахваючы нейкай паперкай.— У зададзеным раёне.

Таццяна ўсхапілася.

— Якім спосабам? — хвалюючыся, запытала яна.

— Пакуль што пра гэта нічога невядома,— усміхнуўся хлопец.

Таццяна таксама ўсміхнулася.

— Можа, якраз будзе так, як вы гаварылі.

— Наўрад. Будзе, напэўна, ізноў так, як сказаў Вася Шавель.

Таццяна зразумела, што Вася Шавель — гэта той, трэці.

— Кажуць, гэта недзе каля Саратава.

— Пэўна, што там.

— Паблізу ад таго месца, дзе прызямліўся Гагарын.

— Здорава!

— Уяўляю, што цяпер там робіцца!

— Але, але!

Які ён, аднак, высокі. Каб зазірнуць у вочы, трэба вунь як задзерці галаву. І вельмі дужы, напэўна. І смелы. Наогул, ён не абы-які хлопец. А вочы ў яго светлыя. Быццам нават празрыстыя. Першы раз яна бачыць такія вочы.

— А па-другое... тут справа ўжо больш складаная. Воранава ў інстытуце цяпер няма.

— Няма?..

— Мы ўсё чыста абшукалі. Але вось яго адрас.

— Яго адрас?

— Ну, але. Ён чамусьці жыве не ў інтэрнаце, а на прыватнай кватэры. Вось, тут запісана. Першамайская, трыццаць сем.

Ён працягнуў Таццяне лісточак паперы.

— Трыццаць сем? А кватэра?

Яна чамусьці зусім не здзівілася, што ён прынёс ёй адрас Воранава. Быццам так яно і павінна было стацца, быццам Таццяна якраз гэтага толькі і чакала.

— Там няма кватэр. Там проста дом. І Воранаў там наймае пакой. Кажуць, вельмі ўтульны такі пакойчык. Нешта метраў з дзесяць, кажуць, калі не болей.

— Дзесяць? Гэта ж цэлае багацце! Ажно дзесяць метраў!

Гаварыць з ім было неяк вельмі лёгка. Нібы яны былі даўно-даўно знаёмыя. І нібы ён ужо цэлую вечнасць стаіць вось тут, побач, і нікуды ніколі не адыходзіў. І не адыдзе ўжо нікуды. І яна нават можа расказаць яму, што таксама бачыць у сне, як ходзіць гэтак жа басанож. Чэснае слова, можа.

— Ну, я пайшоў, прабачце. Трэба яшчэ дазмагацца з таварышам Трухіным. Я яму наб'ю морду, калі што якое.

— А што, вазьміце і набіце,— засмяялася Таццяна.

— Сёння могуць і не прыцягнуць за дробнае хуліганства.

— Хто ж гэта сёння будзе прыцягваць! Сёння наогул варта было б даць амністыю.

— Гэта што ж — усіх павыпускаць з турмаў?

— Ну, можа, і не ўсіх. Бюракратаў, канечне, не трэба выпускаць.

— А іх там, на жаль, якраз і няма. Артыкула, кажуць, на іх у крымінальным кодэксе не прадугледжана.

Ён дзелавіта падаўся да лесвіцы, а Таццяна пайшла на вуліцу. У дзвярах, спахапіўшыся, крыкнула:

— Дзякую вам!

Ды ён, відаць, ужо не чуў. Ён знік за паваротам на другі марш лесвіцы.

На Першамайскую трэба было дабірацца шостым нумарам аўтобуса. Таццяна, пагойдваючы ў руцэ сумачку, рушыла да прыпынку. Ад тлуму ў галаве і звання не засталося, а пра тое, што яшчэ паўгадзіны назад яе агортвала нейкая незразумелая і дзіўная стома, Таццяна нават і не ўспомніла.

Канечне, усё гэта зрабіў той, трэці. І ўдзячнай трэба быць перш за ўсё яму.

Чамусьці заўсёды і ўсюды знойдзецца свой завадатар, нехта такі, хто становіцца над астатнімі. У іхнім інтэрнаце

камандуе ўсімі абыякавая да ўсяго на свеце Шура Зварыкіна. Тут, у гэтых хлопцаў, узяў на сябе права быць старэйшым чалавек са зняважаным тварам, але са шчодрай душою. Каму па якога завадатара пашанцуе.

Цяпер стала ўжо гарачэй, чым было раніцай, але не вельмі душна, не. Сонца быццам шкадуе людзей і старасцца не надта назаляць. Малайчына, сонца!

Навошта, аднак, ён такі высокі, гэты белабрысы?..

Канечне, мужчына не павінен быць малога росту. Мужчынам больш пасуе, калі яны высокія. І наогул кажуць, што недамеркавыя мужчыны злосныя. Але ён ужо занадта перабраў сабе росту. Ён проста перастараўся расці. Аж шыя пачынае балець, калі доўга глядзіш яму ў вочы...

Аўтобус быў з тых, што ездзяць без кандуктара. Таццяна не любіла гэтых аўтобусаў і ніколі не карысталася імі. Яна проста баялася іх. Ёй здавалася, што там людзі толькі тое і робяць, што прыглядаюцца адзін да аднаго — а ці ўкінуў сусед грошы за білет, а ці не едзе ён зайцам. Лепш ужо заплаціць грошы кандуктару і ехаць сабе спакойна. Бо няма горшага занятку на свеце, чым старацца ўсім сваім выглядам даводзіць кожнаму, што ты не заяц, а сумленны чалавек.

Таццяна доўга корпалася ў сумачцы, шукаючы патрэбную дробязь, але ўсё ніяк не выпадала падабраць роўна чатыры капейкі. Былі ў сумачцы два пятакі, была адна манета на тры капейкі, адна на дзве, астатняе — больш буйныя. Таццяна хацела ўжо кінуць у шчыліну касавай скрыні пятак, але нечакана нейкі вусаты дзядзька ў саламяным капелюшы прапанаваў ёй разьмяніць грошы. Ён сам узяў у яе з рук счарнелы пятак, а даў ёй навенькія бліскучыя манеткі па адной капейцы.

Адарваўшы білет, Таццяна крадком агледзелася. Людзей у аўтобус набралася багата, але асаблівага давяжу не было. Стаяў лёгкі гоман, пазвоньвалі манеты аб днішча скрыні, недзе наперадзе раз-пораз успыхваў звонкі дзявочы смех. Аказваецца, дзядзька ў саламяным капелюшы быў не адзіны, хто ўзяўся разьмяніць чужыя грошы. Вунь хлопчык з піянерскім гальштукам старанна адлічвае дробязь старой бабульцы. Бабулька пры кожнай манеце ківае галавой, а хлопчык чырванее, бы з натугі. Лічыць яму прыйдзецца доўга, бо яна трымае ў руцэ аж цэлы рубель. А там вунь яшчэ нехта таксама вядзе грашовыя аперацыі.

Каля акна сядзіць дзяўчына з капою пышных каштанавых валасоў. Твар яе не відзён Тацяне, бо дзяўчына сядзіць да яе спінаю. На каленях у яе ляжыць разгорнутая кніга. Але дзяўчына не чытае яе. Дакладней, яна прачытала была нейкую мясціну, а цяпер апусціла кнігу і задумалася. Цяпер яна, напэўна, недзе вельмі далёка, разам з невядомымі героямі невядомай кнігі...

— Падзел афрыканскіх краін на касабланкскую і манравійскую групы абсалютна штучны і беспадстаўны,— гудзе над Тацяніным вухам прастуджаны бас.— Адкуль вы ўзялі, што касабланкская група больш радыкальная і ваяўнічая, а манравійская больш памяркоўная і разумная?

Бас змаўкае, яму адказвае жаночае кантральта. Але адказвае няўпэўнена, нясмела.

Цікава, гэта ва ўсіх аўтобусах пасажыры гэткія, ці толькі ў тых, дзе няма кандуктараў?.. Раней Тацяна чамусьці наогул не заўважала, якія яны — аўтобусныя пасажыры. А хутчэй за ўсё проста не звяртала ўвагі на часовых сваіх спадарожнікаў. Думала пра нешта сваё або чытала. А якія яны, людзі наўкола,— пра гэта нешта і ў галаве не было. Аказваецца, гэта надзвычай уведліва — назіраць за пасажырамі. І вельмі шкада, што ўжо трэба выходзіць: шафёр абвясціў праз дынамік, што наступны прыпынак — Першамайская вуліца.

У гэтым раёне горада Тацяна была толькі аднойчы, ды і то выпадкова і нядоўга, таму нічога тут не ведала. Першамайская вуліца выглядала нейкім зусім чужым, незнаёмым светам. Быццам гэта была не частка таго самага горада, да якога Тацяна паспела прызвычаіцца ўжо і нават палюбіць, а штосьці зусім іншае, такое, што не мае ніякага дачынення да ўсяго астатняга і жыве сваім асобным жыццём.

Спачатку Тацяна не зразумела, адкуль у яе ўзялося такое адчуванне. Потым, добра агледзеўшыся, здагадалася.

Прычынаю былі агарожы.

Высокія і дыхтоўныя, без аніводнай шчылінкі, з калючым дротам наверсе, яны нагадвалі старажытныя крапасныя сцены, пабудаваныя для таго, каб вытрымліваць працяглую асаду ворагаў. Яны былі розныя, гэтыя агарожы — то з дошак, то з густой металічнай сеткі, спрэс абвітай плюшчом, а то і мураваныя,— але ўсе такія аднолькава самавітыя, шчыльныя і, напэўна, вельмі трывалыя.

Тацяне зрабілася неяк надта няўтульна па гэтай дзіўнай вуліцы. Няўтульна і маркотна. Здавалася, што тут нават цямней, чым на астатніх вулках горада, што сюды і сонца пасылае менш сваіх прамяняў. Чамусьці і прахожых тут амаль не было, і машыны сюды не заходзілі, і нават дзеці не гулялі ў класы і не ганялі футбольнага мяча.

А можа, тут наогул не было дзяцей?.. Ад такой думкі Тацяна аж скалапулася.

Аднак, хто гэта даўмеўся даць вуліцы гэткую назву? Тут жа жывуць, напэўна, адны Пульхерыі Іванаўны і Афанасіі Іванавічы. Што ім да таго Першамая, што ім і да самой тае вясны,— яны, мабыць, і не заўважаюць яе. Жывуць людзі быццам бы і па-суседску, а на самай справе вельмі далёка адзін ад другога. І ні ў госці, напэўна, ні да кога не ходзяць, ні самі гасцей не запрашаюць. Старасветчына нейкая, дый годзе.

Дом пад нумарам трыццаць сем таксама хаваўся за высачэзным плотам, бадай, самым высокім на ўсёй вуліцы. Але брама была адчынена — здаецца, адсюль нядаўна выехала аўтамашына, бо на зямлі відзён быў след ад шын. «Быццам якая трыумфальная арка»,— падумала Тацяна, акідваючы позіркам масіўную, нейкай адмысловай формы, браму.

Недзе ў глыбіні двара забрахаў сабака. На гэты брэх з дзвярэй зашклёнай веранды высунуўся рабаціністы тварык дзяўчынкі гадкоў па шэсць.

— Ён прывязаны,— сказала дзяўчынка.— Не бойцеся. Шарык, сціхні. Ну, сціхні!

Шарык не паслухаўся дзяўчынкі і забрахаў яшчэ мацней.

Тацяна нясмела ступіла на бетанаваную дарожку, якая вузенькай стужкай цягнулася праз увесь даволі прасторны, у зеляніне, двор да веранды.

— Ох і задасць мне Любка! — нібы спахапіўшыся, сказала дзяўчынка і кінулася зачыняць браму. Ёй, такой маленькай і кволай, гэтая работа была, відаць, не пад сілу. Тацяна стала памагаць дзяўчынцы.

— Не трэба, а то Любка...

Дзяўчынка не дагаварыла і спалохана азірнулася. Тацяна ўсё ж памагла дзяўчынцы. Але і ўдзвюх яны ледзьве справіліся з брамай.

— Вы да Любкі? — спытала дзяўчынка.— А мяне завуць Танька.

— Бач ты! — здзівілася Таццяна.— Я ж таксама Танька.

— Ну, вы не Танька. Вы, канечне, Таня. Або, мабыць, Таццяна.

— Праўда, я Таццяна. Нават Таццяна Ларына. Шкада, што ты не ведаеш, хто такая была Таццяна Ларына. Я яе цень, той Таццяны.

Дзяўчынка глянула на Таццяну, падумала.

— Не выдумляйце, цень бывае толькі на зямлі.

— От і я на зямлі. А тая Таццяна была ў марах паэта. Але ты мне скажы вось што...

Сабака раптам перастаў брахаць, яму, напэўна, надакучыў гэты бессэнсоўны ў падобных абставінах занятак. На двары, на верандзе і ў самім доме панавала цяпер цішыня, і была яна нейкая настолькі адчувальная, што яе, здаецца, можна памацаць рукамі.

— А Любка, напэўна, спіць,— сказала дзяўчынка, перапыняючы незразумелую для яе гаворку.— Мама кажа, што яна ўсіх жаніхоў праспала ўжо.

— Не, ты вось што скажы мне, Таня. Гэта ў вас тут кватаруе таварыш Ворапаў?

— Гэта вы пра Федзьку пытаецеся?

— Ну... пра Фёдара Фёдаравіча.

— А-а, ведаю, вы яго жонка!

— Не,— сказала Таццяна і адчула, што чырванее.— Але ён мне вельмі патрэбен.

— Тады добра. А то ў нас вясною кватараваў Антоша, ён гаварыў Любцы, што не жанаты, а Любка паверыла яму, а потым прыехала на таксі яго жонка, і такі ў нас вэрхал быў, каб вы толькі чулі! У мамы адразу забалела пячонка і яшчэ апендыцыт. І яна ўсім гаварыла, што памрэ. Можа, і памерла б, але ёй яшчэ трэба выгадаваць мяне і аддаць замуж. Гадоў яшчэ з дзесяць, кажа, трэба будзе пажыць. А тата гаварыў, што так Любцы і трэба, бо яна зусім не ўмее разбірацца ў людзях. А вы ўмееце разбірацца ў людзях?

— Не, не ўмею,— сказала Таццяна.

— І я таксама не ўмею. А тата кажа, што кожны чалавек павінен умець разбірацца.

— Павінен,— згадзілася Таццяна.— Але гэта ведаеш як цяжка!

— Ведаю,— уздыхнула Таня.

Яны неўзаметку апынуліся ля веранды. Таня першая

ўзбегла па ганачак, за ёю ўслед асцярожна ўзышла і Таццяна.

— Вунека дзе ён у нас жыве,— сказала Таня, паказваючы рукою ў далёкі кут веранды. Там стаяла канапа з высокаю спінкаю, пры ёй быў невялічкі круглы столік, а за столікам узвышалася вельмі недарэчная тут, на верандзе, амаль пустая этажэрка.— Федзька кажа, што гэта ягоныя партаменты.

Вось табе і дзесяць метраў. Вось табе і ўтульны пакойчык. Тацяне зрабілася вельмі шкада Воранава. Чым мець такія «партаменты», лепей ужо было б уладкавацца ў інтэрнаце. Уначы тут, відаць, бывае не надта цёпла.

— Толькі яго цяпер няма.

— Няма? — зжахнулася Тацяна.

— Ага, няма.

— Няма...— знясіленым голасам паўтарыла Тацяна.— От жа не шанцуе мне сёння.

— Гэта бывае,— заўважыла Таня.— Мне таксама часта-часта не шанцуе.

— А можа, ты ведаеш, дзе ён?

— Пайшоў некуды,— пацiснула плечукамі Таня.— Яшчэ раненька пайшоў. Ён ніколі не расказвае, куды ідзе. Паторгае мяне во так за нос і пойдзе. А я страшэнна не люблю, калі торгаюць за нос. Гэта яго Любка навучыла.

— Што ж мне цяпер рабіць?..— уголас падумала Тацяна.

— Не ведаю,— спагадліва сказала Таня.— Можа, пасядзіце ў нас? Во на гэтай канапе якраз і можна. А я пакуль што ногі намыю, бо Любка зноў адлупцуе мяне. «Жанчына павінна шанаваць свае ногі»,— перадражніла некага Таня.— Сама па сто разоў на дзень мые і мяне прымушае. Адно гора мне з гэтай Любкай.

Толькі цяпер Тацяна звярнула ўвагу на тое, што ў другім канцы веранды на падлозе стаіць эмаліраваная міска з вадою, а каля яе — маленькі табурэцік.

— Давай я табе намыю,— нечакана для сябе прапанавала Тацяна.— Праўда, давай.

— Вой, я дужа баюся козыту. Я лепш сама.— Таня скінула сандалікі і з неахвотаю патупала да міскі.

— Я асцярожненька,— запэўніла Тацяна.

Вада ў місцы была халодная, але Таня мужна апусціла ў яе ногі. Тацяна намыліла вяхотку.

— А хто яна — Любка?

— Ат, сястра. Мама кажа, што яна ў нас па выданні і яе нельга злаваць. А хто яе злуе? Яна сама ўсіх чыста злуе. Вунека спіць, мусіць, а то зноў чаплялася б да мяне. А вы і праўда не казычаце. Ну от — ані столечкі.

Тацяна бачыла, што Тані ўсё ж козытна, але яна не хоча прызнацца і мацуецца.

Калі Тацяна выцерла Таніны ногі і зноў надзела ёй сандалікі, дзяўчынка раптам абхапіла ручкамі Тацяну за шыю і моцна пацалавала яе проста ў губы. «Не надта багата, відаць, выпадае на тваю долю пяшчоты, мілая ты мая дзяўчынка»,— падумала Тацяна.

— Любка называе мяне метыскай,— даверліва паскардзілася Таня.

— Чаму метыскай? — не зразумела Тацяна.

— Бо ў мяне мама беларуска, а тата яўрэй.

— То яна ж і сама, калі на тое, метыска.

— Не, у яе тата быў другі. Ён быў на вайне. А мама не дачакалася яго і выскачыла за майго тату. А ён як даведаўся пра гэта, дык пайшоў проста пад кулі. І яго тамака забілі. А Любка ненавідзіць мяне.

Тацяна не знайшлася, што сказаць дзяўчынцы. Яна адно мацней прытуліла яе да сябе і пагладзіла па галоўцы. Яны памаўчалі.

— Вой, што я ўспомніла! — раптам усклікнула Таня.— Ён жа гаварыў, што, калі прыйдзе Раман, трэба паказаць яму вунь той лісток, і тады Раман усё будзе ведаць. То я пакажу лісток і вам, можа, і вы будзеце ведаць.

Таня збегала да століка і прынесла адтуль лісток паперы. Гэта была запіска. Тацяна не стрымалася і прачытала яе.

«Рамане! Не чакай мяне. Я вымушаны буду затрымацца. Разумееш, зусім забыўся, што мне абавязкова трэба схадзіць да брата на будоўлю, ёсць там адно дзельца. Буду чакаць цябе заўтра ў інстытуце ў 3 гадзіны. Не сярдуй! Фёдар».

— А дзе яго брат працуе, ты не ведаеш? — спытала Тацяна.

— Брат?..— Таня паціснула плечукамі.

Не паспела Тацяна аддаць запіску дзяўчынцы, як з дому пачуўся рэзкі жаночы голас.

— Танька, ты з кім там гамоніш?

— З цётачкай Тацяначкай,— спалохана азвалася Таня.

— То я пайду,— заспяшалася Тацяна.— Бывай, Танечка. Дзякуй табе.

Яна пацалавала дзяўчынку і скоранька падалася з веранды.

Калі Тацяна праходзіла паўз вокны дома, яна раптам адчула на сабе нечы позірк. Павярнуўшы галаву, яна аж спынілася на момант. Адно акно было расчынена, і ў ім стаяла дзяўчына. Тацяна ніколі яшчэ не бачыла нічога такога. Гэта была сама Прыгажосць. Прыгажосць незвычайная, ашаламляльная, якаясь фантастычная, проста неверагодная!

Трэба было ісці, а ногі не слухаліся, не краталіся з месца.

Дзяўчына ў акне стаяла як нейкая дзівосная статуя, яна зусім не варушылася, і нават вочы ў яе былі нерухомыя, нібы застылыя. Здавалася — от нехта прывёў яе сюды, шапнуў на вуха нейкае таемнае слова, і яна замерла і будзе цяпер вечна стаяць у адной і той жа паставе, чакаючы, каб ізноў сказалі ёй тое слова. Невядома было, бачыць яна Тацяну ці не. Напэўна, не бачыць. Напэўна, Тацяна для яе штосьці зусім не вартае ўвагі, на што можна глядзець і ані не заўважаць. Бо калі Тацяна нарэшце пайшла, на дзяўчыніным твары па-ранейшаму нічога не адбілася і вочы яе таксама не крануліся.

За брамаю Тацяна зноў прыпынілася. Хацелася вярнуцца назад і яшчэ раз зірнуць на тое акно, яшчэ раз пабачыць незвычайнае тое відовішча. Але яна не адважылася.

А за плотам зноў была цішыня, адтуль не даносілася ні гуку, і нават сабака не гаўкнуў ні разу.

На прыпынку, пакуль яна чакала аўтобуса, Тацяне раптам прыгадаліся радкі з пушкінскага верша. Гэты верш даўно стаў рамансам, Тацяна чула яго неаднойчы і нават сама калі-нікалі машынальна напявала, але толькі цяпер дайшоў да яе ўвесь яго сэнс; у Тацяны з'явілася такое адчуванне, нібы яна пабачыла якраз тое самае, што бачыў некалі і сам паэт, іменна тое самае. Толькі пра гэта і можна было сказаць так:

> Передо мной явилась ты,
> Как мимолетное виденье,
> Как гений чистой красоты.

Гэты геній прыгажосці, аказваецца, тут, на Першамайскай вуліцы, у доме пад нумарам трыццаць сем.

Перад Тацянай зноў і зноў паўставала аблічча дзяўчыны ў акне, і яна проста не магла ўжо не думаць пра яе. Калі б у яе спыталі, Тацяна, напэўна, не змагла б падрабязна апісаць дзяўчынін твар, узнавіць яго рысы, бо яна нічога канкрэтна і не запомніла, проста ведала адно — яе штосьці ашаломіла і аглушыла, як ашаламлівае і аглушае пошуг бліскавіцы. Гэтае штосьці было ўсеўладнае, неадчэпнае.

«Пачакай, ды гэта ж Любка! — нечакана працяла Тацяну раптоўная здагадка.— Гэта Таніна сястра, Любка!..»

Дзіўна, але гэтая думка чамусьці дасюль зусім не прыходзіла ў галаву. Тацяна думала пра дзяўчыну, як пра штосьці абстрактнае, што існуе неяк само па сабе, па-за сувяззю з навакольным светам, і што не мае ніякага іншага імя, акрамя як Геній Прыгажосці. А гэта, аказваецца, Любка!..

Але — зноў жа дзіўна — нічога другога, апроч таго, што дзяўчына ў акне была чыёйсьці сястрой і што завуць яе Любкай, Тацяна болей не прыгадала,— ні таго, што гаварыла пра яе дзяўчынка, ні тых пачуццяў, якія з'явіліся ў яе тады. Усё тое знікла, прапала.

Передо мной явилась ты,
Как мимолетное виденье,
Как гений чистой красоты.

Асталося толькі гэта. Адно гэта.

На тым жа шостым нумары аўтобуса Тацяна вярнулася ў цэнтр горада. Яна сышла на Камсамольскай вуліцы, машынальна зрабіла некалькі крокаў і прыпынілася. Дзе было шукаць цяпер Воранава? Дзе той яго брат, на якой будоўлі працуе? У горадзе вунь колькі будоўляў, хіба ўсе абыдзеш...

Так, куды ісці і што рабіць далей, было абсалютна невядома. А ісці некуды трэба і рабіць нешта проста неабходна. Тацяна лічыла цяпер за свой найпершы, найважнейшы абавязак сустрэцца з Воранавым. «Без гэтай сустрэчы я не магу, проста не маю права паехаць адсюль»,— бясконца паўтарала сама сабе Тацяна.

Яна азірнулася наўкол. Машынальна спыніла позірк на прадаўшчыцы марожанага. Потым на газетным кіёску. Пасля на будцы шаўца. І тады мімавольна перавяла позірк на свае туфлі. Абцасы ў іх, што і казаць, даўно патрабавалі рамонту. Яна проста бязбожна зацягнула гэту справу,

ёю даўно трэба было заняцца... А мо зрабіць гэта зараз? Сапраўды, чаму б не пайсці і не падбіць абцасы? А тым часам можна будзе і падумаць. Пакуль шавец будзе порхацца, якраз, можа, прыйдзе ў галаву якая думка. Абавязкова нават прыйдзе. І вельмі дарэчы, што і людзей да шаўца няма, не трэба стаяць у чарзе. Вельмі дарэчы.

Шавец і напраўдзе быў без работы, ён сядзеў на сваім нізенькім табурэце і чытаў газету. Калі Тацяна прачыніла зашклёныя дзверы будкі, шавец не спяшаючыся адклаў газету ўбок, пільна агледзеў Тацяніны ногі і толькі пасля гэтага ўзняў вочы на яе самую.

— О! — сказаў ён.— Некаторыя мужчыны наабедаўшы любяць выкурыць добрую папяросу. На маю долю выпаў лепшы лёс — я маю магчымасць пасля абеду прабавіць час у кампаніі такой маладой і, паверце слову сумленнага чалавека, такой абаяльнай асобы, як вы. Для мяне, старога чалавека, гэта сапраўднае свята.

Ён быў ніякі не стары, гэты балбатлівы шавец, яму, напэўна, і за сорак яшчэ не пераваліла. Проста ён належаў, відаць, да тых людзей, якія любяць чамусьці накідваць сабе гады — можа, дзеля таго, каб выклікаць да сябе спагаду. Ат, хай сабе балбоча.

Шавец агледзеў адзін туфель, потым другі і паабяцаў:

— Як звон будуць!

Верхняя палавіна будкі была, як і дзверы, зашклёная, але з сярэдзіны шкло было чамусьці абрашэчана тоўстымі жалезнымі палосамі.

— Вы пытаецеся, навошта тут спатрэбіліся гэтыя краты? — сказаў шавец, хоць Тацяна ні пра што ў яго не пыталася.— А ліха яго ведае, нашто яны іх зрабілі. Гэта тайна, пакрытая змрокам. Казка тысячы і адной ночы. Але я здагадваюся, што краты тут для таго, каб ніхто мяне не ўкраў. Бо болей тут няма чаго красці. Дзе вы знойдзеце такога дурня, які б пагаліўся на гэтае шылле-мылле. Калі ўжо, як той казаў, красці, дык красці з добрага каня.

Працаваў шавец упэўнена, але не відаць было, каб ён дужа завіхаўся. Наадварот, стваралася такое ўражанне, быццам адзінае яго жаданне — гэта сядзець над Тацянінымі туфлямі аж да вечара.

— Нашто вам што, вазьміце такі прыклад. От злётаў у космас Юрый Гагарын. Добра. Цяпер злётаў Герман Цітоў. Таксама добра, хто ж кажа, што не. А цяпер, глядзі-

це, бяру я ў руку от гэтую штукенцыю. Можа, вы думаеце, што гэта шавецкі цвік? То вы памыляецеся, калі вы так думаеце. Гэта не цвік, а здзек з рабочага чалавека, вось што гэта такое. Тфу! Куды гэта, скажыце, варта?

Любка, Любка, дзе ты такая ўзялася? На якіх такіх марцыпанах узгадавалася? Я ж думала дагэтуль, што самая найпершая красуня ў свеце — гэта Шура Зварыкіна. А ты ўзяла і ў адно імгненне сцерла, знішчыла яе, ператварыла ў нішто. Хіба ж можна так?..

Любка, Любка, Таніна сястра. Сястра маленькай зусім непрыгожай дзяўчынкі. Вы такія розныя, ані не падобныя адна на адну. Чаму вы такія розныя?..

І тут Тацяне прыгадалася ўсё нанова: маленькая дзяўчынка на верандзе, яе худзенькія плечукі, сказаныя ёю словы і сам яе твар, вельмі напалоханы, жаласны...

А як прыгадалася гэта, тады адбылося нешта зусім ужо нечаканае. Тацяна раптам стала адчуваць як паступова пачала бляхнуць Любчына прыгажосць.

— Цікава, пра што ён будзе гаварыць? Вы не ведаеце?

Была прыгажосць, і от ужо не стала яе. Зусім не стала.

І нічога, нават жалю, нават самага малога шкадавання, што яе больш няма, не асталося.

— Мабыць, пра палёт Германа Цітова.

— Вядома, і пра палёт таксама. Але, я думаю, ён будзе гаварыць не толькі пра палёт.

— Магчыма.

— Чулі, што цяперака ў тым Берліне дзеецца?

— Чула...

Колькі іх у горадзе, гэтых будоўляў? Здаецца, не так ужо і многа. Але ўсё роўна, як ты дазнаешся, на якой іменна працуе той ягоны брат? Вунь і каля нашай ашчадкасы нешта будуюць, нейкую камяніцу. Можа, ён якраз там і працуе?..

— Хай бы лепш сказаў пра нас. Я маю на ўвазе — пра нашы парадкі.

— Якія парадкі?

— Вы пытаецеся, пра якія парадкі? Калі больш правільна сказаць, пра непарадкі.

«Сапраўды, а раптам ён якраз каля нашай ашчадкасы працуе? Бадай, у гэтым нічога неверагоднага няма. Чаму, скажам, Воранаў прыходзіў іменна ў нашу касу? Ці не таму, што яна паблізу ад яго брата? Завітаў чалавек па нейкай патрэбе, от як сёння, да брата, а тады бачыць —

побач стаіць ашчадкаса. Ну, ён і падаўся да яе, бо яму якраз трэба было разжыцца на грошы».

— Дзе толькі не ступіш, анідзе няма парадку. Рабочаму чалавеку дык проста дыхаць няма як. От вазьміце мяне, да прыкладу. Жыву я, самі бачыце, са свайго роднага мазаля. Што зараблю, тое і маю. А ўсё чэпяцца да мяне і чэпяцца. То адно ім не падабаецца, то другое. Цяпер знайшлі новае. Прыдумалі, смешна сказаць, быццам я спекулянт. Памяркуйце самі, ну які я спекулянт? Што ў мяне — фабрыка аўтамабіляў, ці што?

Шавец зусім перастаў гваздаць па абцасу.

— Меў я «Масквіча», ездзіў сабе калі куды трэба і нікога не чапаў. Думаў адно, каб і мяне не чапалі. Яны, праўда, спачатку і не чапалі. А тут, як на тое, падышла мая чарга на «Волгу». Скажыце самі, навошта мне, рабочаму чалавеку, два аўтамабілі? Гэта ж будзе зусім не тыпова, калі наш савецкі грамадзянін будзе трымаць два аўтамабілі. Канечне, я «Масквіча» прадаў, а купіў «Волгу». Скажыце, шаноўная, а вы на маім месцы хіба зрабілі б не так?

У Таццяны зноў заторгалася нейкая жылка на левай скроні. Пра тое, што можна мець свой аўтамабіль, яна нават і не здагадвалася. Такога і ў думках у яе ніколі не было. А існуюць, аказваецца, людзі, якія маюць тыя аўтамабілі. І — калі ласка, вось ён, адзін з гэтых людзей. Ён сядзіць перад ёю і рамантуе ёй туфлі. Цуд нейкі, дый годзе!..

— Канечне, і вы зрабілі б гэтаксама! — Шавец з маху ўвагнаў цвік у абцас.— Вось і я зрабіў, як людзі. А што, хіба ў нас ужо забаронена прадаваць, калі ў чалавека ёсць што прадаць? А мо наадварот, забаронена купляць? Нічога падобнага. Няма ў нас яшчэ такога закону. Тады яны і прыдумалі: ён, маўляў, спекулянт. І яшчэ маюць нахабства дапытвацца, на якія такія грошы купіў. А вы ж самі бачыце, на якія. Са свайго працоўнага мазаля. Што я — украў, ці што? А мо аграбіў каго? Я рабочы чалавек, а не які-небудзь там кішэнны злодзей. І ў вашу кватэру праз фортку я таксама не лезу, не на таго натрапілі.

А божа ж ты мой, чаго толькі не пабачыш на свеце, калі маеш ахвоту глядзець. Нават от і чалавека, які, забіваючы малатком цвік у твой абцас, можа з гэтага мець за што купіць аўтамабіль.

— Ну вось, глядзіце, і ўсё, я ж вам казаў, што будуць

вашы самаходы як звон. Між іншым, можа, вам туфлі на шпільцы патрэбны? У мяне зусім выпадкова ёсць адна пара якраз на вашу трыццаць пятую ножку. І амаль задарма.

— Я на шпільцы не люблю,— сказала Тацяна, а сама аж слінкі праглынула.— Колькі з мяне?

— Глупства, адзін толькі палціннік, шаноўная.

— Чаму так дарага? — сумелася Тацяна.

— А вы што хацелі — бясплатна? Дык мы ж яшчэ да камунізма не дажылі. От прыходзьце да мяне праз дваццаць год — калі ласка, я вам зраблю бясплатна. І яшчэ дзякуй дам, бо тады, кажуць, без работы я проста не здолею быць...

— Чаму бясплатна? Помню, я за такія самыя набойкі плаціла на старыя грошы два рублі і дваццаць капеек. На цяперашнія, выходзіць, дваццаць дзве капейкі.

— Плаціце, грамадзяначка, і не выпендрывайцеся. А то я вунь міліцыянера пазаву. Бо нельга так здзекавацца з рабочага чалавека.

Яна з гідлівасцю кінула яму грошы і куляю вылецела з будкі. У яе было такое адчуванне, быццам да яе дакранулася штосьці слізкае і агіднае, і ёй зрабілася да таго прыкра, што яна аж перасмыкнулася. І амаль бягом кінулася прэч адгэтуль.

Апамяталася Тацяна кварталы праз тры і вельмі здзівілася, што ідзе проста ў кірунку свае ашчаднай касы. «Чакай,— сказала яна сабе,— навошта мне туды ісці, сёння ж выхадны дзень». Потым зразумела: яна кіруецца на будоўлю, на тую, што побач з ашчадкасай.

І Тацяна пайшла далей.

А што, чым чорт не жартуе! Чаму, сапраўды, той яго брат павінен працаваць абавязкова на якой другой будоўлі, а не на гэтай?

Цені сталі зусім кароценькія. А цераз свой цень, калі б ён астаўся на адным месцы, Тацяне пераступіць было б і зусім проста. Толькі от дзіўна: што гэта там наколвае ў пятку? А, мабыць, пясчынка якая трапіла. Во, цяпер, здаецца, перастала калоць.

Будоўля была даволі вялікая. Раней Тацяна неяк не заўважала яе, хоць праходзіла тут штодня. Аказваецца, тут вымахала ўжо вунь якая камяніца, аж на пяць павергаў. Відаць, гэта будзе жылы дом. Ён яшчэ не зусім даведзен да ладу, яго яшчэ нават не атынкавалі, але ўсярэ-

дзіне, здаецца, шмат што ўжо зроблена. Праз вокны відны пабеленыя сцены, а ў некаторых пакоях вісяць нават плафоны. Шчаслівыя будуць тыя людзі, якія атрымаюць тут кватэры!

А ці будуецца дзе кватэра для яе, для Таццяны?.. Ці ёсць дзе архітэктар, які, плануючы свой чарговы дом, падумаў і пра яе, пра Таццяну? Падумаў, напрыклад, так: а вось тут, маўляў, у гэтым пакоі, павінна жыць адна дзяўчына, якую я хаця і не ведаю асабіста, але мне здаецца, што ёй пільна патрэбен пакой, і добра было б, калі б яна займела яго; магчыма, што яе зваць Таццяна, як звалі любімую мною пушкінскую гераіню, і калі яе і сапраўды так зваць, дык я сплануюдля яе самы зручны, самы ўтульны, самы прыгожы пакойчык. «Але, але, таварыш архітэктар, мяне зваць Таццянай, і нават прозвішча маё Ларына, так што вы, таварыш архітэктар, пастарайцеся, калі ласка, я вам век дзякаваць буду».

Ды няма яшчэ пакуль таго дома, і архітэктар той, напэўна, не распачынаў яшчэ свае работы... Прыйдзецца пачакаць, нічога не напішаш. Ну што ж, пачакаем.

Каля будоўлі была агарожа, аднак у варотах ніхто Таццяну чамусьці не спытаў, чаго яна сюды ідзе.

Непадалёк ад варот пажылы рабочы ў зашмальцаваным камбінезоне корпаўся нечага ля шырокай драўлянай скрыні.

— Не ведаеце, дзе знайсці таварыша Воранава? — спытала Таццяна з такой упэўненасцю, быццам яна зусім дакладна ведала, што ён іменна тут.

— А там недзе,— кіўнуў галавой рабочы некуды ў бок камяніцы.— Там.

«Пачынаюцца дзівосы»,— падумала Таццяна.

Дапраўды, не паспела яна прайсці і некалькі крокаў, як яе дагнаў хударлявы хлопец у выліналай клятчастай кашулі навыпуск і ў шырокіх пягнуткіх штанах, мабыць, брызентавых, і дзелавым голасам сказаў:

— Хадзем, я вам пакажу яго.

Напэўна, ён чуў Таццяніна пытанне. Якія, аднак, ветлівыя тут мужчыны!

Яны рушылі да камяніцы. Хлопец крочыў крыху наперадзе, хада ў яго была нетаропкая, паважная, і Таццяне лёгка было паспяваць за ім.

— А чаму ў вас апарата няма? — спытаў раптам хлопец.

Тацяна не зразумела, пра які апарат ён кажа, але на ўсякі выпадак сказала:

— Ды так...

Пасля, падумаўшы, дадала:

— Забылася ўзяць.

— Забыліся? — з недаверам перапытаў хлопец.

— Ага, забылася. Вельмі спяшалася, от і забылася.

Хлопец азірнуўся на Тацяну, як здалося ёй, з пагардаю.

— А з нагою што?

— З нагою?..

— Вы накульгваеце.

— А-а... Паколвае там нешта.

— Пакажыце сюды.

Ён нагнуўся і ўзяўся за яе туфлік. Штаны яго пры гэтым гучна зашамацелі. Тацяне нічога не аставалася, як абаперціся яму на плячо і дазволіць зняць туфлік. Хлопец намацаў пальцамі ўсярэдзіне.

— Рукі трэба паадбіваць такім халтуршчыкам. Пачакайце, я зараз.— Ён выпрастаўся, зноў пашамацеў штанамі і некуды пабег.

Тацяна асталася стаяць пасярод двара на адной назе. Стаяць было няёмка, яна ледзь стрымлівала раўнавагу.

Недзе з правага боку натужліва гула невядомая машына, на рыштаваннях чуліся прастуджаныя жаночыя галасы, з самага дома раз-пораз вылятаў нейкі глухі пошчак, па-за домам нехта апантана крычаў на некага, а над будынінай з велічнай грацыяй плыла страла вежавага крана, на тросе якога боўталася ў паветры скрыня з жалязякамі.

— Майна! — пачуўся зверху голас, і скрыня пачала павольна апускацца на дах камяніцы.

Толькі цяпер Тацяна заўважыла на рыштаваннях на вышыні трэцяга паверха вялізны, праз увесь фасад, плакат. Белыя літары на чырвоным палотнішчы заклікалі: «Таварышы будаўнікі! Бярыце прыклад з брыгады камуністычнай працы Сяргея Воранава!»

«Ого! — прыемна здзівілася Тацяна.— Вось ён які, яго брат!»

Добра хаця, што хлопец збег не дужа надоўга, а то Тацяна ўжо не мела сіл стаяць на адной назе. Подбегам падляцеўшы да Тацяны, ён памог ёй надзець туфлік і занепакоена спытаў:

— Ну як?

— Парадак! — адразу адчуўшы палёгку, бадзёра сказала Тацяна.

Яны рушылі далей.

Тацяну чамусьці ані не здзівіла, што от гэты незнаёмы рабочы хлопец не толькі сам узяўся быць яе павадыром, але нібыта нават лічыць гэту місію сваім самым прамым і непасрэдным абавязкам. Яна адно падумала, што ён, відаць, добра выхаваны, а мо ад прыроды такі далікатны.

— Асцярожна,— сказаў хлопец, калі яны ўвайшлі ў пад'езд.— Тут трошкі бруднавата.

Трошкі бруднавата — гэта было сказана не зусім дакладна. Бо па падлозе і па лесвіцы, якая вяла па паверхі, было па-сапраўднаму брудна. Паразліваны раствор, кавалкі пабітай цэглы, пілавінне, шматкі толю і рознае іншае будаўнічае смецце проста палохалі з непрывычкі. Але, адолеўшы мінутную разгубленасць, Тацяна смела падалася за хлопцам.

Першы марш лесвіцы яны пратупалі моўчкі, адно шасталі хлапцовы штаны. На другім паверсе ім сустрэлася дзяўчына ў новенькіх з чорнага саціну шараварах і ў жоўценькай безрукаўцы. Яна спускалася з пустым вядром ад фарбы, адстаўляючы яго як далей ад сябе, каб не ўпэцкацца.

— Прывет, Таня,— стрымана сказаў хлопец.— Воранаў на чацвёртым?

«Што гэта сёння адны цёзкі мне страчаюцца»,— усміхнуўшыся, падумала Тацяна.

— Мы сёння здароўкаліся ўжо,— строжачыся, адказала дзяўчына.

— Прабач, нешта не памятаю.

— Дзе ўжо табе памятаць.— Дзяўчына кінула на Тацяну быстры позірк. А параўняўшыся з ёю, паглядзела яшчэ раз. І крыху затрымала позірк на Тацяніным твары. Тацяне прыйшлося шчыльненька прыціснуцца да сцяны, бо вядро з пацёкамі яшчэ свежай фарбы пагрозліва прасунулася ў непасрэднай блізкасці ад яе светла-шэрай спадніцы.

— Ты куды? — недарэчна спытаў хлопец.

— На лімапад,— гучна засмяялася дзяўчына.— Ты ж любіш лімапад, праўда?

Калі Тацяна з хлопцам, які па-ранейшаму ішоў наперадзе, павярнулі на новы марш лесвіцы, да іх знізу даляцеў голас дзяўчыны:

— А Воранаў аж па пятым!

Хлопец перагнуўся цераз поручні і ўзрадавана крыкнуў:

— Дзякуй, Танечка!

Потым сказаў да Таццяны:

— З брыгады Воранава.

І праз некалькі ступенек дадаў:

— Залаты чалавек.

— Хто? — не зразумела Таццяна.

— Я, канечне, маю на ўвазе Воранава,— паспешліва ўдакладніў хлопец, і Таццяна ўбачыла, як налілася чырванню яго шыя.

Ім сустрэліся яшчэ тры ці чатыры чалавекі, што спускаліся ўніз. Знізу — чуваць было — таксама ішлі людзі, нехта нават перагнаў іх.

— Пра яго пісаць і пісаць трэба, каб усе ведалі,— памаўчаўшы, зноў пачаў хлопец.— А то адна «Чырвонка» дала невялічкую заметку, і ўсё. Вядома, і пра хлопцаў ягоных трэба пісаць, і пра дзяўчат таксама. Людзі ўсе — во! Адзін да аднаго, як на падбор. Дружныя, таварыскія. Я вам мог бы столькі пра іх папарасказваць, што вам аж да вечара хапіла б слухаць.

Чым вышэй падымаліся яны, тым цяжэй было Таццяне пераставіць ногі.

Хлопец ішоў роўна, у ранейшым тэмпе, бо, відаць, прызвычаіўся да гэтых чортавых лесвіц, і Таццяна старалася таксама не адстаць ад яго, хоць каштавала ёй гэта немалых намаганняў.

— Гэта, здаецца, чацвёрты паверх? — спытала яна на чарговай пляцоўцы.

— Трэці. Цяпер ужо блізка. Між іншым, яна таксама харошы чалавек. У самадзейнасці іграе. І наогул.

На пляцоўцы паміж трэцім і чацвёртым паверхамі хлопец загаварыў зноў:

— А я, між іншым, вялікага маху даў у сваёй біяграфіі. Была ў мяне магчымасць паступіць у лётную школу. Нават ужо дакументы здаў. А тады прыйшлося ўзяць назад.

— Чаму ж?

— З-за аднаго чалавека. Прыйшлося падаць на будаўнічы факультэт. Каб разам з ім займацца.

«З ёю,— паправіла ў думках хлопца Таццяна.— То, можа, і лепш, што на будаўнічы і што разам».

— Аднак, відаць, дарэмна падаваў...— уздыхнуў хлопец.

— Скажыце, у вас ёсць аўтамабіль? — раптам спытала Таццяна.

— Аўтамабіль? Які аўтамабіль?

— Ну, «Масквіч». Або там «Волга».

Хлопец азірнуўся на Таццяну. Адказаў не адразу.

— Глупства гэта ўсё, тыя аўтамабілі.

— А от людзі ж маюць.

— Маюць тыя, хто з перажыткамі.

— Вы хочаце сказаць, што ў вас і перажыткаў ужо няма?

— Можа, якія яшчэ і асталіся, хто іх усіх ведае. Іх жа чортава процьма на свеце. Але наконт прыватнаўласніцкага перажытку я вам магу сказаць пэўна: у мяне яго няма. Анізвання. І яшчэ я вам скажу, што каб на тое мая воля, я ўраз ліквідаваў бы ў людзей гэты перажытак. Ёсць у мяне адзін праекцік.

Але што гэта за праекцік, Таццяна так і не ўведала,— хлопец абвясціў:

— Вось мы і прытопалі.

На пляцоўцы было трое дзвярэй. Хлопец рушыў да левых, прычыніў іх. Таццяну непрыемна ўразіла цішыня, што панавала наўкол.

— Тут нікога няма...— сказаў хлопец, хоць гэта і так было ясна.

Не аказалася нікога і за другімі дзвярыма. У апошнюю, трэцюю кватэру, Таццяна ўвайшла следам за хлопцам.

— Няма...— зусім ужо разгублена паціснуў плячыма хлопец. Ён усё яшчэ не хацеў верыць, што тая «таксама харошая» дзяўчына на лесвіцы проста пакпіла з яго. І з ягонай спадарожніцы, вядома. Пакпіла, можа, і не са злосці, але вельмі недарэчна.

А кватэрка была, між іншым, што трэба! Таццяна абышла пакоі і кухню, зазірнула ў ванну, і сэрца зашчымела пакутлівай зайздрасцю, зашчымела так моцна, што хоць ты плач. Балазе, што побач не было хлопца, ён нечага астаўся ў пакоі, а то было б дужа соромна, бо адна слязінка, аказваецца, і сапраўды слізганула па шчацэ.

Таццяна самотна падалася ў пакой. Там хлопец, перагнуўшыся цераз падаконнік, пытаўся ў некага:

— Дзе, скажы, Воранаў, а? Можа, чуў, а?

Звонку нехта пябачны зарагатаў.

— Гы, дзівак чалавек, куды ўсцёгся! Ён жа на трэцім!

Хлопец, хаваючы вочы ад Таццяны, глуха прамовіў:

— Пачакайце, от я ёй задам перцу.

Ды Таццяна не сумнявалася, што ніякага перцу нікому ён не задасць.

Яны падаліся назад, уніз.

На трэцім паверсе за ўсімі трыма дзвярыма было шумна і гаманліва, і Таццяна здзівілася, чаму гэта яны раней, калі ішлі тут міма, не зразумелі, што якраз сюды і трэба было ім завітаць. «От да чаго прыводзіць сляпая даверлівасць»,— весела падумала яна.

Хлопец подбегам рушыў у сярэднюю кватэру. Таццяна бачыла, як ён падышоў да чалавека ў заплямленым парусінавым гарнітуры і нешта паціху сказаў яму. Той нездаволена, як падалося Таццяне, буркнуў нешта ў адказ. Таццяна зразумела, што гэта і ёсць Воранаў. «Дзіўна, чаму пра яго пісала «Чырвонка», ён жа зусім ужо не камсамолец»,— мільганула чамусьці ў яе думка. У пакоі было яшчэ некалькі чалавек, а ў кутку стаяла тая самая дзяўчына ў фарсістых чорных шараварах і, не таячыся, усміхалася.

— Добры дзень,— сказала Таццяна.— Я да вас, таварыш Воранаў.

— Вельмі прыемна, добры дзень,— не дужа прыветліва адказаў Воранаў.— Але, можа, вы, прабачце, прыйшлі б пазней, пасля работы?

— Я на адну хвіліначку,— заспяшалася Таццяна.— Да вас прыходзіў ужо брат ці яшчэ не?

— Які брат? — раптам захваляваўся Воранаў.— Пецька?

— Не, Фёдар Фёдаравіч.

— Вы нешта блытаеце.

— Блытаю?..

— Ніякага брата Фёдара ў мяне няма.

— Як няма?..

— І быць не можа. Бо я Аляксеевіч. Так што Фёдаравіч аніяк не можа быць маім братам.

— Не можа...— машынальна паўтарыла Таццяна і пабляднела.

— Калі ўжо хочаце ведаць, дык у мяне толькі адзін брат — Пецька. Але ён цяпер на цаліне.— Воранаў павярнуўся да хлопца.— Ты каго, шалапут, прывёў?

Сапраўды, гэты Воранаў быў зусім не падобны на таго.

І з твару яны былі розныя, і рост у іх быў зусім не аднолькавы — гэты на цэлую галаву выглядаў ніжэй.

— Вы хіба не карэспандэнтка? — разгублена спытаў хлопец.

— Што?..

— А я ж чамусьці падумаў, што вы з газеты.

І тады грымнуў смех.

Першая, здаецца, засмяялася дзяўчына ў чорных шараварах. За ёю пусціўся ў рогат Воранаў, а тады і ўсе астатнія.

Не стрымалася і Таццяна. От жа ж дзівак, гэты хлопец! Што і адкуль цюкнула яму ў галаву!

А той ужо і сам рагатаў. І нават мацней за ўсіх.

Таццяна неўзаметку пазірала на дзяўчыну. Дзіўна, чаму яна ні пра што не здагадваецца? Гэты ж хлопец кахае яе, а яна бессардэчна здзекуецца з яго. І яшчэ смяецца. Хіба можна смяяцца з чалавека, які кахае?.. А фарсістыя свае шаравары яна ўсё ж упэцкала. Як ні сцераглася, а ўпэцкала. Мабыць, яшчэ і сама не ведае пра гэта, яшчэ не бачыла. А пабачыць, страшэнна шкадаваць будзе, яны ж сёння, напэўна, першы раз адзетыя і дагэтуль былі такія фарсістыя!..

— Ну і напалохалі вы мяне,— гаварыў Воранаў.— Няўжо, думаю, уцёк Пецька з цаліны?

— То я пайду,— сказала нарэшце Таццяна.— Прабачце. Здарылася памылка друку, як пішуць часта ў кнігах, у самым канцы. Той Воранаў зусім недзе не тут.

І яна падалася ўніз, не чакаючы свайго павадыра. Яму, канечне, трэба да канца выкарыстаць зачэпку, дзякуючы якой надарылася магчымасць наведаць брыгаду Воранава.

Апынуўшыся на вуліцы, Таццяна яшчэ раз паглядзела на камяніцу, і хоць не ведала, ці бачыць яе хто цяпер з трэцяга паверха, падняла руку і развітальна памахала ёю.

Непаразуменне з Воранавым ані не засмуціла Таццяну. Наадварот, нібы нават бадзёрасці прыбавілася. І ўпартасці. Яна ўсё ж знойдзе патрэбнага Воранава, таго, Фёдара Фёдаравіча!

Відавочна, шукаць яго брата не мела ніякага сэнсу. Трэба неяк пільнаваць яго самога. Варта, мабыць, зноў пайсці ў інстытут. Павінен жа ён неяк трымацца таго, праз што прыехаў сюды. Ну не было яго ў інстытуце раніцай, дык гэта ж зусім не азначае, што ён сёння ўжо і не завітае туды. Якраз можа завітаць, гэта вельмі натураль-

на. Ёсць там, напэўна, бібліятэка, ёсць чытальная зала,— чаму ж не прыйсці яму туды ад брата і не пазаймацца?

А туфлікі, аказваецца, узялі сабе ладнае памяці аб наведванні будоўлі. Ад ранейшага бляску і звання не засталося. Адно шэры пыл укрыў іх. А на левым наску здолеў неяк прымасціцца нават камячок зацвярдзелага цэментнага раствору.

...Будынак інстытута здаўся Тацяне даўно-даўно знаёмым, нават нібыта блізкім. Было такое адчуванне, быццам яна ведала ўжо тут усё да драбніц. Людзі тут, напрыклад, падзяляюцца на дзве катэгорыі. Адны — гэта начальнік аддзела кадраў і сакратарка ў прыёмнай, другія — белабрысы юнак, чамусьці задужа высокі і нязграбны, і той, са знявечаным тварам...

У вестыбюлі была цішыня. Непрывычная, нейкая застыглая. Яна адразу ўразіла і насцярожыла Тацяну. І калі насустрач ёй спусціліся ў вестыбюль дзве дзяўчыны з бледнымі тварамі і журботнымі вачыма, Тацяна зразумела, што ў інстытуце нешта здарылася. Яна хацела спытаць у дзяўчат, што тут дзеецца, але тыя прайшлі ўжо міма, да выхада, цалкам паглыбленыя ў свае думкі.

Раптам недзе пачуліся гукі жалобнага марша. Яны рынулі аднекуль зверху і адразу запаланілі сабою ўвесь будынак, усе яго тры паверхі, а можа, адолеўшы сцены, шуганулі нават і далей, на вуліцы горада.

Тацяна ў нейкім здранцвенні паднялася на трэці паверх, гэтак жа дайшла калідорам да насцеж расчыненых дзвярэй, за якімі шчыльным натоўпам стаялі людзі. Тацяне ўдалося праціснуцца, і яна апынулася ў вялізнай зале.

Зала была поўная людзей. І ўсе глядзелі проста перад сабою, туды, дзе на ўзвышэнні былі дзве аднолькавыя чырвоныя трупы, ля якіх застылі юнакі і дзяўчаты з жалобнымі павязкамі на рукавах.

Тацяна не адважылася праціснуцца далей, бліжэй да тых, што спачылі вечным спакоем. Але на сцяне яна ўбачыла іх жывых — яны пазіралі на яе з вялікіх партрэтаў у чорных рамках. З аднаго партрэта на Тацяну глядзеў юнак, з другога — дзяўчына. Яны былі вельмі маладыя і вельмі прыгожыя.

Жалобны марш аціх. Але ніхто не крануўся з месца, ніхто не пакінуў тых дваіх, што чамусьці развіталіся з жыццём. І Тацяна таксама асталася стаяць. Яна адно гля-

дзела па партрэты. Неяк проста немагчыма было паверыць у тое, што гэтых людзей ужо няма. Яны ж такія маладыя і такія прыгожыя. Чаму іх няма?.. Што здарылася, што адбылося?..

— Хто гэта? — спытала Таццяна ў нейкага юнака, што стаяў поплеч і таксама глядзеў на партрэты, глядзеў шырока расплюшчанымі вачыма, у якіх застыў спалох.— Хто яны?..

Юнак здрыгануўся.

— Яны?..— перапытаў ён, па-ранейшаму не зводзячы вачэй з партрэтаў.— Хто яны?..— паўтарыў ён Таццяніна пытанне і змоўк. Відаць, ён шукаў патрэбныя словы, якімі можна было б найбольш дакладна адказаць Таццяне, а магчыма — і самому сабе.

Юнак, падалося Таццяне, маўчаў доўга... Што, ну што тут — няшчасны выпадак?.. Хвароба?.. Злосная наўмыснасць?..

Нарэшце юнак павярнуўся да Таццяны.

— Яны кахалі адно аднаго.

Цяпер скаланулася Таццяна — і ад саміх гэтых слоў, і ад голасу, якім яны былі сказаны,— глухога, поўнага журботнай роспачы.

— Летам яны працавалі ў піянерскім лагеры важатымі. Пазаўчора паплылі на лодцы з дзецьмі па рацэ. А лодка, як на тое, нечага раптам перакулілася. Святлана плаваць не ўмела, але ёй удалося ўчапіцца за борт лодкі, якая яшчэ трымалася на вадзе. Аркадзь стаў ратаваць дзяцей. Яму ўдалося ўсіх павыцягваць на бераг. Потым ён кінуўся зноў у ваду, да Святланы. А ўжо лодка пачала тануць. Аркадзь усё ж паспеў даплысці да яе. Але Святлана ўчапілася за лодку мёртваю хваткай, сутарга скурчыла ёй пальцы, і іх немагчыма было адарваць ад лодкі. Тады Аркадзь апчаперыў Святлану і разам з ёю пайшоў на дно. Іх так і знайшлі — разам.

Потым былі прамовы. Але Таццяна больш нічога не запомніла, яна нават і не чула нічога. І не бачыла таксама нічога, акрамя дзвюх аднолькавых чырвоных трунаў на ўзвышэнні.

Таццяна не памятала, колькі яна была ў гэтай зале і як апынулася на вуліцы. Хутчэй за ўсё яна выйшла, калі выходзілі ўсе. А магчыма, пазней за ўсіх. Але, іменна пазней, напэўна. Бо калі яна схамянулася, не было ўжо ні натоўпу, ні тых дваіх. Толькі недзе наперадзе, там, дзе губля-

ліся ўдалечыні абрысы вуліцы, яшчэ чуліся ўзрыды жалобнага марша.

Тацяна хадзіла цяпер па горадзе, забыўшыся на ўсё на свеце, хадзіла без ніякае мэты. Ніколі яшчэ нішто не ўзрушвала яе гэтак. Яна забрыла нечага ў парк, прысела на лаўку. Парк быў дзіцячы, наўкола — адны малыя, яны бегалі, скакалі, галёкалі. Усе хлопчыкі былі Германамі Цітовымі, а ўсе дзяўчаткі страшэнна зайздросцілі ім. Потым Тацяна чамусьці апынулася ў магазіне. І тут зноў чуліся толькі дзіцячыя галасы — аказваецца, яна трапіла ў «Дзіцячы свет». Праз нейкі час высветлілася, што ў горадзе наогул жывуць адны дзеці: Тацяну немаведама хто прывёў у кінатэатр, але ва ўсёй зале толькі яна адна была дарослая...

Рабочы дзень скончыўся, калі Тацяна раптам выявіла, што яна зноў каля свае ашчадкасы. Незразумела і дзіўна было, чаму тут апынулася. Агледзеўшыся, Тацяна даўмелася, што іменна сюды яна і ішла — ішла ўвесь гэты час, што блукала па горадзе, і толькі цяпер нарэшце дайшла. Не, не да самой ашчадкасы, а зноў да тае будыніны, што побач. Тацяне пільна трэба яшчэ пабыць тут пасля інстытута і таго, што ўбачыла і пачула. Ёй трэба было сустрэцца з дзяўчынай у фарсістых шараварах. Сустрэцца і пагаварыць. Няважна, што яны зусім незнаёмыя. Тацяна мае што сказаць ёй. Яна бачыла Вялікае Каханне, і ёй абавязкова трэба сказаць пра гэта дзяўчыне. Тая павінна ведаць гэта. Бо іначай яна нешта страціць у жыцці.

Цяпер на будоўлі было ціха, нікога і нічога не чутно, але Тацяна вырашыла, што ёй усё роўна трэба пайсці.

Вароты былі зачынены. Тацяна абышла вакол агарожы і на другім баку ўбачыла ладную такі шчыліну. Ёй удалося праціснуцца.

Дзіўна было бачыць нерухомай і аціхлай тую груваст-кую машыну пасярод двара, што раней круцілася і страшэнна грукацела; недарэчным здаваўся вежавы кран з пустым тросам, які сіратліва матляўся ў паветры; і наогул без людзей усё было тут нязвычна самотнае, паніклае.

Крыху палохала цішыня на лесвіцы. Ніхто не спускаўся насустрач, ніхто не абганяў. Тацяна ступала так ціха, што нават сама не чула сваіх крокаў.

На пляцоўцы трэцяга паверха яна прыпынілася. Як і раней, усе трое дзвярэй былі расчынены. А тыя, дзе працавала брыгада Воранава, нават шырэй за астатнія. «Да-

рэчы, што гэта яны рабілі тады? — падумала Тацяна.— Здаецца, фарбавалі сцены. Выходзіць, воранаўцы — маляры».

Тацяна пераступіла парог кватэры і зірнула ў той пакой, дзе ўжо была раней. Там ля акна стаялі двое. Ён быў у тых самых пягнуткіх брызентавых штанах і ў вылінялай клятчастай кашулі навыпуск, яна — у заплямленых, але ўсё яшчэ фарсістых чорных шараварах і ў жоўтай безрукаўцы.

Яны цалаваліся.

Тацяна адступіла крок назад. Цяпер яны схаваліся з вачэй. Тацяна сцішылася, каб нічым не даць ім знаку, што яна тут.

У пакоі, як і раней, было ціха, і можна падумаць, што тыя двое раптам некуды зніклі, прапалі. Або што іх і наогул не было, што Тацяне гэта ўсё падалося. Тады яна асцярожна ступіла наперад.

Не, яны былі тут. І ўсё яшчэ цалаваліся. Ён, абняўшы яе сваімі мускулістымі загарэлымі рукамі і нахіліўшы галаву да адкінутай назад дзяўчынінай галавы, моцна прыпаў да яе вуснаў, і так нібыта застылі.

Тацяна зноў адступіла назад.

Цяпер яна счакала большы час.

Стаяць на адным месцы, не зварухнуўшыся і нават амаль не дыхаючы, можа, якім іншым часам было б чыстаю пакутай, але цяпер Тацяна не зведвала нічога, акрамя на дзіва спакойнай заміранасці. І яна стаяла далей, не ўслухоўваючыся ні ў што і нават не думаючы ні аб чым.

Нарэшце яна зрабіла новую спробу зайсці ў пакой.

Двое былі на тым самым месцы, ля акна. Толькі цяпер ужо не ён цалаваў яе. Цяпер яна, узняўшыся на дыбачкі і абвіўшы рукамі ягоную шыю, уся прыгарнулася і цалавала хлопца. Галава яе трошкі схілілася набок, а вочы былі моцна прыжмураны.

Асцярожненька павярнуўшыся, Тацяна яшчэ больш нячутнай хадою выйшла на пляцоўку і, не спыняючыся тут, пабегла па лесвіцы ўніз. Дзяўчына ў шараварах, аказваецца, усё ведае сама. Ёй нічога не трэба гаварыць.

На вуліцы, калі Тацяна праходзіла паўз вароты, яна ўгледзела праз шчыліну вартаўніка: ён сядзеў на бервяне і задумённа пазіраў некуды ўгору, на неба. Тацяне падумалася, што тыя двое таксама, напэўна, ведаюць пра адтуліну ў агарожы і абавязкова пакарыстаюцца ёю, знікаю-

чы з будоўлі. Азірнуўшыся, Таццяна якраз і ўбачыла іх. Яны ішлі другім бокам вуліцы, узяўшыся рука за руку. Ён нешта весела гаварыў ёй, а яна смяялася.

Прыцемак сама што пачынаў ахінаць горад. Усё наўкола быццам прытаілася ў чаканні прыходу вечара, жаданае пары спачынку пасля доўгага і турботнага летняга дня.

Відаць, дзяўчаты сабраліся цяпер ля тэлевізара і слухаюць канцэрт Гелены Веліканавай... Дзіўна, чаму яна сказала таму шаўцу, што ў іх інтэрнаце няма тэлевізара? Мабыць, шавец дужа стараўся паказаць, што ў яго тэлевізар ёсць. «Ну і чорт з табою, што ён у цябе ёсць, можа, яшчэ дачакаешся, што і адбяруць, калі паразумнее сёй-той. І аўтамабіль адбяруць, вельмі нават проста. А от я прыдбаю сабе з часам тэлевізар. Свой. На свае грошы. А што думаў — і прыдбаю! Куплю от спачатку аксамітнае плацце, а тады і пачну адкладваць патрошку на тэлевізар. Можа, яшчэ і зарплату нам прыбавяць, ходзяць жа такія чуткі. Тады і зусім не цяжка будзе купіць. Нават, калі на тое пайшло, дык і аўтамабіль не такая ўжо недасягальная для мяне рэч. Той хлопец на будоўлі гаварыў, што аўтамабіль — гэта перажытак, а па-мойму, дык ён ніякі не перажытак. Калі маеш за што купіць, калі зарабіў сумленна, а не тымі ўяўнымі мазалямі,— чаму б не займець нават аўтамабіль? Сеў сабе і паехаў куды трэба. І ні ў якай табе чарзе па аўтобусным прыпынку не стаяць, і нікога не перапрошваць, калі дужа няма часу. Праўда. І калі падумаць як след, дык ён проста неабходны чалавеку, без яго нават зусім немагчыма».

Таццяна ўсміхнулася сама сабе. Эге-ге, так ужо і немагчыма! Бач ты, да чаго дафантазіравалася. Проста вынь ды накладзі ёй аўтамабіль. Нічога, паездзіш і па тым транспарце, па якім ездзяць усе, нічагуткі з табою не станецца. Гэта шавец ані не можа без яго, а ты абыдзешся. Не памрэш без таго аўтамабіля.

А з Воранавым Фёдарам Фёдаравічам ёй абавязкова трэба сустрэцца. Так, без гэтае сустрэчы яна не можа паехаць. Цікава, быў ён на пахаванні ці не быў? Канечне, быў. Там жа ўсе былі. А тое, што Таццяна не бачыла яго, нічога яшчэ не азначае. Яна, напэўна, не ўбачыла б яго нават і тады, калі б ён стаяў побач, а не тое што дзе здаля. Цяпер, відаць, ён ужо дома. Канечне, ён павінен ужо быць дома.

Знаёмым шостым маршрутам Тацяна зноў дабралася да Першамайскай. Калі яна выйшла з аўтобуса, ужо ладна такі ўвечарэла. Але Тацяна не збаялася, не адмовілася ад свайго намеру.

Зноў забрахаў сабака, калі Тацяна апынулася ля вядомай ужо брамы. Цяпер брама была зачынена наглуха, і сабака брахаў блізка, зусім побач. На гэты брэх чамусьці доўга ніхто не выходзіў. Нарэшце пачуўся нечы голас, які зваў сабаку. Тацяна чакала, што да яе зноў выйдзе маленькая Таня, але голас быў зусім не яе, гаварыў дарослы, толькі нельга было адразу пазнаць — мужчына ці жанчына. Потым пачуліся крокі, а яшчэ праз момант у браме прачынілася фортка, і тады Тацяна ўбачыла, што яна ўсё ж мае справу з жанчынай. Немагчыма было толькі разабраць у змроку — старая яна ці яшчэ не вельмі.

На Тацяніна запытанне аб Воранаве жанчына чамусьці злосна буркнула:

— Яго няма.

— А калі ён будзе, не скажаце?

— Можа, калі і будзе,— гэтак жа злосна пракaзала жанчына і бразнула форткаю.

«Тады я буду чакаць яго,— сказала сабе Тацяна і сама здзівілася са сваё ўпартасці.— Тут буду чакаць, на вуліцы, і нікуды не пайду, пакуль не дачакаюся. Прыйдзе ж ён калі-небудзь дамоў, урэшце. Павінен прыйсці. Не можа быць, каб не прыйшоў. Я яго абавязкова дачакаюся».

Яна адышлася на якія дамы тры-чатыры ад брамы, потым павярнула назад і зрабіла гэткі ж самы шпацыр у другі бок.

Але ж і праўду кажуць, што няма ліха без дабра: гэта ж вельмі дарэчы, што тут, на Першамайскай, спрэс высокія і шчыльныя агарожы, ніхто не стане дзівіцца з яе, ніхто не будзе задаваць сабе лішніх пытанняў. А на самой вуліцы людзей амаль і не сустрэнеш, толькі зрэдку трапляюцца адзінокія прахожыя; відаць, тутэйшыя насельнікі не любяць вылазіць са сваіх сховішчаў познім часам.

Так і хадзіла яна то ў адзін, то ў другі бок, адчуваючы, як усё больш і больш натамляюцца ногі. Страшэнна абурала, чаму ніхто на ўсёй вуліцы не здагадаўся паставіць каля сваіх варот хоць якую лаўку; робяць жа так часам людзі, яна сама бачыла на другіх гэткіх жа зацішных вуліцах. А то і прысесці няма дзе, каб хоць трошкі адпачыць.

Прайшлі дзве дзяўчыны. Яны апярэдзілі Тацяну, і тады адна з іх стала горача пераконваць другую:

— Малако асабліва смачна піць з тонкай шклянкі. У гранёнай шклянцы яно ўжо зусім не такое. А кава ні ў якой шклянцы не смачная, яе толькі з фарфоравага кубачка піць прыемна. Або яшчэ лепей з фаянсавага.

От жа ж трэба, а? Людзей хвалююць і такія праблемы. А Тацяне зараз хоць бы ў чым далі таго малака, хоць нават у якой бляшанцы, яна апі не пярэчыла б. Ды з якім яшчэ смакам спаражніла б тую бляшанку!

Сапраўды, яна адчула раптам страшэнны голад. Гэта ж трэба, яна сёння, аказваецца, так і не паабедала. Зусім неяк забылася, што трэба есці. А ці снедала яна хаця раніцай? Здаецца, таксама не. Ва ўсякім разе, Тацяне так і не ўдалося ўспомніць, ці заходзіла яна сёння на кухню, ці ўключала там чайнік.

Ды дармо, яна сёння ўсё сцерпіць — і стому, і голад. Цяпер, відаць, чакаць асталося ўжо нядоўга. Мусіць, яна ўжо гадзіны са дзве тупае тут. Прыйдзе ўжо і канец гэтаму тупанню.

Хвілін праз колькі з таго боку, дзе быў аўтобусны прыпынак, і папраўдзе паказалася мужчынская постаць. Тацяна да таго захвалявалася, што нават ісці далей не здолела. Стаяла і адно старалася, каб як перастала стукаць сэрца, бо здавалася, што гэты стук чуваць далёка наўкол. А мужчынская постаць усё набліжалася, яна была ўжо блізка. Так, так, гэта быў Воранаў, той самы, Фёдар Фёдаравіч, сумнявацца ў гэтым ужо не прыходзілася.

Воранаў, напэўна, таксама заўважыў яе. Спачатку ён прыпыніўся на момант, але потым зноў пайшоў насустрач, хоць і не так ужо борзда, як раней, і нават чамусьці крыху пахістваючыся. Ліхтары на вуліцы гарэлі цьмяна, і слупы з імі стаялі рэдка, але і пры гэтым святле было няцяжка ўбачыць, што Воранаў вельмі здзіўлены, а можа, нават і ўражаны тым, што яго хтосьці чакае на пустыннай начной вуліцы.

Тады і Тацяна рушыла насустрач яму.

Воранаў зусім спыніўся. Стаяў і пільна ўзіраўся ў Тацяну.

Яна падышла да яго зусім блізенька.

— Добры дзень,— адолеўшы хваляванне, сказала Тацяна.

Воранаў азваўся не адразу.

— Здаецца, ужо вечар. Нават ноч.

— Ага, ага, ужо ноч, праўда. Я цэлы дзень шукала вас.

— Мяне?

— Дзе толькі не пабыла, і ўсё дарэмна.

Ліхтары маргнулі і зусім патухлі.

— Навошта я вам?

Таццяна адчула, як ад яго патыхнула гарэлкай. І хоць Таццяна цярпець не магла паху гарэлкі, яна цяпер нават не адхіснулася, не адышлася ні на паўкроку назад. Аказваецца, Воранаў таксама вельмі высокі. Хаця, канечне, не такі, як той белабрысы. Таццяне не так ужо цяжка глядзець Воранаву ў вочы, галаву не трэба закідаць гэтак моцна. Але ў ягоных вачах нічога не ўдаецца ўбачыць — на вуліцы зусім цёмна.

— Я цэлы дзень шукала вас...— паўтарыла Таццяна, не ведаючы, як і з чаго пачаць гаворку.

— Гэта я ўжо чуў. Што далей?

— Мне хацелася пагаварыць...— нясмела прамовіла Таццяна.

— Пра што? — рэзка спытаў Воранаў.

Таццяне здалося, што ў яго голасе прагучалі ноткі спалоху.

— Нам няма пра што гаварыць,— сказаў ён хутка. І дадаў: — Здаецца, няма.

— Вы не пазналі мяне? Я з ашчадкасы. Вы ў нас былі ўчора.

— Учора? У вас?

— Ну, але. Вы яшчэ, помніце, сказалі нам пра Цітова.

— А-а, цяпер прыпамінаю. Сапраўды, вы там таксама былі, здаецца.

Ён, відаць, канчаткова ўзяў сябе ў рукі.

— Ну канечне, вы там былі. Я яшчэ падумаў тады, што вы нішто сабе. Праўда. І цяпер магу з усёй катэгарычнасцю пацвердзіць гэта. Нават пад прысягай.

Цяпер Таццяна адхіснулася ад яго. Нейкі момант разгублена маўчала, а тады глуха прамовіла:

— Вы лічыце, нам няма пра што гаварыць?..

— Не, чаму ж, я гэтага цяпер ужо не сцвярджаю. Давайце пагаворым. Абстаноўка якраз вельмі падхадзяшчая для ўсялякіх размоў. Спрыяльная, так сказаць, абстаноўка. І час у мяне ёсць, праўда.

Таццяна раптам зразумела, што недзе падсвядома яна і была ўпэўнена якраз у гэтым,— у тым, што грошы імен-

на ў Воранава. І толькі ўвесь час старалася чамусьці прымусіць сябе паверыць у адваротнае, старалася пераканаць сябе, што ён зусім не такі, што ён не пойдзе на гэта, не можа пайсці. А падсвядома ведала: гэта ён узяў. Узяў, але, магчыма, яшчэ аддасць назад. Усё ж такі ён чалавек. Ён нават зямляк Германа Цітова.

Яна павярнулася і шпарка, як толькі магла, пайшла прэч.

— Дарагуша, куды ж вы...— даляцеў да яе голас Воранава. Таццяна ведала, што ён не кінецца за ёю, але ўсё ж прыскорыла хаду, амаль пабегла.

Далей, далей ад яго, ад гэтага страшнага чалавека. Уцячы, і каб ніколі ўжо не пабачыць яго болей. І слоў яго не чуць, і самога голасу. Голасу, якім ён выхваляўся пра зямляцтва з Цітовым.

А можа, і гэта няпраўда — тое, што ён зямляк Цітова? Сапраўды, хіба ён можа быць земляком такога чалавека? Ніякі ён не зямляк. Ён наогул нічый не зямляк.

Зноў запаліліся ліхтары. Цяпер яны гарэлі зырка, і наўкола адразу зрабілася відна, як удзень.

Аўтобусы ўжо не хадзілі, і Таццяне мо цэлую гадзіну прыйшлося дабірацца да свайго інтэрната.

А назаўтра а палове дзевятай яна прыйшла да ашчадкасы. Ніна Іванаўна і Зіна, якія былі, як і звычайна, без чвэрці дзевяць, вельмі здзівіліся, убачыўшы яе тут.

— Забегла яшчэ раз развітацца,— бадзёра сказала Таццяна.— Перад тым як паехаць назусім. Я ж сёння паеду.

Прахалода ў памяшканні здалася такой прывычнай і роднай, што аж у грудзях зашчымела.

— Ведаеце, я сустрэла Воранава,— сказала Таццяна.

— Якога Воранава? — не зразумела Ніна Іванаўна.

Зіна насцярожана спынілася, не дайшоўшы да свайго століка.

— Ну, таго... Каторы браў тады грошы па акрэдытыве. Зусім выпадкова сустрэла. Ён вельмі ўзрадаваўся. От добра, кажа, што я вас убачыў. Ваша касірка, кажа, пераплаціла мне грошы, я прыйшоў дамоў, гляджу — лішнія. Пабег, кажа, каб аддаць, а каса была ўжо зачынена. А ўчора ў вас выхадны быў. Дык я, кажа, зараз і іду якраз да вас. Вазьміце, кажа, калі ласка, а то мне дужа няма калі. І праўда, ён вельмі некуды спяшаўся. На экзамены, мабыць.

Ніна Іванаўна спярша пабляднела, а потым неяк аж засвяцілася ўся.

— Які высакародны малады чалавек! — расчулена сказала яна.— Вы толькі падумайце! Зіначка, даражэнькая, вы ўсё ж паедзеце на Чорнае мора! Я вам так зайздрошчу!

Зіна пільна паглядзела на Тацяну. Тацяне ўдалося вытрымаць гэты позірк. Яна паклала на Зінін столік грошы і адразу падалася да выхада. У дзвярах павярнулася і прыўзняла руку.

— Бывайце, мілыя мае жанчынкі. Дарэчы, Зіначка, вы мелі рацыю, чорны панаксаміт цяпер зусім не модны. Я надумала ўзяць сабе парчы. Такой залацістай, ведаеце?

Яна памахала рукою і выйшла.

*1962*

# ПЕРШЫ СТРЭЧНЫ

*Кінааповесць*

Пагодлівая чэрвеньская раніца.

Па серабрыстых рэйках імкліва шыбуе пасажырскі поезд.

З паравоза белай птушкай выпырхнула воблачка пары, і адразу ж над наваколлем залунаў басісты гудок. Праз момант ён рэхам азваўся ў далёкім лесе.

Імчыцца, ляціць па неабсяжным сонечным прасцягу поезд. Мільгаюць вагоны, і на кожным шыльдачка: «Масква — Мінск».

Наперадзе — невялікая палявая станцыя. Ужо відны агні ўваходнага светафора. Машыніст Андрэй Беражкоў таргануў за прывод сігналу, пасунуў рэгулятар назад і ўключыў тармазы.

Тым часам памочнік машыніста Васіль Наўроцкі зачыніў топку, высунуўся ў акно.

— Бачу жоўты агонь! — сказаў Васіль.

— Правільна, жоўты! — пацвердзіў Андрэй.

Поезд замаруджвае свой імклівы бег. Перад вачыма машыніста праплывае назва станцыі: «Слаўнае».

Дышлі зрабілі яшчэ некалькі павольных рухаў і замерлі. Паравоз прыпыніўся якраз каля кантрольнага слупіка.

З тамбура апошняга вагона адчыніў дзверы брыгадзір поезда. Зірнуў на перон. Там у гэты ціхі ранішні час — ні душы. Ніхто не сыходзіць з поезда, ніхто не ідзе да яго.

Роўна праз пяць хвілін, вызначаных раскладам для прыпынку поезда на станцыі, з вакзальчыка паказаўся заспаны дзяжурны. І ў той жа момант дрымотную цішыню станцыі парушыў свісток галоўнага кандуктара. Яму паважна адказаў гудок паравоза.

Грымнулі буферы вагонаў, і поезд крануўся з месца, каб зноў пашыбаваць у сваю дарогу, да Мінска.

Стоячы на падножцы вагона, брыгадзір пазірае ўздоўж саставу. Раптам ён бачыць: наперадзе з-за кіёска кінулася да поезда нечая постаць.

Вагон з брыгадзірам параўняўся з дзяжурным па станцыі. Той гукнуў:

— У галаве саставу глядзі! Сеў!

Звычайны бесплацкартны вагон. Некаторыя пасажыры яшчэ спяць, другія прачнуліся ўжо. Нехта прыбірае пасцель, а яшчэ нехта таропка дажоўвае купленыя яшчэ ў Маскве прысмакі. Недзе ў канцы вагона залілося плачам дзіця.

Па вагоне ў суправаджэнні праваднііцы прасоўваецца брыгадзір. Ён уважліва аглядае пасажыраў. Позірк яго слізгае то па верхніх лаўках, то па ніжніх.

Прайшоўшы гэтак увесь вагон, брыгадзір выходзіць у тамбур.

Праваднііца з відавочным здавальненнем кажа:

— У мяне, таварыш начальнік, заўсягды паўнюткі парадачак!

Нічога не адказаўшы ёй, брыгадзір ідзе ў наступны вагон.

Выстукваюць на стыках рэек сваю аднастайную песню колы вагонаў.

І вось перад намі купэ шостага вагона, плацкартнага. Пасажыраў тут небагата. Каля акна сядзіць Наталля Пятроўна — мажная, яшчэ зусім не старая жанчына. Побач з ёю на лаўцы — мноства пакупкаў і пакупачкаў. Насупроць жанчыны, з правага боку ад акна, прымасціўся на сваёй лаўцы мужчына ў вайсковым кіцелі. Ён такога ж прыкладна веку, як і Наталля Пятроўна. Нам адразу кідаюцца ў вочы яго вусы — не заўважыць іх проста немагчыма. Яны ў яго надзвычай доўгія, а канцы іх натапыраны ўгору; такія вусы гадавалі тэлеграфісты ў канцы мінулага стагоддзя. На верхняй лаўцы ляжыць Ліда — маладая і вельмі прыгожая дзяўчына. Яна чытае кнігу.

А болей у купэ нікога і няма. Але, толькі трох чалавек звёў лёс у чацвёртым купэ шостага вагона скорага

поезда, які пагодлівай чэрвеньскай раніцай імчаў з Масквы ў Мінск.

Мужчына паглядзеў у акно, потым перавёў позірк на суседку.

— Мадам, вы заўважылі? Ніякай, прабачце, гармоніі на гэтым участку не відаць. Ну проста абсалютна ніякай гармоніі.

— Вы, безумоўна, маеце рацыю,— адразу і ахвотна азвалася Наталля Пятроўна.— Сапраўды, ніякай гармоніі.

— А вы як лічыце? — звяртаецца вусач да Ліды.

Лідзін твар схаваны ад вусача за кнігай. Але мы бачым яго: на ім вясёлая і нават крыху гарэзлівая, а мо і кплівая, усмешка.

— Хіба я асмелюся пярэчыць супроць вашай такой цікавай і надзвычай слушнай думкі?

Мужчына не ведае, як яму рэагаваць на Лідзіны словы. Ён памкнуўся нешта сказаць, але так і не сказаў нічога.

Да яго звяртаецца Наталля Пятроўна:

— Прабачце, а можа, вы паможаце мне зняць чамадан?

— З найвялікшай прыемнасцю,— узрадаваўся мужчына.— Але ж, здаецца, яшчэ рана вата?

— Не, нічога.

Мужчына бярэ з багажніка чамадан,— стаўляе яго побач з Наталляй Пятроўнай. Тая зірнула на астатнія свае рэчы, пералічыла іх адпымі губамі і манументальна застыла.

— Вы ведаеце, вам дужа пасуе гэты гарнітур. Асабліва кофтачка,— кажа праз нейкі момант мужчына.— Блакітны колер так гарманіруе... Ну проста абсалютная гармонія!

— Няўжо? — ажвавела Наталля Пятроўна і зачырванелася.

— Прабачце, вы не ў ГУМе яе бралі?

— Што вы! Гэта рэч замежная.

— Чэхаславацкая, напэўна?

— З адной капіталістычнай краіны,— падкрэсліваючы кожнае слова, прамовіла Наталля Пятроўна.

Мужчына аж прысвіснуў.

— Я дастала яе зусім выпадкова. Уявіце сабе, мне ўдалося пазнаёміцца з жонкай аднаго маскоўскага перакладчыка. Ён надзвычай лёгка перакладае з новазеланд-

скай мовы. Згадзіцеся, што мне страшэнна пашанцавала. Сапраўды, гэты блакітны колер...

— Э, а вось у жанок перакладчыкаў са старагвінейскай мовы яшчэ і не тое бывае,— з самым сур'ёзным выглядам кажа са сваёй верхняй лаўкі Ліда.

Адчыняюцца дзверы. У купэ зазірае брыгадзір поезда. З-за яго пляча відзён твар праваднiцы.

— У вас тут чацвёра? — пытаецца брыгадзір.

— Трое. Ад самай Масквы едуць,— адказвае праваднiца.

— І больш нікога няма? — азіраючы купэ, кажа далей брыгадзір.

— Як бачыце,— адказвае Ліда.

— У Слаўным ніхто не садзіўся?

— Здаецца, не...— разгублена вымаўляе Наталля Пятроўна і таксама азірае ўсё купэ.

Брыгадзір пільна паглядзеў на яе, паціснуў плячыма і падаўся з купэ.

— Каго-небудзь шукаюць? — спалохана пытаецца Наталля Пятроўна ў праваднiцы.— Можа, шпіёна?

— Ды не, нічога асаблівага,— кажа праваднiца.— Вам білецікі патрэбны?

— А як жа ж! — заяўляе мужчына.— Мы ж камандзіровачныя, а не абы-хто.

Аддаўшы білет мужчыне, праваднiца звяртаецца да Ліды:

— А вам, даражэнькая?

— Не ведаю...

— Бярыце, бярыце! — кажа мужчына.— І квітанцыю пасцельную таксама вазьміце. Усё чыста да справаздачы трэба прыкласці. От таварыш ведае,— ківае ён у бок Наталлі Пятроўны.

— Мне не патрэбен,— заяўляе Наталля Пятроўна.

Не збаўляючы хуткасці, поезд імкліва ляціць наперад, на зыркі і вабны агеньчык светафора чарговага блок-участка.

На паравозе ўсё ідзе сваім парадкам. За правым крылом — машыніст Беражкоў, за левым — яго памочнік Наўроцкі, а на тэндэры — качагар Мікола Хвошч.

Дазвольце вам сказаць, грамадзяне пасажыры, што вы зусім не ведаеце, што гэта такое — стоячы за правым крылом лакаматыва і трымаючы руку на рэверсе, усёй сваёй істотай адчуваць, як машына ўсё набірае і набірае

хуткасць, а вачыма, скіраванымі наперад, рабіць у гэты час адно адкрыццё за другім: бачыць то неабсяжнае жытняе поле, то стромкі сасновы лес, а то ціхае блакітнае азярко з натхнёнаю постаццю вудзільшчыка на беразе, а тады зноў поле, спрэс залітае шчодрым чэрвеньскім сонцам...

Або, знаходзячыся за левым крылом, імклівым рыўком адчыніць дзверцы топкі і, убачыўшы, як у яе пашчы шалее асляпляльна-белае полымя, узяць шуфель і пачаць рытмічна кідаць у тую прагную, ненажэрную пашчу чорны сыпкі вугаль, порцыю за порцыяй...

Або, узлезшы на тэндэр і азірнуўшыся назад, замерці і пачаць пільна ўслухоўвацца ў меладычны перастук вагонных колаў, што даўжэзным цугам бягуць за паравозам, стараючыся нізавошта не адстаць ад яго...

Не, грамадзяне пасажыры, вы не ведаеце, што гэта такое!

А гэта — сама паэзія.

І любы паравознік скажа вам, што менавіта так яно і ёсць.

...Імчыцца поезд.

— Бачу зялёны! — выгукнуў Васіль.

— Правільна, зялёны! — здаволена пацвердзіў Андрэй.

Так, наперадзе зырка гарэў зялёны агеньчык уваходнага светафора чарговай станцыі. Зялёны колер — самы прыемны і жаданы для чыгуначніка. Ён кліча толькі наперад, у дарогу, і вымаўляць гэтае слова — зялёны — заўсёды хочацца з нейкай асаблівай мяккасцю і цеплынёю.

Мікола зноў пачынае пералапачваць вугаль. Але нешта прымушае яго выпрастацца і зірнуць назад, уздоўж саставу. І тады ён раптам заўважае на даху першага вагона нейкага хлопца.

Гэта — Генадзь. Калі меркаваць па ягонай паставе, Генадзь не адчувае аніякай нязручнасці ад такога спосабу язды. Ён ляжыць на спіне, паклаўшы рукі пад галаву, і бесклапотна, а можа, нават і летуценна глядзіць на неба.

— Гэй, ты! — крычыць Мікола.— Чаго ты тут?!

Генадзь прыўзнімае галаву. Нейкую хвіліну ўзіраецца ў Міколу.

— Прывітанне і шчырае віншаванне рабочаму класу! — раптам весела кажа Генадзь і шырока ўсміхаецца.— Спадзяюся, што мы будзем у Мінску своечасова?

Мікола міжволі таксама пачынае ўсміхацца.

— Бач ты яго, пасажыр які патрабавальны. Ты як тут апынуўся? А ну, давай!..

— Звычайна, па лесвіцы,— спакойна адказвае Генадзь.— У вагоне, сам ведаеш, такая духмень, што не дыхнуць. А тут — ветрык і не дужа пыльна. Дый мухі не кусаюць. Вельмі добра, далібог не маню.

— От я табе пакажу зараз гэтае «добра»! — злуецца Мікола.— А ну, кацiся адсюль!

— Гэта куды ж? — з ранейшым спакоем кажа Генадзь.— Пад колы, ці што? Не чакаў я, прызнацца, такога хамства ад цябе. Няўжо ты не ўдзельнічаеш у спаборніцтве за культурнае абслугоўванне пасажыраў?

— Я цябе зараз абслужу!

Тады Генадзь устае і выпростваецца на даху на ўвесь рост. I з выглядам чалавека, пакрыўджанага ў сваіх самых найлепшых пачуццях, адварочваецца ад Міколы.

Поезд імчыць і імчыць наперад.

А наперадзе — мост. Там чыгуначную магістраль перакрыжоўвае аўтастрада. Праз колькі імгненняў поезд будзе пад гэтым мостам.

Мікола інстынктыўна азіраецца. Яго твар бляднее.

— Кладзіся! — не сваім голасам крычыць ён Генадзю.

Але Генадзь не звяртае на гэты крык аніякай увагі.

Тады Мікола скача з тэндэра на вагон. Імгненне — і ён ужо каля Генадзя. Схапіўшы хлопца за плечы, Мікола разам з ім прыціскаецца да даху.

I ў гэты момант над імі праносяцца бэлькі бетоннага моста.

Толькі цяпер пачынае разумець Генадзь, ад якой небяспекі ўратаваў яго Мікола. Лежачы пад Міколам, ён з нейкім новым выразам на твары ўзіраецца ў хлопца.

Да іх з паравоза даносіцца голас Андрэя Беражкова:

— Што там такое, Мікола?

— Ды от... зайца злавіў...

Мікола ўстае. Устае і Генадзь. Першае яго жаданне — саскочыць з вагона, знікнуць. Але поезд ляціць са страшэннай хуткасцю...

Нейкі час Генадзь і Мікола стаяць, бы застылыя, тварам адзін да аднаго. Чамусьці зрабілася надзвычай ціха. Толькі выстукваюць нешта сваё колы па стыках рэек, але і гэтыя гукі даносяцца нібы аднекуль вельмі здалёку.

— Давай гэтага зайца сюды,— кажа Андрэй.— Паглядзімо, з якога ён лесу.

Мікола і Генадзь сышлі ў паравозную кабіну.

Андрэй толькі на момант адвёў позірк ад глядзельнага акна. Пільна зірнуўшы на Генадзя, ён зноў глядзіць наперад, на дарогу.

— Бачу жоўты,— кажа Васіль.

— Але, жоўты,— пацвердзіў Андрэй і паклаў руку на рэгулятар.

— Цяпер будзе Барысаў? — пытаецца Генадзь.

— А табе іменна Барысаў і патрэбен? — не паварочваючыся да Генадзя, у сваю чаргу спакойна пытаецца Андрэй.

— Э, не... Мне патрэбна сталіца. А арматуру, братцы, вы здорава надраілі. Рэверс ого як зіхаціць!

— Нават і пра рэверс ведае! — здзіўляецца Васіль.— То, можа, ты паравознік?

— Не, не зусім...— неяк няпэўна адказвае Генадзь.

Андрэй яшчэ раз зірнуў на яго.

— Кажаш, табе патрэбна толькі сталіца? І што ж — здалёк ты шыбуеш да яе?

— Здалёк. Хоць у мастацкай літаратуры тыя мясціны завуцца чамусьці «мясцінамі не вельмі аддаленымі».

Мікола і Васіль утаропіліся на Генадзя. Зноў зірнуў на хлопца і Андрэй.

— З турмы?..— здзіўляецца Васіль.

— Навошта гэтак груба — з турмы... Не, не з турмы, а з дома адпачынку, дзе папраўляюцца людзі, толькі і ўсяго.

Паравознікі ўжо з большай цікаўнасцю аглядаюць Генадзя.

— Ну і як — направілі цябе там? — з недаверам пытаецца Васіль і машынальна бярэцца рукою за кішэню пінжака.

— Па-мойму, не. Хоць трэба праўду сказаць — яны здорава стараліся. Мне было часамі нават шкада іх.

Поезд прагрукацеў на стрэлках і, сцішаючы ход, пачаў набліжацца да станцыі.

— Чаму ж ты зайцам едзеш? — пытаецца далей Васіль.— Грошай жа табе, напэўна, далі на дарогу?

Генадзь усміхнуўся.

— Хіба то грошы?! Не ведаеце вы, маладыя чалавек, што такое сапраўдныя грошы.

— А ты ведаеш?

— Я — ведаю! — запэўнівае Генадзь.

— Чаго ж ты маршрут перамяніў? — у сваю чаргу пытаецца Андрэй.— Хіба ў Слаўным работы няма?

— Чаму няма? Ёсць. Але мне тая работа не падыходзіць.

— Думаеш, у Мінску лягчэй будзе?

— У мяне там свой клопат ёсць.

— Клопат? — перапытвае Андрэй.

— Чалавека аднаго знайсці трэба. Даўжок за ім лічыцца.

— І многа ён табе вінен?

— Нямала. Цэлае жыццё.

Паравоз апошні раз дыхнуў параю і замёр.

— Ну, хто з вас мяне павядзе? — пытаецца Генадзь і пазірае па чарзе на Беражкова, Наўроцкага, Хвашча.

— Павядзе? — здзіўляецца Андрэй.— Гэта куды ж?

— Вядома куды. У міліцыю. Напэўна, ты, га? — звяртаецца Генадзь да Міколы.

Мікола маўчыць. Маўчаць і астатнія. Чуваць толькі шум інжэктараў, якія зацята пампуюць ваду ў кацёл.

Раптам Андрэй пытаецца ў свайго качагара:

— Мікола, ты не ведаеш, колькі каштуе білет адсюль да сталіцы рэспублікі?

— Глупства, адзін рубель і сорак капеек,— замест Міколы адказвае Генадзь.

Андрэй вымае з кішэні бумажнік.

— Во, рубель у мяне ёсць. А ну, хлопцы, у каго яшчэ што знойдзецца?

Васіль паспешліва кажа:

— У мяне, ці паверыце, ані няма.

— А ў цябе, Мікола?

— Нешта павінна быць. Ага, во якраз хопіць.

Андрэй дае свой рубель Міколу. Кажа да Генадзя:

— Разбагацееш,— вернеш.

Генадзь пільна зірнуў на Андрэя, хацеў нешта сказаць, але Андрэй ужо загадвае Міколу:

— Адна нага тут, другая там! Хуценька!

Мікола адразу зразумеў Андрэя. Ён ківае галавой і злазіць з паравоза.

Андрэй і Васіль таксама злазяць: адзін — на правы бок, другі — на левы.

Генадзь астаецца ў кабіне адзін. Сумеўшыся, ён колькі хвілін стаіць нерухома, зусім не ведаючы, што яму цяпер рабіць. Пастаяўшы гэтак, выглянуў у правае акно. Каля

колаў пачага корпаецца з гаечным ключом машыніст. Генадзь пераходзіць на левы бок кабіны і таксама выглядае ў акно. Унізе памочнік машыніста запраўляе буксу. На Генадзя ўсе нібы і забыліся.

Тады ён пачынае аглядаць кабіну. Пакратаў рукою манометр, скорасцемер, вадамернае шкло. Потым сеў на крэсла машыніста. Паклаў руку на рэверс, зусім так, як гэта рабіў Андрэй Беражкоў.

У гэтай паставе яго і застаў Андрэй, калі падняўся ў кабіну. Адчуўшы Андрэеў позірк, Генадзь падхопліваецца і прымае свой ранейшы абыякавы да ўсяго выгляд.

На пероне Мікола цягне за сабой Генадзя, які ідзе не вельмі ахвотна.

— Хадзем, хадзем, пасажыр! Між іншым, я Мікола. А ты хто?

— А я Генадзь Максімавіч,— паважна кажа хлопец. Пасля, скасавурыўшы вочы на Міколу, дадае паблажліва: — Але ты, на выпадак, можаш зваць мяне Генкам.

— Дзякую,— іранічна ківае Мікола.

Насустрач ім ідзе брыгадзір поезда. Яшчэ здалёк ён кажа да Міколы:

— Адкуль ты яго зняў, гэтага бэйбуса?

Мікола, не прыпыняючыся, паказвае брыгадзіру білет.

— У нас шосты вагон. Дзевятнаццатае месца.

Мікола і Генадзь ідуць далей.

Брыгадзір нездаволена кідае наўздагон:

— А яшчэ дружыннікі...

Генадзь павярнуў галаву, злосна зірнуў на брыгадзіра.

З акна свайго купэ Ліда бачыць Міколу і Генадзя, якія ідуць па пероне. Генадзь чамусьці прыпыняецца.

— Паслухай, Мікола, чаго гэта вы ўзяліся камандаваць мною?

— Хадзем, хадзем,— лагодна кажа Мікола і зноў цягне Генадзя.

Праз колькі крокаў той зноў прыпыняцца.

— Падумаеш, праявілі чуласць! Дабрадзеі знайшліся! А я, можа, пляваць хацеў на вашу чуласць, ясна? І на ўсіх вас таксама. Ясна?

Тады прыпыняецца і Мікола. Ён абураны.

— Ну, от што, Генадзь Максімавіч! Выбрыкі свае ты лепш пакінь. Яны тут нікому не патрэбны. Хочаш ехаць па-людску — едзь. Не хочаш — каціся к чортавай матары!

Генадзь сумеўся. Відаць, ён не чакаў такога ад Міколы. Махнуўшы рукою, ён прымірэнча кажа:

— Калі табе так ужо хочацца... Ладна, давай білет. У нас які вагон?

— Шосты. Хадзем, а то...

У трэцяе купэ шостага вагона паважна ўваходзіць Генадзь. Цяпер тут толькі Ліда і мужчына з адмысловымі вусамі. Наталлі Пятроўны няма, яна некуды пайшла.

Зазірнуўшы ў білет, Генадзь шукае вачыма сваё месца. Знайшоў. Яно на верхняй лаўцы, насупраць Лідзінай лаўкі.

— Я рад вітаць вас, грамадзяне пасажыры, з таго выпадку, што мы паспяхова прыкацілі ў Барысаў,— весела кажа Генадзь.— Наогул, наш поезд ідзе дакладна па графіку. І надалей будзе ісці ў гэткім плане. Я не маню, мне толькі што давялося мець гаворку на гэтую тэму з паравознай брыгадай.

— Вельмі прыемна,— гэтак жа весела адказвае Ліда.— А то мы тут сумняваліся, як яно будзе.

Вусаты мужчына падазрона агледзеў Генадзя, але нічога не сказаў. Толькі адно падсунуўся бліжэй да свайго чамадана.

Генадзь палез на сваю лаўку. І лёг там у той самай паставе, што і на вагонным даху.

— Прыемна ехаць у прыемнай кампаніі,— надаючы свайму голасу паважнасць, кажа Генадзь.— Хоць ёсць з кім абмяняцца думкамі, а гэта вельмі неабходна ў дарозе. Вы масквічка?

— Ага,— ахвотна адказвае Ліда. Ёй нечым падабаецца гэты гарэзлівы хлапчына.

— А я са Слаўнага.

— Не чула.

— У адпачынак чэшаце?

— На работу.

— Не зайздрошчу. На вашым месцы я б цяпер падаўся на Каўказ. Туды, дзе Лермантаў траха не ўкакошыў гэтага фраера Мартынава.

— Лермантаў нават не паспеў стрэліць.

Генадзь выпяў з кішэні пачак «Беламора». Задумепна кажа:

— От то-та ж, што не паспеў... Вы дазволіце закурыць?

— Калі ласка.

Генадзь закурвае, зацягваецца дымам. І раптам мяняецца з твару. Прасачыўшы за ягоным позіркам, Ліда бачыць: Генадзь на ўсе вочы глядзіць па Наталлю Пятроўну, якая толькі што адчыніла дзверы ў купэ. Генадзеў позірк пейкі дзіўны, нібы збянтэжаны, а хутчэй за ўсё злоспы. У ім нават выразна відаць нянавісць.

Наталля Пятроўна таксама зірнула на Генадзя. І яна заўважыла яго дзіўны позірк. Пацісгуўшы плячыма, Наталля Пятроўна спакойна падалася на сваё месца. Падобна на тое, што яна ўпершыню бачыць Генадзя.

— Тут прадаюць абсалютна цудоўныя агуркі,— кажа Наталля Пятроўна да мужчыны.— Вы толькі пакаштуйце! Гэта ж мара, а не агуркі. Ад іх адарвацца нельга.

Мужчына галантна памагае Наталлі Пятроўне пакласці яе пакупкі на столік.

— З прыемнасцю, Наталля Пятроўна, з прыемнасцю пакаштую,— кажа ён, дэманстратыўна павярнуўшыся спінай да Генадзя.— У нас з вамі абсалютна блізкія густы, тут няма ніякага сумнення.

Тым часам Генадзь злазіць са сваёй лаўкі. Так, твар у яго палае нянавісцю. І калі Генадзь зноў пачынае гаварыць, голас ужо зусім не той — ён цяпер пейкі халодны, з металічнымі ноткамі.

— Пайду лепш пакуру ў калідоры. Шчасліва аставацца, грамадзяне пасажыры.

Моцна бразпуўшы дзвярыма, Генадзь выходзіць.

Усе ў купэ са здзіўленнем паглядзелі яму ўслед.

Зноў шыбуе поезд па сярэбраных рэйках у сонечную смугу далечы.

На паравозе — усе на сваіх месцах. За правым крылом, як і звычайна,— Андрэй. За левым — Васіль. Побач з ім стаіць Мікола. Абапёршыся на шуфель, ён глядзіць у расчыненыя дзверы кабіны і летуценна ўсміхаецца.

Прамільгнула хатка пуцявога абходчыка. Праскочыў высозны разгалісты дуб. З'явіўся і адразу знік стары, пачарнелы ад часу вятрак. Пасля наблізіўся і імкліва пабег назад рэдкі невысокі хмызняк.

І от насустрач поезду ўжо ляціць горад-казка, горад-легенда, горад-песня — Мінск.

Добры дзень табе, родны і любы мой кут. Чуеш, як сардэчна вітае цябе залівісты паравозны гудок?..

— До-о-обры-ы-ы дзе-е-ень!

І колы выстукваюць тое самае:

— Добры дзень! Добры дзень! Добры дзень!

Людзям падабаецца сустракаць адно аднаго. Гэта не тое што праводзіць. Праводзіны выклікаюць смутак, пасяляюць у душы трывогу і часам кладуцца невыносным болем на ўсё жыццё. Затое сустрэчы — іншая справа. Яны прыносяць здзяйсненне надзей, здымаюць цяжар чаканняў, а нярэдка звальваюцца на чалавека проста ашаламляльным шчасцем.

Але, шчаслівы той, каго ёсць каму сустракаць!

На пероне ў Мінску было людна. Стракацелі жаночыя сукенкі, іх было відавочна больш, чым мужчынскіх гарнітураў. Пярэсціліся кветкі, яны былі найбольш у руках маладых людзей. Лунаді ў паветры капелюшы, хусцінкі. Было тлумна, як і заўсёды на вакзалах. Людзі штосьці выкрыквалі, некага звалі, з кімсьці спрачаліся.

Уздоўж натоўпу павольна праплыў паравоз. Потым прасунуліся вагоны з пасажырамі ў вокнах і праваднікамі ў тамбурах.

На падножцы шостага вагона стаіць Генадзь. Сустракаць яго ў Мінску не было каму, і Генадзь, не чакаючы, пакуль поезд прыпыніцца, саскоквае на хаду.

Поезд нарэшце прыпыняецца. Да вагонаў кідаюцца людзі. Сярод гэтых людзей вылучаецца невысокі лысаваты чалавек у белым часучовым касцюме. Чалавек шукае вачыма некага ў вокнах вагонаў. Знайшоў і кідаецца да шостага вагона.

З вагона тым часам выходзіць Наталля Пятроўна ў суправаджэнні мужчыны з незвычайнымі вусамі. Мужчына кажа:

— Я дужа раю вам прачытаць Мантэск'е. Шарля Мантэск'е. Вы будзеце мець невыказную асалоду. Дужа раю.

Да іх падыходзіць невысокі лысы чалавек. Так, гэта муж Наталлі Пятроўны — Іван Харытонавіч Рахуба.

Мужчына з вусамі адразу ж рэціруецца.

— Мамусік, бачыш, я здагадаўся, што ты прыедзеш

менавіта сягоння,— кажа Рахуба і цалуе Наталлю Пятроўну ў шчаку.

— Але, сягоння. Бо ў мяне заўсёды абсалютная гармонія,— заяўляе Наталля Пятроўна.

Непрыкметна і моўчкі, нікім не сустрэтая, выходзіць з вагона Ліда. Вось яна параўнялася з Генадзем. І тады заўважыла, што Генадзь на ўсе вочы глядзіць на Наталлю Пятроўну, а дакладней — на яе паважнага лысага мужа. Генадзеў твар аж скрывіўся ад злосці і нянавісці. Здаецца, ён вось-вось кінецца на Рахубу.

Ліду бярэ цікаўнасць, і яна прыпыняецца.

Па першым пуці, кіруючыся ў дэпо, павольна праходзіць паравоз Андрэя Беражкова. Узіраючыся ў натоўп, Мікола раптам убачыў Генадзя. Ён нават узрадаваўся.

— А вунь наш пасажыр!

Падумаўшы, Мікола кажа да Андрэя:

— Я збегаю да яго, можна? Я хуценька.

Андрэй кіўнуў галавой.

Мікола саскочыў з паравоза і кінуўся ў натоўп.

З чамаданамі ў абедзвюх руках і з пакункамі пад пахамі Рахуба разам з жонкай ідзе да выхада ў горад. І Генадзь рушыць за імі. Хлопцам валодае нейкая адчайная рашучасць.

Рахуба, цяжка дыхаючы, кажа жонцы:

— Ты вельмі дарэчы прыехала, мамусік. Ведаеш, у нас заўтра вылазка на возера. Абяцаюць нешта грандыёзнае.

— Зноў з паравознікамі? — паморшчылася Наталля Пятроўна.

— У нас будзе свая кампанія. Я запрасіў Паўла Арцёмавіча.

У натоўпе Генадзя шукае Мікола. Яго пазнае Ліда. Яна здагадваецца, каго той шукае.

— Вы, напэўна, гэтага... шукаеце?..

— А? — Мікола павярнуўся на Лідзін голас. І, уражаны яе маскоўскім выглядам і прыгажосцю, сумеўся.— Ён тут недзе быў...— пачаў мармытаць Мікола. Пасля запытаў ужо смялей.— А вы таксама з нашага поезда?

— Ён туды пайшоў, да выхада ў горад,— не адказваючы на Міколава пытанне, кажа Ліда.— Дзіўны ён у вас нейкі.

Мікола стаіць слуп слупам і адно глядзіць на Ліду.

— Вы не скажаце, як мне трапіць ва ўпраўленне чыгункі? — пытаецца Ліда.

— Ва ўпраўленне? — перапытвае Мікола, а сам думае пра нешта іншае і таму не адказвае на пытанне.

— Не ведаеце?

Мікола нарэшце ачнуўся.

— Ва ўпраўленне? А от выйдзеце на плошчу, потым пройдзеце па вуліцы Кірава, а там дойдзеце да вуліцы Леніна і якраз трапіце ва ўпраўленне.

— Дзякую вам.

Мікола ўжо зусім забыўся на Генадзя.

— А вы, можа, працаваць да нас на чыгунку?

— Але.

— Чаму ж вас ніхто не сустракаў?

— Будзем лічыць, што от вы і сустрэлі,— усміхнулася Ліда.— Аднак свайго прыяцеля згубілі.

— Згубіў...

Рахуба і яго жонка выходзяць на Прывакзальную плошчу.

За імі, крыху воддаль, цікуе Генадзь.

Іван Харытонавіч і Наталля Пятроўна падыходзяць да бэжавага «Масквіча», што стаіць непадалёк ад стаянкі таксі. Генадзь насцярожваецца.

А Іван Харытонавіч і Наталля Пятроўна ўжо залезлі ў «Масквіча». Ляснулі дзверцы, і машына кранулася.

Генадзь ірвануўся быў за ёю, але, зразумеўшы, што з гэтага нічога не выйдзе, прыпыніўся і разгублена паглядзеў вакол сябе. Ніхто не звярнуў на яго ўвагі, ніхто нават не заўважыў яго.

А Мікола ў гэты час ускочыў ужо на паравоз, і той адразу пабег у дэпо.

— Дык дзе ж твой пасажыр? — пытаецца Андрэй.

— Уцёк некуды.

— Як жа гэта атрымалася?

— Ды от так і атрымалася...— няпэўна адказвае Мікола. Пасля, памаўчаўшы, кажа да Васіля: — А ведаеш, між іншым, каго мы прывезлі ў Мінск?

— Ведаю,— флегматычна адказвае Васіль.— Пасажыраў, во каго.

— Нічога ты, братка, не ведаеш,— загадкава ўсміхнуўся Мікола.

— Я нават скажу табе колькі. Пяцьсот сорак шэсць душ. Якраз столькі прадаюць білетаў на наш поезд.

— Мы прывезлі скарб, Вася. Вось што мы прывезлі.— Мікола ўсміхнуўся зноў.— Ах, які гэта скарб, Вася! Каб ты толькі ведаў! Каб ты толькі бачыў!

Андрэй, не паварочваючыся, пільна прыслухоўваецца да таго, што кажа Мікола.

— Ясна,— канстатуе Васіль.— Я трачу аднаго са сваіх сяброў. Ён мяняе прафесію — ператвараецца ў шукальніка скарбаў. Тых самых скарбаў, што з ямачкамі на шчочках...

Мікола памаўчаў. Пасля задуменна кажа:

— От жа ж бывае так... Стрэнеш выпадкова чалавека, зусім выпадкова... а западзе ён табе ў сэрца чамусьці назаўсёды. Так і панясеш яго ў сваёй памяці. Быццам і ніхто ён табе, проста так, першы стрэчны, а чамусьці забыць яго не можаш...

Андрэй уважліва прыслухоўваецца да Міколавых слоў.

— Стрэнеш от так — а яго ўжо і няма,— кажа далей Мікола.— Знік ён, прапаў. І невядома, ці напаткаеш яго яшчэ хоць калі-небудзь...

Здаецца, што гэтыя Міколавы словы нейкім чынам адпавядаюць Андрэевым думкам. На твары ў Андрэя, як і ў Міколы, з'яўляецца такая ж самая задуменнасць і нават нібы загадкавасць.

— Часцей за ўсё — не...— ціха, нібы толькі самому сабе, кажа Андрэй.— Не напаткаеш...

Васіль разумее, што гаворка ідзе зусім не пра таго хлопца, якога яны прывезлі ў Мінск. Але знарок кажа:

— Жэўжык ён, от хто.

Андрэй схамянуўся.

— А па-мойму, ён слаўны.

— Слаўныя ў турмах не сядзяць.

— У жыцці ўсяляк бывае. Бывае, што і добры чалавек спатыкаецца.

— У міліцыю яго трэба было здаць, от што. А то якія ж мы дружыннікі.

У размову ўключаецца Мікола:

— А калі дружыннікі, дык што — хапай і не пушчай, так?

— Хапай, бо мы памочнікі міліцыі,— самаўпэўнена кажа Васіль.— Мы павінны папярэджваць злачынствы, а не патураць ім.

— Яно, вядома, лягчэй за ўсё — кожнага падазронага за краты,— заўважае Андрэй.

— Ат, не будзем сварыцца праз першага стрэчнага,— махнуў рукой Васіль.

Андрэй ужо на тэрыторыі дэпо прыпыняе паравоз і злосна кажа да Васіля:

— От што, Васіль, ты лепш ідзі з дружыны. Работа гэтая зусім не для цябе.

І Андрэй першы пакідае паравоз і ідзе да нараднай. Васіль сумеўся. Перачакаўшы, таксама злазіць з паравоза.

— Быццам муха яго якая ўкусіла...

— Дык жа ж ты глупства вярзеш,— кажа Мікола.

— Не, тут нешта не тое,— заяўляе Васіль.— Не паверу я, што Андрэй праз гэтага шчанюка ўскіпеў. Ён наогул пасля таго, як з'ездзіў у адпачынак, нейкі зусім іншы стаў. Усё думае пра нешта. Або пра некага.

Гэтым летам мінчане асабліва праглі вады і ценю. Там, дзе была хоць якая вада, заўсёды былі людзі. Некаторыя ездзілі на штучнае возера, што ўзнікла яшчэ перад вайной за Старажоўкай і зрабілася ўжо абжытым і прывычным месцам адпачынку. Сёй-той адважваўся выбірацца нават на Нарач, у гэтае блаславёнае царства харасва, дзе пачалі ўжо з'яўляцца дамы адпачынку і індывідуальныя дачы. А большасць аддавала перавагу Ждановічам, дзе нядаўна разлілося цудоўнае мора, створанае рукой чалавека.

Асабліва людна тут бывае ў нядзелю. Берагі мора ў гэты дзень з самае раніцы і да позняга вечара спрэс усеяны купальшчыкамі.

Здаецца, Генадзь толькі тым і заняты, што без усялякай мэты швэндаецца сярод адпачываючых мінчан. Павольна, не спяшаючыся, ідзе ён па беразе, лянива пазіраючы то налева, то направа, то на ваду, а то ў кірунку прыбярэжнага хмызняку.

Але вось позірк яго прыпыняецца на некім. Гэта распасцёрся на пяску даволі грузны, з жыватом-гарою мужчына. Твар ягоны прыкрыт газетай. Генадзь прысеў непадалёк і пачынае назіраць за мужчынам. Праз колькі хвілін мужчына адкінуў газету і перавярнуўся на другі бок. Цяпер Генадзь бачыць яго твар.

Не, гэта не той твар, які патрэбен Генадзю.

Раззлаваны, Генадзь устае і ідзе далей.

Непадалёку ад берага ў цяньку бяроз прыладзіўся Андрэй Беражкоў з сям'ёй: жонкай Верай і сынком Віцем. Разам з імі і Мікола. Сюды яны прыехалі даўнавата, добра прагаладаліся і цяпер закусваюць. На траве перад імі разасланы абрус, на ім бутэлькі — з півам і фруктовай вадой — і ежа.

— Смачна? — пытаецца Беражкоў-малодшы, хлопчык дзетсадаўскага ўзросту.

— Угу! Проста не адцягнеш, у каго рот вялікі,— адказвае Беражкоў-старэйшы.

— А я вунь аладак напёк.— Віця паказвае на вылепленыя з пяску і раскладзеныя на траве «аладкі».

— Мы іх пакінем на пасля, добра? — кажа Вера.

— Не выдумляй, вы да іх і не дакранецеся. Ведаю я вас. Вы толькі ашукваеце маленькіх. Я пайду пагуляю.

— Толькі недалёка. І да вады не падыходзь.

— Добра, не буду.

Генадзь распрануўся і палез у ваду. Плаваў ён не блага і праз хвіліну быў ужо далёка ад берага. Спачатку ён паплыў у адзін бок, потым у другі. І ўсё прыглядаўся да людзей, што былі ў вадзе.

Нарэшце Генадзь вылез з вады, пабегаў трохі па беразе і лёг на пясок.

Так ляжаў ён даволі доўга. Сонца прыпякала мацней і мацней, і Генадзя пачало хіліць на сон. Ён, можа, і заснуў бы, але раптам схамянуўся, бо адчуў на сабе нечы позірк. Падхапіўшыся, Генадзь убачыў непадалёк хлопчыка. Той стаяў басанож, у адных толькі трусіках і глядзеў на Генадзя.

Генадзь падміргнуў яму і сказаў:

— Ну, чалавеча, дакладвай. Ты хто?

— Віця,— ахвотна адказаў хлопчык.

— Віця? — перапытаў Генадзь.— Не можа быць. Ты зусім не падобны на Віцю. Хутчэй за ўсё ты Джэк. Той самы Джэк, які пабудаваў дом. Той самы дом, у якім жыве...

— Не, я Віця,— перапыніў Генадзя хлопчык. І ў сваю чаргу спытаў: — А ты хто?

— А я Маныш-курбыш-аглы-маглы. Вось я хто.

Віця падумаў і сказаў:

— От ты якраз і не падобны.

Генадзь засмяяўся.

— Пачакай, я цябе зараз перакапаю.

Ён пайшоў да вады і хутка спаласнуў пясок з грудзей і спіны. Тады зноў падышоў да Віці. Цяпер хлопчык глядзеў на Генадзя, аж рот разявіўшы. Ад цікаўнасці ён, здавалася, нават і дыхаць перастаў.

Падставы для такой Віцевай цікаўнасці былі, і немалыя. Бо ўсё Генадзева цела — спрэс у татуіроўцы. Грудзі, жывот, ікры ног, плечы, спіна — усё ў Генадзя размалёвана, усюды былі фігуры і надпісы.

З гэтых ніколі не бачаных ім дзівосаў і не зводзіў вачэй Віця.

— Бачыш, я табе не маніў. Я якраз і ёсць Гладышбурчыш-бяжыш-маўчыш. Самы сапраўдны, а не які-небудзь там з кніжкі або з кіно. От я табе зараз цуд пакажу. Глядзі сюды. Толькі ўважліва глядзі.

Генадзь павярнуўся да Віці спінаю. Яна таксама ўся была разрысаваная. Але менавіта тут, бадай, і знаходзілася найвышэйшае дасягненне ўзнёслай фантазіі невядомага яшчэ чалавецтву мастака. На левай Генадзевай лапатцы была выкалата мышка, якая ў панічным страху бегла некуды на край свету, а на правай — яе страшны ганіцель — стракаты, з вялізнымі вусамі кот. Вось Генадзь нейкім асаблівым чынам варухнуў плячмі, і карціна адразу ажыла. Пабегла, робячы падскокі і зігзагі, ашалелая ад страху мышка, а за ёю паўгалоп панёсся раз'юшаны кот. Вось ён ужо амаль дагнаў сваю ахвяру, яму асталося толькі схапіць яе, але Генадзь раптам спрытна варухнуў левым плячом — і мышка ўжо далёка. Зноў пачалася пагоня, зноў паляцеў вусаты кот даганяць бедную мышку.

Так паўтаралася некалькі разоў. Кот то амаль даганяў мышку, то ўпускаў яе.

Не перастаючы спрытна шавяліць лапаткамі, Генадзь робіць тулавам нейкі паварот, і мышка раптам знікае з Віціных вачэй. Астаўся адзін кот — ён быццам застыў ад нечаканасці і здзіўлення.

— Яшчэ, яшчэ! — закрычаў Віця.— Пакажы яшчэ!

Здаволены эфектам, Генадзь павярнуўся да Віці. І раптам у яго ў самога шырока расплюшчыліся вочы. Ён бачыць, што ўдалечыні, пад трыма соснамі, стаіць бэжавы «Масквіч». Генадзь адразу забываецца на Віцю. Ён азірнуўся вакол і шпарка пайшоў да «Масквіча».

Мяркуючы па ўсім, у «Масквічы» зараз нікога няма. Генадзь падыходзіць зусім блізка да яго. Зазірнуў у машыну. Сапраўды, там не відаць нікога.

А гаспадары «Масквіча» цяпер на беразе, Генадзь ужо ўбачыў іх. Гэта Іван Харытонавіч Рахуба, яго жонка Наталля Пятроўна і іх знаёмы Павел Арцёмавіч. Генадзь пільна назірае за імі.

Здаецца, Рахуба прапануе сваёй кампаніі пакупацца. Вось яны ўсе разам, у купальных касцюмах, ідуць у ваду.

Каб знайсці больш зручнае месца для назірання, Генадзь таксама ідзе бліжэй да берага. Убачыў будку, дзе звычайна пераапранаюцца купальшчыкі, заходзіць за яе.

Адсюль яму вельмі добра ўсё відаць. Вось Рахуба падскочыў, нырнуў. Нешта доўга не паказваецца. Тады вынырнуў і паплыў ад берага. Наталля Пятроўна і Павел Арцёмавіч паплылі ў другім кірунку.

Да Генадзя зноў падыходзіць Віця.

— Пакажы яшчэ! Пакажы, пакажы мышку! — просіць ён.

— Адстань! — шэптам кажа Генадзь.— Цябе, напэўна, мама шукае. Бяжы адсюль, чуеш?

Аднак Віця і не збіраецца ісці. Яму тут дужа цікава, і ён падыходзіць яшчэ бліжэй да Генадзя.

Генадзь хацеў быў ужо крыкнуць на Віцю, але тут якраз з вады вылез Рахуба. Вылез, адфыркаўся і падаўся да сваёй машыны.

Яму трэба прайсці якраз міма будкі, каля якой замёр Генадзь. Каб не быць заўважаным, Генадзь абышоў будку і заскочыў у яе ў сярэдзіну. Аднак Рахуба замест таго, каб прайсці міма, як на гэта разлічваў Генадзь, нечакана таксама заходзіць у будку.

Генадзь адвярнуўся, пачынае надзяваць кашулю. Поплеч, цяжка дыхаючы, выціскае трусы Рахуба.

— Пасуньцеся крышку, малады чалавек,— кажа Рахуба. Ён павярнуўся і нечакана апынуўся тварам у твар з Генадзем.

Нейкую хвіліну ён моўчкі глядзіць на хлопца.

— Уцёк?..— панура пытаецца ён пасля.

— Вызвалілі,— гэтак жа панура адказвае Генадзь.— Датэрмінова.

Яны яшчэ памаўчалі.

— Та-ак...— прамовіў Рахуба і, пасопваючы, падаўся з будкі. Але тут жа спахапіўся, што ён без трусоў, і ху-

ценька вярнуўся назад. Не пазіраючы на Генадзя, пачаў нацягваць на ногі трусы.

Нацягнуўшы, дадаў, па-ранейшаму не пазіраючы на Генадзя:

— Будзем спадзявацца, што ты цяпер зразумеў, у які мы час жывём. Пабудова камунізма... і наогул. Трэба ўключыцца, значыць...

З нейкім новым, жорсткім выразам на твары Рахуба выходзіць з будкі.

Прыхіліўшыся да сцяны, Генадзь нейкі час стаіць, бы здранцвелы, не маючы сілы крануцца з месца.

— Ну пакажы, пакажы яшчэ! — моліць Віця.

Тады Генадзь рашуча выходзіць з будкі.

А насустрач яму ідзе Мікола. Ён якраз падаўся шукаць Віцю. Генадзь, заняты сваім, спярша не заўважае яго.

— Шкада табе, ці што,— просам просіць Віця.— Пакажы!

Узрадаваны нечаканай сустрэчай, Мікола хутка падыходзіць да Генадзя і Віці.

— Здорава цябе размалявалі! — зарагатаў Мікола.— От гэта дзіва дык дзіва! Відаць, дужа балюча было, га?

— Не тваё дзела! — сказаў Генадзь.— Чаго чапляешся? Хочаш, каб я за білет грошы аддаў?

— Ад цябе дачакаешся.

— Ну і каціся тады! А можа, хочаш правесці растлумачальную работу?

— Гэтага я не ўмею рабіць,— прызнаўся Мікола.

Генадзь пайшоў.

Мікола ўзяў Віцю за руку і пасунуўся побач з Генадзем.

Так яны прайшлі некалькі крокаў моўчкі.

— Ведаеш, Генка, на тваім месцы я паехаў бы дахаты,— пачаў потым Мікола.— Прападзеш ты тут, у Мінску.

— Ага, от і пачалася растлумачальная баланда,— паморшчыўся Генадзь.

— Ніякая гэта не баланда. Я табе дабра зычу.

— Няма мне чаго рабіць дома. Ды і дома ў мяне няма. Пусты ён.

— І нікога ў цябе няма наогул?

— Нікога.

— Ясна. У мяне, калі хочаш ведаць, таксама нікога

няма. У дзіцячым доме я вырас. Загінулі мае ў вайну. Твае таксама?

— Мае не ў вайну...— сумна сказаў Генадзь.

Генадзь прыпыніўся і сеў проста на пясок. Аказваецца, адсюль яму вельмі зручна назіраць за Рахубамі.

А тыя нечакана пачынаюць уносіць свае рэчы ў машыну.

Мікола паглядзеў на «Масквіча», на Рахубу і крыкнуў:

— Іван Харытонавіч, чаго вы так рана збіраецеся?

— Хопіць,— адказвае таксама гучна Рахуба.— Трэба ведаць меру.

— Наш доктар,— палічыў за патрэбнае паведаміць Мікола Генадзю.

— З чыгуначнай паліклінікі? — перапытаў Генадзь.

— Ага. Добры доктар.

Генадзь вымае папяросы, працягвае пачак Міколу.

— Я не куру,— кажа Мікола.— Мы ўсёй брыгадай кінулі. Любата!

Генадзь закурвае сам.

— Чаго ты ўсё ж такі падаўся іменна ў Мінск? — пытаецца далей Мікола.— Думаеш, тут лягчэй... гэта самае?..

— Ідзі ты!..— злосна кажа Генадзь; ён убачыў, што бэжавы «Масквіч» завурчаў і крануўся. Праз момант ён ужо знік.

Генадзь падняўся і шпарка пашыбаваў прэч.

— Куды ж ты? — кідае наўздагон яму Мікола.

— Ведаеш што, інтарэс свой ты пакінь,— з націскам кажа Генадзь.— Бо ўсё роўна нічога ў цябе не выйдзе. Чуеш?

Вера збірае Віцевы рэчы.

— Дзе ж гэта Віцька? — непакоіцца Андрэй.— І Мікола недзе прапаў.

— Нічога, Мікола яго знойдзе,— спакойна адказвае Вера.— Ведаеш, я ўзяла на сераду білеты ў кіно, май на ўвазе. На восем дваццаць, у «Цэнтральны». Ідзе «Песня першага кахання».

— «Песня першага кахання»? — перапытвае Андрэй. Ён задумаўся на хвіліну, потым кажа:— Цікава, а вось другое каханне — з песняй бывае ці часцей са слязьмі? Ты не ведаеш?

Вера кінула быстры позірк на мужа.

— Цябе гэтае пытанне вельмі хвалюе?

— З чыста тэарэтычнага пункту гледжання.

— Пракансультуйся ў каго-небудзь дасведчанага. Або яшчэ лепш — закахайся сам другі раз. Правер на ўласным вопыце.

— Ты дазваляеш?

— Дазваляю. Але з адной умовай. Дазваляю закахацца толькі ў аднаго чалавека. У мяне.

За рулём бэжавага «Масквіча» сядзіць Рахуба. Побач з ім Наталля Пятроўна. На заднім сядзенні — Павел Арцёмавіч.

Машына імчыцца па шасэ ў Мінск. Мінула Ждановічы і падлятае да трансфарматарнага завода. Наперадзе ў лёгкай смузе відзён горад.

Рахуба звяртаецца да Паўла Арцёмавіча:

— Паслухай, юрыдычная кансультацыя, дай мне даведку.

— Усё на дармаўшчынку хочаш,— дабрадушна ўсміхнуўся Павел Арцёмавіч.— Давай лепш баш-на-баш. Я табе даведачку, а ты мне язвачку.

Павел Арцёмавіч, здаволены сваім жартам, рагоча. Аднак твар у Рахубы вельмі сур'ёзны.

— Напрыклад, так. Вызвалілі, скажам, чалавека з турмы. А потым што з ім робяць?

— Як гэта, што? Спрыяюць. Уладкоўваюць, калі трэба.

— Куды ўладкоўваюць?

— Вядома, на працу.

— А прафілактыка дзе? У сэнсе, каб чаго не здарылася?

— Законам не прадугледжана.

— Дарэмна. Выходзіць, не трэба засцерагаць грамадства ад магчымых рэцыдываў?

— Вызвален — значыць, свабодны. І ўсё тут.

Як ні ўпарціцца Віця, але Мікола трымае яго за руку моцна. І падводзіць да таты і мамы.

— Ты чаго надзьмуўся? — пытаецца Андрэй.

— Я не надзьмуўся,— адказвае Віця.— Я раззлаваўся.

— На Міколу?

— На ўсіх вас. Вы мне заўсёды перашкаджаеце.

Андрэй запытальна паглядзеў на Міколу.

— Зноў я маху даў, Андрэй Сцяпанавіч. Сустрэў быў нашага пасажыра.

— Генку? Тут?

— Зноў ён уцёк ад мяне.

Віця дадае сваё:

— У яго кошка з мышкай, во!

— Доктарам нашым нешта зацікавіўся,— кажа Мікола.

Андрэй задумаўся.

— Хлопец на нешта нацэліўся...

Назаўтра дзень быў ужо не такі сонечны і не такі душны. Неба ахуталі аблокі, зрабілася пахмурна.

Можа, таму цемнавата і ў доўгім калідоры чыгуначнай паліклінікі, хоць усё тут — і сцены, і дзверы — пафарбавана ў белы колер.

Чалавек, які крочыць па калідоры, таксама ў белым. Побач з чалавекам тупае Генадзь.

— Як вы сказалі, малады чалавек? Рахуба?

— Ага, Рахуба,— падказвае Генадзь.— Ён тут?

— Адзін тут, а другога няма. Вы якога Рахубу маеце на ўвазе? Неўрапатолага?

Генадзь паціскае плячыма.

— Трэба, даражэнькі, дакладна ведаць, у каго будзеце лячыцца.

— Ён Іван Харытонавіч.

— А-а, тады гэта тэрапеўт. Але яго зараз няма.

— Няма?..— аж разгубіўся Генадзь.

— Ён на візітах.

— Шкада...— Генадзь падумаў і зноў пытаецца: — А вы, можа, яго хатні адрас ведаеце?

— Вядома, ведаю. Зараз я вам скажу.— Чалавек вымае запісную кніжку, гартае яе.— Во, у мяне тут запісана. Рахуба, Розы Люксембург, 200. Запомнілі?

— Ага, дзвесце.

— Цьфу, чорт, не дзвесце. Гэта я яму столькі ў прэферанс вінен. На старыя грошы, вядома...

У кабінеце начальніка міліцыі цяпер толькі адзін наведвальнік — Іван Харытонавіч Рахуба. Прысутнічае таксама ўчастковы міліцыянер.

— Сігнал, кажаце? — пытаецца начальнік міліцыі.

— Але, але, я ў сэнсе сігналу.

— Прыкметы? Якая на ім вопратка?

Рахуба сумеўся.

— Я яго... разумееце, голым бачыў.

— У паліклініцы, ці што?

— Не, на пляжы.

Адчыняюцца дзверы, і ў кабінет уваходзіць Андрэй Беражкоў. Здароўкаецца з усімі.

— Па справах дружыны? — пытаецца начальнік міліцыі.— Добра, прысаджвайся пакуль што.— І зноў звяртаецца да Рахубы: — Дык якія ж прыкметы? Напрыклад, рост?

Рахуба паднімаецца. Паказвае сабе на грудзі.

— От так, прыкладна. Да селязёнкі.

Начальнік міліцыі таксама ўзяўся за гэтае месца.

— А я думаю, што гэта ў мяне тут баліць. Выходзіць, селязёнка. Добра. Колер валасоў?

Рахуба памацаў сябе за галаву.

— На сабе ілюстраваць не рызыкую. Колер прыкладна спелага жыта.

— Вочы?

— Здаецца, блакітныя.

— Нябеснага, так сказаць, колеру? Дык гэта ж херувім нейкі палучаецца, а не злачынец. На мядзведніка не падобны. На дамушніка таксама. Наменклатура не тая.

— Не, ён наогул не злодзей,— паспешліва кажа Рахуба.

— Адкуль вы ведаеце?

— Не, я не сцвярджаю,— яшчэ больш паспешліва дадае Рахуба.

— Чым жа ён вас гэтак напалохаў?

— Не, не, вы зразумейце мяне правільна. Я ж у сэнсе сігналу. У сэнсе прафілактыкі. Ведаючы, што таварыш, так сказаць, сядзеў. За падпал.

— Добра, таварыш Рахуба, будзем мець на ўвазе.

Рахуба ідзе да выхада.

— Пачакайце, а адрас вы нам свой пакінулі? — Начальнік міліцыі зазірнуў у паперку, што ляжыць у яго на стале.— Ага, ёсць. Гэта той самы дом з флюгерам? Ведаю, ведаю. Твой участак,— кажа ён да міліцыянера.— Ну, бывайце. Заходзьце, калі што якое.

— Дзякую...

Калі за Рахубам зачыніліся дзверы, начальнік міліцыі спытаў у Андрэя:

— Лячыўся ў яго?

— Было.

— Палахлівы ў вас лекар. Пацыент яго нейкі трывожыць. Ці то недалячыў ён яго, ці то залячыў. Адным словам, з'явіўся ў горадзе з прэтэнзіяй. А гэты хоча, каб мы яго засцераглі... Ты чаго такі задуманы?

— Ды так, нічога...

— Ну, давай, што там у цябе.

— Я наконт графіка дзяжурстваў...

Позні вечар.

Генадзь снодаецца па вакзале. Падыходзіць да нейкай жанчыны, што сядзіць на канапе. Садзіцца побач. Жанчына паспешліва падсоўвае бліжэй да сябе клунак. Генадзь пазяхае, потым робіць выгляд, што ўбачыў недзе нейкага знаёмага і імкліва ідзе прэч.

У другой зале Генадзь заўважае буфет, за прылаўкам якога дрэмле прадаўшчыца. Генадзь ідзе да буфета. Выняў з кішэні манеты, пералічыў іх, уздыхнуў і паклаў назад.

Насупроць буфета знаходзіцца акенца, над якім напісана: «Бюро даведак». У акенцы відзён тварык маладой дзяўчыны. Гэта Вікторыя. Яна бачыць, як Генадзь падыходзіць да буфета, як ён лічыць грошы, як кладзе іх, уздыхнуўшы, назад. Зацікаўленая Вікторыя пачынае назіраць за Генадзем.

— Два «Беламоры»,— кажа Генадзь.— Хуценька.

Прадаўшчыца, яшчэ не прачнуўшыся як след, лянiва дае яму папяросы. Паклаўшы іх у кішэню, Генадзь запытальна глядзіць на прадаўшчыцу. Тая, у сваю чаргу, гэтак жа запытальна глядзіць на Генадзя.

— А рэшту? — кажа Генадзь.

— Хіба вы давалі грошы? — здзіўляецца прадаўшчыца і канчаткова прачынаецца.

— А хто ж вам даваў! Вунь тая палціна рэшкай — яна ж мая!

Прадаўшчыца разгубілася. Яна ўзяла са скрынкі манету, на якую паказаў Генадзь, хвіліну глядзела на яе, потым паклала назад. Зноў узяла і зноў паклала.

— Давайце рэшту, што ж вы! — пагрозліва сказаў Генадзь.

— Прабачце... калі ласка...

Генадзь узяў рэшту і спаважна пайшоў ад буфета. Але тут вочы яго сустрэліся з вачыма Вікторыі — яна здзіўлена і нават спалохана глядзіць на Генадзя.

Генадзь апусціў галаву, пакруціў у руках манеты, яшчэ раз паглядзеў на Вікторыю і раптам хутка павярнуўся і пайшоў да буфета. Знарок гучна сказаў:

— Ведаеце, шаноўная, а я ўспомніў! Адышоўся і раптам успомніў: не заплаціў. Праўда, не заплаціў за папяросы. Дык вось... вазьміце...

Калі Генадзь, аддаўшы грошы, пайшоў ад буфета, прадаўшчыца расчулена сказала да пасажыра ў акулярах:

— Вы толькі падумайце, які сумленны малады чалавек!

Генадзь не спяшаючыся вымае з пачка папяросу, закурвае і падыходзіць да «Бюро даведак».

— Прашу даць даведачку! — пусціўшы дым у акенца, кажа ён.— Скажыце, чаму ў вашым горадзе дазваляюць пражываць сукіным сынам?

— Што-о?..— разгубілася ад нечаканасці Вікторыя.

— Ага, гэтага вы не ведаеце. Я так і думаў, што вы тут толькі для мэблі седзіцё.

Вікторыя са злосцю зачыняе акенца, але праз момант зноў адчыняе яго.

— Па-мойму, вы проста хуліган! — кажа яна.— І пра гэта я ахвотна даю вам даведку!

Акенца зноў зачыняецца.

Генадзь стукае, але яму не адчыняюць.

Генадзь пастукаў яшчэ, потым яшчэ. Не, ніхто не адказвае. Ён хацеў быў пайсці, але перадумаў і астаўся чакаць тут.

Праз нейкі час Вікторыя выходзіць з «Бюро даведак».

— Вы яшчэ тут?..— здзіўляецца яна шчыра.

— Але ж я не атрымаў даведкі.

— Нічым не магу памагчы. Маё дзяжурства скончылася. Так што да пабачэння.

— Якое прыемнае супадзенне!— весела кажа Генадзь.— Маё дзяжурства, ці паверыце, таксама скончылася.

Вікторыя накіроўваецца да выхада. Генадзь ідзе за ёй, не адстаючы ні на крок.

Яны выходзяць на плошчу, пасля ідуць па Бабруйскай вуліцы, уздоўж сквера.

— Паслухайце, што вам трэба? — нездаволена кажа Вікторыя.— А мо хочаце, каб я міліцыянера пазвала?

— Хачу, каб пазвалі.

— Магу і пазваць.

— Можаце. Але не будзеце зваць.

— Чаму не буду?

— Хіба я да вас чапляюся? Я ж маўчу як рыба. Вы самі першая са мной размаўляеце.

— Усё роўна пазаву.

— Завіце. Вунь ён якраз ідзе.

Сапраўды, непадалёк відна манументальная постаць міліцыянера. Аднак Вікторыя нават не паглядзела на яго.

Вуліца, па якой ідуць цяпер Вікторыя і Генадзь, зусім бязлюдная. Вікторыі, напэўна, зрабілася страшнавата. Але яна пытаецца яшчэ даволі бадзёра:

— Што вам трэба, ну скажыце? Чаго вы да мяне прычапіліся?

Генадзь адказвае жартам:

— А от збіраюся абкрасці вас. Падбяру зручны момант і — хап! Вы і пікнуць не паспееце.

Жартаўлівы Генадзеў тон перадаўся і Вікторыі. Яна насмешліва агледзела даволі шчуплую Генадзеву постаць.

— Нічога ў вас не выйдзе. У мяне ж другі спартыўны разрад.

Цяпер яны ўжо на нейкай ускраіннай вуліцы. Тут цёмна і глуха. Вікторыя міжвольна паскорыла крокі. Яна ледзь не бяжыць.

Дарогу ёй раптам заступілі двое здаравенных бамбіз. Яны добра падпітыя. Адзін з іх кажа:

— Даражэнькая, вы спяшаецеся да нас на спатканне? У такім разе...

У цёмным небе нізка-нізка праносіцца самалёт. Адчуваецца, што недзе непадалёк знаходзіцца аэрапорт.

Вікторыя кідаецца назад, але тут перад ёю стаіць другі бамбіза. Язык ягоны дрэнна варочаецца ў роце.

— Кр-расачка, вы м-можаце нас па-пакахаць...

Вікторыя паварочваецца да Генадзя. Яна падумала, што гэта адна хеўра.

— Гадзінніка ў мяне няма. І грошай таксама.— Яна працягвае Генадзю сваю сумачку.— Калі і асталося, дык якая драбяза.

Генадзь машынальна бярэ сумачку і робіць рашучы крок да тых дваіх.

— Гэй, вы, будучыя жмурыкі! Мячыце атанду, ясна?

І — дзіўная справа — двое здаровых мужчын нечакана адступаюць перад гэтым шчуплым хлапчуком. Яны пакорліва прызнаюць яго перавагу над імі, «саматужнымі» хуліганамі, адразу зразумеўшы, што гэта бывалы чалавек і жарты з ім дрэнныя. Але яны яшчэ спрабуюць наіграпай бравадай прыхаваць сваю боязь.

— Чаго раскрычаўся... Мы ж нічога такога...

— І н-не ска-кажы ўжо нічо-чога. Па-падумаеш...

Генадзь робіць яшчэ крок да іх:

— Брысь!

П'яныя пераходзяць на другі бок вуліцы і, абняўшыся, паспешліва ідуць далей.

Генадзь пачынае рагатаць. Аддае сумачку Вікторыі. І тады яна таксама рагоча.

— А я ж амаль дома,— кажа Вікторыя.— Вунь там я ў адной бабулі кватарую.

Яна паказала рукой на невялічкую хатку, якая ўся патанула ў зеляніне.

Генадзь з жартаўлівай галантнасцю раскланьваецца і адступае на крок, каб пайсці прэч.

— У такім выпадку да пабачэння. Прыемных вам сноў.

— Пачакайце,— кажа Вікторыя.— Адну хвіліначчку. Хто ж вы такі? Чаму вы... ну, заступіліся за мяне?

— Вельмі проста,— весела адказвае Генадзь.— Я бачыў, як гэта робіцца ў кіно. І мне самому захацелася паспрабаваць. Здаецца, атрымалася. Бывайце.

— Бывайце.

Вікторыя знікае за веснічкамі.

Генадзь пастаяў, закурыў. Ідзе да хаткі. Убачыў лавачку, сеў. Выкурыў адну папяросу, выняў другую, прыкурыў ад першай.

Нечакана ціха рыпнула акно. Але Генадзь, заняты сваімі думкамі, не чуе гэтага. Выкурыўшы і другую папяросу, ён кладзецца на лаўку і выпростваецца па ўвесь рост.

— Як вас завуць?— даносіцца да яго праз лістоту дзікага вінаграду голас Вікторыі.

Не падымаючыся, Генадзь глуха адказвае:

— Генадзь Максімавіч.

— Вы студэнт?

— Настаўнік,— гэтак жа глуха і нават з нейкай па-

грозай у голасе кажа Генадзь. І дадае ўжо зусім злосна:— Заўтра якраз буду даваць урок сяму-таму.

Праз колькі хвілін зноў чуваць шэпт Вікторыі:

— Вазьміце.

З акна праз лістоту паказваецца падушка.

Генадзь падняўся, рассунуў лістоту, узяў падушку. Стрымана прамовіў:

— Будзе цэлая.

Ноч.

На лавачцы пад разгалістай ліпай, паклаўшы рукі пад галаву, з расплюшчанымі вачыма ляжыць Генадзь. Над ім высокі зорны купал неба. Зрэдку недзе недалёка ўзнімаюцца ўвысь цяжкія, з зялёнымі і чырвонымі агеньчыкамі самалёты, адлятаючы ў далёкія і блізкія мясціны.

А ранічкаю, калі Вікторыя высунулася з акна, на лавачцы нікога ўжо не было. Сіратліва ляжала толькі адна падушка, ды на доле валялася некалькі акуркаў.

Вікторыя села на лавачку і доўга сядзела ў адзіноце задуманая.

І от зноў светлая, сонечная раніца.

На тэрыторыі паравознага дэпо па тракцыйных пуцях сноўдаюць паравозы. Далёка чуваць іх гудкі — то басавітыя, то тонкія, то доўгія, то кароткія.

Да дэпо падыходзіць Ліда. Яна ў светлай сукенцы, у лёгкіх белых туфлях. Яна старанна выбірае дарогу, каб не запэцкацца ў мазут і ў шлак, якіх хапае тут.

Напярэймы Лідзе да нараднай шыбуе Андрэй. Убачыўшы яго, Ліда радасна гукае:

— Андрэй!..— Але тут жа, сумеўшыся, папраўляецца:— Андрэй Сцяпанавіч!

Андрэй паварочваецца на голас. Спярша ён здзіўляецца, а потым на яго твары таксама разліваецца радасць.

— Ліда?!

Яна падбягае да Андрэя.

— От я і ў Мінску. Бачыце?

— Але як?.. Чаму?..

— Буду ў вас працаваць.

— У дэпо?

— Ну але. Цеплатэхнікам. Якраз іду прадстаўляцца начальству. Вы не пярэчыце?— гарэзліва пытаецца Ліда.

— Але ж вы павінны былі паехаць у Алма-Ату?

— Начальству відней, дзе больш патрэбны розныя выдатныя асобы,— смяецца Ліда.

Па тым пуці, на якім стаяць Андрэй і Ліда, павольна сунецца манеўровы паравоз. Андрэй і Ліда не бачаць яго, яны глядзяць толькі адно на аднаго. Машыніст раптам дае аглушальны свісток. Ліда ледзь не падае ад нечаканасці. Андрэй адцягвае яе ўбок.

Паравоз праходзіць. Машыніст усміхаецца і жартаўліва ківае Андрэю пальцам. Андрэй — таксама жартаўліва — паказвае яму кулак.

Ліда ўжо ачулася, яна звонка смяецца. Далей яны ідуць разам.

— Вы цудоўная... проста дзівосная дзяўчына,— кажа Андрэй.— Так мне здаецца. Хоць я амаль нічога не ведаю пра вас.

— Гэтак жа, як і я пра вас.

— Тая наша сустрэча... Я ніколі не забуду яе. Двое незнаёмых людзей святкавалі невядома чый дзень нараджэння. Так бывае толькі ў кіно.

— А вы дагэтуль не здагадаліся, чый гэта быў дзень нараджэння?

Андрэй пільна паглядзеў на Ліду.

— Няўжо?..

— Вось мы і зноў сустрэліся,— не даючы яму дагаварыць, зазначае Ліда.

— Але, зноў...

На іх сунецца, але з другога боку, яшчэ адзін паравоз. Цяпер ужо Ліда адцягвае Андрэя.

— У нас вам тут спадабаецца,— кажа Андрэй.— Я вас пазнаёмлю са сваёй брыгадай. І наогул прапаную сябе ў якасці гіда па Мінску і яго ваколіцах. Нават з сённяшняга дня.

— Нават з сённяшняга?

— Значыцца, так. Адразу пасля работы... хоць не, сёння ў мяне лекцыя для першазімнікаў. А заўтра можна...— Андрэй раптам сумеўся.— От жа ж няўдача, і заўтра вечар заняты...

— Лекцыя для маладых следапытаў?— пакпіла Ліда.

— У кіно іду...— Ён пачырванеў.— Ведаеце, усёй брыгадай ідзём. На восем дваццаць, у «Цэнтральны»,— усё

больш і больш бянтэжачыся, пачаў выкладаць ён зусім не патрэбныя ёй падрабязнасці.— Тады ведаеце калі?..

— Наперадзе яшчэ многа дзён,— перапыніла Андрэя Ліда.— Прабачце, мне трэба ісці. Начальства ж не любіць чакаць.

Падобна на тое, што апошнія Андрэевы словы калі і не ўкалолі Ліду, то ва ўсякім разе крыху засмуцілі. Па яе твары прабягае ледзь прыкметны цень.

— Да пабачэння, Андрэй Сцяпанавіч.

— Да пабачэння, Ліда. Да пабачэння. І жадаю вам поспехаў.

Яна пайшла.

Ён пастаяў, паглядзеў ёй услед. Нешта новае з'явілася ў яго на твары, тое, чаго не было дагэтуль.

Не, яно было аднойчы і раней,— тады, калі Мікола гаварыў на паравозе пра сустрэчы і пра ростані.

А Мікола цяпер таксама ідзе ў дэпо. Ён убачыў Андрэя і кіруецца да яго. Але тут зусім нечакана для сябе заўважае Ліду. І тады адразу мяняе напрамак.

— От гэта здорава! — кажа Мікола, даганяючы Ліду.

— Што здорава?— не прыпыняючыся, пытаецца Ліда.

— Што і вы тут! Што вы...— Але, не дагаварыўшы, Мікола змаўкае. Ён падумаў, што Ліда, магчыма, і не памятае яго.

Аднак Ліда памятала.

— Знайшлі вы свайго прыяцеля?— спытала яна.

— Знайшоў,— узрадаваўся Мікола.— Ды толькі ён зноў знік. І акрамя таго, ён... ну, як бы гэта вам сказаць... ён мне ніякі не прыяцель.

— Але ж для нечага ён вам патрэбен.

— Патрэбен,— кажа Мікола.— Хоць хто ён мне? Быццам і ніхто. Так, першы стрэчны, як кажа наш памочнік. А от затое Беражкоў лічыць...

— Вы ў брыгадзе Беражкова?— насцярожылася Ліда.

— Але,— не без гордасці паведамляе Мікола.— Ужо чулі пра яго? Першы машыніст у дэпо! Працаваць з ім — гэта, ведаеце...

— Я яго ведаю,— сказала Ліда.— Напэўна, у вас вельмі дружная брыгада?

— Ага,— кажа Мікола.— Беражкоў, ён такі... такі...

— У кіно нават, кажуць, ходзіце разам.

— Бывае, што і ў кіно...— не разумее, што да чаго, Мікола.

— І заўтра, кажуць, пойдзеце.

— Заўтра? Хто вам сказаў? Першы раз чую.

— Сам Андрэй Сцяпанавіч сказаў.

— А-а, гэта ён з жонкай ідзе. На «Песню першага кахання».

Ліда зачырванелася.

А Мікола кажа далей:

— У гэтым месяцы мы ўжо хадзілі брыгадай, план выканалі. А наогул, шчыра кажучы, ну які інтарэс хадзіць у кіно адным мужчынам? Ніякага інтарэсу. От калі, скажам, у цябе ёсць маршрут з асобай іншага полу... тады, вядома, другая справа...

Занятая сваімі невясёлымі думкамі, Ліда зусім не слухае Міколы.

— Тады, вядома, зусім іншая справа...— Мікола скоса паглядзеў на Ліду, памаўчаў. Потым, набраўшыся смеласці, кажа:— А ведаеце што?.. У вас тут пакуль што нікога, мабыць, знаёмага няма. То чаму б вам не схадзіць, напрыклад, у кіно?

— З вамі?— сумна ўсміхнулася Ліда.

— Заўтра, га?— аж перастаў дыхаць Мікола.

— А то сёння ў вас лекцыя,— насмешліва кажа Ліда.

— Але, Беражкоў чытае,— не зразумеўшы яе насмешкі, сур'ёзна ўдакладняе Мікола.

Тады Ліда раптам рашуча заяўляе:

— Добра. Мы пойдзем. Заўтра. На восем дваццаць, у «Цэнтральны».

— Дзякую!.. Дзякую!..— аж захліпнуўся ад шчасця Мікола.— Усё будзе як мае быць!

Мінуўся яшчэ адзін дзень.

Андрэй Беражкоў у гэты дзень устаў рана. Яму трэба было наведаць хлопцаў, якія жылі ў інтэрнаце, каб пагутарыць наконт чарговага прамывачнага рамонту паравоза. Яны меліся зрабіць гэтую работу самі, без дапамогі рамонтнікаў, таму неабходна было сёе-тое ўдакладніць.

Ён ішоў па адной з вуліц Грушаўскага пасёлка. Тут цэлы квартал займалі домікі стандартнага тыпу, дзе жылі пераважна чыгуначнікі. Каля аднаго з такіх асабнячкоў Андрэй сустрэў даволі высокага чалавека ў цёмным касцюме, з плашчом, перакінутым цераз руку, і ў шэрым ка-

пелюшы, які сядзеў на галаве ў чалавека, бы сядло на карове. З-пад штаноў у яго відны былі старанна наваксаваныя боты.

— Здравія желаю, таварыш Беражкоў! — прастуджаным голасам прамовіў гэты дзіўны чалавек.

Андрэй пазнаў у ім участковага міліцыянера і ледзь не разрагатаўся.

— А міліцэйская форма вам больш да твару,— заўважыў ён.— Дзяжурыце?

— Візуальна назіраю.

— За кім?

— У адпаведнасці з сігналам,— таямніча паведаміў чалавек.

— А-а... — Андрэй успомніў гутарку ў кабінеце начальніка міліцыі.— Давайце, давайце.

— Але, па-мойму, тут усё ў парадку пакуль што. Прайдуся па ўчастку.

Андрэй зірнуў на асабняк, што быў якраз насупроць, убачыў на ім флюгер і адразу пазнаў жытло Івана Харытонавіча Рахубы. Нічога не сказаўшы, ён пайшоў сваёй дарогай.

Чалавек павярнуў у другі бок.

У светлым пакоі інтэрната паравознікаў Мікола робіць пад гукі радыё гімнастыку. Ён у трусах і ў майцы.

Проста перад ім адчыненае насцеж акно. З вышыні трэцяга паверха Мікола добра бачыць усю вуліцу.

— Хопіць дрыхнуць!— крычыць Мікола Васілю, які спіць, накрыўшыся коўдрай з галавою.— Беражкоў вунь ужо ідзе. Чуеш, соня? А ну, уставай!

— Зараз, зараз...— праз сон мармыча Васіль.

Мікола сцягвае з яго коўдру.

— Паспаць чалавеку не дадуць...— незадаволена кажа Васіль.— То ў паездцы, то на лекцыі, то ў дружыне, то рыхтуйся да пераходу на цеплавозную цягу. Замучылі чалавека, хоць гвалт крычы.

— Яму далягляды адкрываюць, а ён прыкідваецца казанскай сіратой. Пад'ём!

Непадалёк ад інтэрната, на рагу, стаіць аўтацыстэрна з газай. Каля яе дзве жанчыны з бітонамі. Трэцяя падала свой бітон прадаўцу.

На вялікае сваё здзіўленне Андрэй бачыць, што да цыстэрны ідзе Генадзь. Пад пахай у яго нейкі скрутак.

Андрэй прыпыняецца зводдаль, цікуе.

— Пачым сёння карасін?— пытаецца Генадзь.

— Пачым учора, патым і сёння,— адказвае прадавец.

— Не падзешавеў?

— Два літры за трынаццаць капеек — гэта і так дарма.

Відавочна, што Генадзь не мае ніякага ўяўлення пра цэны на газу. Вызнаўшы цяпер цану, ён разгортвае пакунак. У руках у яго — літровая бутэлька.

— Калі не падзешавеў, дык вазьму літр.

— Грамадзянін, трымайцеся чаргі,— кажа бабулька да Генадзя, хоць уся чарга і складаецца цяпер толькі з адной яе.— Гарыць, ці што?

— Будзе гарэць! — абяцае Генадзь.

Узяўшы бутэльку з газай, Генадзь загортвае яе зноў у газету і адыходзіць.

Андрэй ідзе следам за ім.

Гэтак яны — Генадзь наперадзе, Андрэй на некаторай адлегласці ад яго — падыходзяць да знаёмага нам дома.

Маленькім, проста нікчэмным здаецца Генадзь у царстве антыкварных рэчаў, якія з усіх бакоў акружаюць Генадзя ў кватэры Рахубы. Масіўная старадаўняя мэбля, дываны нейкай фантастычнай размалёўкі, яркія карціны ў пазалочаных рамах... Чаго толькі тут няма!

Але дзівіцца на ўсё гэта багацце Генадзю няма ні ахвоты, ні часу. Ён хутка разгортвае газету і вымае бутэльку з газай...

І ў гэты момант у пакой уварваўся Андрэй.

Генадзь кідаецца да акна.

— Стой!— крычыць Андрэй і хапае яго за руку.

Генадзь спрабуе вырвацца, але дарэмна.

— Сукін сын!— злосна кажа Андрэй.— Тэрарыст пракляты!

— Усё роўна я яго спалю!— скрыгочучы зубамі ад сваёй бяссільнасці, ледзь не плача Генадзь.— Ён ад мяне нікуды не дзенецца! Я яго на краі свету знайду!

Цяжка дыхаючы, Андрэй са здзіўленнем глядзіць на Генадзя.

— Гэта ж формены надпал! Гэта ж злачынства.

Генадзь ужо аціх.

— Артыкул восемдзесят сёмы,— згаджаецца ён.— Што ж, вядзіце, куды трэба...

— «Вядзіце»!— перадражніў яго Андрэй.— Хіба ў гэтым справа?

Яны нейкі час пільна глядзяць адзін на аднаго. Генадзь вытрымлівае Андрэеў позірк.

— Ну і натура!..— кажа Андрэй.— Што ж, хадзем.

— Бутэльку з сабою браць?

— Бяры.

Яны выходзяць на двор.

— Я думаў, вы і сапраўды машыніст. А вы лягавы. Даўно вы там служыце?

Не звяртаючы ўвагі на Генадзевы словы, Андрэй пытаецца:

— Калі доктар павінен вярнуцца?

— У шэсць гадзін.

— А жонка?

— У пяць.

— Усё, значыць, улічыў. Каб толькі адзін попел астаўся.

— Як у крэматорыі.

Андрэй агледзеўся вакол. Заўважае ў садзе летні душ, абгароджаны дошкамі. Ідзе туды. Генадзь пакорліва тэпае за ім.

— Давай памыемся. А то як нам з табою такімі паказацца на людзі.

— Я лепей ужо там, у сапрапускніку.

— Давай, давай!

Генадзь ідзе за дашчаныя дзверы, прычыняе іх за сабою.

Андрэй садзіцца на камень, які астаўся тут, напэўна, з часоў будаўніцтва дома.

Чуцён шум струменьчыкаў вады. Толькі адзін гэты шум і парушае саплівую цішыню саду.

Перачакаўшы нейкі час, Андрэй кажа:

— Няўдалы, па маю думку, ты выбраў аб'ект. Гэта ж доктар. І, наколькі я ведаю, добры доктар.

Цурчыць вада за дашчанай сцяною. Потым даносіцца глухі Генадзеў голас.

— Нічога вы не ведаеце...

— Чаму ж, я лячыўся ў яго.

— Забойца ён, а не доктар.

— Забойца? Тады ты абраў не лепшы спосаб барацьбы

са злачынцам. Прасцей было б пайсці і заявіць, куды трэба.

— А як дакажаш? Ды і няма такога артыкула, па якім яго можна было б судзіць.

— А ты ўпэўнены, што ён забіў?

— Забіў! Хоць і не з пісталета. І нават не нажом.

— Нічога не разумею.

— Ён проста не прыйшоў да хворага. І не даў лякарства.

— І той хворы... памёр?

Толькі шум вады, замест адказу, чуцён за сцяною.

— Хто гэта быў?— памаўчаўшы, зноў пытаецца Андрэй.

Не адразу даносіцца адказ Генадзя:

— Мая мама...

Здаецца, больш гучна зацурчала вада за сцяною, і дрэвы ў садзе таксама, здаецца, заварушыліся лістотаю...

— Мы жылі тады на сяле,— зноў данасіцца да Андрэя голас Генадзя — ціхі, нібы прыглушаны адлегласцю мінулых гадоў.— Мама і я... Бацька нас кінуў... Вось... А мама захварэла. А потым здарыўся гэты прыступ. Я пабег на станцыю, да яго, да гэтага... Бо ў нас свайго доктара не было. А ён кажа: «Я не абавязаны,— кажа,— вы чужыя, я толькі чыгуначнікаў лячу...»

— І не прыйшоў?

— Не прыйшоў.

Андрэй павярнуў галаву да асабняка Рахубы. На пераноссі сышліся дзве глыбокія маршчыны.

— Калі маму пахавалі, я рашыў: буду помсціць яму ўсё жыццё. А ён якраз пераехаў у горад. Ды я знайшоў яго. Падпільнаваў і падпаліў. Але толькі няўдала, паспелі патушыць. А мяне — у турму. От я і адседзеў тэрмін. Цяпер вярнуўся назад, а ён і адтуль ужо з'ехаў, у Мінск перабраўся. Ну, я яго і тут застукаў. Ён ад мяне нікуды не схаваецца. Я яго і на тым свеце знайду.

Цурчыць і цурчыць вада.

Андрэй маўчыць, задумаўся. Не чуваць больш голасу Генадзя.

— Гэта праўда, Гена?

Адчыняюцца дзверы з душавой. Паказваецца Генадзь — такі ж самы запэцканы, які і быў. А вада льецца і льецца...

— Вядзіце ўжо, ці што.

— Але, пойдзем. Паседаем. А то я здорава прагаладаўся.

Андрэй падыходзіць да брамкі. Бачыць чалавека з плашчом цераз руку, які ходзіць непадалёк. Кажа да Генадзя:

— От што, Гена, давай сігані вунь цераз тыя штыкеты. Сустрэнемся на рагу. Ладна?

— Ладна,— абяцае Генадзь.

На рагу, каля прамтаварнага магазіна, стаіць Андрэй. Паглядзеў у адзін бок, у другі. Генадзя нідзе няма.

Міма ідуць прахожыя. Андрэй кідае на іх кароткія позіркі, потым зноў азіраецца на бакі.

Генадзя няма.

Андрэй пачынае хвалявацца. Зірнуў на свой наручны гадзіннік, праз момант яшчэ раз.

Нарэшце з-за газетнага кіёска выглянуў Генадзь. Пераканаўшыся, што Андрэй адзін, Генадзь ідзе да яго.

Андрэй ледзь прыкметна ўсміхнуўся і, кіўнуўшы Генадзю, збочвае на другую вуліцу. Генадзь даганяе яго і ідзе побач.

Яны моўчкі ідуць па вуліцы. Абодва засяроджаныя, хоць і кожны па-свойму.

Зноў збочылі, ідуць па новай вуліцы.

Потым збочылі яшчэ раз.

Праходзяць па Бетонным мосце.

Праз нейкі час яны апынуліся перад вялікім трохпавярховым будынкам. Андрэй тут прыпыняецца.

Машынальна прыпыняецца і Генадзь. Паглядзеў на будынак, потым на Андрэя. Здаецца, на міліцыю гэты будынак не падобны. Нічога не разумеючы, Генадзь паціснуў плячыма.

— Гэта... што тут такое?..

— Зойдзем паглядзім,— кажа Андрэй.

— Напэўна, файная хавіра.

— Хадзем, хадзем.

Генадзь раптам прымае рашэйшы развязны выгляд.

— А мяне там не абкрадуць?

— Якраз таму я цябе і запрашаю,— усміхнуўся Андрэй.— Дарэчы, дзе твае папяросы?

Генадзь вымае з кішэні пачак «Беламора».

Андрэй бярэ яго і кідае ў урну.

— Тут, братка, не кураць. Май гэта на ўвазе. І, акрамя таго, гэта самае (ён пстрыкнуў сябе пальцам па горле) таксама ані-ні!

— Я не пітушчы,— сказаў Генадзь і памацаў рукою за кішэню — ці на месцы другі пачак. Ён аказаўся на месцы, і Генадзь хітравата ўсміхнуўся сам сабе.

Яны ідуць у будынак.

Падпімаюцца па лесвіцы.

Адольваюць адзін марш, другі, трэці.

Ідуць па калідоры, па абодва бакі якога знаходзяцца дзверы з шыльдачкамі-нумарамі.

І нарэшце прыпыняюцца перад дзвярыма, якія адзначаны нумарам сорак восем.

Андрэй адчыняе гэтыя дзверы.

Першае, што бачыць Генадзь, нераступіўшы парог пакоя, гэта чалавека, які чамусьці стаіць на руках, дагары нагамі.

Аднак Андрэя гэта не здзіўляе.

— Фізкульт-прывет! — весела кажа ён.

— Фізкульт-прывет! — адказвае дзіўны чалавек і ў знак прывітання стукае ў паветры нагамі адна аб адну.

Потым ён ідзе на руках да Генадзя і, стоячы на адной руцэ, другую падае хлопцу.

Генадзь нерашуча паціскае гэту руку.

— А на нагах ты зусім не ўмееш хадзіць? — пытаецца Генадзь.

Андрэй і дзіўны чалавек рагочуць.

Потым чалавек робіць падскок і становіцца на ногі. І тады высвятляецца, што гэта Мікола.

Відаць, Мікола вельмі здзіўлены тым, што бачыць зараз Генадзя, ды яшчэ разам з Андрэем. Але ён і знаку не паказвае. Проста кажа да Андрэя:

— А мы вас чакалі, чакалі!..

— От я і прыйшоў да цябе ў госці,— заяўляе Генадзь.— Прымаеш?

— З дарагою душою, Генадзь Максімавіч!

— Сядай, Гена,— кажа Андрэй і сам першы прысаджваецца на крэсла каля акна.

Генадзь рассеўся на крэсле, што стаяла непадалёк ад дзвярэй. Палез быў у кішэню за папяросамі, але, успомніўшы пра папярэджанне Андрэя, палічыў за лепшае пакуль што ўстрымацца.

Ён з цікаўнасцю азірае пакой. Тут два ложкі — каля адной сцяны і каля другой. Ля ўвахода, з правага боку, шафа для вопраткі. Пасярэдзіне — стол. З левага боку — этажэрка з кнігамі. На тумбачцы стаіць тэлефон.

З ручніком цераз плячо і з прыладкам для галення ў руках уваходзіць у пакой Васіль. На левай шчацэ ў яго прылеплен кавалачак паперы.

— Толькі ў адным месцы парэзаўся? — смяецца Мікола.— Як гэта табе ўдалося?

— Смейся, смейся,— кажа Васіль.— Вось выйграю па латарэі электрычную брытву, тады...— Ён заўважае Андрэя, потым Генадзя.— Прызнацца, не чакаў...

— Колькі ж ты ўзяў білетаў? — пытаецца Андрэй.

— Латарэйных? Пяць,— паказвае Васіль на этажэрку, дзе ляжаць яго білеты.

— І хочаш выйграць абавязкова брытву?

— Толькі брытву! Бо толькі яна мне больш за ўсё цяпер і патрэбна.

— Я мінулы раз таксама пяць браў,— кажа Мікола.— І на ніводзін не выйграў. Цяпер думаю ўзяць з палучкі дзесяць. А то — пяць, падумаеш.

— От што, хлопцы,— кажа Андрэй.— Гаворка ў мяне да вас ёсць.

— Наконт білетаў? — насцярожыўся Васіль.— Дык я магу, калі што якое, і болей узяць. Не адстану.

— А што — прарыў у нас на гэтым фронце? — цікавіцца Мікола.

— Прарыў,— усміхаецца Андрэй.— Але не на гэтым. Андрэй агледзеў пакой.

— У вас тут, канечне, не дужа прасторна. Але трэці ложак, я лічу, мог бы ўсё ж стаць. Напрыклад, вось тут.

— А навошта? — зноў насцярожыўся Васіль.

Затое Мікола адразу ўцяміў, куды хіліць Андрэй.

— Як піць даць, Андрэй Сцяпанавіч,— кажа ён, скасавурыўшы вочы да Генадзя.— Трэці ложак нам тут проста неабходны!

— А ты якой думкі? — пытаецца Андрэй у Васіля.

Васіль таксама ўжо зразумеў, пра што ідзе гаворка. Ён пільна паглядзеў на Генадзя. А той сядзіць, разваліўшыся на крэсле, і ўвесь яго выгляд сведчыць аб тым, што размова гэтая яго зусім не цікавіць.

— А што я?..— незадаволена паморшчыўся Васіль.— Як Мікола, так і я.— І раптам ён заспяшаўся.— Ледзь не

забыўся, мне ж па курсы шафёраў трэба бегчы! Ай-я-яй, ледзь не забыўся!..

— Дык ты не пярэчыш? — пытаецца Андрэй.

— Як Мікола. Няхай ён рашае,— ужо ў дзвярах кажа Васіль і наспешліва выходзіць.

— Значыць, дамовіліся,— канстатуе Андрэй. І пытаецца ў Міколы: — Ты як там з камендантам? Ладзіш?

— Па прынцыпу мірнага суіснавання.

— Тады дамоўся з ім. Добра?

І да Генадзя:

— Табе тут падабаецца?

Генадзь яшчэ раз правёў вачыма па пакоі.

— У нас у турме прыкладна гэтак жа было. Толькі прасціны часта прападалі.

Андрэй і Мікола разрагаталіся. Потым Андрэй кажа:

— А цяпер, хлопцы, пайшлі ў адно месца. Трэба яшчэ вырашыць адну справу.

У кабінеце начальніка аддзела кадраў чыгункі — Андрэй, Мікола і Генадзь. Тут жа, але асобна ад іх, сядзіць начальнік міліцыі.

— Так, паднёс ты мне, Беражкоў, пілюльку! — кажа начальнік аддзела кадраў.

Раптам ён спахапіўся, зірнуў на гадзіннік. Выняў са стала невялічкую каробачку. Узяў пілюлю. Праглынуўшы, запіў вадою. Паморшчыўся. Кажа далей:

— Начальнік дэпо мае рацыю. Бесперспектыўна!

— Але ж выпадак які, Кузьма Кузьміч! — усхвалявана кажа Андрэй.— Няўжо пройдзем міма?

— З вамі ператвараешся ў нейкага камсамольска-піянерскага работніка.

— Кузьма Кузьміч, дык жа ж будучыня! — умешваецца ў размову Мікола.

— Во ў мяне дзе гэта будучыня сядзіць! — ляпае сябе па карку начальнік аддзела кадраў.

— І потым, Наўроцкі нашу брыгаду пакідае,— кажа Андрэй.— Ён атрымаў правы кіравання лакаматывам, пойдзе на другую машыну, за правае крыло. Таварыш Хвошч,— Андрэй ківае ў бок Міколы,— зойме яго месца. Вопыт у яго ёсць, і немалы. Ну, а яго,— Андрэй паказаў на Генадзя,— паставім на месца таварыша Хвашча. У яго

таксама сякі-такі вопыт ёсць. Вузкакалейка ў іх там была, на ёй хлопец і працаваў. Характарыстыку мае.

— Навошта нам павялічваць колькасць качагараў, калі мы вось-вось будзем пераходзіць на цеплавую цягу? Навошта, таварыш Беражкоў?

— То я ж і кажу, падрыхтуем і яго за гэты час на цеплавозніка,— не здаецца Андрэй.

— На цеплавозніка! Гэта табе не качагарыць! Адукацыя, сам ведаеш, якая патрэбна.— Кузьма Кузьміч паварочваецца да Генадзя.— Дзе вучыўся?

— Сем класаў,— падказвае Андрэй.

— Малавата. Па-мойму, самае мэтазгоднае — у рамеснае яго.

— Кузьма Кузьміч!..— зноў хоча сказаць штосьці Андрэй.

Але начальнік аддзела кадраў перапыняе яго.

— А ты сам чаго маўчыш? — звяртаецца ён да Генадзя.— Я нават твайго голасу не чуў. У цябе ёсць які-небудзь голас?

— Магу заспяваць! — кажа Генадзь.— «Гоп са смыкам», «Чубарыкі-чубчыкі»...

— Генка! — цыкае на яго Андрэй.

Начальнік аддзела кадраў заляпаў пальцамі па стале.

— Ну от бачыш...

У кабінеце ўсталявалася цішыня.

І тады пачаў гаварыць начальнік міліцыі, які дагэтуль не прамовіў ні слова.

— Я вось успомніў... Даўно гэта было, нешта ў дваццаць другім годзе. Служыў я тады ў Омскай ЧК. Раскрылі мы вялікую шайку фальшываманетчыкаў. Дзядзькі ўсё сталыя, паважныя. А рысавальшчыкам, так сказаць, цэнтральнай фігурай, аказаўся малец гадоў на пятнаццаць. Вось ён і мастырыў чырвонцы... Ну, прысуд жорсткі быў, аж да вышэйшай меры... Даходзіць, значыцца, чарга да таго хлапчука. Прыціхла зала. А хлапчук стаіць, губы ў яго сінія, самога ліхаманка калоціць. І аб'яўляе суддзя: «Грамадзяніна такога-та накіраваць у горад Леніна, у Акадэмію мастацтва...»

Перачакаўшы крыху, начальнік міліцыі дадаў:

— А ЧК кіраваў тады, як вядома, таварыш Дзяржынскі.

У кабінеце зноў усталявалася цішыня.

Потым начальнік аддзела кадраў моўчкі працягнуў ру-

ку да чарнільнага прыбора, узяў адтуль тоўсты чырвоны аловак і штосьці размашыста напісаў на паперцы, што ляжала перад ім.

Напісаўшы, гэтак жа моўчкі аддаў паперку Генадзю.

Той узяў яе, зірнуў. На паперцы буйнымі літарамі было напісана толькі адно слова: «Аформіць».

З кабінета яны выйшлі ўсе разам.

Начальнік міліцыі казырнуў і спакойнай сваёй хадою пасунуўся па калідоры да выхада.

Андрэй зірнуў на гадзіннік. Кажа да Міколы і Генадзя:

— Значыцца, так. Шуруйце ў дэпо, яшчэ можаце паспець да начальніка. А пакуль што якое, пакуль Мікола ўладкуе справу з інтэрнатам, пажывеш у мяне. Прыходзь к васьмі гадзінам. Я табе вось тут адрас запішу.

Калі Андрэй пайшоў, Генадзь зноў паглядзеў на паперку, якую ўсё яшчэ трымаў у руках. Перачытаў адным губамі рэзалюцыю. Потым асцярожна склаў паперку ў чатыры столкі і гэтак жа асцярожна паклаў у кішэню.

— Афармілі, адным словам...— кажа ён.

Мікола і Генадзь прыпыняюцца каля сатуратарнай цялежкі.

— От бачыш, і начальнік дэпо цяпер шаўковы зрабіўся,— кажа Мікола. І звяртаецца да прадаўшчыцы: — Дзве шклянкі!

— Без сіропу,— дадае Генадзь.

Мікола падносіць сваю шклянку да Генадзевай, чокаецца.

— Замочым гэта дзела!

Калі яны выпілі газіраванай вады, Мікола кажа:

— А цяпер заскочым на хвілінку вось сюды.

Генадзь азірнуўся. Аказваецца, яны знаходзяцца каля кінатэатра «Цэнтральны».

— У кіно збіраешся пайсці, ці што? — пытаецца Генадзь.

— Абяцаў, разумееш, аднаму чалавеку...

Мікола падыходзіць да акенца касы. Яно чамусьці зачынена. Мікола энергічна пачынае стукаць. Генадзь з абыякавым выглядам назірае за ім.

— Чорт ведае што! — абураецца Мікола.— Калі б мы гэтак працавалі, нас бы пасажыры жыўцом праглынулі!

Генадзь заўважае над касай шыльдачку: «На сягоння ўсе білеты прададзены». Штурхае локцем Міколу — глядзі, маўляў.

Мікола разгублена пазірае то на гэту шыльду, то на Генадзя.

— От табе і маеш!..

— Нічога! — кажа Генадзь.— Гэта мы ў адзін момант абцяпаем! Ты пастой тут, я зараз.

Каля кінатэатра даволі багата людзей. Генадзь шмыгнуў у натоўп, шукае некага.

Вось ён заўважыў каля газетнага кіёска высокага шыракатварага хлопца ў кепачцы і адразу ідзе да яго.

— Рэалізуеш? — пытаецца Генадзь.

— Ага,— ахвотна адказвае хлопец.

— Атрымліваецца?

— Не дужа.

— Што — не хочуць браць, піжоны?

— Нацэнка, кажуць, вялікая.

— Давай сюды.

— Усе?

— Два. На восем дваццаць. Грошы — праз дзве мінуты.

— А дзе гарантыя?

Генадзь сплюнуў нейкім асаблівым чынам.

— Я такіх, як ты, бачыў групамі і па адзіночцы! Ясна?

...Мікола здзіўлена глядзіць на білеты, якія дае яму Генадзь.

— Гані рубель,— кажа Генадзь.— Самыя лепшыя месцы.

— Дзе ты іх узяў? — падазрона пытаецца Мікола.

Да іх падыходзіць хлопец у кепачцы.

— Рэалізаваў? — пытаецца ён у Генадзя.

— На, бяры.— Генадзь аддае яму Міколавы грошы.

— Гэта ж намінал! — пералічыўшы грошы, абураецца спекулянт.

— Прыйшлося без нацэнкі. Ты ж сам казаў — не бяруць. Ды і карціна няважная. Студыі «Беларусьфільм».

— Які ж тады мне інтэрас?..

— А табе абавязкова, каб інтэрас быў? Тады паслухай адну байку на гэтую тэму. Адзін чалавек купляў яйкі, ва-

рыў іх і прадаваў за тую самую цану. Калі ў яго спыталі, навошта яму гэткі гандаль, ён адказаў: «Затое я пры дзеле». Ну, бывай, неафармлены элемент!

Мікола ад душы разрагатаўся.

Насвістваючы песеньку нейкага цяпэўнага матыву, Мікола прымервае перад люстэркам гальштук.

— Ну як — добры?

— Добры,— не naзіраючы, адказвае Генадзь. Ён стаіць каля акна і самотна глядзіць на вуліцу.

Мікола бярэ другі гальштук.

— А можа, гэты лепшы?

— Можа, і лепшы.

Мікола не заўважае Генадзевай меланхоліі. Яшчэ раз агледзеўшы сябе ў люстэрку, ён весела кажа:

— Ну, пажадай мне ні пуху ні пер'я. Ага, вось што. Можаш пачытаць маю кнігу. Раманчык — што трэба! Пра шпіёнаў. Я вось толькі зраблю якую закладку, каб не шукаць потым, дзе чытаў.

Мікола бярэ з тумбачкі кнігу, секунду думае, з чаго б зрабіць закладку, потым хапае з этажэркі латарэйны білет, кладзе яго між старонак і дае кнігу Генадзю.

— Мае вам найлепшыя пажаданні! — кажа Мікола.— І мне вашы таксама!

І, зноў насвістваючы, Мікола выходзіць з пакоя.

Генадзь астаецца адзін.

Паглядзеў на дзверы, што зачыніліся за Міколам, пацiснуў плячыма. Пастаяў, падумаў. Прайшоўся па пакоі да дзвярэй і назад да акна. Узяў Міколаву кнігу, разгарнуў яе. Не, чытаць яму зараз зусім не хочацца. Шпурнуў кнігу на Міколаву тумбачку.

Яму захацелася закурыць. Выняў з кішэні папяросы, узяў адну. Але запалак у кішэнях не знайшоў. Пашукаў вачыма ў пакоі — не, тут таксама нідзе запалак няма.

Тады Генадзь падаўся з пакоя.

Перад ім доўгі калідор з мноствам дзвярэй. Адны дзверы прыадчынены. Генадзь зазірае. За дзвярыма гэткі самы пакой, але значна большы. Ложкаў тут няма, затое многа сталоў і крэслаў. Відаць, гэта пакой для нейкіх заняткаў. За адным сталом хлопец якраз піша нешта ў сшытак.

Генадзь ідзе далей.

Падыходзіць да другіх дзвярэй. Прыпыняецца, прыслухоўваецца. Потым асцярожна стукае. Ніхто не адказвае. Генадзь узяўся за ручку, і дзверы лёгка адчыніліся.

У пакоі, дзе апынуўся Генадзь,— ні душы. Позірк яго затрымліваецца на шафе з вопраткай. Потым заўважае пад ложкам чамадан.

З рэпрадуктара чуваць музыка. Нехта самотным голасам абяцае некаму жыццё, якое можна ўбачыць толькі ў сне.

Генадзь шчыльна зачыняе за сабою дзверы. Падыходзіць да шафы, бярэ адтуль пінжак, надзявае яго. Пінжак аказваецца яму якраз па фігуры. Нібы яго на Генадзя і шылі.

Агледзеўшы сябе з усіх бакоў, Генадзь уздыхае. З неахвотаю зняў пінжак і павесіў яго на месца.

Зноў выйшаў на калідор. Насупроць яшчэ адны дзверы. На яго стук зноў ніхто не адказвае.

Генадзь і сюды заходзіць. І ў гэтым пакоі чамусьці таксама нікога няма. А на стале, прыціснутая вазай з кветкамі, ляжыць дзесяцірублёвая асігнацыя...

Хто і навошта пакінуў яе тут?..

— Дзівакі нейкія тут жывуць...— мармыча Генадзь і хуценька выходзіць з пакоя.

У фае кінатэатра пакуль што яшчэ мала людзей. На эстраднай пляцоўцы ўладкоўваюцца музыканты. Ходзіць сюды-туды марожаншчыца.

У фае ўваходзяць Ліда і Мікола. Яны праходзяць направа і прыпыняюцца каля сцяны.

— У кіно дужа смачнае марожанае,— кажа Мікола.

Ліда кіўнула са згодаю.

Мікола ідзе да марожаншчыцы.

І ў гэты час уваходзяць Андрэй і Вера. Ліда адразу заўважае іх. Але Андрэй не бачыць Ліды. Разам з Верай ён таксама ідзе якраз да гэтай самай сцяны.

І толькі апынуўшыся каля самай Ліды, Андрэй сумеўся. Гэты яго стан не астаўся па-за ўвагай Веры. Яна здзіўлена зірнула на мужа.

З марожаным у руках падыходзіць Мікола. Ён зусім не чакаў убачыць тут Беражкова з жонкай.

— Добры вечар...— кажа ён. Падумаўшы, дадае: — Знаёмцеся, калі ласка. От гэта мой машыніст. З жонкаю. А гэта — Ліда...

— Мы знаёмы з Андрэем Сцяпанавічам,— заяўляе Ліда.

— Але, але...— кажа тады Андрэй.— Мы сапраўды знаёмы. Вера, гэта наш новы цеплатэхнік, таварыш Бокава.

Вера і Ліда стрымана раскланьваюцца.

— Вы таксама працуеце ў дэпо? — пытаецца Ліда ў Веры.

Вера чамусьці чырванее.

— Не, я займаюся гаспадаркаю.

Грымнуў аркестр.

Вера і Андрэй пасунуліся крыху далей да эстрады. Мікола і Ліда астаюцца на ранейшым месцы. Ён нарэшце працягвае дзяўчыне марожанае, якое пачало ўжо добра падтаваць.

На эстрадную пляцоўку выходзіць спявачка і зацягвае штосьці тужлівае.

Пачуўшы званок, Віця адразу падбягае да дзвярэй. Адчыняе іх і бачыць Генадзя.

Віця адразу пазнаў яго. Але як ветлівы гаспадар стрымана кажа:

— Заходзьце, калі ласка!

Генадзь нерашуча ўваходзіць.

— Вось наша вешалка,— кажа Віця.— У вас ёсць паліто?

— Няма.

— Дармо, лічыце, што вы павесілі. Хадземце цяпер за мной.

Яны ідуць на кухню.

— Мама і тата пайшлі ў кіно. Але нічога, гэта яшчэ і лепш. Вось гэта наша кухня. Тут мама прымушае мяне есці. А ў мяне ніколі няма апетыту. А ў вас?

— Паскардзіцца не магу.

Яны ідуць у пакой, даволі вялікі.

— А тут жывуць мама і тата,— паведамляе Віця.— Хочаце, я вам пешчачка пакажу?

Віця падбягае да камоды, высоўвае адну шуфляду, дастае свісток і дзьме ў яго.

У адчыненай шуфлядзе ляжыць пачак грошай. Генадзь скасавурыў вочы на гэты пачак.

Зразумеўшы, што свісток не зрабіў на Генадзя ніякага ўражання, Віця паклаў яго на месца і ідзе з пакоя.

— Пойдзем тады да мяне. Я жыву вось тут.

Цяпер яны ў пакоі, у якім шмат цацак. Пасярэдзіне знаходзіцца цудоўнае збудаванне — чыгунка. Генадзь адразу ідзе да яе.

— Гэта мне купілі, калі мне было яшчэ тры гады,— тлумачыць Віця.— Бабуля казала, што ранавата купляць, а тата ўсё роўна купіў. Не паспеў з ёю згадзіцца.

Віця сядае на падлогу і ўключае нейкі рычаг. Чыгунка адразу ажыла. Хутка пабег па рэйках паравоз, а за ім вагончыкі.

Генадзь таксама сядае на падлогу і зачараванымі вачыма глядзіць на поезд, які робіць адзін круг за другім.

— Я думаў, ты ўжо дарослы,— кажа Віця.— А ты гэткі ж, як і я. Табе таксама падабаецца?

— Вельмі,— шчыра прызнаецца Генадзь.

Потым гасцінны Віця частуе на кухні Генадзя сваёй вячэрай.

— Ты еш, еш. Гэта грэцкая каша. Яна вельмі карысная. У ёй шмат ці то медзі, ці то жалеза. А ў гэтым кісялі шмат вітамінаў. А без вітамінаў чалавек жыць не будзе. А кошку-мышку ты мне пакажаш?

— Другім разам,— аплятаючы за абедзве шчакі Віцеву вячэру, кажа Генадзь.— А то табе, мабыць, трэба ўжо кімарыць.

— Што гэта такое — кімарыць?

— Ну, спаць.

— А па якому гэта?

— Па якому?.. Па-англійску...

Фільм пачаўся адразу, як толькі пагасла святло,— часопіса сёння чамусьці не паказвалі. Ён пачаўся з таго, што двое пажылых людзей, якія ехалі ў аўтамашыне,— ён і яна — раптам павярнуліся адно да аднаго і сталі цалавацца. Папераздзе іх знаходзіўся шафёр, але ён, вядома, нічога не бачыў. Так бывае ў кінафільмах.

— Ты даўно яе ведаеш? — ціха спытала Вера.

Андрэй адказаў не адразу.

— Яе?.. Не вельмі...

І пасля новай паўзы паспешліва дадаў:

— Яна наступіла працаваць да нас у дэпо, я ж казаў. А што?

Вера прамаўчала. Але можна з абсалютнай упэўненасцю паручыцца, што яна з гэтага часу страціла цікавасць да карціны, хоць там паказвалі вельмі пікантны момант: двое людзей, цяпер ужо маладых, цалаваліся за спіной у шафёра.

Што ж датычыцца самога Андрэя, то ён цікавасць да карціны страціў ужо даўно, з тае самае хвіліны, як толькі на экране з'явілася аўтамашына. З тае хвіліны ён стаў жыць зусім у іншым свеце. Машына нагадала яму другую машыну, другіх людзей і другія падзеі. Было тое параўнаўча нядаўна, можа, толькі месяц назад, калі ён вяртаўся з адпачынку і зрабіў прыпынак у Маскве.

...Андрэй здаў рэчы ў камеру хавання на Беларускім вакзале, а сам падаўся вывучаць Маскву, бо закампасціраваць білет на Мінск можна было толькі на вячэрні поезд.

Ён і не заўважыў, як надышоў вечар. У раёне Пясчаных вуліц Андрэй спахапіўся, што да поезда асталося ўжо небагата часу. Ён узяў таксі і загадаў везці сябе на Беларускі вакзал.

Шафёр зусім не спяшаўся ехаць. Ён дазваляў абганяць сваю машыну ўсім, каму толькі гэтага хацелася. Пры чарговым такім абгоне машыны нейкім старэнькім «Масквічом» Андрэй сказаў:

— А ці нельга хутчэй, га? А то я, чаго добрага, і на поезд спазнюся.

— Нельга,— не пазіраючы на Андрэя, флегматычна адказаў шафёр.— Вы ж ведаеце — цішэй едзеш, далей будзеш. Асабліва ў нас у Маскве. А калі ваш поезд адыходзіць?

— У дваццаць адну дзесяць. Асталося дваццаць мінут.

— Цюцелька ў цюцельку прыедзем. Упрыцірачку.

Шафёр у гэты момант зрабіў правы паварот, але раптам рэзка затармазіў. Нейкая дзяўчына якраз пачала была пераходзіць вуліцу, але, пачуўшы шум машыны, шарахнулася назад. Спатыкнуўшыся аб выступ тратуара, яна ўпала.

Машына спынілася. Андрэй выскачыў і дапамог дзяўчыне падняцца.

— Вы не пабіліся? — спагадліва спытаў Андрэй.

— Дзякую вам,— сказала дзяўчына і раптам моцна ўскрыкнула.

Яна хацела стаць на левую нагу і не здолела. Ёй прыйшлося абаперціся на Андрэя.

— Здаецца, я паламала нагу.

Толькі цяпер Андрэй зірнуў на дзяўчынін твар. Гэты твар здзівіў і нават збянтэжыў яго. Такой раскошнай прыгажосці яму яшчэ не даводзілася бачыць. Асабліва ўразілі Андрэя яе вочы — вялікія, ярка-блакітныя, і вейкі — доўгія і цёмныя, амаль чорныя, хоць колер валасоў у дзяўчыны быў светлы.

Так яны стаялі нейкую хвіліну — яна, абапіраючыся на Андрэева плячо і моршчачыся ад болю, і ён, падтрымліваючы яе і ўсё больш губляючыся.

— Што ж нам з вамі рабіць? — спытаў нарэшце Андрэй.— Вы далёка дзе жывяце?

— У Чаромушках... Так, завязіце мяне, калі ласка, дадому. Я зусім не магу ісці. Гэта будзе ветліва з вашага боку.

Андрэй памог ёй сесці ў машыну і сам сеў на ранейшае месца побач з шафёрам. Гадзіннік паказваў без дзесяці мінут дзевяць.

— У Чаромушкі,— сказаў Андрэй шафёру.— Хоць не, спачатку паедзем на Беларускі вакзал. Там я сыду, а вы паедзеце ў свае Чаромушкі.

— А як я паднімуся на шосты паверх? — капрызна сказала дзяўчына.

— Добра, спачатку адвязём вас,— амаль злосна прамовіў Андрэй.— Гэта нам па дарозе? — спытаў ён у шафёра.

— Амаль,— адказаў шафёр.— Толькі ў адваротны бок.

Машына памчалася па вячэрняй Маскве.

Цяпер шафёр ужо нікому не дазваляў апярэджваць сябе. Машына ляцела на поўнай хуткасці, якую толькі дазвалялі правілы вулічнага руху. Андрэй стараўся не глядзець на гадзіннік. Знарок не зірнуў ён на яго і тады, калі машына спынілася ля пад'езда вялікага шматпавярховага дома.

— У нас ліфт,— сказала дзяўчына,— але адна я ўсё роўна не змагу падняцца.

Калі яны выйшлі з машыны, дзяўчына ледзь не павісла на Андрэю. І яму нічога больш не аставалася, як падняцца на ліфце разам з ёю.

Каля дзвярэй кватэры яна працягнула яму сумачку.

— Там ключ. Адчыніце, калі ласка.

У вялікай прасторнай кватэры чамусьці нікога не бы-

ло. Андрэй памог дзяўчыне ўвайсці ў пярэднюю, потым у адзін з пакояў. У пакоі было многа мэблі і многа карцін.

— Дзякую вам, шчыра,— сказала дзяўчына.— Я не затрымала вас? Вы, здаецца, некуды спяшаліся. Уключыце, калі ласка, святло.

Андрэй знайшоў на сцяне каля дзвярэй выключальнік. Вялікая люстра над столлю запалілася мяккім рассеяным святлом.

Адмысловы старасвецкі гадзіннік на сцяне паказваў дзесяць мінут на дзесятую гадзіну.

— Я ўжо не спяшаюся,— стрымліваючы сябе, ціха адказаў Андрэй.— Мне ўжо няма куды спяшацца.

— Няма куды? — перапытала дзяўчына.— Я ў нечым перашкодзіла вам?

— Нічога асаблівага, проста я спазніўся на поезд.

— Божа ж мой! Што ж цяпер будзе?

— Паеду раніцою, толькі тае і справы,— як мага спакайней сказаў Андрэй, хоць гэты спакой даўся яму не лёгка.

— Тады вось што. Тады будзьце ўжо рыцарам да канца. Пазваніце, калі ласка, у «хуткую дапамогу», няхай прышлюць доктара. Але спачатку адпусціце шафёра. Ён яшчэ там, унізе?

Андрэй з нейкай незразумелай для яго самога пакорлівасцю спусціўся ўніз.

— Мы, здаецца, прыехалі? — спытаў шафёр.

— Але, цюцелька ў цюцельку. Колькі з мяне?

— Глупства, два рублі.

Шафёр з зайздроснай абыякавасцю запіхнуў грошы ў кішэню, націснуў на старцёр і гулліва сказаў:

— Няма ліха без дабра. Спадзяюся, я вам больш не спатрэблюся сёння?

— Не, дзякую.

Доктар прыехаў хутка. Ім аказалася маленькая пажылая жанчына. Агледзеўшы дзяўчыніну нагу, яна сказала:

— Нічога страшнага. Звычайны невялікі вывіх. Я наставіла ступню на месца. Заўтра зноў будзеце скакаць.

Дзяўчына ўзрадавалася.

— А я ўжо думала... было так балюча... ды і цяпер яшчэ...

— Можаце пакласці лёд. Гэта зніме боль,— сказала доктар.— Бывайце здаровы!

Доктар пайшла. Андрэй хацеў таксама развітацца, але дзяўчына апярэдзіла яго.

— Што ж вы стаіце,— сказала яна.— Калі вам напраўдзе няма ўжо куды спяшацца, дык сядайце, адпачніце.

— Мне напраўдзе няма куды спяшацца.— Андрэй пачаў ужо злавацца.— Але... Я вам больш не патрэбен?

— Патрэбен,— заявіла дзяўчына.— Вы ж чулі, мне неабходны лёд. За вуглом нашага дома стаіць сатуратарная цялежка. Пастарайцеся выпрасіць у прадаўшчыцы хоць кавалачак. Бачыце, я цяпер адна дома. Тата і мама паехалі сёння на курорт, я толькі што праводзіла іх.

Са сцяны на Андрэя насмешліва пазірала Мадонна Бенуа.

— Добра, я вам дастану лёду,— ужо зусім злосна сказаў Андрэй і пайшоў да выхада.

— Гэта направа, адразу за вуглом,— крыкнула яму ўслед дзяўчына.— І вазьміце, калі ласка, замок на засцерагальнік, а то як жа вы пасля зойдзеце.

Андрэю і сапраўды ўдалося расстарацца крыху лёду, хоць з-за позняга часу ніякай сатуратарнай цялежкі за вуглом ужо не было, і яму давялося шукаць бліжэйшага кіёска з прахаладжальнымі напіткамі.

Калі ён вярнуўся, дзяўчына па-ранейшаму напаўляжала на канапе. Па яе загаду ён схадзіў на кухню, знайшоў там грэлку і напіхаў яе лёдам, папярэдне раструшчыўшы яго качалкай на дробныя кавалачкі.

— Вось цяпер вам стане лягчэй,— сказаў Андрэй, прыкладаючы грэлку да яе нагі.

— Але, мне стане лягчэй. Я вам так удзячна. Але ж прысядзьце вы нарэшце, вунь тое крэсла вельмі зручнае.

Андрэй паслухмяна апусціўся ў крэсла, прапанаванае яму дзяўчынай. Зрэшты, ён і сапраўды вельмі натаміўся за дзень.

— І раскажыце, калі ласка, куды гэта я так недарэчна перашкодзіла вам паехаць. Вы курыце? Не бойцеся, я прывычная да дыму.

— Я не куру,— сказаў Андрэй.

— Вам трэба было на Беларускі вакзал, калі не памыляюся?

— Вы не памыляецеся. Я еду дамоў, у Мінск. З адпачынку.

— У Мінск? О, кажуць, гэта вельмі прыгожы цяпер горад.

— Вельмі,— сказаў Андрэй.
— А дзе вы адпачывалі? На поўдні?
— Не, на Урале. У Свярдлоўску, калі гэта вас вельмі цікавіць.
Яна, здаецца, не звярнула ўвагі на яго тон.
— У вас дзіўны густ,— сказала яна.— Мае бацькі дык на Каўказ паехалі. А потым збіраюцца яшчэ ў Крым завітаць.
— Справа ў тым, што ў Свярдлоўску жыве мой друг. Ён таксама машыніст, але...
— Таксама машыніст? — перапыніла Андрэя дзяўчына.— Пачакайце, пачакайце, вы хочаце сказаць, што вы — чыгуначнік?
— А чаму гэта дзівіць вас?
— Наадварот, гэта мяне радуе. Уявіце сабе... не, вы нават не паверыце... уявіце, перад вамі таксама без пяці мінут чыгуначніца. Яна толькі што скончыла транспартны інстытут і чакае прызначэння на работу.
— Дык што ж, прасіцеся ў Мінск,— ужо амаль весела сказаў Андрэй.— А скажыце, вы які факультэт канчалі?
— А такі, што калі я прыеду ў Мінск, дык буду вашым начальнікам, не менш таго,— засмяялася яна.— Буду пясочыць вас за цеплатэхнічны стан лакаматыва.
— Ого! — здзівіўся Андрэй і дадаў жартаўліва: — Але з вамі, я спадзяюся, мы паладзілі б.
— Хто ведае. Я дужа люблю камандаваць, асабліва мужчынамі.
— Яно і відаць,— засмяяўся Андрэй.
Аказалася, што на гэту дзяўчыну зусім немагчыма злаваць.
Яна таксама засмяялася. І раптам зусім нечакана сказала:
— А ведаеце, што мы зараз з вамі зробім? Мы павячэраем. Дарэчы, як вас завуць? Давайце будзем знаёміцца, калі так яно ў нас атрымалася. Я — Ліда.
Андрэй назваў сваё імя і прозвішча.
— То і цудоўна, Андрэй Беражкоў. Ідзіце на кухню і гаспадарце. Там вы знойдзеце сёе-тое ў халадзільніку, сёе-тое ў шафцы — у той, што з правага боку. Дзейнічайце. І майце на ўвазе — мне нельга пярэчыць, я хворая.
Усё гэта паходзіла на нейкі неверагодны кур'ёз, і невядома было, як да яго ставіцца. У Андрэя раптам з'явілася такое адчуванне, быццам і сустрэча з гэтай фантастыч-

най прыгажуняй, і спазненне на поезд, і, нарэшце, гэтае запрашэнне — усё адбываецца не наяве, а ў прыдуманым кімсьці непраўдападобным сне. А ў сне падзеі развіваюцца, не падпарадкоўваючыся ніякай логіцы...

Андрэй устаў і пайшоў на кухню. Але, уключыўшы святло, адразу ж вярнуўся назад.

— Скажыце, а чаму, уласна кажучы, вы мне так давяраеце?

Ліда зірнула на яго і задумалася. Відаць, яна цяпер і сама здзівілася, чаму раптам так лёгка, без усякіх умоўнасцей склаліся ў яе адносіны з гэтым зусім незнаёмым чалавекам. Андрэй зноў сеў і стаў чакаць яе адказу.

З вуліцы данёсся нечы слабы крык. Дзявочы голас настойліва клікаў нейкую Нінку.

— Напэўна, таму,— сказала нарэшце Ліда,— што вы зусім не падобны на благога чалавека.

— А вы іх бачылі — благіх?

— Бачыла...

Яна паспрабавала ўстаць, але войкнула і зноў апусцілася на канапу.

— Добра, я зараз,— сказаў Андрэй і пайшоў на кухню.

Праз паўгадзіны яны сядзелі за вячэрай. Да Лідзінай канапы быў прысунут невялікі круглы столік і тое самае крэсла, у якім, як казала Ліда, сядзець вельмі зручна.

Па Лідзінаму загаду Андрэю прыйшлося адкаркаваць бутэльку «Гурджаані».

— За Мінск! — сказала Ліда і падняла сваю чарку.— За ваш Мінск!

— З задавальненнем! — адказаў Андрэй.— І калі не пярэчыце — за тое, каб наш Мінск стаў таксама і вашым.

— Я не пярэчу,— заявіла Ліда.— І будзем лічыць, што гэта не жарт. Хоць, па праўдзе кажучы, я чамусьці даўно нацэлілася на Казахстан, на Алма-Ату.

Яны чокнуліся і выпілі.

Не, Мадонна Бенуа глядзела, аказваецца, не на яго, яна была цалкам занята сваім дзіцем. І позірк яе проста не мог быць насмешлівым.

Закусвалі сырам, вэнджанай каўбасою і шпротамі. Потым Ліда прымусіла Андрэя схадзіць на кухню яшчэ раз і падсмажыць яечню. Яны выпілі зноў, ужо без усякага тосту, але Андрэю здалося, што Ліда ўсё ж задумала нешта, бо перад тым, як прыгубіць сваю чарку, яна на нейкі момант задумалася і па яе твары прабег лёгкі цень ці то

смутку, ці то трывогі. Андрэй пачаў здагадвацца, што ў Ліды ёсць нейкая свая прычына па сённяшнюю вячэру.

Потым Ліда распытвала Андрэя пра Мінск, пра паравознае дэпо і наогул пра Беларусь. Андрэй расказваў ахвотна і падрабязна.

Была гадзіна ночы, калі Андрэй нарэшце спахапіўся.

— А божа ж мой! — усклікнуў ён.— Як позна, гэта ж падумаць! Я прапаў!

Ён разгублена глядзеў на Ліду, праклінаючы сябе за тое, што гэтак захапіўся і не заўважыў, як хутка прабег час.

— Але, позна ўжо,— задумліва сказала Ліда.— Як жа вы цяпер пойдзеце? Метро ўжо зачынена. Ды і ці ёсць вам куды ісці?

— Пайду на вакзал. Як-небудзь да раніцы...

— Не, гэта нядобра,— вакзал,— рашуча заявіла Ліда,— Вось што, Андрэй Беражкоў, да вашых паслуг — татаў кабінет. Гэта побач, уваход вунь праз тыя дзверы.

— Ліда, гэта немагчыма,— цвёрда сказаў Андрэй.

— Магчыма,— гэтак жа цвёрда сказала Ліда.— І не рабіце, калі ласка, такія вялікія вочы. Мы ж сталі сябрамі, праўда? Вось я і прапаную вам па-сяброўску. Не адрацца ж вам, сапраўды, праз мяне цэлую ноч на вакзале. Месца ў гасцініцы вы зараз ні за якія грошы не дабудзеце. Дык вось — вам даецца асобны пакой. Там вы знойдзеце кушэтку, а ў шафе — прасціну, коўдру і падушку. І не забывайце, што мне нельга пярэчыць, я хворая. А то я магу расплакацца. Вы ж не дапусціце, каб я плакала?

— Не дапушчу.

— Ну, дык ідзіце ў кабінет і ўладкоўвайцеся. А, вось яшчэ што. Уключыце, калі ласка, прыёмнік. Вось так, не вельмі гучна. Яшчэ цішэй. Я яшчэ паслухаю музыку. Сёння перадаюць мой любімы твор. Добрай ночы вам, Андрэй Беражкоў!

«Татаў кабінет» быў сумежны з Лідзіным пакоем. Дзвярэй у дакладным сэнсе слова паміж імі не было, вісела толькі парцьера з маліпавага аксаміту. Яна не магла з'явіцца перашкодай для музыкі, якую перадавалі па радыё і якую захацела паслухаць Ліда.

Андрэй ляжаў і таксама слухаў. Ён не ведаў, што гэта такое было. Чулася шапаценне галінак... чуліся птушыныя галасы... пасля загучала пастухова жалейка... Здавалася,

некага кліча некуды валторна, а за ёю і флейта. Андрэй са здзіўленнем пачаў разумець, што гукі ствараюць адчуванне ціхай сонечнай раніцы недзе ў гарах.

На змену гэтым гукам прыйшлі другія. То была ўжо журботная мелодыя. Журботная і разам з тым нібы і велічная. Выконвалі яе адны струнныя інструменты. Гучала яна ўсё цішэй і ўсё больш глуха.

— Вы не спіце, Андрэй? — ціха спытала Ліда.

— Якая чароўная музыка...— гэтак жа ціха прамовіў Андрэй.

— Гэта Грыг.

— Грыг?..

— Але, Эдвард Грыг. Сюіта з «Пер Гюнта». Вы любіце музыку?

— Так, але я дрэнна разбіраюся ў ёй. Вы сказалі — «Пер Гюнт»?

— Гэта герой драматычнай казкі Ібсена, музыку да якой напісаў Грыг. Дакладней, гэта персанаж з нарвежскага фальклору. Легенду аб ім Ібсен якраз і выкарыстаў у сваёй драме.

— Хто ж ён, гэты Пер Гюнт? Бачыце, я абсалютны прафан...

— Ён быў вясёлы чалавек і смелы паляўнічы. Акрамя таго, ён умеў расказваць цудоўныя казкі. Яго небыліцы паходзілі на быль, а расказы пра сапраўдныя падзеі — на казачныя выдумкі.

— Відаць, ён быў нешта накшталт нашага Несцеркі.

— Гэта персанаж з беларускага фальклору?

— Але.

— На жаль, я нічога не ведаю пра Несцерку. А от Пер Гюнт... яго кахала дзяўчына, у якой было цудоўнае імя — Сольвейг...

— Сольвейг...— паўтарыў Андрэй.

— Яна кахала яго ўсё жыццё і ўсё жыццё чакала яго, цэлых сорак год.

— Ён што — пакінуў яе?

— У яго... як гэта сказаць... бесталкова неяк склалася жыццё. Яго насіла па ўсім свеце, і ён нарабіў, кажучы па-сучаснаму, нямала памылак і нават непрыстойных учынкаў.

— А Сольвейг верыла ў яго і ўсё чакала?

— Верыла і чакала. Хоць і не варта было... Чуеце? Гэта ўжо «Плач Інгрыд».

Так, Андрэй чуў. Глыбокім сардэчным болем стагналі скрыпкі. Хтосьці галасіў і гнеўна ўскрыкваў — гэта выразна перадавала музыка.

Здаецца, Ліда ўздыхнула.

— Была такая дзяўчына — Інгрыд. Яна закахалася ў Пера. Але той не звяртаў на яе ніякай увагі. І яна згадзілася стаць жонкай другога. Тады Пер надумаўся ўзяць яе з-пад вянца і ўцячы з ёю ад жаніха ў горы. Ён так і зрабіў. А назаўтра, у гарах, Пер пакінуў Інгрыд адну...

— Так, так, я чую,— сказаў Андрэй.— Вось пачынаецца світанне ў гарах, і Інгрыд вяртаецца дамоў, пакрыўджаная і зняважаная. Я заплюшчыў вочы і бачу яе. Гэта цуд.

— Яна ідзе вельмі паволына... бачыце? Яе падвянечнае плацце пашматалася аб скалы, ногі падрапаліся, твар заліты слязьмі. А наўкол усё красуе і буяе, і летняя раніца такая чыстая і свежая. Вунь удалечыні ідзе пастух са сваім статкам, ён весела іграе на жалейцы... здаецца, яна называецца ў Нарвегіі ланглейкай. Зіхаціць на сонцы фіёрд, спакойны і чысты, як люстэрка.

Грыгаўская музыка цалкам запаланіла гэту начную маскоўскую кватэру недзе ў Чаромушках, свет гукаў насяліў яе фантастычнымі героямі з легенд і казак, і Андрэй баяўся паварушыцца, каб не спудзіць і не разагнаць іх. Ён маўчаў. Змоўкла і Ліда.

Стагналі і галасілі скрыпкі. Жаліліся на некага ланглейкі...

— Але ён вернецца да Сольвейг? — спытаў нарэшце Андрэй.— Яна дачакаецца Пера?

— Зараз пачынаецца апошняя карціна сюіты — «Песня Сольвейг». Чуеце — у ёй гучыць тэма спакою, адданай любві і суцяшэння. Так, Пер Гюнт вярнуўся. Але вярнуўся, каб пераканацца, што жыццё яго прайшло не так, як трэба. Пер не здолеў застацца самім сабою, у бясконцых вандраваннях і розных прыгодах ён страціў лепшае, што ў яго было,— свой паэтычны талент. І толькі ў сэрцы Сольвейг ён астаўся такім жа чыстым, якім быў калісьці, сорак год назад.

Пасля доўгага працяглага маўчання, калі адгучала ўжо музыка і свет казачных прывідаў растаў і знік, Андрэй сказаў:

— Я мала каму зайздросціў, але вам зайздрошчу. Вы так глыбока і тонка адчуваеце і разумееце музыку.

— Вы таксама яе адчуваеце, я ведаю,— пачуў ён Лідзін адказ.— Толькі вы, папэўна, не спрабавалі разабрацца ў сваіх адчуваннях. А гэта зусім не цяжка, запэўніваю вас. Трэба толькі навучыцца слухаць.

— Цяпер я буду вучыцца слухаць,— сказаў Андрэй.

Ліда папрасіла Андрэя выключыць прыёмнік.

— Спакойнай вам ночы,— сказала яна яму.

— Спакойнай ночы,— адказаў ён.

Відаць, Ліда заснула адразу. А Андрэй доўга не мог заснуць у «татавым кабінеце». Ён ляжаў на канапе і курыў, курыў...

Назаўтра раніцою Ліда праводзіла Беражкова.

Яна яшчэ крыху накульгвала, і таму, калі яны спускаліся па лесвіцы і потым, калі выйшлі з машыны на плошчы ля вакзала, Лідзе прыйшлося абапірацца на яго руку.

Андрэй занёс чамадан у вагон і выйшаў на перон.

— Я хачу ў вас спытаць... Скажыце, у вас учора была нейкая прычына на вячэру з «Гурджаані»? Я не памыляюся?

— Вы не памыляецеся,— засмяялася Ліда.— Учора быў дзень нараджэння... адной маёй добрай знаёмай. Я якраз і ішла да яе, а вы ўзялі і наехалі на мяне.

— Я не наязджаў на вас.

— Вы хацелі наехаць,— зноў засмяялася Ліда.— Але не будзем спрачацца з-за дробязей. Ну, от мне і прыйшлося падняць чарку за яе здароўе дома.

— Трэба было і мне сказаць пра гэта. І я выпіў бы таксама за яе здароўе.

— Мабыць, трэба было.

Пад вагонамі пачуўся характэрны шум. Машыніст поезда пачаў правяраць аўтатармазы, і з паязной магістралі са свістам вырывалася сціснутае паветра.

— Бывайце,— сказаў Андрэй.— Я ніколі не забуду гэтага вечара. Ён застанецца са мною назаўсёды.

— На цэлых сорак год? — сумна ўсміхнулася Ліда.— Але ж, на шчасце, вы не Пер Гюнт, а я не Сольвейг. Дарэчы, а ваш дзень нараджэння сёлета ўжо быў? Ці яшчэ будзе?

— Яшчэ будзе. Дваццаць шостага ліпеня.

— Я запомню,— сказала Ліда.— Дваццаць шостага ліпеня.

Да іх далящеў свісток галоўнага кандуктара.

— Бывайце, Ліда.

— Да пабачэння, Андрэй,— паправіла яна.— Я абавязкова прыеду ў Мінск. Вось убачыце, я даб'юся прызначэння.

Андрэю хацелася сказаць — не трэба, не дабівайцеся. Бо гэта будзе вельмі дрэнна. Для мяне дрэнна. І для вас.

Але ён сказаў другое:

— Жадаю вам поспеху. І беражыце, калі ласка, вашу нагу.

Пачуўся гудок паравоза. Поезд крануўся. Андрэй ускочыў на падножку вагона і знік у тамбуры.

Пасля, выглянуўшы з купэ ў акно, ён бачыў, што Ліда доўга яшчэ стаяла на пероне і махала рукою. Ён таксама памахаў ёй.

Чамусьці гэта апошняе — апусцелы перон і адзінокая Лідзіна постаць на ім — мацней за ўсё і ўрэзалася ў памяць. І потым, калі ён прыгадваў сваю маскоўскую прыгоду, найбольш паўставаў перад ім менавіта гэты малюнак.

...Мяркуючы па ўсім, фільм павінен быў хутка скончыцца. Але чаму ён называўся «Песня першага кахання», Андрэй так і не зразумеў. З аднолькавым поспехам ён мог называцца «Гімн трэцяй здрады» або «Казка для састарэлых халасцякоў». Гэта падышло б нават больш.

— Яна прыезджая? — нечакана задала сваё другое пытанне за час дэманстрацыі карціны Вера.— Калі яна прыехала?

— Хто? — спытаў Андрэй, хоць адразу зразумеў, каго мае Вера на ўвазе.

— Твая новая саслужывіца.

Яна так і сказала — твая. І здаецца, падкрэсліла гэтае слова.

Тады, вярнуўшыся з Масквы, Андрэй доўга думаў — расказаць ці не расказаць Веры пра тое здарэнне. Спачатку вырашыў быў, што трэба расказаць. Ён ведаў, што Вера нічога благога пра яго не падумае: па-першае, ён ніколі не даваў ёй ніякай прычыны для рэўнасці, між імі былі вельмі простыя і шчырыя адносіны, а па-другое, Вера наогул была, як яму здавалася, далёкая ад абывацельскіх уяўленняў аб няверпасці ўсіх жанатых мужчын. Але потым ён пачаў вагацца, у галаву сталі лезці розныя сумненні. Так прайшоў дзень, і другі, і трэці, а потым... а потым ужо было позна расказваць. Бо само тое, што ён зрабіў

гэта не адразу, якраз і магло павесці на непатрэбны роздум, выклікаць непатрэбныя падазрэнні. І ён змоўчаў.

— Прыезджая,— адказаў Андрэй.— Яна масквічка.

А ў думках ён моцна аблаяў сябе. «Дурань я. Страшэнны дурань. Вядома, трэба было расказаць...»

Цяпер зрабіць гэта было канчаткова немагчыма.

Запалілася святло. Зарыпелі і загрукацелі крэслы, зашоргалі падэшвы ботаў, чаравікаў, басаножак. Андрэй стараўся не глядзець у той бок, дзе сядзелі Ліда і Мікола.

І Ліда таксама старалася не глядзець.

Андрэй і Вера выйшлі на волю. Вялізныя плафоны вулічных ліхтароў залівалі праспект яркім, але жаўтаватым святлом. У акне табачнага магазіна чырвоныя літары з неонавых трубак утварылі слова «папяросы», а зялёныя — «цыгарэты». Над паштамтам такія ж неонавыя, але большыя словы патрабавалі ад мінчан неадкладна ўзнавіць падпіску на газеты і часопісы на другое паўгоддзе.

— Як мы будзем дабірацца дадому? — спытала Вера.— Што ты прапануеш?

— Пойдзем пешшу. Сёння цудоўны вечар.

— Ты звар'яцеў. Віця дома адзін з гэтым тваім нейкім новым падшэфным... Давай паедзем на тралейбусе, а потым...

— Добра, давай паедзем на тралейбусе,— згадзіўся Андрэй.

Вечар быў цёплы і ціхі. Па небе плыў шчарбаты месяц. Зрэдку ён хаваўся за невялікія хмаркі, і тады больш зыркімі рабіліся зоркі.

Ліда сказала, што яна яшчэ дрэнна арыентуецца ў Мінску. Таму, можа, Мікола згодзен будзе праводзіць яе. Калі, вядома, у яго ёсць вольны час.

— О, часу ў мяне колькі хочаце! — паспешліва заявіў Мікола.

Яны не дамаўляліся, што не будуць карыстацца ніякім відам транспарту, гэта атрымалася само па сабе. І што не будуць надакучаць адно аднаму размовамі — таксама не дамаўляліся, але іменна маўчанне найбольш спадарожнічала ім аж да самага жаночага інтэрната.

Толькі каля Дома ўрада Мікола адважыўся спытаць:

— Дык вы напраўдзе будзеце працаваць у нашым дэпо?

Ліда адказала, што будзе. У якасці каго — пра гэта яна нічога не сказала, а Мікола да гэтай тэмы больш не вяртаўся.

Калі яны міналі Заходні мост, Мікола сказаў, што фільм яму не спадабаўся. Ліда без пярэчанняў згадзілася з яго думкай. На Маскоўскай вуліцы, за малочным заводам, ён паведаміў, што сёлета такое лета, якога даўно не было ў Мінску. Ліда не стала аспрэчваць і гэтых слоў. На падыходзе да Бетоннага моста Мікола палічыў неабходным растлумачыць:

— А ведаеце, у дванаццатым радзе лепш за ўсё відаць. Я заўсёды бяру дванаццаты рад.

Гэта яго тлумачэнне асталося зусім без адказу. Тады Мікола з жахам падумаў, што Ліда нейкім чынам, можа, ведае пра тое, як яму дасталіся сённяшнія білеты, і пра яго ўяўную прыхільнасць да дванаццатага рада. Гэта падзейнічала на яго ў тым сэнсе, што ён канчаткова анямеў.

Ліда напаўголасу зацягнула нейкую песню без слоў. Яна не спявала, а толькі выводзіла без голасу зусім не знаёмую Міколу мелодыю, сумную і нават тужлівую. Цяпер яна, відаць, ужо ведала дарогу сама, бо ішла крыху наперадзе за Міколу. Мікола вырашыў, што як толькі Ліда скончыць сваё мурлыканне, ён раскажа ёй пра тое, што нядаўна ў Цэнтральным кніжным магазіне яму выпала пазнаёміцца з адным пісьменнікам і што той пісьменнік падарыў яму сваю кнігу з аўтографам. Потым, падумаўшы, Мікола сказаў сабе, што пра гэта, бадай, не варта расказваць, бо Ліда можа ўспрыняць яго словы як пікчэмнае выхваленне. Ды і кніга яму, шчыра кажучы, не вельмі спадабалася, там былі адны апавяданні, а Мікола больш любіў чытаць вялізныя раманы, асабліва пра вайну і пра шпіёнаў. Лепш ён раскажа ёй аб тым, як...

— Вось я і дома,— зусім нечакана сказала Ліда.— Я тут жыву. Да пабачэння. Вы цудоўны кавалер, і мне вельмі прыемна было правесці з вамі вечар. Да пабачэння.

— Але... мы яшчэ сустрэнемся?..— сумна спытаў Мікола.

— Мы будзем сустракацца штодня,— сказала Ліда.— Некаторым чынам, я ж цяпер ваша начальства.

На кухні ў Беражковых, на раскладушцы, скруціўшыся ледзь не абаранкам і павярнуўшыся да сцяны, спіць Генадзь.

Аднекуль даносіцца прыглушаны адлегласцю паравозны гудок. Але Генадзь, напэўна, не чуе яго.

Маўклівая, уся нейкая засяроджаная, Вера ў спальні павольна водзіць прасам па дзіцячай кашулі. Кашуля даўно ўжо адпрасавана, а Вера ўсё водзіць па ёй прасам і водзіць.

Андрэй ходзіць па пакоі. Туды і назад. Туды і назад.

— Ты чаму не кладзешся спаць? — пытаецца Андрэй.

Вера быццам і не чула яго пытання. Але праз колькі часу спытала сама:

— А ты чаму?..

— Я зараз...

— Кладзіся.

Андрэй ходзіць далей. Туды і назад. Туды і назад.

Потым ён выйшаў. Зазірнуў у сынаў пакой, паправіў на ім коўдру. Падаўся на кухню. Генадзь ляжыць на раскладушцы ў ранейшай паставе.

Андрэй вяртаецца назад у спальню.

— Знайшла час калі прасаваць...

— Дык жа ж трэба...

Між тым Генадзь яшчэ не спаў. Ён толькі рабіў выгляд, што спіць.

Але, цяжка заснуць хлопцу ў гэту першую ноч новага, яшчэ не зусім яснага для яго жыцця. Вельмі ж крута павярнулася яно, жыццё, у нязведанае, незнаёмае рэчышча...

Да яго далятаюць словы Андрэя і Веры... Ці не пра яго гэта яны размаўляюць?.. Не, здаецца, не пра яго... Тады пра што ж?..

— Дарэмна ты ўсё гэта, Вера...— кажа Андрэй.

— Што — дарэмна? — голас у Веры ціхі і сумны, ён ледзь чутны.

— Ды от думаеш...

— Нічога я не думаю...

— Бачу я, як ты не думаеш...

— Не разумею — аб чым ты?

— Што ж, па-твойму, мне ўжо і двума словамі ні з кім нельга перакінуцца?..

— Хто кажа — нельга?

— Ну, паступіў да нас працаваць чалавек. Правільней кажучы, прыслалі яго да нас. Ну і што, калі яна жанчына?

Яна псрш за ўсё цеплатэхнік. І нам часта прыйдзецца сутыкацца па рабоце. Нічога не зробіш, што цеплатэхнік — жанчына...

Пасля паўзы чуцён ужо зусім ціхі голас Веры:

— Андрэй, ты каго пераконваеш — мяне ці сябе?

— Ды не, нікога я не пераконваю! Я проста прыводжу факты!

— Кладзіся, Андрэй. Бо сапраўды позна ўжо. А табе заўтра к брэсцкаму поезду трэба.

Але, позна ўжо. Ды Генадзь яшчэ не спіць. І хоць галасоў за сцяною ўжо не чуваць, ён усё думае, думае...

Сонечны прамень слізгануў па вялізным, спрэс запклёным даху дэпо і, адбіўшыся ад яго, мноствам «зайчыкаў» разбегся па павуцінню рэек.

Адзін з гэтых «зайчыкаў» слізгануў па Лідзіным твары. Адсюль, з акна цеплатэхнічнага кабінета, відна амаль уся тэрыторыя дэпо. Сноўдаюць па тракцыйных пуцях паравозы — пасажырскія, таварныя, манеўровыя. Чуваць іх рознагалосыя гудкі.

Вось ідзе новенькі пасажырскі лакаматыў. Ён увесь аж зіхаціць, аж гарыць на сонцы. Ліда падалася наперад... Так, гэта паравоз Андрэя Беражкова. Ён ідзе ў чарговы рэйс. За правым крылом, як і звычайна, знаходзіцца сам машыніст.

— Прыгажун,— сказаў нехта ў пакоі.

— Што? — здрыганулася Ліда.

— Не паравоз, а лялечка.

Ліда апусціла вочы, утаропілася ў разасланы на стале графік прамывачнага рамонту лакаматываў.

— Вам пашанцавала, Лідзія Сяргееўна,— кажа далей той самы голас.— З такімі падшэфнымі мецъ справу адна любата.

Нібы развітваючыся, паравоз даў нягучны працяглы гудок.

Ліда ніжэй апусціла галаву.

На тэндэры, падставіўшы грудзі і твар ветру, стаіць Генадзь. Твар у яго запэцканы вугальным пылам. А вочы ззяюць.

Паравоз вяртаецца з рэйса ў дэпо. Наперадзе, у між-

пуцці, відна жаночая постаць. На гэту постаць глядзіць са свайго акна Андрэй.

Вось паравоз параўняўся з жанчынай... Але, гэта Ліда.

Нейкую хвіліну паравоз сунецца побач з Лідай. Потым паступова пачынае апярэджваць яе. Андрэй азіраецца. Але Ліда не падняла вачэй. Яна шпарка ідзе ў кірунку парадкай.

Андрэй пераводзіць рэгулятар яшчэ па адзін клапан, і паравоз, ахутаўшыся параю, імкліва пайшоў далей.

Начальнік аддзела кадраў чыгункі кідае ў рот пілюлю, запівае яе вадой. Паморшчыўшыся, з дакорам кажа:

— Як жа гэта так атрымліваецца, таварыш Бокава? Чалавек вы, здаецца, дарослы, а паводзіце сябе, прабачце, бы матылёк. Інстытут пасылаў вас у Алма-Ату, вы напрасіліся ў Мінск. Добра, пайшлі вам насустрач. Не паспелі мы вас афарміць, а вы — гоп!— на новае месца надумаліся пераляцець. Несур'ёзна гэта, таварыш Бокава, зусім несур'ёзна.

Твар у Ліды бледны, нават сшэрхлы.

— Мне цяжка тут...

— Пачынаць заўсёды цяжка.

— Я павінна паехаць, таварыш начальнік!— умольна кажа Ліда.— Я не магу тут заставацца.

— «Не магу», бач ты яе! А праз гэтае сваё капрызнае «не магу» вы пераскочыць не можаце? Што ў вас здарылася?

Хіба яна можа сказаць, што здарылася? Ды і як пра гэта скажаш, як растлумачыш?..

— Пашліце мяне ў Гомель. У Оршу. Куды хочаце,— просам просіць Ліда.

Начальнік аддзела кадраў паднімаецца са свайго месца.

— Вось што, таварыш Бокава. Калі на тое, наша чыгунка больш не мае патрэбы ў вашых паслугах.

Ён кладзе перад Лідай яе накіраванне.

— Можаце ехаць, куды вам падкажа ваш капрыз.

— Гэта не капрыз, таварыш начальнік.

— Усё. Можаце ісці.

Ліда таксама ўстала. Але павольна, абапіраючыся аб стол адной рукой, бы падбітая птушка крылом. Другой рукой бярэ накіраванне. Хвіліну глядзіць на яго. Потым, выпрастаўшыся, але не ўзнімаючы вачэй, кладзе яго назад на стол.

— Прабачце. Я вінавата перад вамі. Я сапраўды паводжу сябе, як дзіця. Пра ўсё гэта трэба было думаць раней, а не кідацца на злом галавы... Я астаюся. Я буду працаваць.

У рабочым касцюме, з жалезным куфэркам у руцэ, Андрэй хутка ідзе ў кірунку канторы дэпо. Даганяе Ліду.

— Ліда!..

Яна імгненна павярнулася. І памкнулася была ступіць насустрач Андрэю. Але ўзяла сябе ў рукі. І ўжо глядзіць на яго холадна і абыякава.

— Нам трэба пагаварыць...— вымаўляе Андрэй.

— Прабачце, Андрэй Сцяпанавіч, я спяшаюся. Мне трэба ў лабараторыю,— не азіраючы больш на Андрэя, кажа Ліда.

Але яна не збочвае, а ідзе побач з ім.

— Вы не падумайце, што я знарок маўчаў увесь гэты час. Проста выпадку не было...

— Гэта няпраўда, Андрэй,— ціха кажа Ліда.

— Увесь гэты час я думаў пра вас...

— Не трэба! — перапыняе яго Ліда.

Бліскучыя, бы са срэбра, рэйкавыя стужкі вядуць іх усё далей і далей ад дэпо, ад пошуму цэхаў, ад людзей.

— Я не ханжа якая-небудзь, не... Я хацела б ісці і ісці з вамі... але каб не хаваць вочы ад людзей, каб не баяцца іх позіркаў. Каб бачыць заўсёды сонца і неба, а не шукаць ценю і задворкаў.

— Але ж можна знайсці нейкае выйсце...

— Якое?

— Я яшчэ не ведаю. Зараз не ведаю. Але, можа, усё неяк зробіцца... з цягам часу...

— Вы верыце ў тое, што кажаце?

Маўчыць Андрэй, хмурна глядзіць сабе пад ногі.

— У мяне ёсць памяць...— кажа Ліда.— Я помню вас у Маскве. Няхай астанецца гэтая памяць. Назаўсёды. А зараз... я прашу вас — ні слова больш пра мяне. Ні слова пра сябе. Не трэба. Я не магу. А вы проста не маеце права.

— Не маю права...— глуха паўтарае Андрэй.

Далей ім ісці няма куды — перад імі паўстае тупік: дзве загнутыя ўгору рэйкі і на іх бервяно, якое перагароджвае дарогу.

— Бывайце!..— праз слёзы кажа Ліда.

І адыходзіць.

Андрэй астаецца. І доўга глядзіць ёй услед.

Стрэлачніца пераводзіць стрэлку, дзьме ў ражок. І тады з дэпо, пабліскваючы старанна адпаліраванымі буферамі, выходзіць магутны пасажырскі паравоз. За яго правым крылом — Андрэй. За левым — Васіль. Калі ж зазірнуць на тэндэр, там можна ўбачыць яшчэ дваіх — Міколу і Генадзя.

— Давай, Генадзь,— кажа Мікола.— Пакажы, на што мы здатныя.

Генадзь бярэ шуфель — нават не бярэ, а проста хапае яго сваімі яшчэ не вельмі прывычнымі да такое работы рукамі — і пачынае пералапачваць вугаль.

— Не рві так, не рві,— заўважае Мікола.— І, акрамя таго, тут ужо хопіць. Давай цяпер вунь там.

Генадзь выпроствaецца і азіраецца наўкола. Адсюль, з тэндэра, яму добра відаць: вунь па пуцях ідзе Ліда. Генадзь штурхае Міколу локцем: глядзі, маўляў. І Мікола ўвесь падаецца наперад.

Ліда махае рукою. І Мікола робіць тое самае.

Вядома, адсюль, з паравоза, Мікола не можа дакладна ведаць, куды іменна глядзіць Ліда. Не ведае гэтага і Андрэй. Але, седзячы на сваім крэсле і таксама даўно ўжо заўважыўшы Ліду, ён цяпер у сваю чаргу падымае руку і махае ёю. А потым той жа рукою бярэцца за прывод сігналу, і на ўсё наваколле раптам раве гудок.

Паравоз ідзе да станцыі, каб узяць там поезд «Брэст — Масква».

Васіль, шуруючы топку, раптам спалохана ўскрыквае:

— Стоп! Тармазі!

Андрэй спыняе паравоз.

— Што здарылася?

— Ды вунь... каласнік вываліўся...

Андрэй трывожна зазірае ў топку. Там бушуе полымя — толькі яно адно і відаць.

Саскочыўшы з паравоза, Андрэй глядзіць пад топку, у попельную скрыню. І выцягвае адтуль кручком ужо аплаўлены каласнік.

На сківіцах у Андрэя захадзілі жаўлакі.

Нічога не разумеючы, Генадзь ціха пытае ў Міколы:

— Гэта... што гэта такое?..

— Хана нам,— панура кажа Мікола.— Далей сахаць нельга.

— Назад, значыцца?..— адразу засмуціўся Генадзь.

— Назад... А гэта, браток ты мой, такая ганьба, што горш і не бывае. Горш і сам чорт не прыдумае.

— Мікола!— чуваць рэзкі выгук Андрэя.

Мікола мігам злятае з тэндэра.

— У кладовую, хутка!— тым жа рэзкім голасам загадвае Андрэй.— Новы каласнік!

Мікола, не разумеючы, здзіўлена глядзіць на Андрэя.

— А... навошта? Хіба ж яго ўвапрэш? Агонь такі, тэмпература...

— Марш!— тады амаль ужо крычыць на Міколу Андрэй.

Мікола схамянуўся і пабег.

— Вугаль — вон!— зноў камандуе Андрэй.

Удвух з Васілём яны пачынаюць ачышчаць топку. Ляцяць на дол кавалкі распаленага вугалю.

Генадзь шырока расплюшчанымі вачыма глядзіць, як завіхаюцца Андрэй і Васіль.

Мікола бяжыць у дэпо. На паўдарозе яго спыняе Ліда.

— Куды вы? Што здарылася?

— Бяда ў нас! Каласнік зваліўся!— толькі і паспявае крыкнуць на хаду Мікола.

А сам бяжыць далей.

Не раздумваючы, Ліда кідаецца туды, дзе на пуцях відзён паравоз Андрэя Беражкова, ахутаны дымам і параю.

З топкі ляцяць на дол апошнія кавалкі вугалю. Яго тут ужо ладная гара, і ён не перастае гарэць.

Да паравоза падбягае задыханая Ліда.

— Як жа гэта, Андрэй Сцяпанавіч?— прыціскаючы рукі да грудзей, вельмі хвалюючыся, з пабялелым тварам, кажа Ліда.

— Дзе гэты Мікола, чорт яго не бяры?— не адказваючы Лідзе, кажа Андрэй.

— Навошта вы спаражнілі топку?— службовым голасам пытаецца Ліда.

Андрэй не слухае Ліду. Ён нервова кажа сваё:

— Чорт, дзе ж той Мікола!

Ліда падымаецца на паравоз. Зазірае ў топку. Топка пустая, там вугалю няма ні каліва. Але яна аж дыша агнём, і Ліда міжвольна адхінаецца.

— Што ж цяпер будзе?— пытаецца Генадзь у Ліды.— Мы, значыць, не паедзем? Не павядзём поезд?— У голасе ў яго туга, і сам ён мае выгляд страшэнна пакрыўджанага чалавека.

— Не. Пад поезд пойдзе другі паравоз.

— А мы?

— У дэпо. На рамонт. Там астудзяць паравоз і паставяць новы каласнік.

— І нічога нельга зрабіць?

— Нічога.— Ліда зноў зірнула на топку, паціснула плячыма.— От невядома толькі, навошта Андрэй Сцяпанавіч спаражніў топку, навошта павыкідаў увесь вугаль.

— Генка, папяросу!— даляцеў да іх голас Андрэя.

— Я ж кінуў курыць.

— Не ў пару.

— Дык жа Мікола...

— От я ўсыплю твайму Міколу. Яго толькі па смерць пасылаць.

— Вунь, бяжыць!— радасна закрычаў Васіль.

Андрэй падымаецца ў паравозную кабіну. Бярэ з інструментальнай скрыні абцірачныя канцы і абкручвае імі боты. Нацягвае на рукі брызентавыя рукавіцы.

— Вася, за мной!— загадвае Андрэй і кідаецца да гідракалонкі, што знаходзіцца на пуцях непадалёк ад паравоза.

Васіль ужо зразумеў, што надумаў зрабіць Андрэй. Ён падбягае да калонкі, адкручвае кран. Зверху, з трубы, на Андрэя рынуў цэлы паток халоднай вады.

Ліда жахнулася. Яна крычыць да Андрэя:

— Вы што, звар'яцелі?! Я пратэстую!..

Мігам уся Андрэева вопратка робіцца мокрай і халоднай. Але ён стаіць пад струменем і толькі стараецца, каб не дужа біла вада ў твар.

— Андрэй Сцяпанавіч, я не дазволю!— Ліда кідаецца да Беражкова; яна таксама зразумела, што ён будзе рабіць далей, і ёй стала страшна.— Чуеце, я гэтага не дазволю!

Андрэя пачало ўжо калаціць ад холаду. Ён падняў руку, і Васіль закруціў кран.

Тут якраз і падбег Мікола з каласнікам у руках.

— Кладаўшчык, як на тое, абедаць пайшоў. Дык я, ведаеце, што зрабіў...

— Пасля! Давай каласнік!

Андрэй хапае каласнік і зноў лезе ў паравозную кабіну. Ліда адразу ж лезе за ім. Потым і Мікола.

Ліда зусім разгубленая. Яна бачыць, што Андрэй усё ж зробіць тое, што надумаўся, і ні просьбы яе, ні ўгаворы, ні загады не памогуць. Яна адно толькі шэпча:

— Але ж гэта... гэта вельмі небяспечна!

— Ліда, адыдзіце,— спакойна кажа Андрэй.

Адхіліўшы Ліду, Андрэй нырае ў топку.

Усе замiраюць.

Пакутліва цягнуцца секунды.

А каля паравоза наназбіралася ўжо людзей. Яны, канечне, не ведаюць, дзе зараз Андрэй і што ён робіць. Але кожны хоча выказаць нейкае сваё меркаванне.

— От табе і маеш. От табе і Беражкоў...

— А пры чым тут Беражкоў?

— Такое з кожным можа здарыцца...

— Э, не, цяпер усе шышкі на яго аднаго пасыплюцца...

Пакутліва цягнуцца секунды... Лідзе здаецца, што Андрэй знаходзіцца ў топцы ўжо цэлую вечнасць.

Але вось Андрэй паказаўся з топкі. Ён з шумам выдыхае з сябе паветра. Да яго пацягнуліся восем рук і памаглі вылезці.

Андрэй стаў на ногі, выпраставўся. Відаць, у яго пацямнела ў вачах, бо ён працягнуў рукі і пахіснуўся. Ліда падхапіла яго і прыхінула да сябе. Так яны стаяць нейкі час, зрабіўшыся раптам вельмі блізкімі і патрэбнымі адно аднаму.

— Доктара! Паклічце доктара!— кажа Ліда.

Генадзь адразу высоўваецца з кабіны.

— Доктара! Паклічце доктара, ну!

— Не трэба,— кажа Андрэй. І дадае, радасна бліснуўшы вачыма:— Вугаль!

Усе адразу зразумелі, што Андрэю ўдалося паставіць каласнік на месца. Васіль і Мікола, спяшаючыся, пачынаюць кідаць вугаль назад у топку. Ім памагае Генадзь.

Андрэй апускаецца ў сваё крэсла. Ён дыхае часта і глыбока. Побач усхваляваная, устрывожаная Ліда зазірае яму ў твар.

У топцы зноў палае агонь. Васіль зачыняе дзверцы, глядзіць на манометр.

— Адзінаццаць атмасфер.

Андрэй ківае галавой.

Генадзь з захапленнем глядзіць на Андрэя. І раптам чуе голас, які прымушае яго здрыгануцца:

— Ну-с, каму я тут патрэбен?

На паравоз у белым халаце падымаецца Іван Харытонавіч Рахуба.

Генадзь імгненна апынуўся каля Андрэя і засланяе яго сабою.

— Не дам!— крычыць Генадзь.— Не падыходзь, чуеш!

Рахуба сумеўся.

— Што такое, малады чалавек? Мне сказалі — няшчасны выпадак. Вось я і прыйшоў...

— Ідзі адсюль, ты!.. — крычыць і тупае нагамі Генадзь.

У гэтым мурзатым хлопцу Рахуба пазнае раптам Генадзя. Ён чырванее.

— Таварыш Беражкоў, я ж да вас...— нясмела кажа ён.

Андрэй глуха вымаўляе:

— На гэты раз вас дарэмна патурбавалі. Але нам яшчэ трэба будзе сустрэцца.

— Нічога не разумею...— Паціснуўшы плячыма, Рахуба знікае з паравоза.

Андрэй сунуў рукі ў вядро з нафтаю, патрымаў іх там крыху, потым пачаў выціраць пакуллем.

— Лепшае лякарства,— весела кажа ён.— Яшчэ бацька навучыў.

Зусім нечакана для Генадзя да паравоза падбягае Вікторыя.

— Таварыш Беражкоў, мяне дзяжурны паслаў. Што тут у вас такое, пытае. Чаму не ідзяцё да поезда?

— Ідзём, даражэнькая, ідзём!— яшчэ больш весела кажа Андрэй і торгае сігнал.

Над паравозам успыхвае белае воблачка, і тут жа гудзіць гудок.

Рытмічна пастукваючы на стыках рэек, паравоз ляціць на станцыю да поезда. З тэндэра чуцён голас Генадзя — ён не то спявае нешта, не то проста галёкае ад лаўпаты ахапіўшых яго пачуццяў.

На Лідзіным рабочым стале — чарцяжы, схемы. У расчыненае акно далятаюць гудкі паравозаў. Відаць, яны не-

рашкаджаюць Лідзе. Яна падыходзіць да акна, зачыняе яго. Спрабуе працаваць. Не можа.

Позірк яе спыняецца на букеце кветак, што стаіць на стале ў вазе. Ліда бярэ букет з вазы, глядзіць на яго, потым зноў апускае ў вазу.

Пасля падыходзіць да акна, расчыняе яго. Усё ж гукі паравозных гудкоў — вельмі прыемныя, нечым нават блізкія, мілыя сэрцу. Іх можна слухаць і слухаць бясконца. І пачуць нарэшце адзін — самы прыемны, самы блізкі і мілы...

Удалечыні відны высачэзныя вежы двух будынкаў, што стаяць на Прывакзальнай плошчы. Так, яны стаяць на Прывакзальнай плошчы. А к перону вакзала неўзабаве падыдзе поезд. І прывядзе яго Андрэй Беражкоў...

Ліда з трэскам зачыніла акно. Села к сталу. Пасядзела хвіліну, другую... Раптам рашуча ўстала, узяла кветкі.

І выйшла з пакоя.

— Зялёны!— кажа Васіль.

— Зялёны! — пацвярджае Андрэй.

Не імчыцца, а нібы ляціць наперад паравоз. Позірк Андрэя — нецярплівы, прагны — накіраваны ўперад, да Мінска.

— Зялёны!

— Зялёны!

— Правільна, братцы, зялёны!— аж заходзіцца на тэндэры ад крыку Генадзь.

На вакзале ў Мінску грыміць з рэпрадуктара голас дыктара:

— Грамадзяне пасажыры, праз пяць мінут на першы пуць прыбывае поезд «Масква — Мінск». Праз пяць мінут прыбывае...

У канцы перона, там, дзе звычайна прыпыняецца паравоз,— Вера і Віця. Вера не можа ўстаяць на адным месцы, яна так і рвецца да поезда, дакладней кажучы, туды, адкуль ён павінен паказацца.

Двое рабочых цягнуць па пероне багажную цялежку. Адзін з іх кажа, кіўнуўшы на Веру:

— Мужа, глядзі, прыйшла сустракаць. Беражкова. Перажывае.

— Гэта таго, што ў топку лазіў?— пытаецца другі.

— Але, таго самага.

— Адчаяшны хлопец.

— І поезд яшчэ павёў пасля таго.

На перон прыходзіць Ліда. У руках у яе букет кветак.

— Грамадзяне пасажыры,— грыміць голас дыктара.— На першы пуць прыбывае поезд «Масква — Мінск». Стаянка...

З грукатам праносіцца міма Ліды паравоз. Потым адзін за адным — вагоны. Ліда спяшаецца да паравоза.

Аднак, не дабегшы некалькі крокаў, Ліда раптам замірае. Яна бачыць Андрэя, які ўжо сышоў з паравоза, і Веру з Віцем, што кінуліся да яго. Андрэй падхоплівае сына на рукі. Вера прытулілася да мужа і ці то смяецца, ці то ўсхліпвае...

Задрыжаў букет у Лідзіных руках. Ён вось-вось упадзе на зямлю.

Мікола першы заўважыў Ліду і робіць нясмелы крок да яе. Тады ўбачыла Міколу і Ліда.

— Вось... вазьміце...— збянтэжана кажа Ліда і аддае букет Міколу.

Мікола няёмка бярэ букет, потым хоча вярнуць яго назад, пасля яшчэ мацней сціскае ў руках. І ўжо ўсміхаецца — шырока і радасна, увесь перапоўнены шчасцем.

— Дзякую... шчыра дзякую... толькі скажыце чаму...

Ён не паспеў дагаварыць. Ліда, неяк стуліўшыся, раптам паварочваецца і ўцякае.

Усё гэта бачыць Вера. Яе позірк перахапіў Андрэй і сумеўся. Ён зусім не ведае, што рабіць.

Але тут да паравоза падыходзіць высокі чалавек у строгім чыгуначным гарнітуры. Гэта начальнік дэпо.

— У гераізм падумаўся пагуляць, таварыш Беражкоў?— ссунуўшы бровы, кажа начальнік дэпо.— З якое рады ты палез у топку? На якога д'ябла? Паравозаў у нас не хапае, ці што? Якая ў гэтым была неабходнасць?

— Я не мог іначай. Калі ўжо я выехаў пад поезд, я павінен гэты поезд павесці. Я не мог іначай.

— А калі б што здарылася? А калі б ты там...

— Але ж, бачыце, нічога не здарылася.

— Эх, Беражкоў, Беражкоў, усыпаць бы табе як мае быць...— ужо мякчэй кажа начальнік дэпо.— Ды пераможцаў, як той казаў, не судзяць...

У сваім утульным доміку на вуліцы Машыністаў, на верандзе, адпачывае Андрэй Беражкоў. Зручна ўсеўшыся ў крэсле-качалцы, ён нерухома глядзіць на разгалістую яблыню, што схіліла свае галінкі да самай веранды.

Непадалёку ад яго сядзіць з кнігай Вера. А ў кутку забаўляецца са сваім веласіпедам Віця.

Над самай дальшай у садзе вішняй навіс распалены шар сонца. Ад рознакаляровых шыб веранды кладуцца на падлогу чырвоныя, зялёныя, сінія плямы.

— Ты лёг бы на канапу ды адпачыў як след,— кажа Вера.— Паездка ж вунь якая была.

Андрэй не адказвае.

Тады Віця вырашае, што яму трэба сказаць нешта сваё.

— А я пасля паездкі ніколі не адпачываю. Нават калі цэлы дзень езджу, і то нічога.

Каб даказаць гэта, ён садзіцца на веласіпед і хуценька едзе па верандзе.

— Табе нічога не баліць?— трывожна пытаецца Вера.

— Ведаеш што, я, бадай, пайду ў дэпо,— задуменна кажа Андрэй.

— Нікуды ты не пойдзеш. Ты ж зусім не адпачываў.

— Трэба мне, разумееш...— з нейкай тугою вымаўляе Андрэй, але не падымаецца з крэсла. Падобна на тое, што ён цяпер перакопвае ў нечым сам сябе.

— Даць табе «Новый мир»? Цікавы раман тут ёсць. Таксама пра Беражкова. Я ў бібліятэцы ўзяла.

Андрэй зноў не адказвае. Потым імкліва ўстае.

— Дык я пайду... Ты пра нешта пыталася? Я хутка вярнуся. Не, я не затрымаюся доўга.

Ён шпаркімі крокамі ідзе да брамкі і знікае за ёю.

На Верыным твары — трывога.

У інтэрнаце Васіль правярае латарэйныя білеты. Звесрыў з табліцай першы білет.

— Во, ледзь не выйграў. На два нумары не сышлося.

— Што?— пытаецца Мікола; ён якраз голіцца за сталом.

— Жаночы гарнітур. Глядзім далей.

Васіль правярае наступныя білеты. Адклаў убок другі, трэці.

— Во, зноў ледзь не выйграў!

— «Масквіч»?

— Ліхтарык з батарэйкаю.

Васіль праверыў яшчэ адзін білет. Уздыхнуў. Зноў узяў усе білеты, перагледзеў іх. Задумаўся. І раптам кажа:

— Пачакай, у мяне ж было пяць білетаў! А тут толькі чатыры...

— Сляпая курыца,— кажа Мікола.— Вазьмі вочы ў рукі і пашукай, як хлеб шукаюць.

Васіль ідзе да этажэркі. Шукае. Але білета нідзе няма.

— Дзе ж гэта ён дзеўся...

— Шукай, шукай лепш.

— Не, нідзе няма...

У пакой з газетай у руцэ ўваходзіць Генадзь — радасны, узрушаны.

— Глядзіце, арлы! — з захапленнем кажа ён.— На ўсю чыгунку напісалі пра нас!

Ён паказвае газету. Там на фотаздымку — Андрэй, Васіль, Мікола і ён, Генадзь. Усе на фоне паравоза.

— Бачыце — «Гераічны ўчынак машыніста Беражкова». І вы ўсе тут, бачыце, таксама. І я. Бачыце?

Не дагаліўшыся, Мікола бярэ газету, глядзіць на здымак, усміхаецца. А Васіль панура пытаецца ў Генадзя:

— Паслухай, Генка, ты не бачыў майго білета?

— Якога білета?.. Там, ведаеце, што яшчэ напісана? Пра мяне. Пра тое, што машыніст Беражкоў... узяў мяне...

— Звычайнага, латарэйнага,— перапыняе Васіль Генадзя.— Які ляжаў вось тут, на этажэрцы.

— Пакінь, Васіль! — кажа Мікола.

Генадзь яшчэ нічога не разумее.

— Не, не бачыў. Хоць не, здаецца, усё ж бачыў. Праўда, бачыў. Яны сапраўды там былі.

— Аднаго з іх няма. Ты не ведаеш, дзе ён цяпер?

— Васіль!— зноў спрабуе Мікола спыніць Васіля і паказвае яму з-за спіны кулак.

— Адкуль жа я магу ведаць?..— бянтэжыцца Генадзь. Толькі цяпер ён заўважае нядобры позірк Васіля. З Генадзевых рук падае газета,— у яго, аказваецца, было аж два экземпляры.

— Няўжо... вы падумалі... га, хлопцы?..

Васіль панура маўчыць. Мікола хоча нешта сказаць, але позна ўжо. Генадзь паварочваецца і вылятае з пакоя.

— Эх, ты!..— з дакорам кажа Мікола Васілю. Спёршы мыла са шчакі, ён таксама выбягае з пакоя.

Апынуўшыся на вуліцы, Мікола бачыць, як на прыпынку Генадзь сядае ў аўтобус і як той адразу ж кратаецца з месца.

Вера сядзіць ля акна і шые нешта дзіцячае.

За сталом сядзіць Генадзь. Перад ім шклянка чаю. Але Генадзь быццам і не бачыць той шклянкі. Ён нервова круціць у руках лыжачку.

— Вы піце, Гена, піце,— кажа Вера.— Андруша хутка павінен прыйсці.

У суседнім пакоі каля сваёй чыгункі стаіць Віця. Але чыгунка зараз не працуе. Поезд самотна спыніўся недзе пасярэдзіне дарогі...

І нейкая трывожная, бы нават важкая цішыня пануе ва ўсім доме. І твар у Веры — таксама трывожны.

— Гэта добра, Гена, што вы наведалі нас,— кажа Вера.— Як хаця вам там жывецца, у інтэрнаце?

— Жывецца...— няпэўна адказвае Генадзь.

Чай, напэўна, ужо даўно стаў зусім халодны. Ды Генадзя гэта не турбуе. Ён усё круціць лыжачку ў руках і ўсё глядзіць на Веру. І, магчыма, прыгадваецца яму зараз дзяцінства ў Слаўным, родная хата і мама, якая вось гэтак жа шыла яму некалі штонікі...

— Што вас Андруша аформіў на паравоз, гэта добра,— кажа далей Вера.— Я чыгуначнікаў люблю. Я і сама чыгуначніца. От падрасце Віця, зноў пайду на транспарт. А пра таго доктара вы не думайце. Не трэба гэтак пакутаваць.

Віцю ўсё ж надакучыла быць аднаму. Ён ідзе да мамы.

— Мам, а мам,— кажа Віця,— а чаму таты ўсё няма?

— Ты пагуляй, Віцечка, пагуляй.

— А тата хутка прыйдзе?

— Цяпер ужо хутка. Ты пагуляй, Віцечка, пагуляй...

Памаўчаўшы, Вера зноў кажа да Генадзя:

— Я так думаю. Ну от спалілі б вы яго. Вас, канечне, зноў за краты, бо ад закону нікуды не дзенешся. А ён з выгляду чалавек заслужаны, яму тым часам новую кватэру дадуць. Толькі была ў яго раней, прыкладна сказаць, на тры пакоі, а будзе на чатыры.

— Гэта точна.

— З ім трэба інакш. Андруша мне гаварыў...

Віця штурхае локцем Генадзя.

— Пойдзем з табою пагуляем, га? Ну пойдзем, Гена, га?

— Не дачакаюся я, мабыць, Андрэя Сцяпанавіча,— з тугою кажа Генадзь.

— А вы от схадзіце пагуляйце з Віцем, праўда. Можа, якраз і сустрэнеце яго.

Вяла іх блытаная дарога па горадзе, вяла па вуліцах і завулках і прывяла на стадыён.

Андрэя і Ліду.

На пустэльны, зусім бязлюдны зараз стадыён. Адсюль, дзе сядзяць яны, бясконцымі ярусамі вузіцца паніз яго гіганцкая чаша.

— Аказваецца, мне патрэбна не толькі памяць,— кажа Ліда.— Не толькі ўспамін... успамін аб тым, чаго не было. Мне трэба і больш.

— І мне,— кажа Андрэй.— Так, і мне.

Але, усё з'іначыла, усё перакруціла здарэнне з каласнікам. Цяпер яны ўжо не могуць быць адно без аднаго.

— Я баялася гэтага... і прагла. Гнала ад сябе нават думку пра вас... і бегла вам насустрач. Мне было страшна... і надзвычай лёгка адначасова. Мне і цяпер страшна... хоць не, цяпер мне ўжо не страшна, я пераступіла цераз страх. Прыйшло нешта іншае. Я не ведаю, што гэта такое.

— Вы ведаеце, Ліда. І я ведаю.

— Не, гэта не тое. Хіба яно гэткае — каханне?.. Яно мне ўяўлялася... як гэта вам сказаць... спалучэннем двух колераў: блакітнага і ружовага. Так, так, не смейцеся, чамусьці іменна блакітнага і ружовага. Ён увесь у блакітным. Яна ўся ў ружовым.— Ліда сумна ўсміхнулася.— А от... і ні блакітнага няма, і ні ружовага.

— Пераважае чорны,— зірнуўшы на свой кіцель, сказаў Андрэй.

— Але, чорны... Чорны паравоз. Чорны вугаль. Чорныя ад нафты шпалы... А думкі пра ўсё гэта — светлыя. Таму, што гэта ваша жыццё, Андрэй.

— І ваша.

— І маё. Цяпер — больш, чым калі-небудзь раней.

Вецер сарваў у Ліды з галавы касынку. Андрэй злавіў яе на ляту, але не аддаў Лідзе, пакінуў у сваіх руках. А яна ўсё стараецца вырвацца і паляцець.

— Пойдзем гуляць у футбол,— сказаў Віця, калі яны з Генадзем пасля вандровак па розных мясцінах горада апынуліся ля ажурнай аркі стадыёна.— Ты будзеш варатар, а я цэнтральны нападаючы.

У Віці ў руках — маленькі гумавы мячык.

— Пойдзем, га?

— Пойдзем,— згаджаецца Генадзь.

Магчымасць пастаяць у сапраўдных варотах сапраўднага стадыёна прывабіць хоць каго. І няважна, зрэшты, што на цябе ляціць усяго толькі дзіцячы мячык і што нададзены ён усяго толькі пяцігадовым футбалістам.

— Гол!— з захапленнем крычыць Віця.— Давай свабодны!

Ну што ж, няхай будзе свабодны. Мяч ляціць высока ўгору. Назіраючы за яго палётам, Генадзь раптам выяўляе, што на гэтым незвычайным матчы прысутнічаюць, аказваецца, гледачы. Праўда, іх толькі двое, але яны ёсць.

Зрэшты, балельшчыкамі іх назваць наўрад ці можна. Хутчэй за ўсё, яны нават і не сочаць за гульнёй. Яны, напэўна, проста не бачаць яе.

Так, Андрэй і Ліда нічога не бачылі. Яны былі заняты толькі сабою. Увесь свет для іх зрабіўся цяпер толькі іх уласным светам.

Затое ў Генадзя вока пільнае. Зрок у яго проста выдатны. Ён адразу пазнае гэтых дваіх, што самотна сядзяць на заходняй трыбуне,— Андрэя і Ліду.

І імгненна мяняецца з твару.

— Гол!— зноў крычыць Віця.— Два — ноль у маю карысць!

— Здаюся,— панура кажа Генадзь.— І от што, братка, трэба нам тэпаць дахаты. А то мама...

— Не пайду! Не пайду!— упарціцца Віця.

Але Генадзь учэпіста ўзяў яго за руку і, засланяючы сабою ад Віці заходнюю трыбуну, паспешліва вядзе хлапчука прэч.

Яны мінулі арку цэнтральнага ўвахода. Нібы наганяемы кімсьці, Генадзь ідзе ўсё шпарчэй і шпарчэй.

— Толькі пачалі гуляць, і ўжо дамоў,— капрызіць Віця.— Навошта тады кажаце — паветра, паветра, яно дужа карыснае, трэба больш дыхаць паветрам. Я з татам гуляў не па столькі. А ты адразу цягнеш мяне дамоў...

Ды Генадзь не чуе Віцевых слоў. Або не звяртае на іх увагі.

Позні вечар.

На так званым Бетонным мосце, якім канчаецца Маскоўская вуліца, абапёршыся на балясы, стаіць Генадзь. Каўнер яго каўбойкі падняты, рукі засунуты ў кішэні штаноў. Позірк у Генадзя пануры, змрочны.

Унізе пад мостам ляжыць чыгуначны пуць. Па ім у кірунку вакзала пралятае паравоз. Пасля па другой каляі праходзіць яшчэ адзін паравоз, ужо ў кірунку дэпо.

Генадзь выняў папяросу, закурыў. Відаць, ён стаіць гэтак ужо даўно. Стаіць і некага чакае.

Праз колькі часу ўдалечыні паказалася постаць Андрэя. Генадзь схамянуўся і нібы нават сціснуўся ўвесь.

Дайшоўшы да сярэдзіны моста, Андрэй прыпыняецца непадалёк ад Генадзя, але не заўважае яго. Ён вымае з кішэні пачак папярос. Аказваецца, у яго і папяросы ўжо завяліся... Але тут у яго з кішэні выслізнула жаночая касынка. Андрэй падняў яе. Яна змейкаю выгнулася і затрымцела на лёгкім ветрыку. Скруціўшы яе, Андрэй азіраецца і бачыць Генадзя.

— А, Гена,— кажа ён.— Гуляеш? Дзе быў, мо на танцах?

— Не на танцах...— панура адказвае Генадзь.

— Там у хлопцаў усё ў парадку? — пытаецца Андрэй, а сам затуманенымі вачыма глядзіць некуды далёка-далёка.

— Я пайшоў ад іх...

Але Андрэй не чуе Генадзевых слоў — думкі яго заняты нечым другім.

— Слухай, Гена, не ў службу, а ў дружбу. Ты ж у інтэрнат ідзеш? Аддай там у жаночы корпус... вось гэтую рэч. Здаецца, яна нечая з нашых дзяўчат. Знайшоў, разумееш...

Аднак Генадзь не выняў свае рукі з кішэняў.

— Эх вы, Андрэй Сцяпанавіч!..— з туклівым дакорам сказаў ён.— Вера Іванаўна... Яна ж як мая мама!.. А вы яе...

— Генка!..— збянтэжыўся Андрэй.— Ты што гэта?

— Вы самі гаварылі: усё, што ўкрадзена, нават мільён, ніколі не прынясе шчасця. А хіба можа прынесці шчасце крадзенае каханне?

Андрэй аж закалаціўся.

— Блазнюк! Як ты смееш!

— Мяне сёння палічылі за злодзея. Але гэта вы злодзеі! Вы адбіраеце шчасце ў Веры Іванаўны, у Віці!..

— Прэч адсюль, смаркач! — крычыць Андрэй і робіць крок да Генадзя.

— Вы... вы той самы Рахуба, вось вы хто!— таксама крычыць Генадзь.— Вы нават горшы за яго!

І, крута павярнуўшыся, ён шпарка ідзе ад Андрэя.

Апамятаўшыся, Андрэй ціха сказаў:

— Гена...

Потым сказаў мацней:

— Гена!..

Але яго голас, устрывожаны і нават баязлівы, патануў у грукаце цяжкага таварнага саставу, які рынуў пад мост.

Узвіхоранае яго імклівым рухам паветра вырвала з Андрэевых рук касынку, і яна, слізгануўшы па балясах, паляцела ўніз, пад калёсы поезда.

Ноч надарылася цёмная, без аніводнай зоркі на небе.

На лавачцы каля доміка, што патануў у зялёнай лістоце, сядзіць Генадзь. Курыць. Дакурыў папяросу, прыпаліў ад яе другую.

Рыпнула акно.

— Генадзь Максімавіч,— чуецца з цемры голас.

— Я...

— А я думаю — хто гэта...

Генадзь маўчыць. Маўчыць і Вікторыя.

Пасля Вікторыя кажа:

— Нядаўна я ва універмагу была. Спадабаўся мне там адзін галаўны ўбор. Я і ўзяла. Прымерце, га?

Генадзь узяў прасунутую яму з цемры кепку.

— Ой, малая? — спалохалася Вікторыя.

— Эх, Верачка!..

— Вікторыя.

— Зблыталі, перамяшалі мне ўсю калоду. Ад казённага дома пры чужым інтарэсе адвялі, да далёкай дарогі пры ўласным інтарэсе не прывялі...

— Нешта я нічога не разумею,— кажа Вікторыя.

— Тры гады меў я ў галаве адну думку. Паквітацца каб з адным чалавекам... Адвялі мяне ад гэтага. Перакапалі, што самі ўсё зробяць, іншымі сродкамі. А самі!.. — Генадзь з сілаю шпурнуў папяросу на дол.

— Загадкамі вы штосьці гаворыце. Як канферансье.

— Мы, кажуць, заўсягды за чалавека грудзьмі стаем,— кажа далей Генадзь.— Паверыў я. На людзей, Верачка...

— Вікторыя.

— На людзей другімі вачыма глядзець пачаў. А на самай справе аказалася, што людзі — гэта адны рахубы.

— Вас пакрыўдзілі?— са спачуваннем пытаецца Вікторыя.

— Я чаго завітаў? Адрасок от пакіну. Так, на ўсякі выпадак. Пакідаю я Мінск.

— Пакідаеце? — Нешта задрыжала ў голасе Вікторыі.

— Дадому падамся. Дашчаныя крыжы з вокнаў здыму... От толькі аднаму цяжка будзе падымаць гаспадарку. Ну, можа, вазьму каго на ўтрыманне.

Ён змоўк. Яна пачакала, а тады пачала гаварыць сама.

— То вы студэнт, то вы мсціўца нейкі. А па-мойму, вы самы звычайны песіміст. І за вашы словы ну проста нават сорамна. Узлавалі вы за нешта на таго, на каго маліліся, і цяпер усіх пад адзін капыл. А людзі — яны зусім розныя.

— Ясна... Рознагалоссі ў нас, значыцца, з вамі. То, можа, і адрасок... без патрэбы?

— Пакіньце.

— Напішаце?

— Напішу.

Яны зноў памаўчалі.

— Нацe,— сказала потым Вікторыя.

Скрозь лістоту з акна прасунулася белая пляма падушкі...

...Яна, гэтая падушка, так і ляжыць на лавачцы некранутай.

І нікога няма вакол.

Пачынае днець.

Андрэй дома. Ён падышоў да тэлефона, набраў нумар.

— Мікола? Пакліч Генадзя... Няма? Як няма?.. Учора яшчэ знік? Дык што ж ты маўчаў!..— Андрэй асекся і ціха дадаў:— Я зараз прыйду. Ты чакай мяне.

Зашпільваючы на хаду гузікі на кіцелі, Андрэй паспешліва выходзіць з дому.

Не ездзіцца штосьці сёння Віцю на веласіпедзе. Ляжыць гэты веласіпед на баку ў кветніку, а Віця нават і не глядзіць на яго. Ён глядзіць на маму, якая сядзіць на лавачцы тут жа ў кветніку. А мама глядзіць зусім незразумела куды. Ну, што яна можа ўгледзець на тым небе, калі там нават і хмаркі няма?А галоўнае, колькі ж можна сядзець вось так, закінуўшы назад галаву?..

— Мам, га мам,— кажа Віця,— а татка хутка прыйдзе?

— Не ведаю...— не адразу адказвае Вера.

— А куды ён пайшоў?

— Адчапіся, Віця. Ідзі пагуляй.

— І на вуліцы можна?

— Толькі недалёка.

— Не далей нашай калонкі?

Калі мама не ўдакладняе, значыць, вызначыць адлегласць, на якую можна адысці ад дому, мае поўнае права ён сам.

І Віця мінае водаразборную калонку, паварочвае за вугал і адыходзіць да адхону, за якім — чыгуначнае палатно. На краі адхону ён спыняецца і глядзіць уніз. Там часта-часта ляжаць шпалы. І на іх рэйкі — гладкія, бліскучыя, як з серабра.

У інтэрнаце каля стала стаіць злосны Андрэй. На табурэце сядзіць Мікола. А на ложку — Васіль.

— Шэрлок Холмс! Нат Пінкертон!— праз зубы выціскае Андрэй.— А якія ў цябе былі падставы надазраваць?!

— Але ж білета няма,— кажа Васіль; ён круціць у руках нейкую кнігу.

— Падумаеш, з-за нейкага трыццацікапеечнага білета ўзняў такі вэрхал!— гарачыцца Мікола.

— Але ён мог выйграць, і тады гэта было б не трыццаць капеек,— апраўдваецца Васіль.

— А я не веру, што Генка ўзяў! — грукнуў Андрэй кулаком па стале.

— А я веру! — крыкнуў у сваю чаргу Васіль і бразнуў кнігаю на ложку.

З кнігі выслізнула паперка. Васіль узяў яе, і вочы ў яго, як кажуць, палезлі на лоб. Гэта — той самы чортаў білет.

Убачылі білет і Андрэй з Міколам. Мікола ляснуў сябе па лбе:

— Ідыёт! Гэта ж я сам яго туды паклаў!

У пакоі запанавала цішыня.

— Нарабілі, нічога не скажаш... — прамовіў Андрэй. І ціха дадаў:— Ды і я таксама...

Ён яшчэ памаўчаў.

— Білет от знайшоўся. А чалавек...

Потым Андрэй рашуча кажа:

— Вось што, хлопцы. Трэба шукаць яго! Я пабягу ў дэпо, а вы мабілізуйце ўсіх дружыннікаў! Усіх чыста!

І вось хлопцы і дзяўчаты з чырвонымі павязкамі на рукавах — па адным, па два, а то і групамі — з'яўляюцца:

па вакзале,

у аэрапорце,

па аўтобуснай станцыі,

у закусачнай-аўтамаце

і проста на вуліцах і плошчах горада.

Сустракаюцца два такія хлопцы на рагу праспекта Леніна і Камсамольскай вуліцы. Першы пытае:

— Не бачыў?

— Як скрозь зямлю праваліўся,— адказвае другі.

Яны разыходзяцца і зноў пільна ўзіраюцца ва ўсё і ўсіх навокал.

Яшчэ двое сустрэліся — гэта ўжо дзяўчына і хлопец.

— Не чуваць?

— Не яшчэ.

На вакзале нейкая мажная кабета, што чакае свой поезд, пытаецца ў суседа па лаўцы:

— Каго гэта шукаюць, не чулі?

Сусед — мяркуючы па ўсім, бухгалтар або домакіраўнік, што пайшоў на пенсію,— адказвае:

— Каго ж яшчэ могуць шукаць? Ясна, каго. Першага стрэчнага шукаць не будуць.

А ў чарзе на тралейбусным прыпынку маленькая сівенькая бабуля на сакрэту паведамляе маладзенькай дзяўчыне:

— Чуеш, мілая, а ён, кажуць, зусім і не ён.

— Хто, бабуля?

— Ды шпіён, якога шукаюць. Быццам гэта яна. Баба. Таму і не могуць знайсці, што невядома — у спадніцы шукаць ці ў штанах.

Бяжыць удалечыню, кудысьці ў невядомасць, рэйкавы пуць. Шпалы, шпалы, шпалы...

Па іх, па шпалах, крочыць Генадзь. Ён згорбіўся, вочы яго ўваліліся і пазіраюць адчужана і злосна.

Ідзе Генадзь, крочыць па шпалах, а куды — толкам і сам не ведае. Толькі б далей адсюль, толькі б не бачыць больш нікога!..

А на адхоне стаіць Віця. Магчыма, другім часам Генадзь і здзівіўся б, убачыўшы Віцю так далёка ад дому. Але цяпер яму да гэтага няма ніякай справы.

Ды Віцю да ўсяго ёсць справа. Угледзеўшы Генадзя, ён радасна кажа:

— А цяпер кошка-мышка ў цябе ёсць? Ты мне пакажаш?

Маўчыць Генадзь, нібы і не чуе. Адно крочыць і крочыць.

— Ну і не трэба, падумаеш!..— з крыўдаю кажа Віця.— Я ўсё роўна не глядзеў бы, вельмі мне патрэбна!

І ён спускаецца з адхону. Падняўшы невялікі камень, садзіцца на рэйку і пачынае стукаць па ёй. Не, рэйка не звініць. Атрымліваюцца нейкія глухія, невыразныя гукі: бух! бух! бух!

Хіба мог ведаць Віця, што па гэтым пуці, на якім ён так зручна ўсеўся, іменна зараз павінен быў прайсці таварны поезд?.. Вунь ён і ідзе ўжо — не ідзе, а ляціць са страшэннай хуткасцю...

Машыніст заўважыў хлопчыка тады, калі ўжо і экстраннае тармажэнне не магло памагчы... Зарыпелі бандажы, пасыпаліся іскры з-пад колаў, але поезд па інерцыі ляціць і ляціць наперад. Раве гудок, але Віця, які сядзіць на рэйцы спінай да поезда, не звяртае на гэта ніякай увагі: дзіва што — ён з пялёнак прывучаны не палохацца паравозных гудкоў...

Паравоз ужо блізка. Машыніст ад жаху заплюшчвае вочы...

Нема раве гудок.

Генадзь, пачуўшы яго, паварочваецца. І, адразу ўсё зразумеўшы, з усіх ног кідаецца назад, насустрач поезду, да Віці.

Вось ён ужо каля хлопчыка. А паравоз зусім блізка. І тады Генадзь разам з Віцем падае на шпалы і выпростваецца на іх уздоўж рэек. І ў той жа момант над імі загрукацелі паравозныя колы...

...Усе семдзесят вагонаў прагрукацелі над Генадзем і Віцем. Апошні вагон, сцішыўшы ўжо свой шалёны бег, спыніўся праз некалькі метраў ад іх.

І калі зрабілася ціха-ціха, Генадзь расплюшчыў вочы, потым падняў галаву. Ён цэлы. Цэлы і Віця. Хлопчык, відаць, яшчэ не асэнсаваў таго, што з імі зараз адбылося. Мурзаты, з падрапаным тварам, ён глядзіць на Генадзя, а потым пачынае смяяцца. Тады смяецца — і плача адначасова — і Генадзь, таксама мурзаты, таксама падрапаны, з нарванай каўбойкай.

У штабе народнай дружыны трывожна зазваніў тэлефон. Васіль бярэ трубку.

— Машыніст Наўроцкі слухае!— сказаў ён.— Беражкова? Не, няма. А што там такое?.. З сынам? Што з сынам?.. Добра, я пазваню.

Васіль кладзе трубку, зноў бярэ яе, набірае нумар.

— Дзяжурны па дэпо? Там недзе павінен быць машыніст Беражкоў. Так, пашукайце. Скажыце, дома няшчасце. З сынам нешта здарылася. Га? Дакладна не ведаю. Здаецца, трапіў пад поезд...

Паведамленне Васіля імгненна абляцела ўсё дэпо.

У нарадную набіўся цэлы натоўп паравознікаў. Ва ўсіх устрывожаныя твары. Кожны выказвае сваё меркаванне, але нічога пэўнага ніхто сказаць не можа.

Бледны, з ашкляпелымі вачыма, Андрэй куляй вылецеў з пакоя дзяжурнага па дэпо. Ля выхада з нараднай ён ледзь не збівае з ног Ліду.

— Андрэй Сцяпанавіч...

— З Віцькам бяда...— толькі і змог выдыхнуць Андрэй.

Ліда рванулася была за ім, але спынілася. Яна і хоча пабегчы, і не адважваецца.

Андрэй імкліва бяжыць па вуліцы, і дзіўныя прывіды-ўспаміны паўстаюць перад ягоным унутраным зрокам адзін за другім...

...Так ён убачыў сябе разам з Верай у той момант, калі яны спускаліся па лесвіцы радзільнага дома, а на руках

у яго ляжала маленькая істота — ягоны першынец, ягоны сын...

...Так ён убачыў сябе з Віцем, якому якраз споўнілася год веку, і ён, бацька, вёў малога па бульвары, а той забаўна пераступаў ножкамі ў пінетках, робячы першыя нясмелыя крокі...

...І яшчэ ўбачыў ён свайго Віцю, калі той самастойна ўключыў самы найлепшы свой падарунак — чыгунку — і твар яго так свяціўся шчасцем, што ў бацькі не аставалася ніякага сумнення ў тым, што сын таксама пойдзе па бацькавай дарозе...

Нарэшце Андрэй дабег да дома. Дзверы былі адчыненыя, і ля ўвахода тоўпіліся суседзі. А ў пакоі, на стале, сядзеў Віця і мацаў сябе ручкамі то за галаву, то за нос, то за шыю, усхліпваючы і размазваючы па твары слёзы. Каля яго — Вера і Генадзь. І яшчэ людзі, вядомыя і невядомыя.

— Ух!..— нібы скінуўшы з сябе нешта неймаверна важкае, выдыхае Андрэй. Твар яго святлее, у вачах загараюцца цёплыя агеньчыкі.

Андрэй бярэ сына на рукі.

— Ну што, ну што з табою, сынок?..— Голас у Андрэя дрыжыць і рукі таксама дрыжаць.— Баліць што-небудзь, га?

— Ні-чо-га...— неяк нараспеў і нібы нават са здзіўленнем, усё яшчэ ўсхліпваючы, цэдзіць Віця.— Гэты Генка сваім пузам мяне як прыціснуў!.. Я нічога і не бачыў.

Праз натоўп да выхада з пакоя прабіраецца Генадзь. На яго ніхто не звяртае ўвагі. Вось ён шмыгнуў у дзверы, за якімі знаходзіцца спальня.

Андрэй тым часам дапытваецца ў Віці:

— А вуха што? Чаго ты трэш яго? Баліць?

— Ба-а-ліць... Яно на шпале было... на цвёрдай...

— Ну, нічога, нічога, ну не плач, давай я намыю цябе,— кажа Вера.

— Хітры ён,— перастаючы ўсхліпваць, кажа Віця.— Сам усё бачыў, а мяне закрыў рукамі...

Апынуўшыся ў спальні, Генадзь шчыльна зачыняе за сабою дзверы, падыходзіць да камоды, адсоўвае шуфляду. Бярэ пачак грошай, адлічвае некалькі паперак, астатнія кладзе назад. Засунуўшы шуфляду на месца, ён нячутнай хадою выходзіць з дому.

Ля брамкі ён сустрэў Васіля. Яны не сказалі ні слова адзін аднаму.

Ужо разышліся суседзі. Ужо Віця памыты і пераадзеты. Вера надзявае яму сандалікі.

Астаўся пакуль што ў Беражковых адзін толькі Васіль.

— Але, нялёгка вам,— кажа Васіль, надаючы сваім словам нейкае асаблівае значэнне.

— Ну што вы, ён спакойны,— усміхаецца Вера.

— Я не ў тым сэнсе.

— А ў якім?— пільна паглядзела на Васіля Вера.

Са шклянкай кісялю ўваходзіць Андрэй.

— Не буду!— бярэцца за свае капрызы Віця.

Паставіўшы кісель на стол, Андрэй бярэ сына і падкідае яго пад столь. Віця аж вішчыць ад радасці.

— Цяпер буду,— кажа ён потым і сам хапае шклянку з кісялём.

— Вось так яно і атрымліваецца, Андрэй,— павучальным тонам кажа Васіль.

Перахапіўшы нядобры позірк мужа, Вера паспешліва кажа да Васіля:

— Вы заходзьце як-небудзь вечарком. Чайку вып'ем. Заходзьце.

Паціснуўшы плячыма, Васіль выходзіць.

У пакоі жаночага інтэрната сядзіць Ліда. Тут некалькі ложкаў, але Ліда зараз адна. Яна ў плашчы, нібы сабралася некуды ісці.

Асцярожна ўваходзіць Генадзь. Убачыўшы яго, Ліда чамусьці зусім не здзіўляецца.

Генадзь кладзе штосьці на тумбачку перад Лідай.

— Вось... — не пазіраючы на Ліду, мякка кажа ён.— Тут білет. Месца, па маю думку, добрае. Ніжняя лаўка.

Ліда зірнула на білет, на Генадзя.

— Які білет? Куды?— сумелася яна.

— Вядома, на поезд. На маскоўскі.

Ліда яшчэ раз пільна зірнула на Генадзя. І, нібы яна толькі гэтага і чакала, устала і пачала машынальна збіраць рэчы.

— Так, так, мне іменна на маскоўскі і трэба. Толькі на маскоўскі. Вы малайчына, Гена.

— Я потым зайду,— адыходзячы, кажа Генадзь.

— Дарэчы, якое сёння чысло?— спытала раптам Ліда.

— Дваццаць шостае.

— Але, дваццаць шостага ліпеня,— горка ўсміхнуўшыся прамовіла Ліда.— Хто мог падумаць, што іменна ў гэты дзень мне прыйдзецца ад'язджаць назад.

— Я так і ведаў, Беражкоў, што ты дайграешся з гэтым сваім Генкам,— кажа дзяжурны па дэпо.

Паравоз Андрэя Беражкова стаіць на кантрольным пункце, падрыхтаваны да выхаду з дэпо, пад поезд. Але на паравозе толькі два члены брыгады. Трэцяга няма.

— Ну, добра, бяры качагарам Мікуловіча з брыгады Сцяпанава,— кажа далей дзяжурны па дэпо.

Высокі няўклюдны хлопец, якога прывёў дзяжурны па дэпо, падымаецца на паравоз. Ён моўчкі бярэ саўковы шуфель і лезе на тэндэр.

Нічога не адказаўшы дзяжурнаму, Андрэй кладзе руку на рэгулятар. Здрыгануўшыся, паравоз кратаецца з месца.

Генадзь паставіў Лідзін чамадан у тамбур, потым ускочыў сам, памог занесці чамадан у купэ.

Трэба было развітвацца. Ліда сумна паглядзела на Генадзя. І, падбадзёрваючы сябе, сказала, працягваючы руку:

— От цяпер самая пара на Каўказ ехаць, туды, дзе Лермантава гэты... як вы тады сказалі?

— Не помню.

— А, фраер... Самая пара.

Генадзь пацісну̌ў Лідзіну руку, пераступіў з нагі на нагу. Яму трэба яшчэ нешта сказаць, але ён не ведае, як гэта зрабіць. Нарэшце ўсё ж кажа:

— Ведаеце, а на білет... прабачце, мне прыйшлося пазычыць грошы.

— Так, так, канечне!..— спахапіўшыся, Ліда таропка дастала з сумачкі грошы.— Дзякую вам. Бывайце, Гена.

...Нібы з-пад зямлі з'явіўся Генадзь у дзвярах паравознай кабіны.

І адразу пацяплелі твары Андрэя і Міколы.

Шырока заўсміхаўся качагар-запаснік.

А Генадзь падышоў да яго, узяў з ягоных рук шуфель і замёр, як салдат на пасту.

Качагар-запаснік, зразумеўшы, што ён тут цяпер лішні, моўчкі пасунуўся па прыступках уніз.

Андрэй паклаў сваю руку на рэверс. Узіраючыся перад сабой, сказаў:

— Ты, Гена, пра дысцыпліну ўсё ж не забывай. Бо ты не заяц там нейкі, а прадстаўнік сёмай дзяржавы — чыгуначнага транспарту.

Усміхаючыся нейкім сваім думкам, Генадзь падаўся на тэндэр. Да яго даляцелі апошнія словы Андрэя:

— Не жартачкі, Гена, людзей вязём.

...З пошумам вырвалася пара з цыліндраў. Пасунуліся дышлі. Крутнуліся колы. І вось паравоз скрануў ужо з месца вагоны. І тыя ахвотна рушылі ў сваю далёкую дарогу. Адно мільгаюць шыльдачкі «Мінск — Масква».

*1964*

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Яўген Пятровіч Васілёнак нарадзіўся 26 снежня 1917 года ў Оршы ў сям'і чыгуначніка. Вучыўся ў Аршанскай чыгуначнай сярэдняй школе, пасля нейкі час — у Магілёўскім педагагічным інстытуце. З 1935 года пачалася журналісцкая дзейнасць будучага пісьменніка. Ён працаваў у рэдакцыях газет Шклова, Багушэўска, Барысава, Оршы.

У 1939 годзе Яўген Васілёнак па пуцёўцы камсамола паехаў на Далёкі Усход. Працаваў у Хабараўскім радыёкамітэце, у рэдакцыі чыгуначнай газеты «Приморская магистраль» у горадзе Усурыйску, карэспандэнтам маскоўскай «Учительской газеты» ва Уладзівастоку, а пасля ў Новасібірску. У якасці спецыяльнага карэспандэнта гэтай газеты вясною і летам 1943 года знаходзіўся ў Сталінградзе і Краснадары. Са студзеня 1944 года да кастрычніка 1945 года быў ваенным журналістам. У маі 1945 года прыняты ў члены КПСС.

Пасля дэмабілізацыі працаваў карэспандэнтам газеты «Гудок» на Турксібе, у горадзе Алма-Аце. З 1948 года жыве і працуе ў Мінску. Быў карэспандэнтам газеты «Труд» па БССР, працаваў у рэдакцыі часопіса «Маладосць», у апараце Саюза пісьменнікаў БССР, галоўным рэдактарам часопіса «Неман».

Першыя паэтычныя творы Яўгена Васілёнка з'явіліся ў друку ў 1935 годзе, аднак сталай літаратурнай дзейнасцю ён заняўся ў пасляваенны час. У 1954 годзе выйшла кніга апавяданняў пісьменніка «Зялёныя агні», у 1956 годзе — «Прызванне», у 1957 — зборнікі «Выпадковы прыпынак» і «Розныя дарогі». Потым з'явіліся кнігі «Тацяна Ларына» (1964 г.), «Вячэрняя размова» (1968 г.), «Сімфонія са спагнаннем» (1969 г.), «Забыты вензель» (1970 г.) і «На перагоне» (1973 г.).

У перакладзе на рускую мову выйшлі кнігі пісьменніка «Седьмое окно» (1958 г.) і «Татьяна Ларина» (у 1964 годзе ў маскоўскім

выдавецтве «Советский писатель» і ў 1964 годзе ў выдавецтве «Беларусь») і «Последний вагон» (1972 г.). Асобныя творы пісьменніка перакладаліся на многія мовы народаў СССР.

Яўген Васілёнак напісаў таксама п'есу «Каралеўскі гамбіт», якая ў 1957 годзе друкавалася ў часопісе «Полымя» і выйшла асобнымі выданнямі ў Мінску і ў Ленінградзе ў выдавецтве «Искусство» ў перакладзе на рускую мову.

Памёр Яўген Васілёнак 23 верасня 1973 г.

# ЗМЕСТ

Замець . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Звычайная ноч . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
На перагоне . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Хавай, як я хаваю . . . . . . . . . . . . . . . 38
Горкая радасць . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Салдаты не адступаюць . . . . . . . . . . . 52
Адзіночная камера . . . . . . . . . . . . . . 62
Бліскавіца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 85
Таццяна Ларына *(аповесць)* . . . . . . . . . . 140
Першы стрэчны *(кінааповесць)* . . . . . . . . 213
Біяграфічная даведка . . . . . . . . . . . . . 300

*Евгений Петрович Василенок*

Избранные произведения в двух томах

ТОМ 2

На белорусском языке

Рэдактар А. Д. Куліш. Афармленне Л. Я. Прагіна. Мастацкія рэдактары А. І. Труханава, Л. Я. Прагін. Тэхнічны рэдактар Т. М. Сокал. Карэктар Я. А. Бебель.

ИБ № 47

АТ 10032. Здадзена ў набор 9/IX 1976 г. Падп. да друку 14/II 1977 г. Тыраж 10 000 экз. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Ум. друк. арк. 15,96. Ул.-выд. арк. 16,79. Зак. 3557. Цана 1 руб. 32 кап.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Свярдлова, 4.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Мінск, Чырвоная, 23.

**Васілёнак Я.**

В 19 Выбраныя творы ў 2-х тамах. Том 2. Апавяданні і аповесці. Мн., «Маст. літ.», 1977.

304 с.

Другі том склалі аповесць «Таццяна Ларына», кінааповесць «Першы стрэчны», а таксама апавяданні. Добра ведаючы жыццё сваіх герояў, Я. Васілёнак стварыў цікавыя вобразы сучаснікаў.

**Бел 2**

В $\frac{70303\text{-}064}{М\ 302(05)\text{-}77}$ 94-77